# ВЕРАСЕНЬ

літаратурна-мастацкі часопіс



3

2/2010

# Змест


## ПАЭЗІЯ

**Надзея Філон.**
*Дабраславенне.* Вершы. ... 7

**Ігар Кананові.**
*Табой мяне Бог пакараў...* Вершы. ... 10

**Настасся Кухарэнка.**
*Ты — мая балотная сімфонія!* Вершы. ... 16

**Аляксей Арцёмаў.**
*Хай застанецца лепшае!* Вершы. ... 22

**Вольга Грынь.**
*У венах маіх — словы...* Вершы. ... 27

**Андрэй Кабан.**
*Сэрца — адно на дваіх...* Вершы. ... 35

**Таццяна Тамашэвіч.**
*Троіца.* Вершы. ... 42

**Аляксей Палачанскі.**
*Гарадскія акорды.* Вершы. ... 45

**Павел Надольскі.**
*Слёзы Бога.* Вершы. ... 51

**Сяргей Законнікаў.**
*Мімалётнае дзіва.* Вершы. ... 57

**Анатоль Вярцінскі.**
*Во лёс які...* Вершы. ... 65

## ПРОЗА

**Сяргей Белаяр.**
*Марныя спадзяванні.* Фантастычнае апавяданне. ... 73

**Ганна Старыковіч.**
*Настаўнік.* Апавяданне. ... 79

**Раіса Крывальцэвіч.**
*Мой каляндар.* Экспрэсіі. ... 89

**Ганна Дар.**
*Пра Бігі-Казытуна-Калючую-Бараду і яго краіну.* Казка. ... 95

**Леанід Дайнека.**
*Герадоцінкі — 10, або Арытмія.* ... 119

## ПЕРАКЛАДЫ

**Славе Георгі Дзімоскі.**
Вершы. ... 147

## КРЫТЫКА ПУБЛІЦЫСТЫКА ЭСЭ

**Раман Дубашынскі.**
*Вяртанне да свайго...* Артыкул. ... 157

**Святлана Калядка.**
*Хіба паміраюць людзі?..* Артыкул. ... 165

*«І голас Бога слухае душа...»*
Гутарка Эдуарда Акуліна з Рыгорам Сітніцам. ... 170

**Ася Паплаўская.**
*Два лісты Уладзіміру Сіўчыкаву.* Эсэ. ... 181

**Юнэля Сальнікава.**
*Макс Шчур: Сучаснае разуменне інтэлектуала.* Рэцэнзія. ... 190

**Алена Гінак.**
*У пошуках прыгажосці...* Артыкул. ... 200

**Алесь Пашкевіч.**
*Дрэва...* Эсэ. ... 208

**Альдона Мартыненка.**
*Дзве гутаркі.* ... 215

Анкета «Верасня». ... 223

**Уладзімір Караткевіч.**
*Кнігі і рукапісы.* Слова Л. Дранько-Майсюка. ... 235

**Вітаўт Мартыненка.**
*CD-калекцыя.* ... 241


www.kamunikat.org



# ВЕРАСЕНЬ
# ПАЭЗІЯ

надзея філон
ігар кананові ч
настасся кухарэнка
аляксей арцёмаў
вольга грынь
андрэй кабан
таццяна тамашэвіч
аляксей палачанскі
павел надольскі
сяргей законнікаў
анатоль вярцінскі

www.kamunikat.org



# Надзея Філон

паэтка. Студэнтка 3 курса філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Нарадзілася ў 1988 годзе ў Гомелі. Жыве ў Гомелі.

## Дабраславенне

### Сустрэча з небам

Гляджу ў нябёсы... І губляю час,
Якога на зямлі так не хапае?
Магчыма так сказаў бы нехта з нас,
Але не той, хто дом у небе мае.

Але не той, хто ведае у чым
Ёсць прыгажосць нябёснага прытулку.
Мяне так вабіць неба далячынь,
Як часта я туды імкнуся ў думках,

Бо там чакае міласэрны Бог,
Які любоў адкрыў нам у пакутах.
Прыпыніцца там бег зямных дарог,
І больш не будзе ні граху, ні смутку.

### Шчасце

Імклівы позірк незнарок ты кінуў,
Нібы ў натоўпе некага шукаў,
Калі ж са мной сустрэўся ты вачыма,
То здагадаўся: «Вось яна, спаткаў.

Такая блізкая для сэрца незнаёмка
З блакітнымі вачыма, як мае...»
І стала неяк на душы няёмка,
Замільгацелі думкі ў галаве.

Як падысці і што спытаць не ведаў,
Напружанне твой позірк выдаваў.
О, колькі раз пайсцi карцела следам,
Але заўжды дыстанцыю трымаў.

www.kamunikat.org

Трываў... Але аднойчы не стрымаўся
І пры сустрэчы усміхнуўся мне.
Па позірку відаць, што закахаўся...
Цяпер я знаю — шчасце не міне!
*2010*

## Трыялет

Жыццё даецца людзям толькі раз...
Нам невядома, што у ім чакае...
Але заўсёды памятай той сказ:
«Жыццё даецца людзям толькі раз...»
І што цябе у ім не напаткае,
Скажы усім нягодам у адказ:
«Жыццё даецца людзям толькі раз,
Нам невядома, што у ім чакае...»
*2008*

## Дабраславенне

Калі ўзыходзіць сонца над зямлёй,
І бачу ў небе светлае праменне,
Імкнуся да Цябе я, Божа мой,
Дзень новы сустракаю на каленях.

Дабраславення у Цябе прашу,
Каб засцярог ад крокаў памылковых.
Трывогі ўсе да ног Тваіх нясу,
Каб дзень пражыць пад Божаю ахавай.



# Ігар Кcontainer

паэт. Вершы друкаваліся ў часопісах «Дзеяслоў» і «Верасень». Працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Карацкай СШ Клецкага раёна. Нарадзіўся ў 1983 годзе ў Клецку. Жыве ў Клецку.

www.kamunikat.org

# Табой мяне Бог пакараў...

## Зброя

Разлюбіў я людзей. «Пакланяюся» слову як зброі,
Што няўмольна чакае рахункаў і дзейсніць сваё.
Разумею смяротных: яны не пакінуць спакою —
«Жыць» ім трэба! Спяшайцеся — хоць напаю вастрыё!..

Разлюбіў я людзей. Шкамуталі, таптáлі, ламалі!..
Правакатар, спакусніца, хітры і жорсткі дзялок
Рабавалі мой час! Атакую, не маючы жалю:
Джалю трапна, глыбока, атрутна... Гэй, шэршні, набок!

Разлюбіў я людзей, у баталіях існасці — пешка.
Без трывалай нянавісці. Проста, не маю надзей
На Прынцэс і Герояў... Але, тым не меней, усмешку
Захаваў, як настаўнік, для мудрых і светлых дзяцей...

## Хірасіма

*(эпітафія В.Гадульку)*

Багатым быць — не з гэткімі вачыма...
Шчаслівым быць — не з гэткаю душой...
І ў кожнай яго фразе — Хірасіма.
Па моцы і трагедыі сваёй.

## Позірк назад

Талент, ускормлены болем. Паэт...
Не, не скалечаны бедамі —
Дрэсіраваны. І ў гэтым сакрэт.
(Ці не зашмат я ведаю?)

## Адказ

*«Трэція, аддаўшы дарозе, што іх затрымлівала і цямніла, увaходзяць, быццам у браму новага свету, у сонца, і самі становяцца сонцам і ў людзях зямлі прадбачаць сонцалюдзей».*

А. Разанаў

Даю за Беларушчыну адказ
Чальцам — хто на сябе законы шые:
Так, мёртвымі прызначылі вы нас,
А йдуць за намі самыя жывыя —

Хто мае Залатога Сонца ген.
І як ні выхваляйце свой парадак,
Вяршыня развіцця — інтэлігент,
А не паўфабрыкаты на пасадах.

## Капішча року

*Алесю Елісееву*

Цеснаваты мундзір лейтэнанта народнай асветы.
Іранічная роля. Надзьмуты дырэктар-камбат.
«Тэма... мэта...» , і ўсё: надалей не хапае імпэту,
Крэмзаць школьныя планы — ніякі з мяне бюракрат...

Лепш гітару вазьму ды сяпю пра нядолю і шчасце,
Пра каханне, растанне, гулянне і верных сяброў!
...Ты адна не сышла ад мяне, не дала мне прапасці...
Зробім капішчам року наняты пакойчык ізноў!

Цішыню расстраляюць жалезныя, жорсткія рыфы —
Пачуццёвыя залпы гітарных раз'юшаных струн.
Разбураюцца, гінуць мяшчанства агідныя міфы...
Для апошняй атакі мелодыі штых навастру

І праткну, ашалелы, абрыдлыя, хмурныя сцены,
А на рэшту — удару у нізкую брудную столь!

www.kamunikat.org

Хай драпежная нотка уджаліць галоўную вену
Раўнадушных нябёсаў. Каб сэрца галоднага боль

Перадаўся туды. Не чакаю падзякі, вядома,
Ад Таго, Хто над намі стаіць, як адвеку стаяў.
Але рвецца малітва — з душы непакорнай разлому!
Але рвецца малітва — бунтарская, шчыра мая!

Не напішацца план. Аніводны. Ад планаў далёкі,
Для мастацтва жыву. І няхай ад начальства — труна
За «працоўныя подзвігі». Я не пакіну. Я рокер.
Праўда з Воляй — мой крыж, на якім разагнецца спіна...

## Карона

*Б.К.*

Атакуе зіма. Маразамі штурмуе кватэру.
Але я не здаюся — я годна трымаю мяжу.
Проста, грэе Каханне, якому, канешне, не веру...
За якое, канешне, і цела аддам, і душу...

Атакуе зіма. Прапаўзлі скразнякі-дыверсанты.
Разумею: іх мэта — мой слаба прадуманы тыл...
І няхай! Бо шчаслівы: працуе другая канстанта,
Што завецца Каханнем. Настрой — і дурны, і святы...

Ты, славянка мая, абудзіла лірычныя струны.
І яны — у падзяку — плятуць сямінотны вянок.
Атакуе зіма. Душаць справы. Я гэта адсунуў.
Даваршаю карону — кунежу свой радасны шок...

І дурны, і святы... Вечар лютага выстудзіў сцены —
Атакуе зіма. Але я не пазбаўлены тэм.
Выбіраю найлепшую — верай у светлыя змены.
А каб верыла ты, стаўлю «шах» найкласічным «жа тэм!»



## Спадзяванне

Спадзяюся, ты недзе пазначыш, няўмольнае Неба,
Што ганебна грашыў, але потым стаяў за крыжы!
Што звычайную праўду вяртаў, рызыкуючы хлебам!
І, згарэлай душою, малітву гадуючы, жыў...

## Шоўмэн

...«Зорка» лялечных шоў. Рэчаіснасць заторгала ніткі:
Рукі-ногі падкідваеш — скачаш на ўцеху дурным...
Бог над намі — памёр. Пераплавілі Бога на злíткі.
Неба чорны правал цыгарэтны усмоктвае дым...

## Боль

У партрэце зімы — надзвычайная праўда... Аблокі
Зносяць веру маю, пакідаючы сцюжу вятроў...
«Мы — парэшткі ліцвінаў! Магутных русінаў абломкі!»-
Перабіты хрыбет абзываецца болем ізноў...

## Апошні эфір людзей планеты Праванс

Браты па розуму, прыём!
На гэтай вусцішнай планеце
Мы паміраем — не жывём!
Нібы, апошнія ў Сусвеце

З людзей! Вы чуеце, сябры?
Прышліце, молім, дапамогу!
Навокал хітрыя звяры —
Мутанты. Іх няўмольна многа!..

Ёсць зброя, ёсць надзейны гурт,
Ёсць вараў умелых слава.
Але за дзень паляжам тут,
Калі насунецца аблава!

www.kamunikat.org

...Не перайсці ў наступны год.
Хоць карабель па нас прышліце!
А не — тады... вайсковы флот
І ўсё да пылу разбамбіце!

Апошні шанц! Канаем! SOS!
Фартуна больш не дасць авансаў!
Імклíва раз'ядае лёс
Паветра дзікага Праванса...

## Ахвярапрынашэнне Адвечнаму

Распальваю Печ.
І найлепш
бяруцца агнём газеты,
прапітаныя
славалюбствам палітыкаў...

## Абое...

*Б. К.*

Пасварыўся па тэлефоне
з каханай да словаў:
«Табой мяне
Бог пакараў!»

А Бог пасмяяўся
толькі,
астудзіў мяне,
п'янага,
дожджыкам
і адносна роўна
давёў
да прыхільнага ложка...
А ўжо раніцай
сарамліва смяяліся
з учорашняга
абое...



## Настасся Кухарэнка

паэтка. Студэнтка 4 курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Друкавалася ў часопісах «Верасень» і «Дзеяслоў». Нарадзілася ў 1987 годзе ў Любані. Жыве ў Мінску.

www.kamunikat.org

# Ты — мая балотная сімфонія!

## Гэй, народзе! Плакаць годзе!

*(наследванне нашаніўцам)*

Не шаптаць, а біць у бубны!
Не стагнаць, а песняй звонкай
Адгукнуцца ў кожным сэрцы,
Раскатурхаць сонны свет!

Каб шумела і гучала,
Каб грымела, не змаўкала,
Ярчэй сонейка заззяла
Наша праўда на ўвесь свет!

Над шырокімі лугамі,
Залацістымі палямі,
Па-над рэкамі і борам
Заліваецца-гучыць

Песня вечная кахання,
Адраджэння, знітавання
Лёсаў у жывую сутву:
Беларусь мая ляціць!

Пырскі сонечных усмешак
Намярэжылі мярэжак
На льняной яе кашулі,
Каб лацвей было насіць;

Рукі-крылы белым пёркам
Аблачыны ловяць вёртка,
Шчыра сэрцам абдымаюць
І далей пускаюць плыць;

Вецер ветліва вітае,
Шчокі вуснам давярае
І ўжо больш не адпускае —
Побач радасна ляціць!

## Ты — мая балотная сімфонія!

Ты — мая балотная сімфонія,
Матылёвых крылаў паліфонія!
Як бясконца недасяжная гармонія —
Душы, знітаваныя ў адно.

Свае мары адкрываеш стоена.
Кожны дзень даруеш скарбы новыя.
Ажывіць здалею зерне кволае.
Праз стагоддзі прарасце яно.

Душы нашы беларускія аблудныя.
Не дазволь складаць вершы пакутныя.
Сваёй мовай, спевамі ахутанай,
Нашых сэрцаў наталі радно.

Ты мая трывалая і смелая,
На лясных вазёрах чапля белая!
Сцежка памяці народа утравелая
Ды крыніцы з-пад камлёў відно...

Ты мая шыпшынка ручаёвая!
Патаемная паляна верасовая!
Размаўляць з табой адною моваю —
Піць па кроплях вечнае жыццё.

Нашых лёсаў пані ўсеуладная!
Перапёлачка ласкавая прывабная!
Да світальнай шэрані ядвабнае
Журавы хаваюцца ў трысцё.

www.kamunikat.org

Твае дзеці, паслухмяна-шчырыя,
Мы ляцім за маткай белакрылаю.
Нас сілкуе пераможнай сілаю
Багны патаемнае святло.

***

Усё складана.
Хранічны недахоп нірваны.
Сціснуты між пальцаў час —
Адарваны.
Непачатыя справы варта лічыць скончанымі.
Непачатаму раману хэпіэнд гарантаваны...

Сувязь майго сэрца з тваім мозгам
Нетрывалая.
Рэакцыя рухаў на думкі
Адсталая.
З шэрага неба дождж усё ж празрысты.
Несвядомыя мы ў гэтым жыцці, хоць і не мала нам...

Выйсце з лабірынту думак
Заблакаванае.
Жыццё ўласнае
Бы чужое прыгаданае.
Для жыхароў зоркі Сонца кожны дзень прамяністы.
На шалях свету святло і цемра незбалансаваныя...

Усе варыянты жыцця
Штучныя.
Вартаўнікі чалавечых мараў
Непрыручаныя.
Лётаючы за шчасцем, беражыце крылы.
Пачатак з канцом у кола злучаныя...

***

Калі змяняецца жыццё,
Дажджом руйнуюцца надзеі,
Бы фарбы бляклыя, лісцё
Спаўзае да зямлі. Нямее.

І дыхаць мару...
І маўчаць...
Непрадказальныя учынкі
Замест малітваў нам крычаць
Схавацца ў моцныя абдымкі.

Пад скурай сцішана трымціць
Напаўзабытае жаданне...
Не, не кахаць, а проста жыць
І дыхаць...

## Зорнае растанне

Цвіце ў тваіх вачах тугой
Невыказальнай, брудна-шэрай.
Над возерам душы маёй
Балююць цені недаверу.

Святкуюць трызну па былым,
Высока келіхі ўздымаюць,
Пакутам нашым маладым
Калючкі-кпіны дасылаюць.

Маўляў, наіўныя стварэнні,
Чакалі захаваць паланне.
Святло любое згасне хутка:
Час панавання чорных зданяў.

Надзейна ў гэтых пенных хвалях
Яны каханне пахавалі...

www.kamunikat.org

Ды прагадалі...
У момант хвалі спынілі баль,
Цені прагналі.

***

Не застанецца. Слязьмі праліецца.
Адчаем замшэлым, плытом адзічэлым
Да месца спаткання аднойчы прыб'ецца.

А ты не згадаеш ні зорак, ні знічак,
Ні даўніх таемных чысцюткіх крынічак.

Заўчасна забытыя летнія казкі.
На месцы святым нас прыгадваюць краскі.

З высокіх муроў, дубам-ясенем шытых,
Лісты долу падаюць, слёзы нібыта.

І багна вачыма смяецца з-пад моху —
Прыгадвае нашай пяшчоты дарогу.

Бярозка — пакутніца хустачку сушыць,
Каб сум успамінаў адмесці ад душаў.

Сярод гэтых хвой і асінак пахілых
Трымаць прыгажосць ледзь хапае ёй сілы.

Як чорныя зяпы пачварных стварэнняў —
Каменне заўжды варагуе з карэннем.

Ды марна... Карэнне ўспамінаў свідруе
Той мур камянёў і душу трапяткую.



## Аляксей Арцёмаў

паэт. Студэнт Тульскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтар зборніка вершаў «Двойная звезда». З 2008 года піша на беларускай мове. Вершы і пераклады друкаваліся ў часопісах «Дзеяслоў» і «Маладосць». Пераможца каляднага конкурсу інтэрнэт-часопіса «ПрайдзіСвет», прызёр конкурсу маладых літаратараў імя Шэрмана (2009 г.), фіналіст конкурсу імя Ларысы Геніюш (2010). Нарадзіўся ў 1991 годзе ў Туле. Жыве ў Туле.

www.kamunikat.org

# Хай застанецца лепшае!

## Дазволь

Табе цяжка ісці? Вось парэнчы.
Сонца ў вочы? Вазьмі капялюш.
Хай я лішні цяпер, недарэчны —
Снег, што ў чэрвені лёг на зямлю.

Ты — як промень святла, як удача,
Мой жа лёс — сум і шэрая столь...
Я прайду па сусвеце нябачна,
Толькі быць недзе побач дазволь.

Буду лёгка лунаць ценем, мрояй,
Каб не ўчула мяне. Сапраўды
Спадзяюся я толькі на тое,
Што ўратую цябе ад бяды.

***

Душа мая — нявольніца:
І хочацца, і колецца
Прайсці па наваколлі ці
Глядзець у хісткі змрок

І слухаць, як пад клёнамі
Трава шапоча сонная
І пасмамі зялёнымі
Змякчае кожны крок.

Шаўковымі кілімамі
Плывуць дарогі-лініі,
Ды толькі змрок адрыне — і
Працягне час свой бег.



Хай застанецца лепшае —
Лісты, цыдулкі, вершыкі,
Сусвет, святлом усцешаны,
І шчасце — для цябе.

***

Замовамі не вылечыць самоту.
Яна жыве, як за калючым дротам,
У таямніцах цела і душы.
І лекі ад тугі не дапамогуць,
Твой паратунак — доўгая дарога.
Дык не марудзь — бяжы, бяжы, бяжы!
Так, шлях далей за сонца, за аблокі,
За небакрай, утульны і шырокі,
Але ты кіламетры не рахуй.
Хай дыхаць замінаюць пыл і вецер —
Бяжы, бяжы! Пакінь сляды ў сусвеце,
І людзі пойдуць па тваім шляху...

## Прасека

Пятляе палкая прысада:
Пажоўклым полымем — прасвет.
Прыроды прыгажосць — прынада.
Прайдзі прасекаю, паэт!

Пабачыш позірк піхты пекнай,
Прыпомніш: па палях прайшоў,
Пакуль пяшчотна пелі пеўні
Пра пазяханне паплавоў.

## Камінар

Шпакі галілі крыламі паветра,
Гарэў заход прыгожы, як мана.
На вышыні недасягальных метраў
Хадзіў па дахах чорны камінар.

www.kamunikat.org

Блукаў штовечар ён без працы новай
І зразумець не мог, што ўсё дарма.
У джунглях гарадскіх шматпавярховых
Ёсць камінары — комінаў няма.

Жангліраваў кастрычнік жоўклым лісцем,
Ды слухаў чалавек, як вецер ныў.
Замест жыцця надзеі засталіся,
Але каму патрэбныя яны?

І доўжыцца дасюль ягоны шпацыр,
І сумна ўніз глядзіць мурзаты твар...
І пачынае мне чамусь здавацца,
Што я такі ж, як гэты камінар.

## Ліфт

Кабіна ліфта едзе ўніз,
Трасы скрыгочуць у паўзмроку...
Ты пакідаеш парадыз,
Мне да яго яшчэ далёка.

Растання нашага туга
Не закране цябе, я веру.
Я вінаваты сам — я лгаў,
А ты ўвайшла ў чужыя дзверы.

Што застаецца мне? Глядзець,
Як надвячорак тоне ў скрусе.
Я не чакаю новы дзень —
Дажыць да досвітку імкнуся.

Ды прыйдзе ранак. І тады
Пазбавіць ён мяне спакою:
Кабіна ліфта назаўжды
Зачыніцца перада мною.



## Кардонныя героі

Краіна чакала кардонных герояў
І верыла — з'явіцца ён,
Той лідар магутны, што ўладнай рукою
Загорне народ у кардон.

З'явіўся. І кожнаму даў абалонку
(Бясплатна — прыйшоў і бяры),
Каб людзі былі недасяжнымі звонку
І ўтульна жылося ўнутры.

Настаў час раскошы, штодзённага свята!
Галоўнае — помніць заўжды:
Не трэба зважаць на чужынцаў-вар'ятаў,
Няма ні бяды, ні нуды.

Героі з кардону, не будзе вам зводу,
Бо кроў не цячэ ў валакне.
Вы мэты сваёй — руйнавання свабоды —
Ужо дасягнулі. Ці не?

www.kamunikat.org



# Вольга Грынь

**паэтка. Студэнтка 4 курса Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Друкавалася ў газетах «Светлагорскія навіны», «Гомельскі ўніверсітэт», «Переходный возраст». Нарадзілася ў 1989 годзе ў вёсцы Асінаўка на Гомельшчыне. Жыве ў Гомелі.**

# У венах маіх — словы...

## Зорка

У дзіравым небе —
ані зоркі-знічкі,
на сухой на глебе —
ані грушкі-дзічкі.

Знямоглыя людзі
шчасце-мары ловяць.
І ляжаць у брудзе
шурпатыя словы.

***

Не бойся.
Не бойся, я побач.
Я побач, твой верны анёл.
Я разам з табою заўсёды.
Заўсёды. Да канца тваіх дзён.

***

Ты будзеш жыць.
І з болем, і з нянавісцю,
з маленькім сэрцам
у раскрэмсанай душы
ты будзеш жыць.
Былое варушыць.

***

Ты сапраўднае, жыццё зямное.
Што захочаш, зробіш ты са мною,

www.kamunikat.org

павярнеш, куды я не жадала.
Ды й таго табе ўсё будзе мала!

***

Перад непрыгожай
апускаюць вочы,
позіркам зямлю свідруюць.
Толькі ці яна даруе?

***

Ліпень.
Мокрыя ліпы.
Пялёсткі да пальцаў ліпнуць.
Маленькія сонейкі гінуць —
у тваіх вачах,
у тваіх руках
маленькія сонейкі ліпы.

***

Так хочацца адчуваць
рухі ранку.
Так хочацца пасляваць
калыханку.
І хочацца зберагаць
спакой у хаце.
Мне хочацца стаць
нарэшце маці.

***

Туман. Дыміць.
Маною мяккай
ахутае,
спытае піць.



Падам.
Пад дах
туман спаўзе,
падзякуе
туманна мне.

***

Ламаючы пазногці,
грабеш зямлю рукамі.
Нямыя сведкі — зоры —
з нябёсаў пазіраюць.
Карэнні, бы вужакі,
заблытваюцца ў пальцах,
здзіраюць скуру камяні,
трава ў крыві,
зямля ў крыві.
Грабеш зямлю рукамі,
кідаеш зерне ў яму.
Палі, каб не засохла.
Чакай. Узыдзе сонца.

***

Дзень прытуліўся да ночы.
Шэра.
У неба шэрыя вочы,
як і ў мяне.
А ноч у мане:
дзень авалодаў зямлёю
і мною.

***

Пра што табе пішацца,
пакуль саграваецца ложак,
пакуль свае справы даробяць суседзі,
пакуль не астыла, што набалела,

www.kamunikat.org

пакуль жа трымцяць асцярожна і ледзьве
твае ўспаміны, мары, надзеі?
Пра што табе пішацца ў стоме?
Так далёка ад дома.

***

*Маме*

Я хацела грэць твае рукі,
гладзіць іх ціха,
нічога не гаварыць,
проста цяпло дарыць.
Ціхі вечар у ціхай зіме.
Я хацела грэць твае рукі;
атрымалася —
ты грэла мае.

***

Стомленым зорам
свяціць надакучыла
стомленым пусткам
і падарожнікам стомленым —
паўсляпым.
На сляды
блытаныя
снег упадзе.
След прападзе.

## Вечнасць

Куляюцца цені
праз дарогі,
праз лёсы.
Змеямі
паўзуць па вадзе,
праз лясы прадзіраюцца.

Святло прадзіравяць
за краем,
прыйдуць дадому.
Паляжаць і зноў пойдуць
за сонцам.

## Каханне

На шматкі ірвецца неба —
як рыззё ірвуць рукамі.
І прымае з неба глеба
падарунак жалю —
крохкія расы каралі.

***

Я не баюся слоў.
Скажу: кахаю —
і буду паміраць
і ўваскрасаць.
І буду жыць.
Скажу: палаю —
і буду полымем
крывавым я палаць.
Я не баюся.
Страх — занадта проста.
Ператваруся ў боль.
Ператваруся ў слёзы.
Я не баюся слоў.
Скажу: пабудзь са мною —
і ты са мною будзеш
Дыхаць роўна.

***

Бадзяецца дождж
паміж небам і горам
і чуе:

www.kamunikat.org

дзень скончыцца,
выльецца,
выцячэ.
Стомленым морам
дзень разальецца ў прасторы.
Бясконцы.
Засне
паміж небам і горам.

***

Б'ецца ў шыбу
сэрца,
б'ецца.
разаб'ю —
парэжу пальцы.
Сэрца ў хаце
адагрэю.
Сэрца,
хворае каханнем.

***

Перакрыюць паветра,
уздых
немагчымы.
Мне
не дазволяць дыхаць
снегам,
прапахлым дымам.
У замеценым горадзе гіну.

***

На сценах драпіны,
на сталі драпіны:



святло
з-за шыбы
шэрасць мне надрапала.
І плачуць сцены,
плачуць сцены сцішана.
І плача сон мой,
сон, шчэ не напісаны.

***

*Волі*

У венах маіх —
водар
ружы, табою падоранай.
У венах маіх —
соннае
малако, разлітае поўняю.
У венах маіх —
словы
пульсуюць нястомным болем.
У венах маіх —
імёны
прыдуманых мною анёлаў.

***

Праз боль прадзіраецца сонца —
трэба рабіць сваю працу:
камусьці захочацца волі,
камусьці захочацца шчасця,
камусьці яно будзе знакам,
камусьці — назвай для песні,
камусь зарыфмуецца ў вершы,
камусьці яно будзе сэнсам.
Сонца цягнецца ў небе:
ці сонцу балюча, ці небу.

www.kamunikat.org



# Андрэй Кабан

паэт. Студэнт будаўнічага факультэта БНТУ. Пераможца сёлетняга конкурсу (дыплом II ступені) маладых літаратараў, які праводзіўся беларускім ПЭН-цэнтрам да 100-годдзя Ларысы Геніюш. Нарадзіўся ў 1988 годзе ў г. Маладзечна. Жыве ў Мінску.

## Сэрца — адно на дваіх...

### У радках

*М. Б.*

У радках адно пражытае:
Разарванае і перашытае,
Сэрца крывёю аблітае
І ніякіх мар і надзей...

У радках не хапае эпітэтаў
Ім не быць у граніце адлітымі,
Хіба толькі сляпіць кілабітамі
Без таго саслеплых людзей.

У радках я не лаюся матамі,
Няма думак пра злотыя з латамі.
Ёсць каханне. І ззяюць каратамі
Дыяменты жаночых вачэй...

У радках мне не быць ні элітаю,
Ні нізамі грамадскімі спітымі,
Нітак сэнсу жыцця не разблытываць —
Ўсё адно сэнс ад нас уцячэ.

У радках досыць роздуму з розумам.
Патаемнага шмат. Нецвярозага.
Увесь я — невялічкімі дозамі.
Між радкоў пахаваная ты...

### Вечная валюта

Я вельмі багаты.
Акіянамі словаў.
Яны будуць вечнай валютай.
Свой скарб я захоўваю ў розных мовах
На тонкай паперы бялюткай.

www.kamunikat.org

Я вымяняў пяць
Сартраўскіх словаў
На 20 слоў Пастэрнака,
Аднак наогул ні пры якіх умовах
Я не абменьваю Танка.

За гэты час
Побач з табой
Мой рахунак займеў сотню вершаў.
Разбураю сябе кожны дзень, як Рэмбо,
І яшчэ спадзяюся на нешта.

Пабудую са слоў
Цэлы горад для нас.
Ён будзе, як Львоў, альбо Вільня.
У ім будзе светла, як дзецям падчас
Пускання бурбалак мыльных.

Я вельмі багаты.
Я словам купляў
Нянавісць, зайздрасць, каханне.
Калі ў багну часоў мяне ўцягне зямля,
Багацце маё — не зацягне.

## Ноч у Грэноблі

*В. Б.*

Грэнобль. Ноч. Ты побач. Нібы Ева.
Я твой Адам. Адначасова змей.
І долу скінуты твой гонар каралевы
Разам з бялізнай, без якой — цяплей.

І наша жарсць, нібыта гільяціна,
Ад цела адсякае галаву.
За намі сочыць пільна Трыадзіны.
Мы мнём павольна райскую траву.

Мы цягнем рукі, каб схапіць той яблык,
Каб захлынуцца асалодай ад яго.
Але, як дзеці з племя канібалаў,
Толькі адзін кусаем аднаго.

Мы сочым за світаннем. Сонца промні,
Заўважыўшы цябе ў сукенцы Евы,
Аб Альпы разбіваюцца галовамі
І тонуць у глыбіні Ізэра спеваў.

Менск. Раніца.Траецкае. Спакуса.
Ты ўжо не Ева. Я не твой Адам.
Наш рай жывы — на яблыку ні ўкуса.
Наш рай пусты. Ён не патрэбен нам...

## Прускі сцяг

Сцягам усходніх прусаў
Сталі мае валасы...
Без усялякіх прымусаў...
Нібы кроплі расы

Змянілі жыцця світанак...
Як гэта зрабіла ЧАЭС
У красавіцкі ранак...
Узніклі нібыта бэз

У чэрвені ля пад'езду...
І гэтага ўжо не змяніць...
За сівізною следам —
Быць мне ці можа не быць?

Мне трэба было спаткацца
З Вашых вуснаў цяплом,
Каб зноўку пераканацца,
Што мы нездарма жывём.

Што кожны ссівелы волас —
Рэха зямных абраз.
Што кожны ссівелы волас —
Гэта люстэрка Вас.

www.kamunikat.org

Вальсам сваіх пачуццяў
Я Вас даўно стаміў...
Вальс немагчымы ў трохкуцці,
Калі за трохкуццем абрыў...

Калі я ўшчэнт ссівею,
І над маёй галавой
Сцяг пераміp'я ўзвее
Са смерцю, таксама сівой,

Узгадаю акупаваны
Табой майго сэрца абсяг...
Узгадаю не маляваны
Сваіх валасоў прускі сцяг...

## Недарэчнасць

Мы жывём з табой успамінамі,
Тымі што нарадзіліся
у 41 тралейбусе, па дарозе
ад адзіноты да адзінства.
Мы б лёгка далі рады
знішчыць усе сваркі і кпіны,
каб звярыная спакуса
адступіла хоць на імгненне.
Я не веру ў тое, што
чалавека чакае не адно жыццё,
я наогул не веру, што хтосьці кагосьці
чакае.
Я жыву нашай з табой будучыняй,
якая пачнецца
зноў
з недарэчнай шчырай усмешкі,
і пакіне нам столькі
шчасця і гора,
наколькі хопіць месца
у нашым сэрцы...
Не, я не памыліўся пра наша сэрца,
Я не веру у анатомію
і лічу, што сэрца — адно на дваіх,
пераўпэўніць у адваротным
мяне зможа хіба мой
паталагаанатам.
Мне цяжка сабе ўяўляць,
як твае вусны цягнуцца
да чужацкай крыніцы пяшчоты,
але я цешуся, разумеючы,
што мае вусны ты не забудзеш ніколі.
Мы б маглі пачаць
наш шпацыр па часе наноў,
з дзіцячага садочка,
з самага простага
і светлага.
Але, я не веру ў перараджэнні,
таму мы не пазбавімся чорнага колеру
нашай палітры.
Мы б маглі жыць з табой успамінамі,
якія б знайшлі на бурштынавым узбярэжжы
Балтыйскага мора,
ці
якія б пачулі у напевах
карпацкіх гуцулаў,
але нам не хапіла часу.
Недарэчнасць, якая
лёгка выпраўляецца,
улічваючы тое, што, нават
калі ты прачынаешся
у ложку з іншым мужчынам, імя якога
рэжа слых усім тваім і маім знаёмым,
ты думаеш аб тым,
аб чым я думаю з раніцы заўсёды,
нягледзячы ў якім стане, дзе
і з кім я прачнуўся — пра нас...

www.kamunikat.org

## Пражская восень

Неба балюча сколата
Пікамі пражскай готыкі.
Дрэвы скінулі золата
Ад ветру пяшчотных дотыкаў.

Тутака сонца хворае,
Можа загінуць хутка.
Аб гэтым даўно ўжо гавораць
І гэта наўрад ці чуткі.

Але ніхто не спалоханы,
Сонца увесну вернецца
Ззяць над чырвонымі стрэхамі
Самотным феніксам. Верыцца,

Што я сустракаць прыйду
Пачатак яго палёту.
І разам з сабой прывяду
Забойцу
Сваёй адзіноты...



## Таццяна Тамашэвіч

паэтка. Студэнтка 5 курса Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сябра літаратурна-музычнай гасцёўні «Натхненне» студэнцкага гарадка БДУ. Вершы друкаваліся ў часопісе «Дзеяслоў». Нарадзілася ў 1986 годзе ў г. Маладзечна. Жыве ў Мінску.

www.kamunikat.org

# Троіца

## Белы рыцар

Белы рыцар надзеі, адкуль жа ты ўзяўся?
З светла-шэрых аблокаў, сумненняў, дажджу?
З майго болю і радасці ў вобраз саткаўся,
Каб расквеціць той шлях, па якім я іду.
Колькі трэба яшчэ гэтых дзён маіх дзіўных,
Каб у снах адшукаць паратунак сабе?
Колькі песень прапець мне адчайных, надрыўных,
Каб не здацца ў палон ненавіснай журбе.
Не пакінеш мяне а ні сёння, ні заўтра.
Ад цябе адракуся — працягнеш руку,
Каб душа мая болей не ведала страты,
Не гублялася ў цёмным жыцця закутку.
Ад цябе я ўцяку — зноў мяне напаткаеш,
І абудзіш пяшчотай ад вечнага сну.
Твае вочы гавораць і ўсё адчуваюць,
Яны ўсё разумеюць: тугу і вясну.
Белы рыцар — мой сябар, каханы і любы,
Абаронца ад жахаў пустога жыцця,
Барані мяне й свет ад пякельнае згубы,
Зберажы нас для праўды святой адкрыцця.

***

Жоўтая вяргіня расцвіла ля ганку,
Мілаю дзяўчынай бачыш Ты мяне.
Твар я свой расою акрапіла зранку.
Мая песня шчасця слых Твой не міне.
Светлыя пялёсткі, быццам сонца промні,
Летнімі дзянькамі спеляцца ў душы.
Сэрца майго споведзь, я прашу, запомні
І агонь надзеі ў ім не затушы.
Сябар мой адзіны, кветкаю любові
Палымнее памяць, гіне суму суд,
І гаворыць вецер на шчымлівай мове,
Раскрывае вечар адзіноты цуд.
Хутка створыць восень залатую казку,
І адкрые сонца хмараў хіжы зман.
На дзівосным балі я здымаю маску —
Вечнага чакання прывідны туман.
Любы мой настаўнік, хай мая усмешка
Белаю галубкай ляжа ля рукі.
Непагаснай зоркай ззяе галавешка —
Той, хто моцна любіць, мае лёс такі.
Таямніц нямнога ў сарамлівай кветкі:
Вернасць і цнатлівасць між зімы снягоў.
Хай зазелянеюць у вясну палеткі,
З Божае любові мы ўваскрэснем зноў.

## Троіца

Мне спаткацца з табой гэтак мроіцца.
Сёння дзень святы светлай Троіцы.
Дзень і ноч жыццё карагодзіцца —
Толькі шчасце людское не зводзіцца.
Паглядзі на свет — ён будуецца,
Што ні крок, то спявае вуліца.
Што ні позірк — спаўняецца новае.
Налівае Гасподзь чашу поўную:
Крылы белыя Духа вечнага,
Позірк Бога Айца хуткастрэчнага
І ахвяра Хрыста пакутная...
Гэта я, Твая Дзева смутная.
Абдымі ж маё сэрца радасцю,
Дай напоўніць душу мне святасцю,
Дай напіцца слязой, спатоліцца
Ля крыжа твайго Багародзіцай.

www.kamunikat.org



# Аляксей Палачанскі

паэт, празаік. Студэнт 2 курса факультэта радыёфізікі і электронікі БДУ. Друкаваўся ў альманаху «Пасейдон». Нарадзіўся ў 1992 годзе ў Мінску. Жыве ў Мінску.

## Гарадскія акорды

### Маўчанне

з вялікай жалобы
разгортваюць маўчанне,
покрыва.
звароты, газеты
і тыя самыя афіцыйныя скароты —
покрыва.
моўчкі
закіпаюць сківіцы,
моўчкі
баляць зубы.
маўчанне — грэх
маўчыць
самотны святар у спавядальні,
і моўчкі
выходзіць лекар
з аперацыйнай.
моўчкі
ставіць маці
шклянку малака перад сынам,
моўчкі сядае
ў незнаёмую машыну.
моўчкі
заходжу пад шыльду
па дарозе дадому.
бяру тэлефон да вуха
і маўчу.
і крычаць за сцяной
б'юць посуд
таксама моўчкі.
маўклівыя навіны
пра тое,
як маўчаць у розных краінах.
маўклівая сімфонія,
маўклівая агонія.

www.kamunikat.org

тут, здаецца,
самае месца для «але»:
але маўчым.

***

*Дзеду*

усё міне, і будзе велічна і ціха
у сціснутай руцэ сляза свяціцца...
а сківаца дрыжыць, абцягнутая скурай,
у прадчуванні непазбежнага канца.

знікае час, маўчанне нарастае,
нібыта з бізуном хтось за спіной стаіць;
пад дахам душна: выбегчы на ганак,
падыхаць зорным небам хоць напрыканцы.

а за ракой віднеецца світанак,
і сілуэты п'яныя выходзяць з цішыні.
як па блакіту воднай роўнядзі празрыстай,
так пад вачыма расцякаюцца кругі.

прайшоўся вецер па заблытаным шчаціннi,
святло ўключылі, запалілі газ,
гарбата на пліце тужліва закіпае,
і рэжа сэрца свістам мутная вада.

упаў замок, трывожна бразнуў гаплік.
выходжу — за дзвярмі халоднае святло,
а на стале пакінуты самотны недапалак
глядзіць настойліва праз шэрае вакно.

## Крыж

крыж на фоне заходу
сіратлівае дрэва
і ружовае ў барвах
вечаровае неба,
і застыгла імгненне
над пустымі палямі,
у вачах утрапенне
ды салёныя мары.
успаміны пранiклі
у рудое паветра
між электраслупамі
быццам тонкія нервы
хто захоча спасцігнуць
тое, што адыходзіць,
прошча за небасхілам —
хто узніме пагоню?
хто ад шчасця заплача,
пах пачуўшы знаёмы,
на зямлю ціха ляжа
пад нябесныя стромы?
хто ўзгадае былое
ды адрозніць святое,
хто насмеліцца выйсці
заспяваць сярод поля!
толькі сумна чакае
крыж на фоне заходу,
ды паволі згасае
гонар слаўнага роду.

## Апошняя запалка

Так значыць, усё ж такі бывае
апошняя запалка
і часам ад яе залежыць
усё жыццё.
Колькі разоў я бачыў
у фільмах
і смяяўся:
Чаму заўжды застаецца
толькі адна?
Калі адчыняеш пушку,
не можаш даць веры,



www.kamunikat.org

што ўсё скончыцца
калі-небудзь,
і аднак ведаеш,
што будзе апошняя.
Гляджу наперад
і ведаю,
што ўсё скончыцца,
што будзе астатні дзень
і намагаюся жыць.
Але чаму заўсёды
самая каштоўная
апошняя запалка?

## Гарадскія акорды

стогне паветра,
скалынаецца каменне —
лезуць з зямлі
прастакутныя гмахі
лаецца маці —
вонкі лезе дзіця;
раве будаўнік —
цаглінай па пальцах

на скрыжаванні
размахвае рукамі прарок,
а насупраць —
рэгуліроўшчык

трык-тарарык!
грукоча дзед
па лесвіцы ў метро,
спрытна пераскокваю
праз ломкія косткі

вылятае з аўтобуса
безбілетны пасажыр,
капае тлушч
з пальца кантралёра

падае з услона
стомлены грамадзянін,
цвярозая грамадзянка
адслізгвае далей

кірмаш, кірмаш!
распродаж годнасці,
зніжкі на сумленне

на пераход!
патрабуе светлафор.
падпатыльнік у пратакол

не спяшайся!
падганяюць плакаты
заспаных кіроўцаў

з бетоннай скрыні
нечакана ліецца Шапэн,
люты сусед
рашуча ломіцца ў дзверы

за безбілетны праезд,
за алкаголь,
за гучную музыку —
штраф за жыццё ў горадзе

мой любы кут,
мая радзіма —
на чацвёртым паверсе
налева і ўбок

вішчаць жанчыны ў краме,
лезуць на прылавак,
ціскаюць свініну —
хутка новы год.

www.kamunikat.org



# Павел Надольскі

паэт. У 2002 годзе скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Зараз вучыцца ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. Аўтар двух зборнікаў вершаў. Нарадзіўся ў 1979 годзе ў Мінску. Жыве ў Кракаве.

## Слёзы Бога

### Кроплі

Далонь. Кропля цяжкая на ёй:
нябёсы ўжо болей не могуць цярпець.
Я кроплю тую з халоднай крывёй
не параўнаў ледзь-ледзь.

Надта густою здалася яна,
цёмнаю, быццам з далёкіх глыбінь.
І пах працінаў, быццам смак віна —
не дапівай, пакінь!

Уверх я гляджу і з нябёсаў п'ю,
і кожная кропля імкнецца, хоча
крывёй напаіць душу маю,
як толькі трапляе ў яе праз вочы.

Кропля за кропляй. І вось ужо —
нічога я болей не бачу.
А холад дзярэ вастрынёй нажоў,
і неба заходзіцца плачам.

Калі супакоіўся летні гром
і вецер прагнаў прэч хмару,
цела знайшлі пад начным ліхтаром,
і кроплі цяклі па твары.

### Шкло

Шкло, як магніт: і бруд, і Бога слёзы,
калі з нябёсаў коцяцца яны,
прыцягвае праз краты... Там адны,
адныя толькі шэрыя абозы.
Ляжым на іх, і зноў нам сняцца сны

www.kamunikat.org

пра радасць, цуд і надыход вясны.
Ды толькі прачынаемся. І з воза
здымаюць нас, падводзяць да сцяны...
Прыдбаць свабоду хутка, без маны
свінцовая нам абяцае доза.

## Трыялет

Так кожны раз, як светлы маладзік
губляе ў вокнах позірк задуменны,
гадзіннік размаўляе з ім насценны.
Так кожны раз, як светлы маладзік
сыходзіць і жыццё цячэ нязменна,
здаецца мне, што я таксама знік...
Так кожны раз, як светлы маладзік
губляе ў вокнах позірк задуменны.

## Адлегласць

Часы мінулі, дні, стагоддзі
і вечнасць амаль што вычарпана.
Спусцелі воды, пагнілі сады
і ссохлі мроі. Гала.
Чарнеюць каржакі і
з'едлівую вільгаць праглынаюць зоры.
І толькі змрок і сум
не адступаюць назаўжды.
У багне, дзе галосяць мерцвякі на ўсе лады
і млеюць пакалечаныя выспы,
савіным вокам жоўтым
я пільную зноў яе.

Яе, адлегласць,
што нарэшце паміж намі стала.

***

Што чалавек, калі ён не жыве,
калі яго не сцерагуць пакуты,
калі ён жылы сам сабе не рве,
калі з жалеза часам ён не скуты?

Што чалавек, калі яго рука
адное здольна коўзаць па кішэні,
калі ў душы ніводнага радка,
а страх паставіў волю на калені?

Што чалавек, калі сваёй хлуснёй
ён забівае прыгажосць і веру,
Бо можа бараніцца толькі ёй,
бо толькі ёй усе адкрыты дзверы?

Што чалавек, калі яго няма
ў тым месцы, дзе ён больш за ўсё патрэбны?
Жыццё такога страчана дарма,
і шлях яго павінен быць ганебным.

Дзе ж Чалавек? Сапраўдны чалавек
у часе нашым дзікім ненажэрным,
які слязу не пусціць з-пад павек
з нагоды той, што кволы і мізэрны?

Дзе Ты? Дзе твая Вера, Моц, Любоў,
якой усім так не хапае востра?
Мо лоб Твой сярод тысячаў ілбоў
узвысіцца, нібыта ў моры востраў?

А, можа, ціха прыйдзеш, каб наш род
увогуле ўцяміць не змог нічога
ажыццявіць апошні свой зварот
жывым увасабленнем пана Бога?..

www.kamunikat.org

## Возера

Нябёсаў вока.
Лясы навокал.
Над гладдзю сонца
стаіць высока.

Сівыя хвалі
ў сабе схавалі
часы, якія
калісь бывалі.

Квітнелі травы,
блішчэў яскравы
ўначы агеньчык
ля пераправы.

Яры крутыя...
Як сэрца ные!
Забыць не можа
мясціны тыя.

***

Часамі, бывае, здаецца,
што нервы, нібыта струна,
якая ледзь-ледзь не парвецца —
так моцна напята яна.

Часамі, бывае, здаецца,
што ад неадступных нягод
не тое, што сэрца не б'ецца,
а б'ецца, як рыба аб лёд.

Часамі, бывае, здаецца,
што дыхаць даўно няма чым,
аж лямант з грудзей ірвецца,
ды нечым дапамагчы.

Часамі, бывае, здаецца,
што вочы не могуць глядзець,
што з гэтых вачэй не сарвецца
салёная кропля ледзь-ледзь.

Часамі, бывае, здаецца,
што вушы не чуюць здаўна
і ўсё, што да іх не праб'ецца,
свядомасць турбуе дарма.

Часамі, бывае, здаецца,
што вуснаў нічым не спыніць,
ды толькі з іх радасць не льецца,
і сэнсу губляецца ніць.

Часамі, бывае, здаецца,
што час гэты не для мяне...
Ці, мо, гэта толькі здаецца
і ўсё гэта з часам міне?

www.kamunikat.org



# Сяргей Законнікаў

**паэт, перакладчык, публіцыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1991 г.). Аўтар паэтычных кніг: «Бяседа», «Устань да сонца», «Пакуль жыве мая бяроза», «Вера, Надзея, Любоў» , «Прысак часу», «Сутнасць», «Вечная далеч», «Заклінанне», «Лісцем дарога запала», «Дол» і інш. Нарадзіўся ў 1946 годзе ў вёсцы Слабада на Віцебшчыне. Жыве ў Мінску.**

## Мімалётнае дзіва

### Зялёная свабода

Можа, пераблытаў я радню,
Можа, і з прапіскай памыліўся?
Не даюць цягнуцца ў вышыню,
Хочуць, каб ніжэй травы сцяліўся.

Кажуць: ты працуй — ды будзь здароў,
Думаць і расці няма патрэбы.
А мяне цягнула да бароў,
Да тых сосен, што гавораць з небам.

Хоць да дыялога не дарос,
А паперу атрымаў для вершаў.
Паміраць, каб жыць — зайздросны лёс,
Вечны круг быцця
І дрэвы вершаць...

Я пагладжу радасна кару,
Гляну на вяршалін карагоды.
Перад тым як знікнуць, гавару:
«Дзякую, зялёная свабода!»

### РБ

*На беларускім тэлебачанні ў перадачах*
*і ў рэкламе пастаянна гучыць абрэвіятура — РБ.*

Раскрадаюцца налам, безналам
Скарбы продкаў бязлітасным чынам.
Пустадомкаў гайня памяняла
На РБ нават назву Айчыны.

Вось і ходзіць яна сёння крыва,
Ды хлуснёю бразгоча па звычцы,

www.kamunikat.org

Як пустая бутэлька з-пад піва
У вагоне начной электрычкі.

Зноў слязою скоціцца з веек,
Соллю выступіць на гарбе...
Час свабодай настойліва вее,
А тубыльцы — ні мэ, ні бэ.

Эх, РБ ты маё, РБ!

## Ля помніка Джорджу Вашынгтону

Сышоў я з прыступак, дзе сонца паліць,
І раптам адчуў далонь на спіне:
«Містэр, зрабіце нам здымак на памяць.
Дзеткі, бяжыце хутчэй да мяне!»

Мужчына ў класічнай апратцы каўбоя
З усмешкай падаў фотаапарат.
Затым тэхасец прывёў за сабою
Жонку сваю, чатырох хлапчанят.

Прызнаюся:
Слаўна было здымаць мне,
Партрэт эпічны і просты такі:
Тата-асілак, прыгожая маці,
А побач — баравічкі-мацачкі.

Глядзеў на сямейку, дзе радасць, згода,
Бачыў, як спеліцца вольнасці плён...
Так: нездарма ваяваў за свабоду
Бацька Амерыкі —
Джордж Вашынгтон.

## Ляйпцыгскі трамвай

Я гляджу праз сонечнае шкло
На урбаністычныя «пейзажы».
Як жыццё разгоніста прайшло,
У трамваі ляйпцыгскім заўважыў.

Бачу дні былыя, як праз дым,
Сэрцу хвораму ніяк няймецца,
Зноў сябе прыпомніў маладым
У вандроўцы па зямлі нямецкай...

За вакном плыў той жа краявід,
Ды трымцеў ад крыўды люд зялёны,
Бо ў трамваі злосны інвалід
Нам услед сіпеў свае праклёны.

Дзе былы танкіст згубіў нагу,
Атрымаў жахлівыя апёкі?
Што згадаў ён — Курскую дугу,
Ці пакуты ў пекле пад Глыбокім?

Невядома.
Ён пачуў славян,
Твар увесь перакрывіўся нават.
Успаміны і нямоглы стан
Выліліся ў бурную нянавісць...

Мы ж пасля ўступілі ў слоўны бой
Пра вайну, пра гераізм і страты.
Хто злачынца большы быў у ёй?
Але мірам скончылі дэбаты.

Гітлер або Сталін?
Кожны гад!
Свет ад пыхі іхняе залежаў.
Розніца адна:
Не наш салдат
Першым перайшоў чужыя межы.

Ляйпцыг.
Мчыць трамвай...
Больш інвалід
Страчанай нагой не дакарае.

www.kamunikat.org

Адыходзяць ворагі ў нябыт,
Мірацць іх — агонь,
Зямля сырая...

***

Зманны міг, мімалётнае дзіва,
Як крынічка ў святой старане,
Па душы так сцякае імкліва,
Што журботна становіцца мне.

Гэты твар, валасоў аблачынка,
Постаць зграбная, як каласок, —
Цуд такі на звычайным прыпынку,
Што міжволі суцішваеш крок.

А яна свет цалуе вачыма,
Нешта піша на небе рукой...
Як да месца ў пейзажы жанчына!
Я ніколі не ўбачу такой...

## Ваяводзінская альтанка

*Богдану Касановічу*

*У аўтаномным краі Ваяводзіна (Сербія)*
*ёсць завядзёнка летам пакідаць для вандроўнікаў*
*у прыдарожных альтанках садавіну:*
*абрыкосы, грушы, яблыкі.*

На лаве шырокай сядзелі мы ўдвух,
Ламіўся пад садавінаю стол.
Было так спакойна і ціха наўкруг,
Што чуўся зумкат замораных пчол.

Вячэрняе сонца ўглядалася ў твар,
Завершваўся зноў паварот Зямлі.
А ў думах раздзьмухваўся болю пажар:
Куды мы ў аблудзе сваёй зайшлі?

Куды адплыла да свабоды любоў,
Дзе дзеўся ранейшы нязломны дух?
Народ памяняўся на статак рабоў,
Які пільнуе «жалезны пастух».

Як вырвацца з даўняй, заклятай бяды,
Як нам асядлаць няўстойлівы час,
Калі за гатоўнасць людской грамады
Прымаюць не лепшых,
А горшых з нас?

Але мы не ганім, а любім свет,
Хоць праўду баронім,
На гэтым стаім...
Таму я пасунуся,
Як і сусед, —
На лаве шырокай ёсць месца ўсім.

## Люблю Украіну

*«Свою Україну любіть,*
*Любіть її... Во время люте,*
*В остатню тяжкую минуту*
*За неї господа моліть.»*
Тарас Шаўчэнка

Топяць імя тваё гордае ў слоўным паганым брудзе,
Воля твая для зласліўцаў, як быццам у горле косць...
Лёгка любіць Украіну, што некалі будзе,
Я ж абдымаю тую, якая ёсць.

Згадваю годную веліч асветленых сонцам прастораў,
Каб урываліся радасна ў грудзі мае наноў
Хвалі дняпроўскія, стэпы, Карпацкія горы,
Спелыя нівы, пушчы, квецень садоў.

Шлях Украіны не ўдасца ніякай хлуснёй знявечыць,
Сцяг і трызубец не вырваць нікому з яе рукі.

www.kamunikat.org

Сэрцы нашчадкаў жывіць дух Запарожскай Сечы,
Клічуць да перамогі паўстанцаў палкі.

Вучымся разам у жорсткім, глабальна няпростым свеце
Жыць без лакейскіх паклонаў на Захад або на Ўсход.
У беларускіх душах вечнымі на прыкмеце
Вы — украінцы: мудры, стойкі народ!

Не сумняваюся ў створаным вамі дзяржаўным цудзе,
Зноў па Крашчаціку крочу як брат, а не проста госць...
Лёгка любіць Украіну, што некалі будзе,
Я ж лашчу сэрцам тую, якая ёсць!

## Віртуальны пагост

Шмат разоў я крышыў
Свой калінавы мост.
Вырастаў у душы
Віртуальны пагост.

Зноў будзённасці тлум
Крыжаваў бальшакі
Смелых, дзёрзкіх задум,
Закалыхваў радкі.

Дзівіць зношаны свет
Словам свежым, як сад,
Толькі той, хто паэт —
Ад макушкі да пят.

Шал натхнення гарыць,
Недзе ўнізе — зямля,
Нельга гэты прарыў
Адкладаць на пасля.

Крочыць трэба наўпрост,
Натаваць зорны ўздых...
І ў мяне ёсць пагост
Ненапісаных кніг.



## Берлінская сцяна

Часта яна трушчыць вольныя сны,
Прывідам шэрым прыдушвае горла...
Некалі я ля Берлінскай сцяны
Пільна ўглядаўся ў падзелены горад.
Быў і тады, як крышылі яе,
Як абдымаліся люду лавіны...
Час праляцеў, а зліцця не стае,
Цяжка зрастаюцца дзве палавіны.
Шляхам падобным прайшоў беларус,
Захад і ўсход — берагі страшнай раны...
Помнікам стаў
Меж старых пыльны друз,
Але над ім кружаць цені тыранаў.
Брыдка глядзець, як у свеце паўсюль
Хлам палітычны вылазіць на сцэну,
Каб расцярушваць прэтэнзій хатуль,
Каб нагрувашчваць нянавісці сцены.
Што там да немцаў, да ўтульнай зямлі,
«Свой» і «чужы» зноў з'явіліся дома!..
Вось чаму нельга маўчаць мне, калі
Дэспаты рэжуць народ па-жывому.

## Цана слова

Бяру «Буквар»,
Гартаю змест «Чытанкі»...
Ніколі не складзецца праўда ўся,
Каб помніць след на шыі Кастуся,
Нож у руцэ знясіленага Янкі.

Бярэ за Слова плату час пракляты,
Лёс генія яму — не ў галаве.
Але радок скрываўлены жыве,
Яго не могуць знішчыць нават каты.

www.kamunikat.org



# Анатоль Вярцінскі

**паэт, драматург, журналіст, крытык, перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя П. Лепяшынскага (1988 г.). Аўтар кніг: «Песня пра хлеб» (1962 г.), «Тры цішыні» (1966 г.), «Чалавечы знак» (1968 г.), «З'яўленне» (1975 г.), «Ветрана» (1979 г.), «Нью — Йорская сірэна» (1987 г.), «Хлопчык глядзіць» (1992 г.) і інш. Нарадзіўся ў 1931 г. у в. Дзямешкава на Лепельшчыне. Жыве ў Мінску.**

# Во лёс які...

## Канстатацыя

*Спадару Стэфану Эрыксану,*
*Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу*
*Каралеўства Швецыя ў Беларусі*

Ён — Паўнамоцны насамрэч.
Ведаў кароль, каму даручыць паўнамоцтвы.
Прынамсі, для гэткіх, як сёння, сустрэч,
поўных прыязні і салідарных эмоцый.

Ён — Надзвычайны сапраўды.
Ён — патрыёт свайго каралеўства.
І ён так засвоіў нашай мовы лады,
нібы пачынаў на ёй гаварыць з маленства.

Так, ён пасол, якіх мала бачыў свет.
Пасол Надзвычайны, незвычайны —
і як сын радзімы сваёй, як швед,
і як беларушчыны сябра адчайны.

## Ад чаго мой сум?..

Не ад таго мой сум,
што я не таўстасум,
што, можа, ў нечым абышоў калега.
Не ў гэтым мае альфа і амега.
Не, іншага паходжання мой сум.
Не ад таго мой сум, што каралю не кум,
што не заўсёды з лёсам быў у згодзе,
што, мабыць, песіміст я па прыродзе...
Не, пэўна ўсё ж не ад таго мой сум.
Хутчэй за ўсё ён, мабыць, ад таго,
што больш нашмат нагодаў для яго,
чым для уцехі, чым для весялосці.

www.kamunikat.org

Не ладзіцца во шчасце штосьці
у люду беларускага майго.
Тут зноў чужая сіла правіць баль.
Трывога... Паняверка... Скруха...
Ігэтак мала радаснага духа.
Да гэтага ж яшчэ, на жаль,
хварэем во, старэем во... Але.
Жанчыны нашыя цяжэй за нас хварэюць.
Жанчыны нашыя раней за нас старэюць,
і страху таго больш на іх чале.
А гэта ліха, смерцю што завем,
і што, як тая злая зграя,
штодзень і ўсюды нас падсцерагае.
Пад знакам сваёй смертнасці жывем.
Не ад таго мой сум, што я не таўстасум.
Як бачыце, ад іншага мой сум...

## Пра гора, якое бязмежнае...

Беды бываюць большыя.
Беды бываюць меншыя.
А гора таму найгоршае,
што яно — бязмежнае.
Гора... Яно — як горы,
яно — як цёмныя нетры.
І мы перад ім без апоры.
Нібы пыл на ветры.
Перад ягоным гмахам
мы толькі часцінкі, пылінкі,
агорнутыя страхам...
Гаруем, братове, сяброве?
Гаруем, мае дзеці?
Ловім таго на слове,
хто кажа пра шчасце на свеце?
Гаруем во, дачушка?
Ты ў школе чула часта,
што як для палёта птушка,
так створана ты для шчасця.



Птушка напраўду лятае.
Чаму не лятаць, не спяваць ёй!
А ты вось зноў у лякарні,
у цеснай казённай палаце.
Вязу я табе лекі,
вязу я табе перадачу,
цяжкія мае павекі
і у душы я плачу.
З бядою я справіўся б скора.
А тут штосьці няўцешнае.
А як адолееш гора,
калі яно бязмежнае?

## Рэпліка ў дыскусіі аб правапісе

Заснавальнікі нашай граматыкі
былі здатныя вельмі прагматыкі.
Скажу болей — яны былі геніі:
не выдумвалі, не мудрагелілі
(геніяльнае ўсё — простае).
А рашылі так бацькі хросныя,
як маўляецца, артыкулюецца,
якраз гэтак жа і чуецца.
А як чуецца, так і пішацца,
так на літаркі гукі ніжацца.
А як пішацца, так і чытаецца,
так адно з адным тут сплятаецца,
так стасуюцца гук і літара.
Непадзельныя, неразлітныя.
Кажу псеўдарэфарматару:
не чапай маю арфаграфію —
ці не самую удалую,
ці не самую дасканалую.
Яна ўзгоднена з Усявышнім.
Мы як чуем, так і пішам.
А чытаем, як пішам, — са згоды
самой роднае нашай Прыроды.

www.kamunikat.org

## Лёс краіны

Па зямлі маёй, праз вякі
Прайшлі калісь ледавікі.
Ішлі розныя ваяўнікі,
Гвалтаўнікі, рабаўнікі.
Былі потым бальшавікі.
Іх змянілі сілавікі...
Во лёс які.

## Выйсце

Адзін у полі не воін.
Для танга трэба двое...
Словам, мусім яднацца.
Найперш — станавіцца нацыяй.
Не толькі па назове, —
па духу, па справае, па мове.

## Беларускі кнігазбор

*Наследванне Багдановічу*

Я томік важкі ў руках трымаю.
Сабрана у ім шмат прозы і лірыкі.
Так, я не самотны, я кнігу маю
з друкарні Вінярскага і Цвіркі.

## Ускраіны Мінска

Курапаты — дарога смерці.
Едзь па ёй, калі хочаш памерці.
Старажоўка, Сляпянка, Лошыца...
Памяць гэтак жа трывожыцца.
Бараўляны — зноў жа трывога.
А Навінкі — жалю дарога.
Вось такая Мінска аколіца.
Ёсць чаго яму непакоіцца.

## Першавыток

Бацькі не ладзілі між сабой.
Дзеці ўсё чулі і бачылі.
Іх душы ўсё зазначылі
і поўніліся журбой.
Пытанне ў іх душах расло,
не ладзяць чаму таты-мамы,
З'яўляцца стаў роздум той самы
пра самыя тыя дабро і зло.

## Пажаданне

Мерце жыццё не вёрстамі,
мерце жыццё не рэчамі.
Мерце жыццё вёснамі,
сустрэчамі чалавечымі.

www.kamunikat.org



# ВЕРАСЕНЬ
# ПРОЗА

сяргей белаяр ганна старыковіч
раіса крывальцэвіч ганна дар
л е а н і д д а й н е к а

www.kamunikat.org



# Сяргей Белаяр

празаік. Скончыў гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Друкаваўся ў часопісе «Маладосць», тыднёвіку «ЛіМ», альманаху «Своя стихия». Нарадзіўся ў 1978 годзе ў Брэсце. Жыве ў Брэсце.

## Марныя спадзяванні

Лятаючая талерка завісла над мястэчкам. Крыху памаячыўшы ў гарачым ліпеньскім паветры, мякка спланіравала. Выпусціла магутныя апоры, прызямлілася. Сонечныя блікі весела зайгралі па паверхні касмічнага апарата, кідаючы на твары выпадковых прахожых дзіўныя цені. А гараджане спяшаліся, мітусіліся на аўтобусных прыпынках, лаяліся, і нікому не было справы да іншапланецян, нібыта кожны дзень у мястэчку садзіліся зоркалёты.

Стоячы ля вялікага люстэрка, высокашаноўны Алгрр паправіў парадны мундзір, падмiргнуў сваёй выяве, настройваючыся на мажорны лад. Усміхнуўся. Нарэшце ў космасе знойдзена населеная планета. І дзе?.. У самай глухмені Сусвету, куды нават патрульныя караблі заходзяць вельмі рэдка... Гэта было сапраўднай удачай, шансам, які выпадае раз у некалькі мільёнаў гадоў. Россып узнагарод ажыўлена зазвінеў, нібыта пацвярджаючы думкі прышэльца.

Паляпаўшы сябе па кішэнях — ці не забыўся на ўрачысты даклад — высокашаноўны Алгрр рашуча накіраваўся да трапа, цягнучы па металічнай абіўцы падлогі доўгі зялёны хвост. Касмічны падарожнік прайшоў па ярка асветленым калідоры. Спыніўся ля задраенага люка. Набраў код доступу. Брама адчынілася.

Паціраючы рукі ад задавальнення, пасланнік зорак павольна спусціўся па трапе. Глыбока ўдыхнуў, падставіў твар сонечным промням. Новая планета яму падабалася. Яна нагадвала Алргг. Тое ж неба, тыя ж дрэвы, нават паветра здавалася родным.

Іншапланецяніна перапаўняла эйфарыя. Кантакт... Як доўга расы Універсума чакалі сустрэчы з братамі па розуму. Колькі патрачана сіл і сродкаў... З часу апошняга кантакту з разумным істотамі прайшло больш за мільён гадоў, і зорная садружнасць ужо паспела забыць усю радасць пазнання новага. Ім усім трэба было ўскалыхнуцца. І свежая планета падыходзіла для гэтага як мага лепш. Падумаць толькі — да саюза касмічных рас далучыцца новая жыццёвая форма са сваёй сістэмай каштоўнасцей, арыгінальным светаразуменнем і назапашанымі ведамі...

Высокашаноўны Алгрр ледзь стрымаўся ад таго, каб не пусціцца ў скокі. Аднак своечасова авалодаў сабой. Новая, няхай нават і разумная, раса яшчэ не падстава ўпадаць у дзяцінства. Што ні кажы, а санавітаму чыноўніку не да твару скакаць, нібы балерына. Вярхоўны кіраўнік садружнасці наўрад ці ўхваліць падобнае...

На вялікае здзіўленне іншапланецяніна яго ніхто не сустракаў. Не было ні духавога аркестра, ні дэлегацыі афіцыйных асоб, ні натоўпу цікаўных, якія б гронкамі ўвешвалі ліхтарныя слупы і платы. Нікога...

www.kamunikat.org

«Дзіўна, — падумаў высокашаноўны Алгрр, нервова тузаючы кончык хваста. — Аналітыкі ж казалі, што новая раса гатовая да кантакту...» Іншапланецянін здзіўлена агледзеўся. Нейкія каменныя скрыні (няўжо ў іх можна жыць?) навальваліся з усіх бакоў, прыціскаючы сіметрычнымі прамавугольнікамі. Нудна цягнуліся вуліцы. Зрэдку праносіліся транспартныя сродкі, аднак кіроўцаў-робатаў высокашаноўны Алгрр разгледзець не змог. Прама пасярод вялізнай плошчы высіўся бронзавы ідал.

Прышэлец нават адкрыў рот ад здзіўлення. Бронзавы ёлупень, пакрыты разводамі птушынага памёту, здаваўся недарэчным. Калос у адной руцэ трымаў зматы кавалак матэрыі, а другой паказваў некуды ўдалечыню. Высокашаноўны Алгрр міжволі паглядзеў у пазначаным кірунку, але нічога, акрамя чарговай каменнай скрыні з металічнымі крыжамі, якія блішчалі на сонцы, выявіць так і не змог.

Пасланнік паціснуў плячыма. Аб густах не спрачаюцца. Калі першабытнікам падабаецца жыць у скрынях і любавацца на кавалак засмечанага гіпсу, гэта іх права. А ў высокашаноўнага Алгрра ёсць справы больш важныя.

Іншапланецянін змахнуў з мундзіра нябачныя парушынкі, а затым накіраваўся да безгустоўнага будынка, ля якога мітусіліся двое тубыльцаў. ВІННА-ГАРЭЛАЧНАЯ КРАМА.

Высокашаноўны Алгрр зверыўся з кішэнным аналізатарам, але прыбор упарта маўчаў. Сэнс дзіўнага словазлучэння быў яму невядомы.

Высокашаноўны Алгрр, падышоўшы да першабытнікаў ушчыльную, сказаў:

— Добры дзень, спадарства. Рады вітаць вас ад імя зорнай сістэмы Арглл. Я прыйшоў з мірам.

Пачатак быў урачыстым і велічным. Высокашаноўны Алгрр нават пакрыўся потам.

Аднак словы іншапланецяніна прывялі да нечаканага выніку. Адзін з абарыгенаў, які задраў да неба шкляны прыбор і назіраў за зоркамі (высокашаноўны Алгрр быў здзіўлены — як можна глядзець на зоркі днём?), раптам папярхнуўся, закашляўся. З рота тубыльца палілася брыдкая вадкасць, якая гідка смярдзела.

— Чуеш, Калян. Здаецца, у мяне глюкі. Балбатлівая яшчарка... — вымавіў абарыген, утаропіўшыся на пасланца зорнай садружнасці, які звінеў россыпам узнагарод.

— Так. І, падобна на тое, што ў мяне таксама, — адазваўся суразмоўца.

Высокашаноўны Алгрр, памятаючы настаўленні псіхолагаў, усміхнуўся. Дарма.

Тубыльцы, убачыўшы два шэрагі роўных вострых клыкоў, рэзка адскочылі.

— Маці мая жанчына... дапіліся. Калян, трэба завязваць, а то мне ўжо яшчаркі з медалямі бачацца.

Другі абарыген кіўнуў.

— Спадары, дазвольце мне ўнесці яснасць, — ціха, як таго патрабавалі правілы этыкету, прамовіў высокашаноўны Алгрр. — Я не зусім яшчарка, як вы сказалі. Я — прадстаўнік роду Агрлл, які бярэ свой пачатак у глыбіні стагоддзяў.

На гэты раз браты па розуму адрэагавалі менш эмацыйна. Падхапіўшы «тэлескопы» (яшчэ некалькі штук стаялі на зямлі), тубыльцы апасліва наблізіліся да пасланца. Ткнулі бруднымі пальцамі ў беласнежны мундзір. Высокашаноўны Алгрр не супраціўляўся, хоць мундзіра было шкада.

— Не, Калян, гэта не глюкі. Натуральная яшчарка, я табе кажу. Толькі ў шмотках і з бразготкамі.

— Угу, — няпэўна прамычаў другі. Закінуўшы галаву, утаропіўся ў неба. Глядзеў доўга, выдаючы незразумелыя для тонкага слыху высокашаноўнага Алгрра гукі. Нарэшце адарваўся ад «прыбора».

«Што ж, давядзецца пачаць наноў», — падумаў высокашаноўны Алгрр. Ад хвалявання кончык хваста дрыжаў.

— Вітаю вас, браты па розуму! Вы мяне разумееце?

— Чаго равеш, мутант недароблены? Мы не глухія. Што за базар?

Аналізатар не спраўляўся, і аб значэнні некаторых фраз даводзілася толькі здагадвацца.

— Я прыляцеў з далёкіх зорак, каб прынесці вам Веды, далучыць да сусветнай Гармоніі, — пафасна пачаў высокашаноўны Алгрр. — Браты, вам выпаў вялікі шанц далучыцца да вялізнай сям'і разумных рас, дакрануцца да таямніц Сусвету, адчуць сябе сапраўднымі сябрамі зорнай садружнасці.

— Во залівае, — кракнуў абарыген. Прыклаўшыся да «тэлескопа», доўга не адрываўся.

Калі працэдура «назірання» была скончаная, высокашаноўны Алгрр працягнуў знаёміць тубыльцаў з кароткай гісторыяй Універсума. Ён гаварыў і гаварыў, пераадольваючы хваляванне і гонар ад усведамлення таго, што яму выпаў вялікі гонар далучэння новай расы да таямніц Сусвету.

Абарыгены слухалі ўважліва, час ад часу прыкладваючыся да «тэлескопа». Потым здарылася зусім дзіўнае — тубыльцы дасталі нейкія палачкі, сунулі іх у рот. Задымілі, выпускаючы белыя воблачкі праз сіняватыя насы.

Уражаны ўбачаным, высокашаноўны Алгрр змоўк. І толькі праз некалькі імгненняў знайшоў сілы працягнуць, імкнучыся не выкарыстоўваць надта складаныя для ўспрымання тэрміны.

Абарыгены слухалі слаба, аддаючы перавагу назіранню за небам. Высокашаноўны Алгрр нават пазайздросціў такой апантанасці астраноміяй.

www.kamunikat.org

Тубыльцы пачалі ажыўлена размаўляць між сабой. Высокашаноўны Алгрр тактоўна адышоў убок, стараючыся не прыслухоўвацца да гутаркі. Ён і сам быў узрушаны не менш, калі яму адкрылі вочы на Сусвет, дазволілі ткнуць ключом у дзверы, якія хавалі таямніцы Універсума.

Да слыху пасланца ўсё ж даносіліся асобныя словы, кінутыя першабытнікамі.

— Чуеш, Калян, давай возьмем яшчэ па адной... колькі ў цябе? І ў мяне яшчэ 350... тваю маць, не хапае... А калі ў яшчаркі?..

Зямляне павярнуліся да высокашаноўнага Алгрра.

— Чуеш, зялёны. Даўгані пару тысяч. З заробка аддамо.

Прышэлец запытаў аналізатар. У мясцовых ва ўжыванні былі прымітыўныя сродкі аплаты, нейкія металічныя кружочкі і папяровыя прамавугольнікі. Высокашаноўны Алгрр задаў прыбору каманду, і праз некалькі секунд у руцэ пасланніка з'явіліся новенькія купюры.

— Гэтага хопіць?

Тубыльцы ў захапленні заківалі. Адзін з іх нясмела наблізіўся да высокашаноўнага Алгрра, узяў працягнутыя паперкі, пасля чаго імгненна знік, нібы яго здзьмула мінтойскім ураганам. Матэрыялізаваўся гэтак жа хутка, несучы ў руках некалькі «тэлескопаў».

Зямляне адкаркавалі апаратуру. Зноў выцягнулі дзіўная палачкі. Рукі абарыгенаў дрыжалі ўсё больш. «Ад хвалявання», — вырашыў высокашаноўны Алгрр.

Яшчэ праз некалькі хвілін тубыльцы ўжо не спраўляліся з усхваляванасцю. Яны хісталіся, штурхалі нагамі «тэлескопы», хацелі пачаставаць пасланца палачкай, якую называлі «цыгарэта». Высокашаноўны Алгрр тактоўна адмовіўся.

— Дык якім будзе вердыкт? — у рэшце рэшт пацікавіўся іншапланецянін.

— Зялёны, чо ты нам парыш? Якая, на хрэн, гармонія? Якія, блін, зоркі? Паглядзі навакол — каму патрэбныя твае таямніцы? Пітво — гэта рэч... а то зоркі. Цьфу. Давай лепш пацягнем па сотцы, — абарыген няцвёрдай рукой схапіўся за «тэлескоп». — Будзеш?..

Вочы высокашаноўнага Алгрра шырока адкрыліся ад здзіўлення. Ніводная з касмічных рас пасля таго, як атрымлівала магчымасць далучыцца да Гармоніі, не адмаўлялася ад такога шансу, бо другога разу магло і не быць. А тут...

— Зялёны, навошта табе гэтае неба? Народжаны поўзаць, лятаць не можа. Давай цяпні. А то на табе ўжо і твару няма. — У нос прышэльца балюча ткнуўся «тэлескоп». Высокашаноўны Алгрр паморшчыўся. «Што за дрэнь тубыльцы выкарыстоўваюць у якасці рэактываў?» Смярдзела так, што прабівала на слёзы.

І тут высокашаноўны Алгрр нарэшце зразумеў, што гэта не «тэлескопы», а посуд для захоўвання атруты.

— Дзякую вам, спадары, але вымушаны адмовіцца ад вашага запрашэння, — вымавіў іншапланецянін. Ад жудаснага паху пачала кружыцца галава. Пасланнік ледзь спраўляўся з нахлынуўшай на яго дурнотой.

— Чо??? Не зразумеў... — абарыген узлаваў, рушыў да высокашаноўнага Алгрра. — Не хочаш піць? А можа, ты нас не паважаеш? Чаго маўчыш? Ці сказаць пацанам няма чаго?

Высокашаноўны Алгрр падаўся назад. Зямляне наступалі.

— Чуеш ты, «фраерок». Адмаўляешся піць з правільнымі пацанамі?

Далейшае пасланнік старажытнага роду Агрлл высокашаноўны Алгрр памятаў з цяжкасцю. Вось абарыгены накідваюцца на яго, збіваюць з ног. Ён крычыць, кліча на дапамогу. Але тубыльцы праходзяць міма, а некаторыя зларадна ўсміхаюцца, паказваюць на іншапланетніка пальцам... звіняць медалі... ірвецца парадны мундзір... Першабытнікі б'юць яго нагамі... жудасны боль... Рука цягнецца да аналізатара...

Ачомаўся высокашаноўны Алгрр ужо на борце зоркалёта пад ціхае гудзенне аўтадока.

* * *

Са справаздачы пасланца зорнай садружнасці высокашаноўнага Алгрра:

«Са смуткам павінен давесці Вярхоўнаму кіраўніку, што разумнага жыцця на планеце Зямля не знойдзена...»

*17 мая 2009 г.*

www.kamunikat.org



# Ганна Старыковіч

**празаік, паэт. Скончыла БДУ культуры і мастацтваў (2007 г.). Друкавалася ў часопісе «Качэлі». Лаўрэат літаратурнага конкурсу «Добрая Ліра» (2008 г.). Нарадзілася ў 1984 годзе ў Расіі, у горадзе Палярны. Жыве ў Мінску.**

## Настаўнік

У вёсцы К., дзе я жыву, ніколі нічога не адбываецца. Насельніцтва ў чатырыста тры чалавекі, сто дваццаць двароў, касцёл, школа, дзіцячы сад, клуб (ён жа кінатэатр і дыскатэка), пошта і грамадская лазня. Адносна маладое насельніцтва ходзіць на працу ў гэтыя ўстановы, усе старшакласнікі мараць адсюль з'ехаць. Мяне завуць Маша Калюшкіна, я вучуся ў адзінаццатым класе з яшчэ пяццю дзяўчынкамі і трыма хлопчыкамі, і таксама хачу адсюль з'ехаць. Я мару паступіць у інстытут, пасяліцца ў інтэрнаце, а пасля заканчэння навучання любым спосабам учапіцца ў горадзе. Ну, ці амаль любым.

Маладыя настаўнікі прыязджаюць да нас кожны год, працуюць дзве чвэрці і знікаюць, стараючца перавесціся бліжэй да горада. Гэта ў асноўным тоўстыя дзяўчыны з непрыгожымі тварамі і сумнымі вачыма. Усе яны не замужам і малая верагоднасць, што калі-небудзь выйдуць. Мужчыны не прыязджалі ў нашу вёску ніколі.

Але ў канцы сакавіка на ўрок матэматыкі ў клас нечакана ўвайшоў прыгожы хлопец. Стройны, чарнявы, сінявокі, апрануты ў шэрую вадалазку, светлы пінжак і чорныя штаны. У руках тонкі партфель з карычневай скуры. Малады чалавек сарамліва ўсміхнуўся і сказаў:

— Добры дзень, я ваш новы настаўнік матэматыкі.

— Мы гэта ўжо зразумелі, — пачуўся голас з суседняй парты. Зміцер Хвошч. Яшчэ б! Адзіны хлопец, у якога пад чэрапам крыху варушацца мазгі, адчуў канкурэнцыю.

— А яшчэ вы будзеце бачыцца са мной на геаграфіі і астраноміі.

Сэрцы дзяўчат, і маё ў тым ліку, радасна затрымцелі. Матэматыка ў нас чатыры разы на тыдзень, плюс геаграфія ў панядзелак, плюс астраномія. Нарэшце, у нашым Цёмным царстве з'явіўся праменьчык святла, глыток свежага паветра.

— Завуць мяне Андрэй Валянцінавіч Скрыганаў, і я буду з вамі да канца ...

— ... вашых дзён! — Зноў Хвошч! Нярвуецца! Яго хрыпаты голас ні ў якое параўнанне не ідзе з мяккім прыемным голасам новага настаўніка.

— На шчасце не. Толькі да канца года.

Я азірнулася. Зміцер аскаліў у радаснай усмешцы свае на здзіўленне прыгожыя зубы, якія ніяк не ўпісваюцца ў аблічча здаровага лысага бамбізу, падобнага на малпу.

— І экзамены прымаць таксама буду я.

Андрэй Валянцінавіч сеў і раскрыў класны журнал.

— Што ж, я прадставіўся, цяпер давайце знаёміцца з вамі.

А што тут знаёміцца. Восем чалавек, усе з адной вёскі, ведаем адзін аднаго з дзяцінства.

www.kamunikat.org

— Аўсянік Іна.

— Я.

Інка падскочыла. Што аб ёй скажаш? Тоўстая, румяная, рудая, любіць хімію, хоча паступіць у медынстытут і стаць педыятрам. Праўда мне думаецца, што застанецца яна пры маме і з часам выйдзе за Пулякоўскага з дзясятага класа, народзіць яму дзяцей і будзе іх лячыць.

— Колюшкіна Марыя.

— Я.

Ён мне ўсміхнуўся. Да чаго прыемная знешнасць! Не тое, што ў галоўнай зоркі нашай вёскі, Мішы Жыгалка з дзясятага класа. Што сказаць пра мяне? Бландзінка, худая, мама кажа, нават занадта, маленькага росту, блакітныя вочы, бледныя шчокі. Увогуле, як усе.

— Ступіна Уладзіслаў.

— Я.

О, ну гэты нічога ў жыцці не хоча. Маці ўгаворвала яго ехаць паступаць у ПТВ пасля дзявятага класа, недалёка, тры прыпынкі на электрычцы. Дык ён сказаў, што не хоча і на тыдзень збег у лес. Ох, і пакутвае з ім маці. Бацька піў, пад трактар трапіў, і гэты пачынае, па некалькі тыдняў у школе не з'яўляецца. Гора, ды і толькі. Хаця нядаўна таксама заявіў, што хоча з'ехаць. У Амерыку.

— Трус Генадзь.

— Я.

Добры, худы хлопец, чымсьці хварэе. Ніхто не ведае чым. Нават чуткі ніякія не ходзяць. Вучыцца дрэнна, затое вельмі любіць сваю малодшую сястру і кажа, што калі яна збярэцца з'язджаць, рушыць услед за ёй, хоць на край зямлі.

— Ушацкая Валянціна.

— Я.

З Валечкай мы сябруем, разам хочам паступаць у педуніверсітэт на гістарычны факультэт. Такая ж худая і белая, як і я, толькі высокая. Наша залатая медалістка.

— Хвошч Зміцер.

— Перад вамі.

— Што ж, вельмі прыемна. Я так зразумеў, што Таццяна Шымко і Таццяна Яблонская адсутнічаюць.

— Так, — сказала я і пачырванела. Мяне ніхто не пытаў, настаўнік канстатаваў факт, а я выдала сваё да яго стаўленне і ўлезла не да месца.

— Яны прагульваюць, — зноў сказаў Хвошч. У прынцыпе, ён быў недалёкі ад ісціны. Дзяўчынкі перабіваліся з двойкі на тройку і марылі з'ехаць працаваць гувернанткамі ў ваенны санаторый, каб знайсці сабе там багатых мужоў. Ці палюбоўнікаў. Школа ім у гэтым імкненні была не патрэбна.

— Тады пачнем урок.

Калі б матэматыка была маім моцным бокам, усе зносіны з Андрэем Валянцінавічам праходзілі б у радасць. Але сінус, косінус і іншыя квадратныя карані ніяк не ўкладваліся ў маёй галаве. Наогул, пагражаў мне нізкі бал на экзамене. Да майго задавальнення, настаўніка гэта таксама турбавала. Неяк у красавіку ён сказаў мне, каб я засталася пасля ўрокаў і зайшла да яго ў кабінет. Шчыра скажу: сэрца маё затрымцела. За той нядоўгі час, што Андрэй Валянцінавіч правёў у нас у школе, мы з Валяй паспелі ў яго закахацца. Я прызналася ёй у гэтым першая, думала, сяброўка мяне падтрымае, знойдзе патрэбныя словы і растлумачыць, што ў настаўніка нельга ўлюбляцца, усё гэта пустая трата часу. А яна ў адказ усміхнулася і сказала, што таксама марыць аб ім доўгімі вечарамі, замест таго, каб вучыць урокі.

Дык вось зайшла я ў кабінет матэматыкі пасля шостага ўрока. Адкрыла дзверы і бачу, што сядзіць мой любімы настаўнік адзін, схіліўся над сталом і нешта піша.

— Гэта я, — больш нічога не знайшлося для прывітання. На самой справе, мне хацелася б пракрасціся вельмі ціха, абняць яго за шыю і пацалаваць у шчаку, але ...

— Праходзь, Маша.

Я села за першую парту насупраць яго стала. Акно было адчынена, і з двара даносіўся смех дзяцей і чароўны, салодкі водар квітнеючых дрэў. Мабыць, па чым я буду сумаваць у горадзе — дык гэта па вясковым чыстым паветры.

— Я занепакоены тваёй паспяховасцю па матэматыцы. Ты заўсёды так слаба ведала прадмет?

— Так, Андрэй Валянцінавіч. Можаце паглядзець мае адзнакі за папярэднія чвэрці. Усё добра, акрамя матэматыкі і фізікі.

— Я ўжо паглядзеў. — Ён зірнуў у вакно, а потым зноў на мяне і сказаў: — Будзеш займацца са мной па аўторках і серадах пасля шостага ўрока.

Сэрца маё аж ёкнула. Два разы на тыдзень я буду сядзець побач з ім і займацца матэматыкай. Гэтая думка грэла. Лепш бы, вядома, геаграфіяй або астраноміяй, а лепш наогул не ўрокамі займацца, а пацалункамі, але добра. Пачнем з матэматыкі.

— Добра.

— Увогуле, я не пытаўся тваёй згоды, а канстатаваў факт, — Андрэй Валянцінавіч усміхнуўся. Адкуль яму ведаць, што ён кожны раз разбівае мне сэрца, калі ўсміхаецца? Колькі яму гадоў? Дваццаць два? Дваццаць тры? Мне так захацелася гэта даведацца, што я не стрымалася і спытала:

— А колькі вам гадоў?

— Дваццаць чатыры гады. Гэта мае нейкае дачыненне да прадмета нашай размовы?

www.kamunikat.org

Які з'едлівы. Цікава, ён з усімі дзяўчынамі так размаўляе, або толькі са мной? І ладна, хай злуецца, хай прагоніць, а я ўсё ж задам яму некалькі пытанняў, не дазволю я такой удачы прасачыцца скрозь пальцы.

— Вы скончылі інстытут два гады таму?

— Так. Педуніверсітэт. Спачатку мяне размеркавалі ў вёску С., потым сюды.

— А чаму вас перавялі?

Давай жа, адказвай!!

— Гэта вельмі рамантычная гісторыя, і я вымушаны быў сам папрасіць аб пераводзе.

О, ну канешне. Хіба можна ў яго не закахацца? У гэты голас, у гэтыя вочы, у гэтую ўсмешку. Зразумела, што знайшлося і ў вёсцы С. пару дзяўчынак, якія гублялі з-за настаўніка галаў. Закідалі яго, напэўна, любоўнымі лістамі. Не, я так сябе паводзіць не буду, я проста стану ціха кахаць яго адпушчаны тэрмін, а потым са светлым сумам з'еду паступаць у горад, забыўшыся пра свае пачуцці. Можна было б на нешта спадзявацца, калі б ён застаўся працаваць тут...

— Калі скончыцца навучальны год, вы з'едзеце?

— Гэта допыт?

— Так.

Ну, і нахабніца. Нахабства — другое шчасце. А ў мяне ў дадзенай сітуацыі — яно адзінае.

— Так, з'еду, паступаць у іншую навучальную ўстанову.

Нахабства маё скончылася, і я не стала распытваць, куды ён паедзе вучыцца.

— Зразумела, дзякуй, што не прагналі мяне за тое, што я вас распытвала.

— Няма за што. Заўтра пасля шостага ўрока я цябе чакаю.

І зноў усмешка! Што ж ён робіць са мной? Замест таго, каб думаць аб экзаменах і будучым жыцці, я ўсё больш кахаю настаўніка і мару аб рамантычным спатканні з ім.

У аўторак я, як і было дамоўлена, прыйшла пасля шостага ўрока здавацца. Ён сеў побач і стаў тлумачыць мне тыя задачы, у якіх я рабіла абуральныя памылкі. Шчыра прызнацца, мне не было ніякай справы да аўтамабіляў, баржаў і аўтобусаў, якія рухаюцца насустрач адзін аднаму, таму, што я ўся растварылася ў пяшчоце да майго настаўніка. Ад яго пахла цудоўным водарам парфумы, на шыі яго пульсавала жылка, і я раз пораз глядзела на гэта месца, уступаючы ў няроўны бой з жаданнем нахіліцца і пацалаваць яго туды. Аднойчы я нахілілася, але тут жа схамянулася і стала церці вуха, быццам з ім нешта не так. Увогуле, паводзіла сябе як дурніца.

Але ў чымсьці я ўсё ж разабралася і да канца заняткаў стала нешта разумець.

Неяк у нядзелю, ужо ў сярэдзіне траўня, я пайшла ў касцёл. Больш па патрабаванні маці. Я была, вядома, ахрышчана, адзначала з бацькамі ўсе святы, але неяк не складаліся ў мяне адносіны з Богам. Мама хадзіла ў касцёл рэгулярна і спрабавала прыцягнуць мяне. Я нават скончыла нядзельную школу, але потым усё роўна па нядзелях заставалася дома. А тут замаячылі на даляглядзе іспыты, так што прыйшлося ісці прасіць у Бога дапамогі. Зайшла я ў наш касцёл на ўзгорку, а там так добра, трохі цёмна, свечкамі пахне і кожны сам сабе з Богам размаўляе. Усе чакаюць пачатку імшы. Галовы ўсіх, хто схіліў калені, знаёмыя: цётка Люда з суседняга дома, цётка Ніна, бабка Тамара і бабка Васіліна. Шмат людзей, усіх і не пералічыш. Я прысела з самага краю, амаль на выхадзе, і стала глядзець на алтар. І сам па сабе стаў маналог складвацца. Госпадзе, дзякуй Табе, што даў мне давучыцца і сустрэць такога цудоўнага чалавека, як Андрэй Валянцінавіч. Дапамажы мне, калі ласка, здаць іспыты і паступіць вучыцца туды ж, куды і ён ...

Кажуць, што думка матэрыяльная, і наогул, я не ведаю, якую прымаўку можна прымяніць да таго, што адбылося далей, але ў дзверы ўвайшоў мой любімы настаўнік. Не гледзячы па баках, ён схіліў калена насупраць алтара і прысеў на лаву праз праход ад мяне. Мой маналог да Бога быў скончаны. Я больш ні пра што не магла думаць. Пачалася імша, людзі вакол шапталі малітвы, станавіліся на калені ці проста ўставалі. Я рабіла тое ж самае, не разумеючы сэнсу таго, што адбываецца. Я глядзела на Андрэя Валянцінавіча. Ён пастаянна шаптаў нейкія малітвы, з веданнем справы ўставаў ці сядаў, а калі ўсе пайшлі да алтара атрымліваць камунію, ён таксама ўстаў. І ўбачыў мяне. Нашыя вочы сустрэліся і ён усміхнуўся. Мне хацелася пабегчы за ім следам, расцалаваць, крычаць ад захаплення, але я толькі ўсміхнулася ў адказ.

Усю дарогу дадому я думала. Аб чым? Вядома, аб ім, аб тым, што ён ідэал, якога мне ніколі не дасягнуць, мужчына, з якім мне ніколі не быць. Я не ведала канкрэтнай прычыны, якая зможа гэтаму перашкодзіць, але з жаночай інтуіцыяй не паспрачаешся.

І ўсё ж такі я вырашыла паспрабаваць ...

Замест таго, каб займацца ўрокамі, я села пісаць яму ананімны ліст. Прызнанне ў каханні. І што ж атрымалася?

«Дарагі Андрэй Валянцінавіч. Я вас люблю».

Вось і ўсё. Узгадала ліст Таццяны, і ручка застыла на месцы. Я ўсё роўна так не напішу, дык навошта лішнія словы. Люблю і ўсё, што тут яшчэ дадаць?

www.kamunikat.org

Дом, дзе ён жыў, ведалі ўсе. Там жылі ўсе маладыя спецыялісты. Аляксандра Фёдараўна здавала ім два пакоі. Разам з матэматыкам жыла маладая настаўніца ангельскай мовы. Маленькая, кругленькая, вядома ж, у яе не было шанцаў. І я рашылася на самае вялікае вар'яцтва, на якое толькі была здольная — пад покрывам вясновага вечара я пракралася да дому, дзе жылі настаўнікі. Маці я сказала, што іду да Валі...

Мне пашанцавала. У вакне гарэла святло, і я ўбачыла любімага настаўніка. Ён сядзеў за сталом у звычайнай майцы і чытаў нейкую вельмі важкую кнігу. Вакно было крыху адчынена, і я вырашыла, што гэта знак, і Бог дапамагае мне давесці мой план да канца. Я нахілілася, прабралася да вакна, а потым кінула свой ліст. І патрапіла! Я чула, як ён ўпаў на стол. Далей, праўда, я слухаць не стала і пабегла дадому. Сэрца грукала ў грудзях у два разы хутчэй. Па-першае, таму што я бегла, па-другое, таму што баялася. Я пачула, як ён крыкнуў: «Хто тут?», але гэта было як у тумане. Ногі, нягледзячы на тое, што дрыжалі, хутка данеслі мяне дадому.

А дома чакала мама. Рукі ў бокі, твар сур'ёзны, бацька сціх за кухонным сталом. Нешта не так.

— Ты дзе была?

— У Валі.

— Няпраўда, яна сама да цябе заходзіла.

Пра такое ўскладненне абставінаў я нешта не падумала.

— Я гуляла, адна. Я заходзіла да яе, але мы мабыць размінуліся. Я прайшлася і вярнулася дадому.

Што ж, адсутнічала я нядоўга, таму бацькам прыйшлося паверыць у маю версію.

— А можа быць на спатканне хадзіла? — запыталася маці для парадку, хоць рукі ўжо прыняліся чысціць бульбу, а твар палагаднеў, і на ім з'явілася ўсмешка.

— Ой, мама, з кім? І на паўгадзіны?

Тата засмяяўся, мама ўсміхнулася, і я задаволеная пайшла ў свой пакой. Небяспека мінула.

У панядзелак на ўроку Андрэй Валянцінавіч ніяк не даў зразумець, што атрымаў любоўную цыдулку. Ноччу мне прыйшло ў галаву, што настаўнік зусім дакладна здагадаецца ад каго яна, таму што ён ведае почырк усіх сваіх вучняў. Але ніводнага лішняга погляду, усмешкі, нічога такога не было. І я засмуціла, а потым пачырванела, калі ён нагадаў мне, што я павінна заўтра з'явіцца на дадатковыя заняткі.

Увечары мама дала мне грошай і сказала, каб я расплацілася з настаўнікам, таму што гэта неправільна — працаваць бясплатна, кожная праца павінна аплочвацца, тым больш такая: вучыць матэматыцы няздольную дзяўчыну.

Я грошы ўзяла і прынесла іх на наступны занятак. Перш чым сесці, я працягнула купюры настаўніку і сказала:

— Вось, мама прасіла перадаць.

Ён паглядзеў на мяне з тугой.

— Забяры і аддай назад. Я нічога не вазьму. Цяпер сядай і даставай падручнік.

Я паслухалася. Толькі калі я ішла да парты, за якой мы звычайна працавалі, ён сказаў:

— Сядай насупраць майго стала.

Вось, значыць як. Здагадаўся. І не хоча мець са мной нічога агульнага. Крыўда і нейкая безвыходнасць здавілі горла. У глыбіні душы я ведала, што так і будзе, што ён не ўзрадуецца майму прызнанню і не кінецца мяне цалаваць. Але я да гэтага была не гатова. Падручнікі і сшытак паслухмяна ляглі на стол, я села, але ўсё ніяк не магла падняць вочы. Закрылася валасамі, плакала і шукала ў пенале ручку. А потым шморгнула носам. Ён перастаў пісаць.

— Эй, Колюшкіна, што такое?

— Нічога.

— Ну-ка паглядзі на мяне.

Хіба яму адмовіш? Я падняла галаву, прыбрала валасы назад і зноў шморгнула носам. Уяўляю, якая я павінна быць, прыгажуня зараз: твар пайшоў плямамі, туш, напэўна, пацякла.

— На.

Ён працягнуў хустку і я ўзяла. Потым падышла да люстэрка і стала выціраць туш. Андрэй Валянцінавіч чакаў. Я прывяла сябе ў парадак і села на месца. Ён сказаў:

— Я не буду марнаваць час нашага занятка на высвятленне прычын тваіх слёз. Мы пагаворым пра гэта пазней.

Ага, значыць, усё ж такі пагаворым.

Я займалася з новымі сіламі і вырашыла правільна ўсе задачы. Дзіўна, якія цуды можа тварыць з чалавекам адчуванне хуткага шчасця. Для мяне гэта была размова на любую тэму з маім любімым настаўнікам.

Але размовы не адбылося. У калідоры нас сустрэў завуч і кудысьці паклікаў Андрэя Валянцінавіча, я ж панура пайшла дадому.

Размова адбылася на наступны дзень. Я прыйшла на дадатковыя заняткі па матэматыцы. Андрэй Валянцінавіч сядзеў за сталом і запаўняў журнал. Я прысела насупраць яго стала, дастала падручнік і сшытак і падрыхтавалася займацца. Толькі настаўнік адарваўся ад свайго занятку, паглядзеў на мяне неяк абыякава, нават з сумам, і сказаў:

— Усё схавай.

www.kamunikat.org

Я паслухалася. Калі рэчы былі ў торбе, а рукі мае адпачывалі на стале, мой любімы настаўнік устаў. Гледзячы сабе пад ногі, ён прайшоўся некалькі разоў уздоўж дошкі, потым спыніўся і сказаў, гледзячы мне ў вочы:

— Ты напісала мне запіску.

Я кіўнула. Мне здавалася, што яго блакітныя вочы бачуць мяне наскрозь, я не магла адарвацца ад яго погляду.

— Навошта?

— Я напісала праўду.

— Гэта няпраўда.

Я ледзь не задыхнулася. Мяне абразілі ў лепшых пачуццях, каму як не мне самой ведаць, што я адчуваю.

— Гэта праўда.

— Не, — ён працягваў глядзець мне ў вочы. — Ты не можаш мяне любіць, ты мяне зусім не ведаеш.

— Ведаю ... — я спрабавала пратэставаць, спрабавала пераканаць сябе і не магла. Яго погляд упэўненага ў сваіх словах чалавека душыў ува мне ўсялякае жаданне змагацца за сваё меркаванне.

— Ты ведаеш мяне, як настаўніка, як спецыяліста. Табе падабаецца мая знешнасць, але ты не ведаеш мяне, не цікавішся, чым я жыву.

— Чым?

— Пачакай, мы да гэтага прыйдзем. Табе падабаецца мой твар, магчыма голас, усмешка — гэта дакладна. Я ўсё жыццё ад гэтага пакутую. Я не хачу, каб мяне кахалі жанчыны, але яны з упартым пастаянствам гэта робяць.

— Чаму вы не хочаце, каб вас любілі жанчыны?

Я сапраўды не разумела. Па-мойму, многія аб гэтым толькі мараць.

Я б, напрыклад, хацела, каб мужчыны чапляліся за мяне позіркам, шукалі сустрэчы са мной.

Ён раптам падышоў і сеў побач са мной. Яго вочы былі зусім блізка, я адчувала яго дыханне і пах. Яшчэ крыху, і я пацалую яго...

— Ведаеш, куды я паеду, калі адпрацую?

— Куды?

— Паступаць у семінарыю. Я стану святаром.

— Не ...

— Так. Я хацеў гэтага з дзяцінства. З дзесяці гадоў, але маці ўгаварыла мяне паступіць у педагагічны ўніверсітэт, яна думала, што я сустрэну дзяўчыну, пакахаю яе, і закіну сваю ідэю. Але я не сустрэў такой дзяўчыны, якая захапіла б мяне на столькі, каб я забыўся аб сваёй любові да Бога і імкненні служыць Яму.

— А я?



Ох, не хацела я гэтага казаць, але словы зляцелі з вуснаў хутчэй, чым прыйшла думка, што лепш гэтага не рабіць.

— Ты — добрая дзяўчына, ад адзіноты і нуды выдумала сабе з мяне прыгожага прынца. Нават не думай пра мяне. Усё, што я табе кажу — праўда. Ты мне не патрэбная, мне ніхто не патрэбны. Табе трэба паступаць на гістарычны факультэт, выходзіць замуж, нараджаць дзяцей і працаваць у школе.

— А вы?

— А я пайду сваёй дарогай.

Я не магла паверыць у пачутае. Для мяне святаром заўсёды быў дзядуля з добрымі вачыма і дрыжачым голасам, а не малады прывабны хлопец...

— Ведаеш, чаму я распавёў усё табе?

— Чаму?

— Мне прыходзілі цэлыя паэмы, а не проста лісты або запіскі. Але твае некалькі слоў кранулі мяне, і я вырашыў не мучыць цябе, а расказаць праўду, каб ты не падманвала сябе пустымі марамі.

— А магу я падтрымліваць з вамі сувязь? Узяць ваш тэлефон?

— Навошта? Жыві сваім жыццём. Хадзі ў касцёл, маліся, і Бог абавязкова пашле табе добрага чалавека.

— А вы будзеце маліцца за мяне?

Ён задумаўся. Няўжо скажа «не»?

— Так, буду. Я пастараюся. Так што, мілая Колюшкіна, хопіць марыць пра мяне, даставай падручнік і будзем займацца.

Пасля гэтых слоў мне адразу стала цёпла на душы, і я ўсміхнулася. І з чаго я прыдумала, быццам закахалася ў яго? Добры, прыемны чалавек, які ўпрыгожыў тры месяцы майго жыцця сваім розумам і выхаваннем, і да таго ж паказаў мой далейшы жыццёвы шлях.

Я нікому не сказала аб тым, што пачула ад Андрэя Валянцінавіча, бо гэта было б несумленна.

На экзамене ён дапамог мне, і я атрымала добрую адзнаку па нялюбай матэматыцы.

Уручаючы атэстат, дырэктрыса ўсміхалася, і мой любімы настаўнік таксама. Ён радаваўся за мяне, што праз два дні я ажыццяўлю сваю мару — паеду паступаць у інстытут. А я ўсміхалася ў адказ і радавалася за яго, што ён, нарэшце, будзе шчаслівы ў сваёй семінарыі.

Дарэчы, я перагледзела свае адносіны з Богам. Пасля нашай размовы я стала хадзіць у касцёл кожную нядзелю і неўзабаве ва ўсім разабралася. А што? Мне спадабалася!

www.kamunikat.org



# Раіса Крывальцэвіч

празаік, паэт. Закончыла гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Выкладчыца ЕГУ. Нарадзілася ў 1960 годзе на Наваградчыне. Жыве ў Мінску.

# Мой каляндар

***

Ніколі не любіла «замалёвак», цярпець не магла апісанняў прыроды, старалася іх прапусціць у кніжках, якія «глытала» ў дзяцінстве.

Даўно гэта было. А зараз... Здаецца, што гэтыя некалькі радкоў — самыя каштоўныя, бо ты не мог іх не напісаць, яны выспелі ў тваёй душы, дакладна перадаюць яе стан...

## Каштаны ў верасні

Канец верасня... Горад засыпаны каштанамі...Яны як згаварыліся, сталі хуліганістымі — страляюць калючымі вожыкамі схаваных унутры пладоў, барабаняць дажджом па празрыстых пластыкавых стрэхах гарадскіх прыпынкаў, адзін рыкашэтам стукнуў па сумцы — прымусіў усміхнуцца... Яшчэ смяшней было б, калі б па галаве... Смяшней не мне, а людзям на прыпынку...

На асфальце — спелыя, гладкія, карычневыя, бліскучыя плады, якія хочацца заціснуць у руцэ і не выпускаць...

Каштаны нарадзіліся, прыйшлі ў гэты свет: на зямлі — пустыя ракавінкі абалонкі, у якой жылі ўсё лета, гадаваліся і раслі. Мацярынскі паслед...

Падымеш каштанчык — апрануты ў зялёнае калючае адзенне, ён хітра вызірае з растрэснутай хаткі-схованкі. Заціснеш у руцэ цвёрдае карычнева-бліскучае цельца як талісман — будзь са мною, восень, расквець душу тымі дзіўнымі фарбамі, як ты зрабіла гэта з клёнамі... Я люблю цябе, раннюю...

А школьнікам, якія чэшуць раніцай у школу, ужо не цікава кідаць хіжым вокам на дрэвы — самы падаюць, няма патрэбы збіваць ... Нехта акуратна пазбіраў каштаны ў кучкі...

*29-30 верасня 2009*

***

Першага кастрычніка... Дробны дождж ык, імжа, халодны вецер...Можа, што восень апала з неба на зямлю, так сумуецца па табе і кахаецца ў думках? Недахоп цябе... Амаль заўсёдны... Як паветра, як ежа, як дабрыня — так неабходная твая любоў...

Як цяжка спраўляцца з пачуццямі...

На мокрым асфальце, у лужынах — markerнакаляровыя зорачкі кляновых лістоў... Такія розныя варыяцыі спалучэння фарбаў пры ўсім іх падабенстве...

www.kamunikat.org

Здаецца, усё гэта ты бачыў сто разоў за сваё, аказваецца, не такое ўжо і кароткае, жыццё... Але не наглядзецца, не надзівіцца, не нацешыцца...

Бог гаворыць з намі фарбамі і формай... Здаецца, гэта Боскае пасланне — пяць канцоў кляновага лістка, адбітак яго Боскай далоні, расквечаны радасцю колераў — блаславенне нам, хто на Зямлі: ідзіце, не бойцеся цемры і холаду, яны мінуцца...

*1 кастрычніка 2009*

## Яблыні ўвосень

У завулку з выразнай назвай Прыгожы ля Магілёўскай яшчэ захаваліся старыя драўляныя дамы і сады. На высокіх старых яблынях звісаюць нязнятыя яблыкі — ярка-чырвоныя, яны абцяжарваюць голыя, без лісця, пачарнелыя галінкі, прымушаюць іх хіліцца долу... Празрыстасць яблыняў на фоне восеньскага неба з чырвонымі шарыкамі яблыкаў нагамінае пра хуткае Раство Хрыстова, пра яркія круглыя «бомбачкі» на пухнатых штучных елках у вітрынах магазінаў і радасць свята ...

*Лістапад 2009*

## Дрэвы ў лужынах

Месяц лістапад. Дрэвы адлюстроўваюцца ў лужынах... На сталёвай воднай гладзі яны выглядаюць карцінамі. Пазіраеш, як у люстэрка...Толькі бачыш не сябе, а чорныя голькі дрэва на металёва-бліШчастым фоне вады.

Дрэва ў паветры і дрэва ў вадзе — такія розныя. Падымеш галаву ў неба — чорныя галінкі ў нябёсах... А вось у лужынцы — цэлы мастацкі твор, вачэй не адарваць. Так бы стаяў і ўглядаўся, калі б усё роўна было, што пра цябе людзі падумаюць...

Так некалі ў дзяцінстве пазірала ў шчылінку цацачнай пластмасавай альтанкі, якую старэйшая сястра прынесла са школы: унутры, калі зазірнуць, у нейкай невядомай далечыні можна было ўбачыць сястрын твар. Далёкі, той і не той, ён быў не такі, як, калі б яна стаяла побач...

*16 лістапада 2009*

## Купанне галак

А ўчора зноў была вясна ў скверы. Цёмна-сінія разбэрсаныя аблокі несліся па небе, праглядвала сонца, а ў глыбокай лужыне каля елак купалася вялікая кампанія вясёлых галак.

Відовішча было захапляльнае...

Стоячы пасярод лужыны, галкі радаваліся вадзе ўсім сваім апераным птушыным цельцам, заглыбляліся дзюбамі, ледзь не з галавой, у ваду, трапяталі распушанымі крыламі, білі хвастамі па воднай гладзі. Яны беспярэстанна ўздымалі вадзяныя фантаны і апускалі іх на сябе, стаялі пад імі і цешыліся зробленым ...

Так весяляцца малыя жэўжыкі летам на возеры, б'ючы рукамі па вадзе, каб пырскі ляцелі на суседа...

*26 лістапада 2009*

***

Я стала падобная на восеньскую траву. Яна зялёная, але не зусім жывая. Яна не можа прадукаваць. У ёй не зародзіцца маленькая кветачка, беленькая непрыкметная стакротка.... Яна не народзіць...

Здаецца, скончыўся жаночы век... А калі пачаўся? Не памятаю, не заўважыла, не прыдала вялікага значэння...

Можа таму трэба было так моцна пакахаць, зайсціся, патануць у пачуцці любові, каб не сумаваць з прычыны развітання з ... З чым? Каб адчуваць сябе жанчынай і надалей...

А сёння суцешыла сябе. Зялёная трава, няхай не тая яркая і сакавітая, як вясной ці ўлетку, патрэбная. У яе свая важная роля — радаваць пасярод восеньскай шэрасці. Напамінаць пра лета і даваць надзею на тое, што яно вернецца. А калі на ёй ляжаць жоўтыя бярозавыя лісточкі, яна выглядае пярэстым мілым дыванком, ад якога не адарваць у замілаванні вачэй...

*19 лістапада 2009*

***

*Калі бэз асыпаўся — будзе зіма*
(народная прыкмета)

А бэз у скверы асыпаўся... Увесь.. Толькі некалькі зялёных лісточкаў на кусціках... Няўжо будзе зіма? Не верыцца, бо на двары дождж, то дробны, то не вельмі, слота, стаяць лужыны, вада добра прамыла пясок на сцяжынках...

А лісточкі бэзавыя так і ўпалі на зямлю зялёныя, не змяніўшы свайго колеру, не пажаўцеўшы...

Дубовае лісце і ёсць дубовае... Усё аднаго колеру — светла-карычневае, ляжыць пругкае, няломкае, з выразнай «разьбою» па баках. І не думае ўтоптвацца ў сцяжынку, як тое пяшчотнае бярозавае...



www.kamunikat.org

У вялікіх вазах на гарадскіх вуліцах з'явіліся пухнатыя зялёныя лапкі хвойкаў... Цяпер яны замест летніх і восеньскіх кветак выконваюць задачу радаваць прахожых... Вядома, не могуць яны сказаць чуламу сэрцу так шмат, як вочкі незабыўных анютак, але кажуць пра хуткае Раство, Новы год, пастаянства зменаў і змены ў пастаянстве...

*20 лістапада 2009*

## Жанчыны ўвосень

Як выглядаюць дрэвы ўвосень! Якая ў іх вопратка! Яны шыкуюць апошні раз! Радасным буяннем фарбаў яны прыцягваюць да сябе погляд яшчэ больш, чым улетку... І нават, калі ператворыцца гэтая прыгажосць у цёмную гурбу зляжаласці, успамін пра восеньскае лісце будзе грэць...

Восень жаночая... Як хочацца, каб у ёй усё было прыгожа і годна: гармонія ў душы, у целе і на целе...

Нашыя жанчыны-пенсіянеркі не першага года пенсіі падобныя ў адзенні. Так хочацца іх пераапрануць, вярнуць іх да вясны жыцця іхняга: куртачку прыталіць, боцікі зграбныя на ножкі, прычоску, макіяж, шапачку модную — цешцеся, здзіўляйцеся, мужчыны! А гэтыя амаль аднолькавыя галаўныя ўборы, гэты прасторны, без таліі балахон, шырокія, без шыку, штаны і бясформенны грубы абутак (толькі ў нас яго могуць выраблядь!), якія так лёгка адбіраюць жаноцкасць, выкінуць назаўсёды...

Але без зменаў у душы не адбудзецца гэтых вонкавых пераменаў на лепшае...

Калі ў душы восень...

*16-27 лістапада 2009*

## Пра павучка і пра цябе

Сяджу ў кухні і грэю спіну ля печы...Заўважаю павучка — такога слаўнага, маладзенькага, далікатнага, з танюсенькімі, сагнутымі, як мае быць, доўгімі лапкамі-косамі («Касі, каса, пакуль раса...») і маленькім цельцамлямпачкай... Павучок звісае долу, яму добра-весела, бесклапотна, як гэта было нам у дзяцінстве, калі дурэлі, звешваючыся на драбінах галавою ўніз, трымаючыся адно нагамі за перакладзіну....

Узрадавалася павучку, як роднаму: верная прыкмета — будзе навіна, ліст... Гэта значыць, што ты адгукнешся, напішаш...

Павучок вісіць нерухома... Яму добра.... А мне добра бачыць яго — я так чакаю тваіх радкоў...

*14 снежня 2009*

## Мароз і сонца...

Нерэшце лёг снег... Зіма ўсё роўна прыйшла нечакана... Раптам знікла нуда і няўтульнасць шэрых дзён... Мароз... Нос, ногі і рукі яго адчуваюць, калі своечасова не перастроіцца на зімовы стыль адзення...

Удзень сонца такое яркае... І як яно ўжываецца з моцным марозам?

На казачных елках у скверы тоўстым слоем ляжыць снег, быццам бялковы крэм на святочным торце...

І ўсё наваколле раптам стала святочным. Свята ад белі снежнай, ад шчодрага, хоць і зімовага, сонца, ад блізкай радасці ад нараджэння Хрыстовага, ад прадчування хуткіх Калядаў, завяршэння чарговага кола прыродна-жыццёвага ...

Урачыстасць не толькі ў прыродзе, яна і ў хаце. Родныя сцены сталі прыцягваць цяплом, якога не знайсці на двары, з'явілася новая ўтульнасць і новая радасць ад яе... Усё дадае жадання заглыбіцца ў любімую працу, працаваць, планаваць будучыню, думаць пра нешта дарагое, прыемнае, блізкае...

Вялікія вокны няўцепленага балкона ўжо не вокны, а карціны з зімовага храма з суцэльным і вечным узорам з адмысловых дробных і вялікіх лісточкаў, заснежаных елачак... За гэтай зімовай фіранкай адчуваеш сябе абароненым ад свету, можаш схавацца ад яго...

*15 снежня 2009*

www.kamunikat.org



# Ганна Дар

празаік, перакладчык. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нарадзілася ў Мінску ў 1981 годзе. Жыве ў Варшаве.



www.kamunikat.org

# Пра Бігі-Казытуна-Калючую-Бараду і яго краіну

*Прысвячаю брату*

Мой шаноўны Сябар, калі ты любіш казкі, якія добра заканчваюцца, то лепш адразу адкладзі гэтую кнігу ўбок. «Чаму?» — спытаешся ты. Ды таму, што я хачу расказаць самую сумную казку, якую ты калі-небудзь чуў. І ўвогуле, гэта не казка. Гэта самая праўдзівая гісторыя пра Бігі-Казытуна-Калючую-Бараду і пра Краіну-Назву-Якой-Ніхто-Не-Памятае. «Ха-ха, — засмяешся ты, — такія імёны і назвы бываюць толькі ў казках!» Я нічога не буду табе на гэтае адказваць, ты проста паслухай маю гісторыю і вырашай сам: казка ці не казка?

Дык вось, жыў у Нязнаным Лесе Бігі-Казытун-Калючая-Барада. Дзе той Нязнаны Лес ніхто дакладна не ведае, але ляжыць ён недалёка ад Багністай Твані і Блакітных Люстраў, а разам яны ўтвараюць Краіну-Назву-Якой-Ніхто-Не-Памятае. Ды і сам Бігі-Казытун забыў яе назву, хоць раней і памятаў. Мо таму і патрапіць туды складана: бо як патрапіць туды, не ведаю куды? Тыя нешматлікія, каму тое ўдалося, кажуць, трэба проста ісці і ісці з захаду на ўсход, ці з усходу на захад, і аднаго дня нечакана для сябе апынешся ў краіне Бігі-Казытуна-Калючай-Барады. Можа яно і так, але ёсць і іншы шлях. Пра гэта пазней, а пакуль

**Распавяду табе тое, што мая бабуля апавядала мне, а ёй пра тое казала яе бабуля.**

Блукаў калісьці па свеце і раз-пораз трапляўся на вочы людскія Мруклівы-Без-Імя. Раней ён, канешне, меў Сваё Імя, быў вясёлым і дужым, любіў спяваць песні. Але так сталася, што пакахаў ён Прыгажуню-з-Зялёнай-Гары і кінуў свае мясціны. І паколькі раней інтэрнэту не было, то сувязь з домам перарвалася, і паступова ён забыў сваё імя, хто ён і адкуль яго род. (*Так, так! Такое бывае і даволі часта, на жаль! Калі ты не сустракаўся яшчэ з тым, хто забыў сваё імя, то я жадаю табе ніколі яго не сустракаць. Гэта вельмі-вельмі сумная карціна*). І вось сталася, што Мруклівы-Без-Імя пачуўся так невыносна, што кінуў жонку і дзетак і пачаў блукаць па свеце — дарогу дадому шукаць. Мая бабуля апавядала мне, што яе бабуля спаткала яго неяк у лесе, калі па ягады хадзіла. Папрасіўся той пераночыць ды застаўся амаль да самых святаў жніўеньскіх. І падобна падабалася яму ў нас дужа, асабліва, як дзяўчаты спяваюць. Ён ім нават

падпяваць пачынаў. Адкуль толькі мовы навучыўся?! Неяк падскочыў ды ну дзяўчат цалаваць, кажа, узгадаў Блакітныя Люстры. А наступнага дня знік, нават святаў не дачакаўся. Чаму, я ўжо не магу сказаць, бо мне таго бабуля не перадавала. Мо нешта значылі тыя Люстры для яго, так што і ўседзець не мог. Але я вось думаю, што сусед ён нашаму Бігі-Казытуну-Калючай-Барадзе, а мо і брат які.

**А цяпер распавяду табе пра хлопчыка Кіселя.**

Не смейся з ягонага імя, бо ён можа абразіцца, а мы ж не хочам яго крыўдзіць — ён адзіны хлопчык, які пабываў у Нязнаным Лесе.

І потым ёсць куды больш смешныя імёны. Я вось некалі сустрэла хлопчыка, што меў імя Альфонс. Я нават вымавіць яго не магла, мяне адразу браў смех. А ўсё чаму? Бо яно нагадвала мне вялізную зялёную муху. Вось як скажуць: «Альфонс» — так адразу муху ўзгадваю і рагачу аж да колікаў у жываце. З-за гэтага мы і не пасябравалі, бо ён на мяне пакрыўдзіўся. А ён, між іншым, стаў вядомым мастаком. Праўда-праўда! Будзеш у Празе, спытайся пра мастака Альфонса, табе кожны пакажа ягоны дом.

Дык вось. Была ў Кісеika (*гэта памяншальнае ад Кісяля, мне так больш падабаецца*) Вялікая-Кніга-Міфаў-і-Легендаў, якую ён заўсёды цягаў з сабой у сваіх вандроўках. Адкуль была, хто тое ведае. Мо ад дзядулі засталася. Той таксама вандраваць любіў. Кнігу сваю Кісялік не ўсім паказваў, мабыць, баяўся, што адбяруць. Але мая бабуля бачыла. Меліся ў Кнізе цудоўныя каляровыя карцінкі, аповеды пра чароўныя краіны, якія існавалі даўно-даўно, пра людзей і чарадзеяў, што жылі ў тых краінах, волатаў і карлікаў, русалак і вадзянікоў, цмокаў і Каралеву Вужоў (*як-небудзь раскажу табе пра яе*), пра затопленыя гарады і падарожжы ў іншасвет. І яшчэ шмат чаго цікавага, але галоўнае, у ёй была мапа. А на той мапе былі пазначаныя ўсе гэтыя затопленыя гарады і зніклыя краіны, лясы, у якіх можна сустрэць волата, і лясы, якія лепей абмінуць, бо ў іх жывуць цмокі. Яшчэ ў ёй былі намаляваныя розныя азёры, рэкі і вадаёмы: звыклыя, са звыклымі русалкамі і вадзянікамі, і нязвыклыя, як тое, якое пакінула Тая-Самая-Русалачка. Меўся на ёй і Свіцязь-горад з мужнымі жыхарамі, што баранілі яго ад чужынцаў, але ўрэшце мусілі схавацца ад тых на дне возера, дый так там і засталіся. Бабуля казала, што і Нязнаны Лес, і Блакітныя Люстры, і Багністая Твань на той мапе былі!

Відаць, з Вялікай-Кнігі-Міфаў-і-Легендаў Кісялік і вычытаў пра Нязнаны Лес і Краіну-Назву-Якой-Ніхто-Не-Памятае. Вычытаў прыкладна тое, пра што я табе крыху распавяла ўжо, а таксама вершык. Вось ён:

паміж захадам і ўсходам  
ёсць чароўная зямля  
ты ўзгадай яе імя  
над калодзежам высохлым  
і калі ў ім вада  
перальецца цераз край  
бы ў люстэрка зазірні  
і скажы сваё імя  
(не забудзь яго пасля)  
смела скокні... і бывай!

З таго часу зацікавіўся моцна Кісялік Краінай-Назву-Якой-Ніхто-Не-Памятае. Брыў ён сабе па дарогах праз вёскі і гарады, лясы і рэкі, бо ведаеш, не было тады яшчэ самалётаў. Цягнікі мо ўжо і былі, і параходы, а самалётаў дакладна не было. І вось як сустрэне высохлы калодзеж, давай у яго розныя слоўкі прыдуманыя крычаць — раптам адгадае назву той зямлі:

— У-то-пі-лэнд! — гукае Кісялік

— Пі-лэнд... лэнд...лэнд... — адгукаецца рэха.

— Нэт-лан-дзі-я!

— Лан-дзі-я... дзе-я... дзе-я... — пытаецца рэха.

— Нар-ні-я!

— Ні-я... ні-я... я... — пярэчыць само сабе рэха.

Так прыкладна перамаўляўся Кісялік з высохлымі калодзежамі, але нічога не адбывалася. Пакуль аднойчы не сталася тое, чаго так прагнуў. Прытаміўся ён у дарозе ды лёг ля нейкага чарговага калодзежа, падклаўшы сваю Кнігу пад галаву. Пачаў ужо засынаць, як раптам чуе: з калодзежа кліча нехта: «Алесік! Алесік!». І падалося Кісяліку праз сон, што гэта яго нехта кліча, ён зазірнуў у калодзеж і вымавіў Назву Краіны. Проста вымавіў, як быццам заўсёды яе ведаў. І тут нейкая сіла ўзяла і ўцягнула яго ў калодзежны вір, і апошняе, што падумаў Кісялік: «Я ж не ўмею плаваць...»— і страціў прытомнасць.

***

Ты канешне ўжо зразумеў, дзе апынуўся Кісялік. Але для нездагадлівых патлумачу — у Краіне-Назву-Якой-Ніхто-Не-Памятае.

**А цяпер я раскажу табе, як Кісялік забыў сваё імя і стаў Алесікам, і каго ён сустрэў каля калодзежа.**

Ачомаўся Кісялік, агледзеўся — а вакол прыгажосць: кветкі каляровыя звіняць, трава шуміць, птушкі спяваюць, ягадаў поўным-поўна, аж чырванеецца ад іх паляна. І паколькі Кісялік быў вельмі галодны, то пачаў ён суніцы збіраць і есці. Ах, якія ж смачныя і сакавітыя былі тыя суніцы! Еў і еў іх Кісялік, аж пакуль не спахапіўся, што кнігу сваю згубіў. Прыбег да

www.kamunikat.org

калодзежа, а там нейкі дзядуля сядзіць: галава сівая, з барады нібы голкі тырчаць, сам увесь у белым, — сядзіць ды кнігу яго гартае.

— Хто вы такі? — пацікавіўся Кіселік.

Дзядуля толькі задаволена хмыкаў ды працягваў гартаць кнігу.

— Гэта мая кніга, — сказаў Кіселік і пацягнуўся забраць яе, але стары лёгка дзьмухнуў, і Кіселіка схапіла казытка: ён смяяўся і выварочваўся, але тая ўсё адно знаходзіла самыя чулыя месцы. Нарэшце хлопчык зваліўся ад знямогі, і казытка пакінула яго ў спакоі.

— Дык гаворыш — твая гэта кніга? — запытаўся дзядуля.

— Мая.

— А як цябе завуць, хлопчык?

— Мяне завуць..., — і раптам Кіселік зразумеў, што не памятае свайго імя: Кампоцік? Студзёнік? Сакавік? Бярозавік?

— Я не памятаю, — прызнаўся ён і хацеў ужо заплакаць (*хто б не заплакаў у такой сітуацыі?*), але стрымаўся.

— Можа цябе завуць Алесік? — падказаў дзядуля.

— Алесік... Алесік... — прашаптаў Кіселік некалькі разоў і яно адгукнулася ў яго сэрцы чымсьці цёплым і знаёмым:

— Так, вельмі падобна, — узрадваўся Кіселік, — Я — Алесік.

— Ага, так я і думаў, — пасміхнуўся дзядуля, — А я — Бігі-Казытун-Калючая-Барада. Але ты можаш называць мяне дзядуля Казытун. Бачу ласаваўся суніцамі-забыўніцамі. Шмат іх тут апошнім часам развялося, і рознага іншага стрэнджырса.

— Што такое «стрэнджырс»?— спытаў Алесік, паколькі ўпершыню чуў гэтае слова.

— Тое што, не ведаючы, у рот не кладуць, а то не толькі імя сваё забудзеш, — строга адказаў Бігі-Казытун. — Хадзем, будзеш у мяне пакуль жыць. Ведаў, Алесік, я твайго дзядулю, сябрамі былі. Гэта я яму Вялікую-Кнігу-Легендаў-і-Міфаў даў, калі ён вымушаны быў выправіцца ў Краіну-Чорнага-Другана.

— Мой дзядуля быў у Краіне-Чорнага-Другана? — вочы Алесіка ўспыхнулі ад захаплення і жаху, бо ў Вялікай-Кнізе ён трошкі чытаў пра яе.

**Што ведаў Алесік пра Краіну-Чорнага-Другана, і што распавёў яму Бігі-Казытун-Калючая-Барада.**

Краіна-Чорнага-Другана цягнецца ад Самага-Канца Зямлі да яе паловы, пакрытая пераважна ільдамі, мае вельмі суровы клімат. Згодна легендзе, раней гэта былі квітнеючыя землі, населеныя шматлікімі казачнымі і легендарнымі народамі. Але шмат гадоў таму, так шмат, што ўжо ніхто і не памятае калі, Чорны Друган са сваімі памагатымі Крукамі зваяваў землі, а жыхарам павыклёўваў вочы і прымусіў працаваць на сябе. Вельмі нешматлікія, хто апынаўся ва ўладаннях Чорнага Другана, вярталіся дадому. І яшчэ менш такіх, якія засталіся самі сабой пасля вяртання. Адным са шчасліўцаў быў хлопчык Кай, якога выратавала сястра. Але тады кіравала маці Чорнага Другана, і ўладанні іх былі меншыя, і сіла меншая. Ніхто не ведаў яе сапраўднага імя. Розныя народы называлі яе па-рознаму: Снежная Каралеўна, Белая Сарока, Царына.

— Так, так. Я таксама ў дзяцінстве Вялікую-Кнігу любіў чытаць, — пахітаў галавой дзядуля Казытун, — Але звесткі тыя няпоўныя, даўно Кніга тая пісалася. Не гаворыцца ў ёй, напрыклад, пра Фабрыку Забыцця, што Чорны Друган стварыў. Там прыдумляюць розныя сродкі, што адбіраюць памяць.

— Суніцы-забыўніцы, — здагадаўся Алесік.

— Так, суніцы-забыўніцы, а яшчэ сон-травіца, скваспасць-вадзіца, кровы і шмат іншых. Пастаянна на нешта новае натыкаюся. Але ты не хвалюйся, пра ўсё з часам даведаешся.

Так размаўлялі яны, ідучы ў глыб Нязнанага Лесу, дзе жыў Бігі-Казытун-Калючая-Барада. За размовай і не заўважылі, як прыйшлі туды, куды ішлі:

**Ва Ўладанні Бігі-Казытуна-Калючай-Барады.**

Што ўяўляюць з сябе Ўладанні Алесік даведаўся паступова, але я табе раскажу асноўнае зараз. Дык вось звонку ўсё выглядала звычайна, ну як хата на вёсцы, толькі трохі большая. Але галоўнае, што ў доме меліся шматлікія нябачныя дзверы ў патаемныя пакоі і падземныя хады, што ўтваралі складаны лабірынт. Толькі Бігі-Казытун-Калючая-Барада ведаў, колькі іх было, і што дзе знаходзілася. Вакол дома рос вялізны сад з рознымі яблынямі, грушамі, слівамі і кустамі чырвонай і чорнай парэчкі, зарасцямі маліны, градамі памідораў і гуркоў, нават бульба недзе там сядзела. Карацей, шмат чаго было. Сад патроху пераходзіў у лес, а лес у Нязнаны Лес. Пагатоў усё гэта і было Ўладаннямі Бігі-Казытуна. А яшчэ ў садзе быў ход... Але пра гэта пазней, бо зараз

**Да іх бегла нечым усхваляваная Галінка-Гаючая-Слязінка.**

— Дзедусь! Дзедусь!

— Што такое, Галінка-Гаючая-Слязінка, што здарылася, ясачка мая чароўная? — ласкава прамовіў дзядуля Казытун і пагладзіў дзяўчынку па галаве.

— Мне вавёрка сказала, што на ўскрайку Нязнанага Лесу, як пачынаецца зямля Блакітных Люстраў, — усё яшчэ задыхаючыся, прамовіла Галінка, — бачыла Зыля-Чаруй-Голас.

Потым сцішана дадала:

www.kamunikat.org

— І падобна ён быў мёртвы...

Бігі-Казытун-Калючая-Барада заспяшаўся, асядлаў Хуткага, Алесіка ды Галінку пасадзіў на Імклівага, ды паімчалі яны нібы вецер на ўскраек Нязнанага Лесу. Ляжаў Зыль, нібы волат у валатоўцы, падобна ні дзень і ні два; ажно мохам брацца пачаў. Галінка-Гаючая-Слязінка заплакала, з вачэй яе слёзкі паліліся і на грудзі яму закапалі. І вось ужо не мёртвы волат ляжыць, а проста Зыль-Чаруй-Голас спіць. Дзядуля Казытун з барады голку выдзернуў ды ўбок Зыля кінуў — тая вяроўкай абярнулася, у вузлы дзе трэба завязалася, у пасцілку сплялася. Адзін канец вяроўкі да Хуткага прымацавалі, другі — да Імклівага: так і валаклі Зыля да самага дому. А там Бігі-Казытун-Калючая-Барада зёлак у садзе нарваў, хвост яшчаркі змалоў, зямліцы шчыпту ўкінуў, вадзіцы з крыніцы даліў, сонечны праменьчык дадаў, замову прашаптаў ды зелле зварыў. У глечык пераліў і наказаў Галінцы ды Алесіку двойчы на дзень, перад узыходам і заходам сонца, па глытку Зылю даваць.

— Зыль прачнецца, нічога памятаць не будзе: ні хто ён, ні адкуль ён. Зелле маё дапаможа яму ўсё прыгадаць, але шмат не давайце, іначай кепска будзе.

— Дзядуля, хто ж Зыля хацеў забіць? — спыталася Галінка-Гаючая-Слязінка.

— Можна толькі здагадвацца, ясачка мая, — спахмурнеў Бігі-Казытун, — пачакаем, што Зыль успомніць.

Доўга Зыль-Чаруй-Голас праляжаў, аж пакуль не ўзгадаў сваё імя, а як узгадаў, дык справа шпарчэй пайшла. Пачаў ён прыпамінаць усё. Згадаў нават як у дзяцінстве з дзядзькам суп з бярозавіка гатавалі. Але галоўнае, песні ўсе ўзгадаў: і пра «Ваякаў на грозных канях», і пра «Ўладара сусветаў», і пра «Чарапах»... Ды ўсе і не ўзгадаць, так шмат песняў ведаў Зыль! А да таго ж яшчэ голас які меў — заслухаешся! Нездарма ж ён Зыль-Чаруй-Голас называўся. Асабліва любілі Алесік і Галінка-Гаючая-Слязінка вось гэтую:

ммм......................................................

тут павінна быць «Песня пра волатаў».

..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................



..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................
..............................................................

І з вялікімі здараюцца пралікі!

*Мне вельмі сорамна, мой шаноўны Дружа, але я не памятаю гэтую песню! Я паспрабавала сачыніць яе, але ў мяне нічога не атрымалася. Калі ты думаеш, што гэта вельмі проста — сачыняць песні, то паспрабуй сам. Я пакінула трошкі месца, каб ты мог запісаць сваю песеньку, калі ў цябе атрымаецца яе сачыніць. А ўзамен я распавяду табе*

**Вельмі просты рэцэпт любімага яблычнага пірага Зыля-Чаруй-Голас.**

*Ты можаш прыгатаваць яго з дапамогай мамы ці таты!*

3-4 яблыкі пачысціць, на тонкія скрылькі нарэзаць — і хай сабе паляжаць пакуль.

Тым часам:

3 яйкі разбі ў рондаль, туды ж закінь 1 філіжанку цукру — і добранька перамяшай. Дадай паступова 1 філіжанку мукі — і зноў усё гэта перамяшай.

Далей — алеем змаруем форму, выкладваем у яе яблычныя скрылікі і заліваем іх цестам. Ставім на 40-50 хвілінак у пякарнік — і гатова! Смачна есці!

***

Падсілкаваўшыся, самы час вяртацца да нашых герояў, бо Зыль-Чаруй-Голас успомніў, што з ім здарылася.

А здарылася тое, што выправіўся Зыль па сваіх справах у горад ды зазірнуў да Сіма-Шынкара-Сына выпіць куфаль крамбамбулі. Дзверы ў шынок адчыніў, а там Крукі, памагатыя Чорнага Гругана, як у сябе дома сядзяць, песні свае круковыя гугнявяць.

— Што за справы такія? — спытаўся Зыль у Сіма, — Што яны тут на зямлі нашай забыліся?

— Дык гэта ж яны ў Рэма-Шэрага, гаспадара Малахітавых Затокаў гасцююць, — патлумачыў шынкар.

Зыль-Чаруй-Голас сеў, кіўбасы з хлебам умінае, крамбамбуляй запівае. Ажно яшчэ адзін Круковы заходзіць. Аглядваецца — а месцаў няма.

www.kamunikat.org

— Гэй ты! — і Зыль адчуў, як адзін з Крукоў па плячы яго ляпае, — Перасядзь мо, месца нашаму сябру вызвалі.

— Твой сябар — не мой, вось сам і саступі, — спакойна адказаў Зыль, — не перашкаджай добраму чалавеку вячэраць.

Тут Крукі разззлаваліся і на Зыля з абодвух бакоў насунуліся, за рукі схапілі ды давай яго з-за стала выпіхваць. Але што яны ў параўнанні з Зылем — пацукі, дый годзе! Згроб ён іх пад пахі ды з шынка ўсіх і павыкідваў.

— Нарэшце павячэраць можна спакойна, а то ежа ў горле ставала, — падтрымаў нехта з месцічаў учынак Зыля.

А на наступны дзень у Сіняе Вока да Зыля-Чаруй-Голас з размовай Рэм-Шэры прыехаў.

— Што ж ты, Зыль, гасцей маіх крыўдзіш?

— Што ж гэта за гасцей ты ў сябе прымаеш? — у тон яму адказаў Зыль. — Яны ж гаспадара з уласнага дому выкінуць ды яшчэ падзякі за тое запатрабуюць.

— Э, браце, гарачы ты, не так зразумеў, — лагодна так гаворыць Рэм-Шэры ды пляшку на стол ставіць. — Вось, кажа, на знак згоды перадалі табе.

— Не хацеў я піць, дружа Казытуне-Калючая-Барада, але ты ж ведаеш нашыя звычаі: калі мірыцца прыехаў, то як адмовіць суседу? А пасля як скруціла мяне тое зелле круковае, што калі б не вашая дапамога, карміў бы ўжо чарвякоў на радасць ворагам, — закончыў свой аповед Зыль-Чаруй-Голас.

— Ходзяць чуткі, не адзін Рэм-Шэры з памагатымі ЧорнагаРугана хаўрусуе. Не хацеў я ім верыць, але твой аповед пацвярджае іх, — прамармытаў у глыбокім задуменні Бігі-Казытун-Калючая-Барада.

— Трэба адпомсціць Рэму-Шэраму за Зыля! — усклікнуў уражаны пачутым Алесік.

— Ха-ха, дзякуй, мой маленькі сябар, — зычліва засмяяўся Зыль-Чаруй-Голас, — але помста — гэта зброя слабых.

— Што ж рабіць? Няўжо Рэм-Шэры і Крукі не заплоцяць за свой учынак? — разгубілася Галінка-Гаючая-Слязінка.

— Трэба склікаць сход, каб людзі дазналіся пра ганебны ўчынак Рэма-Шэрага і вырашылі, якога пакарання ён заслугоўвае, — падсумаваў Бігі-Казытун-Калючая-Барада.

**Што адбылося падчас сходу, і ці атрымаў Рэм-Шэры справядлівае пакаранне.**

Сход вырашылі праводзіць ля Вялікага Камяня, што ляжаў раўнютка між Нязнаным Лесам, Блакітнымі Люстрамі і Багністай Тванню. Камень той сапраўды быў велічэзны, напалову ўрослы ў зямлю, і нават дзесяць чалавек не змаглі б ссунуць яго з месца. З-пад Камяня цурчэла крынічка, якая валодала цудадзейнай сілай, але не ўсім яе цудадзейнасць раскрывалася. Вось Бігі-Казытун-Калючая-Барада часта выкарыстоўваў вадзіцу з крыніцы, калі зеллі разнастайныя варыў, і яму яна аддавала сваю сілу цудадзейную. Памятаеш, як дзядуля Казытун дадаў вадзіцы ў склад зелля, якое вярнула памяць Зылю-Чаруй-Голас? Дык гэта была вадзіца з цудадзейнай крынічкі. Але як злы чалавек з нядобрымі намерамі вадзіцу захоча ўзяць, то нічога ў яго не атрымаецца.

Мела вада крынічная яшчэ адну ўласцівасць. Калі вып'еш яе, то ўжо не можаш няпраўду казаць, бо сумленне цябе пачне сушыць да той пары, пакуль не памрэш альбо праўду не скажаш. Таму і прызначалі ўсе важныя сходы ля Вялікага Камяня з крынічкай. Апоўдзень пачалі прыходзіць людзі. Нібы тры ручайкі беглі ў адно месца, каб там утварыць шумлівае мора месцічаў, што праглі даведацца, што ж адбылося паміж Зылем-Чаруй-Голас і Рэмам-Шэрым, заможнымі і паважанымі гаспадарамі.

**А пакуль людзі сыходзяцца, распавяду табе легенду пра Вялікі Камень і цудадзейную крынічку.**

Даўно-даўно тое здарылася, калі і Бігі-Казытуна-Калючай-Барады яшчэ на свеце не было. А яму ўжо гадкоў тых — лічыць не пералічыць! Жылі ў вёсцы Янка ды Надзейка. Надзейка была дзяўчына прыгожая, не адзін хлопец у яе закаханы быў. Ды яна толькі пасміхалася з іх, вачыма сваімі чорнымі чаравала, ды чакала, калі ўжо Янка ёй у каханні прызнаецца. А той не ідзе ды не ідзе, з усімі дзяўчатамі роўны, нікога не вылучае і кветкі нікому не дорыць. Тады Надзейка сама да яго пайшла: «Янка, — кажа, — за жонку мяне возьмеш?». А Янка засмяяўся ды гаворыць: «Ой, Надзейка, вакол цябе столькі жаніхоў — выбірай любога!». Надзейка не саступае: «Але ж я *цябе* сваім мужам бачыць хачу. Кахаю я цябе, Янычка!». Янка руку яе ў сваю ўзяў, у вочы зазірнуў: «Надзейка, — кажа, — для кахання двое патрэбныя». Як нажом па сэрцы рэзануў. «Усё роўна маім будзеш!» — крыкнула яна. А ўночы пайшла да вядзьмаркі, каб тая ёй зелле нагаворнае дала. На наступны дзень Надзейка зручны момант улучыла ды зеллем нагаворным Янку апаіла. І вось ужо Янка за Надзейкай, як прывязаны ходзіць, ажаніцца з ёй гатовы. І сваты ўжо высланыя і вяселле прызначанае, ажно не лёс было Надзейцы жонкаю Янкі стаць.

Паехаў Янка ў горад падарункі нявесце купляць, ды ўбачыў Зоську, дачку званара. Каса русая, доўгая, вусны вішнёвыя, вочы васільковыя, а ў іх душа яе чыстая відаць. Як глянулі яны адно на аднаго, так і закахаліся. А дзе каханне сапраўднае, усе зеллі прываротныя сілу губляюць. Вярнуўся

www.kamunikat.org

Янка ў вёску ўжо з новай нявестай. Надзейка ганьбы такой не даравала. Пракляла яна Янку: «Няхай бы ты лепш камянём зрабіўся, чым з супернiцай маёй шчаслівай жыў!» Толькі вымавіла праклён свой, як Янка ў камень і ператварыўся. А Зоська, кажуць, не змагла без любага жыць, усё да камяня хадзіла, слёзкі пралівала і аднойчы ў крынічку і ператварылася.

Тым часам Бігі-Казытун-Калючая-Барада з Алесікам і Галінкай-Гаючай-Слязінкай таксама да Вялікага Камяня прыйшлі.

— Дзядуля Казытун, Алесік, глядзіце! Ён расколваецца! — усклікнула Галінка-Гаючая-Слязінка, указваючы на Вялікі Камень. А па ім і праўда, невялікая, але заўважная, расколіна пайшла.

— Нядобры гэта знак, — прамовіў Бігі-Казытун-Калючая-Барада і паміж броваў яго залегла зморшчынка.

Зыль-Чаруй-Голас убачыў сяброў і падышоў павітацца:

— Спёка сёння надзвычайная! Алесік, Галінка, хадземце ў цень! — і яны схаваліся ў ценю вялізнага дуба, што стаяў крыху наводдаль ад паляны, дзе тоўпіліся месцічы.

— Вось што, Зыль, — звярнуўся да яго Бігі-Казытун і працягнуў маленькую шклянку, — выпі гэта перад пачаткам сходу.

Урэшце, сход пачаўся. Звычайна яго праводзіў Бігі-Казытун-Калючая-Барада, як самы старэйшы ды ўсімі паважаны: яму належала выбраць з месцічаў дванаццаць асобаў, якія павінны будуць прызнаць праўду аднаго з бакоў ды вызначыць пакаранне таму, хто яго заслугоўвае.

Бігі-Казытун падышоў да Вялікага Камяня, заклікаў усіх сцішыцца і абвесціў: «Сход пачынаю!» Потым выклікаў Зыля-Чаруй-Голас і Рэма-Шэрага, пасадзіў аднаго праваруч, другога — леваруч, і запытаўся: «Ці ёсць у бакоў нейкія заўвагі наконт правядзення сённяшняга сходу?» Выявілася, што Рэм-Шэры мае што сказаць:

— Пратэстую супраць старшынства Бігі-Казытуна-Калючай-Барады на гэтым сходзе!

Народ здзіўлена загудзеў: ніколі яшчэ ніхто не выступаў супраць Бігі-Казытуна-Калючай-Барады, усе ведалі яго сумленнасць у такіх справах. Але Рэм-Шэры працягнуў:

— Не сакрэт, што Бігі-Казытун — стары сябра Зыля-Чаруй-Голас, дык ці зможа ён аб'ектыўна весці сход?

Галасы ў натоўпе падзяліліся і ўжо гатовая была пачацца сварка, але Бігі-Казытун прызнаў рацыю Рэма-Шэрага ды склаў з сябе абавязкі старшыні сходу. Вызначылі новага старшыню — Лема-Старога, абралі дванаццаць паважаных гаспадароў яму ў дапамогу. Кожны з дванаццаці абраных мусіў выпіць вадзіцы з крыніцы, што мела быць гарантыяй, што яны будуць судзіць па праўдзе. Кожны, хто браў слова на сходзе, мусіў зрабіць тое самае.

Пачалі слухаць бакі. Зыль-Чаруй-Голас распавёў, што здарылася, і выказаў свае падазрэнні адносна Рэма-Шэрага.

— Я прашу Рэма-Шэрага прызнаць сваю віну і патлумачыць перад усім народам, што за зелле было ў пляшцы, пасля якога я ледзь Богу душу не аддаў. А вас, паважаныя старшыні, прашу вызначыць Рэму справядлівае пакаранне, — закончыў свой выступ Зыль-Чаруй-Голас.

Наступны казаў Рэм-Шэры:

— Шаноўныя старшыні! Паважаны народзе! — і ён шчыра і шырока ўсміхнуўся, — Я не ведаю, адкуль Зыль узяў у галаву, што я хацеў яго атруціць. Гэта праўда, што Зыль учыніў бойку ў Сіма-Шынкара-Сына і пабіў годных людзей, якіх я маю гонар прымаць у сябе. Так, я ездзіў да суседа, каб запатрабаваць ад яго прабачэння, але не тады, калі Зыль гаворыць, а на дзень пазней. Паколькі я не застаў гаспадара дома, то вярнуўся дахаты. Не ведаю, чым так упіўся Зыль, што ледзь не сканаў. Але ў чым мая віна перад ім?

Алесік і Галінка ў адзін голас выдыхнулі:

— Ён жа хлусіць!

— Так, хлусіць, — пацвердзіў дзядуля Казытун, — Толькі пра тое ведаем мы, а для старшыняў сходу — слова Зыля супраць слова Рэма-Шэрага. Патрэбны доказы, таму пачакаем, што сведкі скажуць.

— І праўда! — узрадваўся Алесік, — Зыль распавядаў, што ў шынку было шмат людзей. Яны пацвердзяць, што Рэм гаворыць няпраўду!

— І Брыль-Садоўнік павінен быў бачыць, як Рэм-Шэры да Зыля прыязджаў, — падтрымала Алесіка Галінка. — Але не баіцца, што вадзіца яго высушыць!

— Гэта і мяне здзіўляе, — прамовіў Бігі-Казытун-Калючая-Барада.

**Шаноўны Дружа, цяжка апавядаць пра тое, што адбылося далей, але я мушу казаць табе праўду, якой бы горкай яна не была.**

Усе, на каго так спадзяваліся Алесік і Галінка, сведчылі, што нічога не памятаюць і таму не могуць пацвердзіць словаў Зыля-Чаруй-Голас. Старшыні сышліся для абмеркавання: палова верыла Зылю, другая палова — Рэму-Шэраму. Але паколькі сведкі нічога ўцямнага не сказалі, то і прызнаць віну Рэма-Шэрага без доказаў адмовіліся, што і было абвешчана перад сходам.

Народ пачаў разыходзіцца. Зыль быў збянтэжаны і выглядаў як пабіты сабака: гэта ж людзі зараз будуць думаць, што слова Зыля пустое, што ён здольны толькі нагаворваць на людзей бы пустабрэх які!

Тым часам Бігі-Казытун-Калючая-Барада зусім не быў разгублены. Пакуль Алесік і Галінка-Гаючая-Слязінка суцяшалі Зыля-Чаруй-Голас, ён ху-

www.kamunikat.org

ценька набраў з крынічкі вады ў шклянку і паспяшаўся дахаты. Некалькі дзён ён практычна не выходзіў з аднаго з патаемных пакояў. Нарэшце выйшаў, ці то нервова, ці то задаволена мармычучы пад нос: «Так я і думаў, так я і думаў...», і разам з Алесікам і Галінкай накіраваўся ў Сіняе Вока да Зыля-Чаруй-Голас.

**Бігі-Казытун-Калючая-Барада тлумачыць, што адбылося на сходзе.**

— Як вы ўжо напэўна здагадаліся, — звярнуўся Бігі-Казытун да сваіх сяброў, калі ўсе расселіся за сталом у прасторным пакоі сядзібы «Сіняе Вока», — крынічная вада была атручана. Нядобрае я адчуў, калі Галінка паказала нам расколіну на камяні, таму даў Зылю свой напой, які засцярог яго ад атручанай вадзіцы.

— Але ж яе піў і Рэм-Шэры, — заўважыў Зыль.

— Паколькі я чакаў нядобрага, то ўважліва сачыў за ўсім, што адбываецца. Магу вас запэўніць, што Рэм-Шэры не піў крынічную ваду, а незаўважна выліў яе за спіну. Але вы не запыталіся ў мяне: чым была атручана крынічка? Гэта было няпроста, але я выявіў, што гэта была забывай-вадзіца, адзін з прадуктаў Фабрыкі Забыцця. Хутчэй за ўсё, памагатыя Рэма-Шэрага ўночы перад сходам атруцілі крыніцу. А зараз мы павінны высветліць у Брыля-Садоўніка наколькі моцна дзейнічае забывай-вадзіца.

Зыль паклікаў Брыля-Садоўніка і нядоўгія роспыты выявілі, што той не памятае ні падзей на сходзе, ні хто яго бацькі, ні адкуль ён паходзіць, ні — нават — уласнага імя! Адзінае, што ён памятаў — гэта тое, што ён садоўнік і мусіць ісці абразаць дрэвы.

— Дзейнічае яна мацней, чым я меркаваў, — пахітаў галавой Бігі-Казытун-Калючая-Барада. — Вось, давай яму па глытку кожны дзень, пакуль ён не апамятаецца. Ох, і нарабіў зла Рэм-Шэры!

**Нечакана ў дзверы нехта пагрукаў і праз хвіліну ў хату ўвайшлі Лем-Малады і Сім-Шынкара-Сын.**

— Добры дзень у хату! — прывітаўся Лем.

— Добры! Праходзьце, сядайце. З чым прыйшлі: так ці па справе? — запытаўся Зыль.

— Хутчэй па справе, — адказаў Лем-Малады і, паклаўшы руку на плячо Сіма, прымусіў таго сесці, — Пачну з пачатку...

— Ага, лепей з пачатку, чым з канца, — пакпіў нязлосна Зыль.

— Дык вось, шаноўнае спадарства, пачаў я заўважаць, што з бацькам маім нешта нядобрае творыцца: што ні дзень, то ўсё больш чужы становіцца, ні мяне, ні брата не пазнае. Я супаставіў адно з адным, і выйшла, што пасля сходу пачаў ён памяць губляць. Учора зайшоў я ў шынок і, як убачыў Сіма-Шынкара-Сына, то і ўзгадаў, што ён таксама ж на сходзе выступаў. Я яму пра бацьку распавядаю ды пытаюся, ці з ім, Сімам, усё добра і як ён сябе адчувае... і бачу — вочкі яго так і бегаюць, так і бегаюць! І позірку майго пазбягаюць... — голас Лема набыў грозныя ноткі.



Сім відавочна адчуваў сябе няёмка і ўвесь час спрабаваў адсунуцца ад Лема, але той паклаў яму на плячо сваю лапішчу і прагрымеў:

— Сядзець, дробная твая душонка! Расказвай, як прадаўся Крукам за трыццаць срэбнікаў!

— Але што ж я меў зрабіць? Яны ж пагражалі і... — няскладна прамармытаў Сім-Шынкара-Сын.

— Ведалі да каго ішлі, хто душу сваю і радзіму за марныя грошы прадасць! — не сунімаўся Лем.

— Але што ён зрабіў? Патлумач, нарэшце! — спыніў спрэчкі Бігі-Казытун-Калючая-Барада.

— Крукі заплацілі яму, каб ён атруціў ваду ў крыніцы! — з абурэннем прамовіў Лем-Малады.

— Гэта праўда? — звярнуўся да Сіма Бігі-Казытун.

— Яны пагражалі, што заб'юць мяне, што выклююць вочы і пусцяць у свет з торбай... Што мне было рабіць?

— А грошы ад Крукоў браў?

— Ну, як жа-ж, грошы ў гаспадарцы не зашкодзяць... Ведаеце, як шмат расходаў патрабуе шынок: келіхі пастаянна разбіваюць... посуд... бойкі ўчыняюць... а грошы за пашкоджаную маёмасць ніхто не вяртае... так, я вам скажу, ніхто не вяртае...

— Досыць! — не вытрымаў яго ныцця Лем. — Дык ты людзей добрых атруціць вырашыў? Агідна слухаць... Цьху!

— Што з ім рабіць? — запытаўся Зыль-Чаруй-Голас.

— А што са смеццем робяць?.. — і Лем схапіў быў Сіма за каўнер, але Бігі-Казытун спыніў яго:

— Мы цябе, Сім, адпускаем пакуль, але ты ўважліва слухай, што Крукі паміж сабой гавораць. Як нешта важнае пачуеш, так адразу каму-небудзь з нас і перадай. Зразумеў? А цяпер ідзі адсюль!

Калі дзверы за спінай Сіма-Шынкара-Сына зачыніліся, Зыль-Чаруй-Голас прамовіў:

— Нешта Крукі занадта актыўную дзейнасць развялі. Не падабаецца мне гэта!

— Так, так, — падтрымаў яго Бігі-Казытун і пачаў разважаць, — навязваюць хаўрусы мясцовым, падкупляюць іх грашыма, ледзь не забілі Зыля, атруцілі з дапамогай шынкара крыніцу... Гэта толькі тое, што мы ведаем... а з іх, як з гусі вада, ніякага пакарання.

www.kamunikat.org

— Хм, ці не хіліце вы да таго, што яны землі нашыя рыхтуюцца захапіць? — спытаў уражаны Лем.

— Мо і зарана такія высновы рабіць, але каб не запозна было, — прамовіў Бігі-Казытун.

— Але што можна зрабіць?

— Мяркую, перш за ўсё, трэба праверыць азёры і рэчкі, ці не атруцілі іх Крукі забывай-вадзіцай.

— Навошта ім гэта рабіць? — спытаў Алесік, які ўвесь гэты час, як і Галінка, сядзеў ціха, але ўважліва сачыў за размовай.

— А таму, Алесік, — сумна патлумачыў Зыль-Чаруй-Голас, — што чалавек, які не памятае, хто ён і адкуль, не будзе бараніць сваю зямлю.

**Галінка-Гаючая-Слязінка склікае сваіх сяброў на дапамогу.**

Лёгка сказаць: праверыць усе рэчкі, азёры ды вадаёмы! А іх у Блакітных Люстрах больш за дзве тысячы, ледзь не ў кожнай сядзібе меласа сваё азярко, рэчка ці вадаём, а яшчэ ў Нязнаным Лесе таксама варта было праверыць. Гэта ж працы на цэлы год хопіць, а час падціскае. Тады Галінка-Гаючая-Слязінка вызвалася дапамагчы.

Мой шаноўны Дружа, гэтая маленькая дзяўчынка ведала мову звяроў, любіла з імі размаўляць і дапамагала, калі нехта з лясных сяброў хварэў ці быў паранены. Ратавала вожыкаў, выцягваючы іх з ракі. Як ты ведаеш — вожыкі дрэнна плаваюць. Трымала пры ганку для калючых сяброў і вужыкаў талерачку малака. Дапамагала вавёркам збіраць арэшкі, прыглядвала за маленькімі трусікамі, калі іх маці шукала ежу. За ўсё гэта лясныя звяры таксама любілі Галінку-Гаючую-Слязінку і рады былі ёй дапамагчы.

Таму яна выйшла на паляну і паклікала сваіх сяброў такім няхітрым вершыкам:

Гэй, мае сябры!
Ваўкі і барсукі,
Рудыя сяброўкі —
Спрытныя вавёркі,
Хітрыя сястрыцы —
Куніцы і лісіцы,
Шэранькія трусікі,
Вожыкі і вужыкі —
Усе сябры лясныя
Хутчэй сюды бяжыце:
Маленькая Галінка-
Гаючая-Слязінка
На дапамогу кліча!



Толькі яна паспела вершык свой вымавіць, як да яе з усіх бакоў пачалі звяры лясныя сыходзіцца. І вось ужо яны сцяной абкружылі Галінку, Алесіка, Зыля і дзядулю Казытуна. Галінка распавяла, што ад іх патрабуецца, потым кожнаму былі раздадзеныя маленькія шкляначкі і звяркі разбегліся.

Да вечара Бігі-Казытун-Калючая-Барада, дзякуючы лясному народу, меў спробы вады з усіх азёраў, рэчак, вадаёмаў і крыніцаў Блакітных Люстраў і Нязнанага Лесу.

**Сябры шукаюць рашэнне ў цяжкай сітуацыі.**

Наступныя некалькі дзён усе напружана працавалі, але вынікі выявіліся жахлівыя: усе азёры, рэчкі, вадаёмы і крыніцы ў Блакітных Люстрах памагатыя Чорнага Гругана атруцілі забывай-вадзіцай. Адзіная палёгка, што не дабраліся пакуль да Нязнанага Лесу.

— Ну, дружа Казытуне-Калючая-Барада, што ж нам рабіць? Як нам Крукоў паганых прагнаць, калі нават на ўласны народ разлічваць не выпадае? — горка запытаўся Зыль-Чаруй-Голас.

— Сітуацыя цяжкая, але адчай — не лепшы адказ на твае пытанні, — з дакорам адказаў Бігі-Казытун. — Па-першае, я праверыў калодзежную ваду — і яна аказалася чыстай.

— Значыць, мы можам разлічваць на гаспадароў сядзібаў, якія бяруць ваду з калодзежаў! — узрадваўся Алесік.

— Так, можам. Адзінае, што такія сядзібы і дзясятай часткі не складуць ад усіх сядзібаў Блакітных Люстраў, — астудзіў яго радасць Зыль.

— Жыхары Нязнанага Лесу безумоўна дапамогуць, — зусім не збянтэжыўся песімізмам Зыля Бігі-Казытун.

— Ты ж ведаеш, мала хто жыве ў Нязнаным Лесе, — прамовіў Зыль, і ўсе на некаторы час змоўклі.

— Дзядуля, а па-другое? — парушыла маўчанне Галінка-Гаючая-Слязінка.

— А па-другое — хадземце са мной, — ажывіўся Бігі-Казытун і паманіў сваіх сяброў.

Яны спусціліся па вузкай лесвіцы ў сутарэнні дома, застаўленыя разнастайнымі прадметамі: вялікімі і малымі бочкамі, драўлянымі цэбрамі і кухлямі, шклянкамі і плецёнымі кошыкамі, вязанкамі сухіх грыбоў і траў, куфрамі, ботамі, граблямі, мётламі, і іншымі разнастайнымі прыладамі. Сярод усяго гэтага скарбу дзядуля Казытун вывудзіў нейкі маленькі ключык, прыклаў яго да незаўважнай адтуліны ў сцяне і — перад сябрамі адкрылася дзверка ў адзін з патаемных пакояў.

Гэта была даволі вялікая бібліятэка, застаўленая акуратнымі паліцамі з кнігамі з назвамі на разнастайных мовах. Адны кнігі былі сціплыя, іншыя

www.kamunikat.org

— багата аздобленыя скурай і выкладзеныя каштоўнымі камянямі. Асобна стаялі стэлажы з пергаментамі і надпісамі на бяросце, да якіх Бігі-Казытун адразу забараніў дакранацца. Алесіка агаломшыла ўсё гэтае багацце:

— Дзядуля Казытун, вы прачыталі ўсе гэтыя кнігі? — чамусьці шэптам запытаўся ён.

— Не ўсе, канешне, — усміхнуўся задаволены зробленым уражаннем Бігі-Казытун, — але з большасцю знаёмы.

Ён пацягнуўся, дастаў вялізную кнігу і паклаў на нізенькі драўляны столік.

— «Старыя абярэгі даўніх часоў на зямлі адзінай Нязнанага Лесу, Блакітных Люстраў і Багністай Твані», — прачытаў услых назву кнігі Алесік. Гэта было зусім няпроста, паколькі літары былі так прыдумліва выведзеныя, што ўспрымаліся як арнамент, а зусім не назва кнігі. А некаторыя сцерліся за даўнасцю і амаль не праглядаліся. Выглядала яна прыкладна так:

Бігі-Казытун-Калючая-Барада адкрыў яе недзе пасярэдзіне, тыцнуў пальцам і сказаў:




— Ну, Алесік, прачытай нам, што тут напісана.

І Алесік прачытаў наступны тэкст:


Апоўдні пры Вялікім Камяні,
Калі прымусіш загучаць тры галасы:
Адзін з іх медны, потым – срэбны й трэці – залаты,
на тры бакі хай разляцішца гук –
і праз імгненне бы з агню сцяна
паўстане вакол земляў і
Душа Зямлі Тваёй прачнецца,
каб ворагаў прагнаць у сэрца
Святарным Мечам Гневу.

— І што гэта ўсё значыць: тры галасы на тры бакі, вогненая сцяна, Душа Зямлі Тваёй? — спытаўся Зыль-Чаруй-Голас.

— Ну, тры галасы — гэта жалейкі: медная, срэбная і залатая. Далей, тры асобы апоўдні мусяць стаць пры Вялікім Камяні: адна — тварам на Багністую Твань, другая — на Блакітныя Люстры і трэцяя — на Нязнаны Лес, і прадудзець кожны ў сваю жалейку.

— А якая жалейка ў які бок павінна дудзець? — спытала Галінка-Гаючая-Слязінка.

— Залатая — у бок Нязнанага Лесу, срэбная — Блакітных Люстраў, а медная — Багністай Твані, — упэўнена прамовіў Казытун-Калючая-Барада.

— Але, дружа, адкуль табе гэта вядома? — і Зыль яшчэ раз прабег вачыма тэкст, — У кнізе нічога не напісана, і дзе нам шукаць гэтыя жалейкі?



— Ведаю таму, што *залатая* жалейка захоўваецца ў мяне, — і Бігі-Казытун рассмяяўся, калі вочы яго сяброў акругліліся ад здзіўлення.

— А дзве іншыя? — нарэшце абудзіліся яны.

— *Медную* павінны захоўваць мой брат Буль-Вадзянік, уладар Багністай Твані, а *срэбная* ў нашай сястры — Уны-Прамяністыя-Косы, Каралевы Блакітных Люстраў.

— Ну добра, з першай часткай больш-менш зразумела, а што азначаюць апошнія пяць радкоў?

— Гэтага я вам ужо не змагу патлумачыць, бо і сам не ведаю. Але гэта наша адзіная надзея, — і Бігі-Казытун-Калючая-Барада закрыў кнігу, паставіў на палічку і скіраваўся да выхаду.

У зале іх чакалі ўстрывожаныя Лем-Малады з братам Лемам-Цесляром. Ад Сіма-Шынкара-Сына яны даведаліся, што

**Войскі Чорнага Сругана ідуць вайной,**

збіраючыся захапіць спачатку Блакітныя Люстры, а потым і ўсю краіну. Супраціву яны не чакаюць і мяркуюць лёгка і хутка захапіць землі, паколькі народ, атручаны забывай-вадзіцай, не будзе змагацца. Пасля гэтага няпрошаныя госці плануюць зладзіць цырымонію, на якой новым Уладаром Блакітных Люстраў абвесцяць Чорнага Сругана, а потым пачнуць рыхтавацца да нападу на Нязнаны Лес.

Стала зразумела, што дзейнічаць трэба ўдвая хутчэй. Зыль-Чаруй-Голас распавёў братам пра атручаныя рэчкі і азёры і пра адзіную магчымасць абараніць зямлю, аб якой расказаў Бігі-Казытун-Калючая-Барада. Вырашылі, што Лемы збяруць усіх, хто яшчэ не атруціўся забывай-вадзіцай і здольны змагацца, і дадуць адпор нападнікам. У гэты час Бігі-Казытун з Галінкай пойдуць да Буля-Вадзяніка па медную жалейку, а Зыль з Алесікам паімчацца да Уны, Каралевы Блакітных Люстраў, па срэбную. Апоўдзень, найпазней праз сем дзён, яны павінны будуць спаткацца пры Вялікім Камяні і мець усе тры жалейкі.

— Ты, Лем-Малады, і ты, Лем-Цясляр, — звярнуўся да братоў Бігі-Казытун-Калючая-Барада, — вам выпадае цяжкая задача: людзей, здольных змагацца, мала, але вы павінны пратрымацца сем дзён.

— Зробім усё, на што хопіць сілаў, — паважна адказаў Лем-Малады.

— Вазьміце майго Хуткага, — сказаў братам Бігі-Казытун, калі яны выйшлі на падворак, — вам ён зараз больш патрэбны. А Імклівага даю вам, Зыль і Алесік. Беражыце іх, бо яны — лепшыя: лётаюць нібы вецер!

Потым Казытун-Калючая-Барада даў Зылю залаты грабеньчык, каб перадаў сястры, інакш тая не аддасць жалейку, паказаў на мапе, дзе жыве Уна-Прамяністыя-Косы, і ўсе раз'ехаліся.

www.kamunikat.org

Зыль і Алесік хутка мінулі Нязнаны Лес і ўжо імчаліся па зямлі Блакітных Люстраў. Паўсюль, як кінуць вокам, рассцілаліся азёры і рэчкі, і сапраўды стваралася ўражанне, нібы навокал раскіданыя люстэркі. Часам яны хаваліся за густым кустоўем, дрэвамі і ўзгоркамі, але варта было мінуць узлесак ці падняцца на ўзвышша — і вочы зноў насычаліся шчодрым блакітам. Толькі чым далей на поўнач, да Бурштынавага возера, дзе жыла Уна-Прамяністыя-Косы, тым часцей гэтыя люстэркі адбівалі небяспечныя цені непажаданых гасцей. Праз нейкі час Зыль і Алесік мусілі адпусціць Імклівага дадому і прабірацца пешшу.

Яны ўжо былі каля Бурштынавага возера і шукалі ўваход у Бурштынавы горад, пра які ім казаў Бігі-Казытун-Калючая-Барада, калі нечакана натрапілі на Крукоў. Не доўга думаючы, Зыль выцягнуў меч і адсек аднаму галаву. Але іншыя былі больш увішнымі і завязалася бойка. Алесік як мог дапамагаў Зылю: кідаў Крукам у вочы пясок, падбіваў ім ногі камянямі — і ўрэшце Крукі былі пераможаныя.

— Хадзем адсюль хутчэй, пакуль іншыя Крукі не занепакоіліся адсутнасцю сяброў, — і Зыль з Алесікам пабеглі ўздоўж возера і раптам праваліліся пад зямлю.

— Зыль, ты тут? — спытаўся Алесік, бо было даволі цёмна.

— Так. Гэта, відаць, і ёсць ход у Бурштынавы горад. Пачакаем, пакуль вочы прывыкнуць да цемры, і хадзем.

Яны даволі доўга ішлі падземным ходам, калі нарэшце апынуліся на вуліцы, залітай святлом. Здагадацца, што

**Яны трапілі ў Бурштынавы горад**

было не цяжка: усе вуліцы, дамы, масты, ліхтары, лавы, карацей, усё было зроблена з бурштыну. Зыль запытаўся ў нейкага гандляра, дзе жыве Уна, Каралева Блакітных Люстраў.

— Гэта зусім блізка, — адказаў той, — направа за тым домам з срэбным акунём убачыце яе палац.

Праз некалькі хвілінаў Зыль-Чаруй-Голас і Алесік размаўлялі з ахоўнікамі-шчупакамі, каб тыя паведамілі Каралеве, што яны прыйшлі ад яе брата Бігі-Казытуна-Калючай-Барады з пільнай справай. «Якія ж яны аднолькавыя» — падумаў Алесік, але прыгледзеўся ўважлівей, і пакуль яны з Зылем чакалі, каб іх прапусцілі, паспеў налічыць восем адрозненняў. Магчыма, ты знойдзеш больш.

Яшчэ праз некалькі хвілін служка-акунь праводзіў іх у палац, дзе да іх выйшла Уна, Каралева Блакітных Люстраў. Яна была асляпляльна прыгожая, з доўгімі шыкоўнымі залацістымі валасамі, а на галаве мела карону з бурштыну.





— Вітаю вас, — і Уна-Прамяністыя-Косы ветліва ўсміхнулася, — сябры майго брата — заўсёды жаданыя госці ў гэтым доме.

Затым яна запрасіла Зыля-Чаруй-Голас і Алесіка на абед, што было вельмі дарэчы, бо яны даўно ўжо прагаладаліся. Яна пасадзіла іх за стол, такі даўжэзны, што з аднаго і з другога яго боку змяшчалася больш за сто асобаў. Абед цягнуўся невыносна доўга, змене блюдаў, здавалася не будзе канца. Але ўсё калісьці канчаецца, вось і бясконцы абед скончыўся. Тады Уна праводзіла сяброў у свае каралеўскія пакоі і распытала, з якой нагоды яны прыехалі. Зыль патлумачыў, і Уна загадала прынесці куфэрак. Прыплыла рыба-поўня, Каралева торгнула яе за плыўнік, і тая выплюнула ключык.

— Шаноўныя, мой брат нічога мне не перадаваў? — звярнулася яна да Зыля і Алесіка.

— Як жа, перадаваў, — і Зыль сунуў руку ў кішэнь, але там грабеньчыка не было. Ён пачаў абшукваць усе свае кішэні, але марна.

— Алесік, можа я табе яго даваў? — але Алесік пахітаў галавой, што не, не даваў яму Зыль грабеньчыка.

— Прабачце, але я не магу аддаць срэбную жалейку без грабеньчыка, — прамовіла Уна-Прамяністыя-Косы, і куфэрак з рыбай-поўняй умомант зніклі. — Запрашаю вас застацца на баль. Сёння а дзявятай гадзіне ўвечары ў аметыставай зале.

www.kamunikat.org

Мабыць, грабеньчык выпаў, калі Зыль і Алесік біліся з Крукамі. Але дзе ж яго цяпер шукаць? Яны вырашылі знайсці куфэрак з срэбнай жалейкай і паспрабаваць выкрасці.

*Мой шаноўны Сябра, ты, канешне, ведаеш, што красці нядобра, але ж ты таксама ведаеш, што Бігі-Казытун-Калючая-Барада даваў Зылю грабеньчык. Акрамя таго, сітуацыя вымагала, каб срэбная жалейка загучала пры Вялікім Камяні разам з залатой і меднай.*

Сябры вырашылі раздзяліцца: Зыль пайшоў шукаць куфэрак, а Алесік рыбу-поўню з ключыкам. Алесік хадзіў з пакоя ў пакой, пільна абглядваў, але рыбы-поўні не было. У некаторых купкамі ці парамі перамаўляліся госці, хіталі галовамі, нягучна пасмейваліся, і не звярталі ўвагі на заклапочанага маленькага хлопчыка. Алесік стаміўся і прысеў на лаву. Ён сумна глядзеў у акно і з роспаччу думаў, што яму не знайсці рыбу-поўню, калі раптам заўважыў яе ў парку: тая запальвала святочныя ліхтары перад балем. Алесік куляй выскачыў з палаца і, незаўважна падкраўшыся да рыбы-поўні, схапіў яе за плыўнік. Але рыба вымкнулася з рук. І ўсякі раз, як Алесік спрабаваў яе ўхапіць, рыба выслізгвала. Ёй відавочна падабалася гэтая гульня: калі Алесік адставаў, яна вярталася і круцілася перад яго носам, нібы здзекавалася.

За гэтым заняткам Алесіка і знайшоў Зыль-Чаруй-Голас. Ён выведаў, дзе знаходзіцца куфэрак, заставалася дастаць ключ. Паколькі Алесік канчаткова стаміўся, лавіць рыбу-поўню пачаў Зыль, зрэшты, з тым самым поспехам. Раптам загучала музыка — і рыба знікла.

**Пачынаўся баль.**

Госці парамі праходзілі ў аметыставую залу, кланяліся Каралеве і адыходзілі, даючы месца іншым. У Алесіка разбягаліся вочы ад мноства прысмакаў, ён хацеў паспрабаваць усяго па трошку. Пасля двух порцый марожанага, фісташкавага і трускаўкавага, пасля памаранчавага і ананаснага соку, шакаладных цукерак і цянучак, трох піроржных і кавалачка торціка жывот проста лопаўся. Маленькая сімпатычная русалачка запрасіла яго на танец. Алесіку яна вельмі спадабалася, але па-першае, ён не ўмеў таньчыць, і па-другое, аб'еўшыся, рухацца было вельмі цяжка. Ён з жалем адмовіўся, чым заўважна пакрыўдзіў русалачку. Сярод усяго гэтага шумнага балю, можна было лёгка забыцца, з якой мэтай ты сюды прыйшоў.

Калі госці ўжо сталі крыху стамляцца ад танцаў, і ўсё што можна, было паспытана, Зыль папрасіў дазвол праспяваць песню. Уна-Прамяністыя-Косы з радасцю пагадзілася.

Спачатку некаторыя з гасцей яшчэ перамаўляліся, але паступова ўсе сцішыліся, зачараваныя голасам Зыля. Я не буду распавядаць Табе, Шаноўны Дружа, пра што спяваў Зыль-Чаруй-Голас. Тое не магчыма раскавесці словамі, але кожны, хто меў гарачае неабыякавае сэрца, не мог стрымаць слёз. І Уна, Каралева-Блакітных-Люстраў, была глыбока ўзрушаная. Яе вочы блішчэлі ад слёз, але яна не саромелася іх. Калі Зыль закончыў спяваць, яшчэ доўга ніхто не мог перарваць цішыню. Нарэшце Уна прамовіла:

— Дзякуй, Зыль-Чаруй-Голас, за тваю песню, што будзіць душы, — яна зрабіла знак і ўнеслі куфэрак, а рыба-поўня выплюнула ключык, — я аддаю вам срэбную жалейку. Не хачу, каб той край, пра які ты спяваеш, захапіў Чорны Груган.

**Вось так, здавалася б з безвыходнай сітуацыі знайшлося выйсце.**

Заставалася два дні і паспець дадому ў такі кароткі час было б нерэальна, але Уна пазычыла ім сваю рыбу-птушку, якая лётала гэтак жа хутка, як коні-амарфіны Бігі-Казытуна. Таму вырашылі па дарозе завярнуць у горад даведацца аб навінах, і адтуль ужо ляцець да Вялікага Камяня.

Яны прызямліліся недалёка ад горада, і пайшлі пешшу, рыба-птушка ляцела побач. Усё больш на вуліцах трапляліся Крукі. Жыхары горада праходзілі рэдка, апусціўшы галаву, яны стараліся як найхутчэй схавацца ў якім-небудзь доме. Зыль і Алесік спусцелымі вулкамі дабраліся да шынка Сіма. Той не на жарт перапужаўся, калі ўбачыў іх.

— Жыхарам Блакітных Люстраў забараняецца сюды хадзіць, — прашаптаў ён і хуценька ўпіхнуў сяброў у нейкі пакойчык, — загад Чорнага گругана.

— З якога часу я павінен слухацца нейкага чужынца? — раз'юшыўся Зыль. — Кажы, што тут адбываецца.

— Хіба не ведаеце? — здзівіўся Сім-Шынкар. — Учора пры Рыбіным Воку быў разбіты апошні атрад Лема-Маладога. Схапілі яго, і брата ягонага, і іншых. Заўтра перад каранацыяй Чорнага Гругана збіраюцца іх забіць.

— Вось як... — сумеўся Зыль і, падумаўшы, дадаў, — то я ў цябе сёння пераначую, Сім. Каб нікому ні слова — зразумеў?

— Ну што ты, канешне, канешне... Што я вораг сабе? Ды калі Крукі даведаюцца, што я размаўляю з табой...

Тут у дзверы пачалі грукацца Крукі, відаць, заўважылі Зыля і Алесіка. Зыль зрабіў Сіму знак, каб той што-небудзь сказаў:

— Зараз выйду, — і Сім праціснуўся ў дзверы і адразу прычыніў іх, — што трэба, шаноўныя?

— Каго гэта ты хаваеш там?

— Нікога... Вам падалося... — няўпэўнена прамовіў Сім.

— Але ж мы бачылі, што ты кагосьці правёў у гэтую камору. Ці не мяцеж-

www.kamunikat.org

нікаў, а Сім? Ведаеш, што бывае з тымі, хто хавае мяцежнікаў? — і Крук адпіхнуў шынкара і адкрыў дзверы, але адразу напароўся на меч Зыля-Чаруй-Голас і зваліўся мёртвы. Зыль зачыніў дзверы, перш чым другі Крук змог прасунуць нагу, і хуценька прашаптаў Алесіку:

— Я іх затрымаю, а ты хутчэй выбірайся адсюль і ляці да Вялікага Каменя, — з гэтымі словамі Зыль павесіў Алесіку на шыю срэбную жалейку. І вельмі ў час, бо Крукі выламалі дзверы. Усчалася бойка. Алесік кінуўся на падлогу, прапоўз пад нагамі аднаго з Крукоў, падняўся і кінуўся бегчы. Рыба-птушка чакала каля шынка, і як толькі Алесік ускачыў на яе, умомант узляцела ў неба. Некалькі Крукоў кінуліся наўздагон — яны ж таксама лётаюць. Нясоладка прыйшлося б Алесіку, але рыба-птушка была сапраўдным майстрам — удала адарваўшыся ад пагоні, яна панеслася ў бок Нязнанага Лесу.

Апоўдні Алесік быў пры Вялікім Камяні. Бігі-Казытун-Калючая-Барада і Галінка-Гаючая-Слязінка ўжо чакалі яго. Алесік памахаў ім рукой, у якой трымаў срэбную жалейку. Яны не сталі пытацца, дзе Зыль, — часу заставалася мала. Дзядуля Казытун загадаў Галінцы ўзяць медную жалейку і стаць тварам да Багністай Твані, а Алесіку з срэбнай — тварам да Блакітных Люстраў. Сам з залатой жалейкай стаў у бок Нязнанага Лесу — і роўна апоўдні яны задудзелі ў жалейкі...

**Тым часам**

Зыль здолеў адбіцца ад Крукоў і ўцячы. Ноч ён правёў у лесе, а раніцай, набыўшы ў нейкай краме плашч, пашыбаваў на пляц. Дзесяць вісельняў чакалі нескароных герояў, якія арганізавалі атрады з жыхароў Блакітных Люстраў, каб бараніць сваю зямлю ад Чорнага Крука. Іншых палонных Крукі збіраліся адправіць у Краіну-Чорнага-Ругана для працы на Фабрыках Забыцця. Вакол тоўпіўся народ, і Зыль патроху, але працісنуўся наперад.

Загучалі барабаны, людзі змоўклі, назіраючы за тым, як кат падводзіў падсудных да вісельняў. Круковы зачытаў прысуд, і кат пачаў накідваць на шыю першаму з дзесяці вяроўку. І раптам зваліўся мёртвы, працяты наскрозь стралой. Зыль прасачыў накірунак, адкуль прыляцела страла і заўважыў Лема-Цесляра. Асуджаныя тым часам кінуліся ў натоўп людзей, тыя пачалі разбягацца. Крукі бязладна стралялі, але хутка зарганізаваліся і ачапілі пляц. Зыль амаль паспеў вырвацца з ачаплення, але заўважыў Лема-Старога, які, схіліўшыся, сядзеў на зямлі ля мёртвага сына. Зыль вярнуўся, сілай адарваў старога, падхапіў яго і завалок унутр нейкага дому. Яны ледзь паспелі схавацца ў якімсьці пакоі, калі па калідоры міма іх прабеглі Крукі з вайсковых.

Так яны з Лемам-Старым і праседзелі пад носам Крукоў да самых прыцемак, а потым пачалі выбірацца ў бок лесу. Зыль збіраўся ісці на паўночны ўсход, дзе знаходзіўся падземны ход, той самы, што вёў у сад Бігі-Казытуна. Гэта было разумна яшчэ і таму, што на поўдзень ісці было небяспечна. Чорны Груган вельмі раззлаваўся, што каранацыя была сарваная, і Крукі сноўдалі па Блакітных Люстрах у пошуках мяцежнікаў. Усе дарогі на поўдзень і захад кантраляваліся.

**Бігі-Казытун, Алесік і Галінка разгублена сядзелі пры Вялікім Камяні.**

Пасля таго, як прагучалі тры жалейкі, нібы вогнены шчыт паўстаў вакол Багністай Твані і Нязнанага Лесу, але — *не вакол Блакітных Люстраў*.

— Не разумею, — прамармытаў Бігі-Казытун, — я ўпэўнены, што правільна растлумачыў старажытны заклён.

— А вы бачылі вершнікаў? Яны праімчаліся ў бок Блакітных Люстраў, а потым расталі нібы... — спытаўся Алесік, але ні Бігі-Казытун-Калючая-Барада, ні Галінка не бачылі прывідаў-вершнікаў: яны ж глядзелі зусім у іншыя бакі.

— Алесік, Галінка, дайце-ка мне жалейкі, — і Бігі-Казытун расклаў перад імі на траве тры жалейкі, — Бачыце?

— Так, срэбная адрозніваецца ад залатой і меднай, — прамовілі яны здзіўлена.

— Таму заклён і спрацаваў толькі напалову, — прамовіў дзядуля Казытун.

— Значыць Зыль, і браты Лемы, і іншыя не змогуць да нас вярнуцца? — сумна спытала Галінка.

— І Блакітныя Люстры належаць цяпер Чорнаму Тругану і Крукам...

Гэта быў чорны дзень у гісторыі адзінай краіны Нязнанага Лесу, Блакітных Люстраў і Багністай Твані.

Цяжка пра гэта казаць, мой шаноўны Дружа, а тым больш заканчваць гэтымі сумнымі падзеямі свой расповед. Але ж мы дамовіліся, што я буду распавядаць толькі праўду пра Краіну-Назву-Якой-Ніхто-НЕ-Памятае. У суцяшэнне магу сказаць толькі вядомае: прайграць бойку — не значыць прайграць вайну.

**Прайшоў час і аднойчы**

ў садзе Бігі-Казытуна-Калючай-Барады з'явіліся Зыль-Чаруй-Голас з Лемам-Старым, Лемам-Маладым і яшчэ чатырма адважнымі сынамі Блакітных Люстраў, чым выклікалі слёзы радасці на вачах сваіх сяброў, якія ўжо і не спадзяваліся ўбачыць іх жывымі. З гэтай нагоды ўсімі жыхарамі Нязнанага Лесу і Багністай Твані было наладжана вялікае свята, з'едзены дзясяткі яблычных пірагоў і гара кіўбасаў, выпіта маленькае возера крамбамбулі, раскладзена шмат вогнішчаў, бо акурат выпала свята Купалля.



www.kamunikat.org



# Леанід Дайнека

паэт, празаік. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Івана Мележа і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Кастуся Каліноўскага. Аўтар кніг: «Галасы», «Бераг чакання», «Бацькава крыніца», «Футбол на замініраваным полі», «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды», «Чалавек з брыльянтавым сэрцам» і інш. Нарадзіўся ў 1940 годзе ў вёсцы Змітраўка 2-я ў Клічаўскім раёне на Магілёўшчыне. Жыве ў Мінску.

# Герадоцінкі — 10, або Арытмія

## Нацмены

Што такое «нацмен»? Нацыянальная меншасць? Не. Нацмен — гэта Нацыянальны Мужчына, Нацыянальны Мужык, Мужык з Вялікай Літары. Нацмены рухаюць Гісторыю!

Я п'ю за вас, за шлях нязменны,
За вечнасць нашае Айчыны,
За тое п'ю, што вы — Нацмены,
Нацыянальныя Мужчыны!

***

«Божа, дай мне сілы вытрымаць усё тое, што я не ў сілах змяніць».
Святы Францыск.

***

Хоць крычыш, хоць енчыш ты як злегчаны,
Траціш і даляры, і рублі,
Усё роўна наша мова — лепшая!
Светлы дух жыве ў ёй, Дух Зямлі.

***

«У мяне няма часу на стомленасць».
Германскі кайзер Вільгельм Першы, на 92 — ім ( ! ) годзе жыцця.

***

Грыміць музыка.
Уладарыць музыка.
Там, за музыкай,
За лесам музыкі,

www.kamunikat.org

Ёсць поле цішыні.
Там расце сіні васілёк —
Вока мёртвага вікінга
Пазірае з цёмнай зямлі .

## Шкілет

Хто б не быў ты — бандыт, паэт,
Ты — турма. (Бог такую даў ролю!).
У табе сядзіць твой шкілет.
І аднойчы ён выйдзе на волю.

***

Не здолеў з'ездзіць, як быў малады.
Не меў ні грошай, ні волі.
Прабачце, краіны і гарады,
Ў якіх я не буду ніколі.

***

Той горад гняздом пацучыным будзе.
Яму непатрэбны ні Кант, ні Вальтэр.
Жывуць мітусліва-маленькія людзі
У цесных каробачках шэрых кватэр.

***

Чым арол беларускі розніцца ад арла расейскага? У расейскага на адных плячах дзве галавы. У беларускага ж галава адна, але ў роце ў гэтай галавы два языкі!

***

«Калі чалавек слімак , ён будзе пісаць пра слімакоў нават тады, калі ўяўляе, што нібыта ён піша пра жаўранкаў».

Олдас Хакслі, англійскі раманіст.



***

Калі сонца даўно не ў зеніце
І паўзе да магілы дарога,
Супакойцеся, не грызіце,
Не гарпуньце адно аднога.

## Косава поле. 14 чэрвеня 1389 г.

А на Косавым на полі
Сербанулі сербы ліха,
Атрымалі злую рану.
Злеглі хлопцы, як таполі,
Пад турэцкім ятаганам,
Хоць забілі пса-султана,
Сербскі строй ушчэнт стаптаны.

А на Косавым на полі
Жорны смерці ўсіх змалолі.
Хто руку згубіў, хто вока.
А на Косавым на полі
Вые вецер лютым воўкам.

Той, хто ўпаў, не ўстане болей.
Курчыцца душа ад болю.
А на Косавым на полі
Мы, сябры, згубілі волю.

Едзе турак. Смажце курак,
Каб аддаць яму з паклонам.
Для яго дачок кладзіце
На шырокі дол зялёны.

Над ракою плачуць вербы.
Сербанулі ліха сербы.

## Зіма на Кіпры, або Гэта не зіма

А як снегу няма —
Гэта не зіма.

www.kamunikat.org

А як лёду няма
Гэта не зіма.

Як марозу няма —
Гэта не зіма.
Як гарэлкі няма —
Гэта не зіма.

Дык чаму ж тады мы
Жывем без зімы?

А таму, што я змог
Тут купіць дамок.

І на Кіпры зімы
Больш не бачым мы.

Я з далёкіх краёў
Прылячу дамоў.

Вы засуньце мяне
Галавой у снег.

Бо як снегу няма —
Гэта не зіма!

## Лясны мініверш, або Тры Ў

Запоўз
Пад лоўж
Смоўж...

## Загадкі

Гляджу ў столь.
Пішу «ў стол».

Магу крывавы зладзіць вам пір.
Я — кухар. Я — ...

Па заснежаных палях
На кані імчыцца ...

Бог у сэрцы! Свечак хараство!
Зноў да хрысціян прыйшло...

Грозны Цэзар на чужы ступіў парог
Прыйшоў. Убачыў. ...

Калі грыбы вядомыя,
Тады яны...

Мяне з валуноў збудавалі, не з дрэва.
Я — замак славуты славутага...

Будзем смяяцца! У кубкі ліць віны!
Мы — Дзеці Пагоні! Мы — ...

## Паэтам

Цікава — ці будзеце вы ў звышнатхнёным палёце
Спяваць аб каханні, як майскі салоўка-саліст,
Калі захістаюцца зубы ў роце,
І волас апошні зляціць з галавы, нібы восеньскі ліст?

Вы скажаце: «Так!» Вы прыпомніце Цютчава, Фета,
Грахоўскага, Танка ўстрывожыце велічны цень.
Вы скажаце: «Так!» Пакуль тчэцца жыцця эстафета.
Пакуль памірае ў баі за сяброўку прыгожы гарачы алень .

О, як я люблю вас, крылатае светлае племя!
Наіўныя дзеці, нязломныя рыцары, што не адступяць назад.
Не трэба вам славы, ні царскае ласкі, ні прэмій,
А толькі — кубак віна ды жаночы іскрысты пагляд!

Збірайцеся ў круг, песняры, менестрэлі, ваганты!
Ударце па струнах! Няхай яны ўспыхнуць агнём!
Рассыпіцца шкло нябёсаў. Божыя грымнуць куранты.
Па землях, эпохах і душах раскоціцца гром.

www.kamunikat.org

І цемра адступіць. І Нешта (не ведаю што ) настане.
І спусцяцца з зорак сёстры. Выйдуць з магілаў браты.
Мы будзем кахаць! Мы будзем спяваць аб Каханні!
І будзе свяціць замест сонца Божы Прастол Залаты!

## Слова да членаў Другога Саюза

Не дзяльбой, а сяўбой мы займацца б павінны.
Што патрэбна вам, цёцям крыклівым і дзядзям?
Абсякаюць карэнні. Аддзіраюць галіны.
Шум і гвалт стаіць у Купалаўскім Садзе.

Скрозь нясуцца папрокі, праклёны, пагрозы.
Дзе ні ступіш — сякеры грымяць адмыслова.
А з галінаў сцякаюць не росы, а слёзы.
Гэта плача маё беларускае Слова.

Пашкадуем жа нашых крылатых муз.
Даруем, забудзем крыўды-даўгі.
Мы — Першы Саюз.
Вы — Другі.

***

Гарыць агонь майго жыцця.
Імчыць вагон майго быцця.
Агонь і я. Агонь і я.
Ў якім лячу вагоне я?
Агонь і я.
Агонь і я.
Агонія.

***

Цяжкія часіны. Бясконцыя дні.
Распухла душа ад глухой цішыні.
Пяском паміж пальцаў імгненні цякуць.
Хоць слова б жывое аднекуль пачуць.



На вусны павесілі камень-замок.
Апушчана сэрца ў бяссонечны змрок.
Праносяцца дні, за звяном звяно.
Так падаюць костачкі даміно,
Калі іх, паставіўшы ланцужком,
Рукою кранеш.
Халаднее мой дом.
Радзей загараюцца ў доме агні.
Цяжкія часіны. Бясконцыя дні.

***

«Калі хочаш прачытаць Будучыню, вывучай Мінулае».
Канфуцый.

«Што не перамог Напалеон у бітвах, я перамагу ў раманах».
Анарэ Бальзак.

***

Літаратурнай творчасцю карміласе і корміцца вялікае мноства людзей. Празаікі, паэты, драматургі, крытыкі, гумарысты, бібліёфілы, дактары і кандыдаты навук, бібліятэкары, пісьменніцкія ўдовы, сябры і землякі творцаў, перакладчыкі, выдаўцы і г. д . «Несть им числа», — сказаў бы мудрэц, які таксама корміцца тым жа хлебам.

Заўсёды быў перакананы, што з гэтага агромністага войска хоць у празаікаў маецца больш-менш прыстойная адукаванасць і эрудыцыя. Усё-ткі, збіраючыся пісаць раман, трэба злёгку паднапружыць інтэлект...

... На міжнародную кніжную выставу-кірмаш завітала з Масквы ў Мінск Паліна Дашкава. Ейныя раманы ідуць нарасхоп. Расійская Агата Крысці, дый толькі! Сам я, каюся, іх не чытаў, бо не цікаўлюся творчасцю сучасных «дэтэктыўных» амазонак. Я б і не ўспомніў пра Паліну Дашкаву (дай ёй Бог атрымаць нобелеўку ў літаратуры!), калі б не яе інтэрв'ю. У тым эмацыянальным інтэрв'ю аўтар шматлікіх раманаў паведаміла, што Дашкава ейны псеўданім. Самае ж цікавае — наперадзе! На запытанне журналіста, чаму яна абрала такое выбітнае ў расійскай гісторыі прозвішча ў якасці псеўданіма, каранаваная шматлікімі прэміямі аўтарыса, не міргнуўшы вокам, сказала, што ўзяла псеўданім у гонар сваёй любімай дочачкі Дашкі, а пра існаванне сваёй славутай папярэдніцы Дашкавай яна не ведала (!!!). Аўтар шматлікіх, у тым ліку,

і гістарычных раманаў не ведала (!!!) пра паплечніцу і сяброўку імператрыцы Кацярыны Другой, кіраўніцу Расійскай Акадэміі Навук, пісьменніцу ( ! ), княгіню, рамантычна-містычную прыхільніцу французскіх філосафаў-энцыклапедыстаў Кацярыну Дашкаву ( ! ). Як кажуць: «Стоп! Далей цягнік не йдзе!».

Хто піша раманы? Хто іх чытае? Хто сачыняе на іх рэцэнзіі? Немагчыма адказаць. Можа, адказаў бы мікраскапічны жучок — папераед, але ён вельмі-вельмі заняты. У кніжнай шафе ён са смакам грызе чарговую старонку чарговага тоўстага рамана.

***

Хто мне скажа куды падзеўся «сацыялістычны рэалізм»? Знік, як туман, як мамант. Ні подыху, ні гуку... Толькі манбланы кніжак, якіх ніхто не чытае. Мяркуем, што рэалізм пабег следам за сацыялізмам.

Сёння некаторыя з творцаў зацугляли больш гарачага коніка — ударыліся ў «неацынізм». Гэта такі стан рэчаў, калі спаборнічаюць ці здолее адзін геній з вялікай адлегласці трапна плюнуць у левае вока другому генію. Чаму ў левае? Таму што правае вока ўжо заплявалі. Чытаць гэткія опусы — тое самае што з голым задам дзерціся ў зарасці вогненна-пякучай крапівы.

Пішуць людзі... Чытаюць людзі...

Мы, паверце, таксама ўмеем і можам ТАК пісаць, але не хочацца брудзіць паперу.

***

Нет ничего слюнявее и плюгавее
Русского безбожия и православия.
Сочинения Козьмы Пруткова.

***

«Толькі той, хто мысліць, свабодны і самастойны».
Людвіг Фейербах.

***

Знямог. Упаў. Ляжу каля дарогі.
Ліецца з сэрца горкіх слёз ручэй.
О, Маці Божая Нястомнай Дапамогі,
Прыдзі хутчэй!

Скарэў ад пылу плашч. Сандалі ў дзірках.
Пякучка-соль іскрыцца на спіне.
Драпежны звер з начнога лесу гыркаў,
Бег і кусаў мяне.

Усё сцярплю. Узняўшыся з каленяў,
О, Маці, да цябе пакрочу зноў.
Ты ўся саткана з сонечных праменняў.
Ты ўся — Любоў!

Гарыць святы агонь за небакраем.
У тым агні твая сляза дрыжыць.
На пласе вечнасці мы ўсе там паміраем,
Каб жыць.

***

Дзяўбуць нашага брата беларускага пісьменніка ўсе хто толькі дзюбу мае. І журналісты, і публіцысты, і дэпутаты. Яны дзяўбуць, а нам смешна. Дзяўбуць, а нам весела. Чаму? А таму, што наш рабочы інструмент — слова. А ў самай галоўнай кнізе, у Бібліі, запісана: «Спачатку было Слова». Усёк, румяны крытык наш? Слова было на самым-самым пачатку, а, значыць, і нашае пісьменніцкае рамяство. І што б ты пра нас ні крычаў, а мы былі і будзем (для народу будзем !) першымі. Бо наша прафесія з'явілася на тысячагоддзі раней чым, скажам, прафесія старшыні калгаса.

## Гімн апошняга дня

Дзень апошні...
Заржавелі цыліндры і поршні
Смяротнага цела,
Што знікаць не хацела,
А чаплялася за існаванне.
Надыходзіць кананне...

Бомбай выбухне сэрца!
Шкло вачэй разаб'ецца!



www.kamunikat.org

Усё меней святла.
Усё болей пакуты і цемры.
Там, у цемры,
Ні Нёмну не будзе, ні Тэмзы.
Ні сяброў там не будзе, ні дому.
Там цячэ Невядомасць.

## Дзень апошні...

Хай у садзе зялёным
Няўтомна спяваюць шпакі.
Хай у моры ільдзістым
Цюлені плывуць і нерпы.
Гэй! Гэй!
Забівайце ў сэрца цвікі!
На зыходзе быцця
Гэй! Гэй!
Мы адчуем жыцця
Боль нясцерпны.

## Лавачка Біла Клінтана

*Ва ўрочышчы Курапаты ўстаноўлена мармуровая лавачка, якую падараваў Беларусі Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.*

Не шанцуе лавачцы Клінтана Біла.
Нечая рука яе зноў разбіла.
Грукнуў па ёй чарговы малаток...
Нехта яе на сметнік завалок.

Ах, бедны-бедны містэр Біл,
Хіба ты не ведаў, дэмакратыю хвалячы,
Што на кожнага Біла знойдзецца дэбіл,
Які ненавідзіць Білаву лавачку?

Ты думаў (дзе табе дэбілаў зразумець?),
Што лавачкі ставяць, каб іх з месца не краталі,
Лавачкі ставяць, каб на іх сядзець.
Сядзець і думаць аб дэмакратыі.



Да нашых дэбілаў ты не дарос.
Дзе табе дужацца з імі?
Загартаваў іх сібірскі мароз,
Мазгі зрабіў ледзянымі.

Іхні вокліч любімы: «Рота , плі !!!».
Для іх ты не станеш босам.
Яны рыцары страху і мёрзлай саплі,
Што ўрачыста блішчыць пад носам.

***

У Францыі напрыканцы 18-га стагоддзя класічныя келіхі для віна вырабляліся адпаведна памерам і форме грудзей (цыцак) каралевы Марыі-Антуанеты. Цела каралевы з'яўлялася эталонам. А, няблага, пэўна, было смактаць чароўнае віно і ў салодкіх мроях уяўляць, як ты цешышся з прыгажуняю каралевай пад залатым балдахінам каралеўскай апачывальні. Думаецца, што і якабінцы любілі гэткі занятак. Але гэта не перашкодзіла ім кінуць Марыю-Антуанету на эшафот у 1793 годзе.

Звонка шчоўкнула гільяціна. Пакацілася прыгожая ганарлівая галоўка. Халодныя сухія вусны Максімільяна Рабесп'ера кранула ледзь прыкметная ўсмешка.

Перачытваю кніжкі, навуковыя і мастацкія, пра той грозна-велічны крывавы час, дыхаю навальнічным паветрам Вялікай Французскай Рэвалюцыі, а ў падсвядомасці, як дзікая лясная птушка, трывожна ўспырхвае радок: «Разбілі келіх чароўны...»

***

У газетнай праграме тэлеперадачаў чытаю назву перадачы — «Духовная война»...

Няўжо ў «Прощёное воскресенье» (5 сакавіка 2006 года), калі ў праваслаўнай краіне, якой быццам бы з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, патрэбна кожнаму і ўсім «прощать», даравац крыўды, на галоўным тэлеканале праваслаўны, калі верыць яму, публіцыст Азаронак зноў будзе жорстка і агрэсіўна весці перадачу «Духовная война», пляжыць сваіх уяўных ворагаў, утоптваць іх у бруд? Нейкі тэлевізійны крыжовы паход, дый толькі!

У апошні момант перадачу адмянілі. Усё-ткі знайшлася недзе «наверсе» светлая хрысціянская душа.

www.kamunikat.org

***

Аказваецца, Адольф Гітлер меў рост у 165 сантыметраў. Нічога не скажаш, нядужа высокі арыец. Ды й бландзінам ён не быў. Вось табе, бабуля, і вышэйшая раса.

***

Не думай пра шчасце, не думай пра гора.
Смяротныя мы пад праменнямі зор.
Сядзь ля агню. Раскажы як учора
Завея заходзіла з поля ў наш двор.
У пошумах ветру мы згубіліся
Праз ноч мы плылі, як праз вякі.
А ў наша вакно біліся-біліся
Срэбна-блакітнага снегу клубкі.

Мяцельны таран грыміць безупынку.
Руку тваю грэю ў сваёй руцэ.
Ты — сняжынка... Я — сняжынка...
Ляцім...
Растанем на Божай шчацэ.

***

Усё ва ўсім. Усё праходзіць. Але і ўсё вяртаецца.

Гэта — МАЯ ФІЛАСОФІЯ. Я выпрацаваў яе САМ на сваім няпростым жыццёвым шляху.

Быў я камуністам. Быў лібералам. Сёння я хрысціянін-каталік. Я прыйшоў да Езуса Хрыстуса і, мне здаецца, што я ўжо не баюся смерці...

## Песімістычнае

І ты памрэш... І я памру...
Мы новага жыцця зару
Не ўбачым, хоць хацелі ўбачыць.
Не будзе слёз і медных труб.
Над намі кнігаўкі заплачуць.

У небе зоркі, нібы сны.
Не зварухнецца сад начны.
І толькі там, дзе шэры змрок,
Трымціць на яблыньцы лісток.

Я гэту яблыньку садзіў.
Каля яе ўвесь дзень хадзіў.
Пад цёмнай кронаю пастой —
І ты пачуеш голас мой.

***

П'ю каву. Не чытаю прэсу.
Ад тэлевізара адвык.
Я выпаў з творчага працэсу,
Як са старога плоту цвік.

Ціхмяным стаў мой век шматбурны.
Аб вечнасці не сняцца сны.
Ляжаць пад лаваю катурны.
Больш не спатрэбяцца яны.

І толькі зрэдзь, у вечар цёмны,
Калі няма агнёў, людзей,
Прыходзіць верш, як боль фантомны,
Ды ўсё радзей, усё радзей...

***

Сакавік 2006 года. У чарговым супроцьстаянні беларускіх пісьменнікаў (акыны — рамантыкі) зноў перамагаюць акыны. Акыны спявалі дыферамбы савецкай уладзе, таварышу Сталіну, камуністычнай партыі... Рамантыкам «сніліся сны аб Беларусі». Сёння акыны прысягаюць цвёрдай кіраўнічай руцэ. Рамантыкам сніцца «еўрапейскі шлях».

Сам я, па духу, па інтэлекце, рамантык. Але, жывучы на гэтай нікому (акрамя Бога) непатрэбнай зямлі, дыхаючы яе суровым паветрам, спатыкаючыся аб яе найцвёрдыя камяні, я здымаю капялюш перад акынамі. Хоць яны, вядома ж, перш — наперш клапоцяцца пра сябе — свае выданні, кватэры, узнагароды, ганарары, але сваёй прысутнасцю на духоўна-па-



www.kamunikat.org

літычным полі Беларусі яны, акыны, зберагаюць ад знікнення наш святы, наш залаты скарб — беларускую мову.

## Чызікі

— Зноў чызікі па ўсім праспекце вісяць. Пэўна, нейкае свята чакаецца, — гаворыць мне мой знаёмы, прафесійны шафёр.

Не разумею яго. Ён смяецца:

— Адпаў ты ад жыцця, Марцінавіч. Чызікі — гэта беларускія сцягі. Чырвона-зялёныя. Шафярня ў нашым гаражы іх так ахрысціла.

***

Мы жывем у час расколаў... Раскалоўся Савецкі Саюз. Раскалоліся камуністычная партыя і БНФ. Раскалоўся (аж на тры часткі!) звонкагалосы ансамбль «Песняры». Раскалоўся й наш Саюз пісьменнікаў. Ударыла даўно прагназуемая маланка, і ад тоўстага дубовага камля адляцела ўбок тонкая абвугленая трэска. (На лістапад 2005 года, калі здарыўся раскол, сябрамі Першага Саюза было, па словах Алеся Пашкевіча, 582 чалавекі. У Другі Саюз перайшло — ці мо перабегла — 53. І паціху працягваюць збягаць...).

Вось такія падзеі. Рыба шукае, дзе глыбей, пісьменнік, дзе ганарарней. Ляжаў на градзе гарбуз, пераспеў, лопнуў, і з яго выпаў гарбузік. Быў творчы Саюз. Ад яго адкалоўся Саюзік.

Неба не рухнула на зямлю...

***

А той радзінны край,
Як хлебны каравай.
Пячэ душу зіма,
Калі яго няма.

Ён — сонцаносны храм.
Там бацькаў след. І там
Бялее дзьмухавец
Над рэчкай Мухавец.

***

Горкага лякарства вып'ю лыжачку,
І на сэрцы стане саладзей,
Вершы напішу і выдам кніжачку.
Можа й пачытае хто з людзей.

***

Пачытай мяне, пачытай.
Я пішу, а ніхто не чытае.
Пачакай мяне, пачакай,
Пакуль свеціць зара залатая.
Прыйдзе смерць. Змрок усё праглыне.
Ты не ўбачыш мяне...

***

Прабач і даруй, што не ён твой муж,
Хоць, як цень, за табою бегаў...
Пялёсткі белых прыгожых руж
Зрабіліся проста снегам.

## Кропля ліцвінскай крыві

Калі не спіцца табе
У цёмнай хаце тваёй,
Калі сцены шкрабе
Вецер халоднай рукой,

Устань. Ліхтар запалі.
Свой накіруй крок
Туды, дзе начныя палі
Глытае трывожны змрок.

Пад кронай дубовай сядзь
На белы шурпаты валун.

www.kamunikat.org

І ў сэрцы тваім загучаць
Тысячы звонкіх струн.

І ярка ўспыхне агонь.
І ў ноздры ўдарыць дым.
Чырвоны ўбачыцца конь.
І грозны вершнік на ім.

Ён крыкне: — Ідзі да нас,
Калі душою не спрах!
Усё тут наша! І — Князь,
І Воля, і Слова, і Сцяг!

Усё тут наша! Ідзі!
Ды зноў наплыве цішыня.
І толькі з-пад хмараў-ільдзін
Пачуецца тупат каня.

Зямля пасвятлее ўначы...
Вер! Усміхайся! Жыві!
Гэта ў табе крычыць
Кропля ліцвінскай крыві.

## Шляхціц

Спіну бізуном ён крывавіў хлопу.
Кахаў паненак. Баляваў штодня.
Калі ж асманы пайшлі на Еўропу,
Ускочыў на баявога каня.

І адбыліся ў жыцці перамены.
Не смакаваць больш паўнюткіх чар.
Яму ля сценаў места Вены
Дзіду ў сэрца ўсадзіў янычар.

Адкрыўся ў неба шлях незваротны.
У кветках зямля плыла, у расе.
І зразумеў ён, што ён — смяротны!
Ён смяротны!
Такі, як усе.



***

Што такое смерць?
Яе не трэба нам баяцца, людзі.
Проста — мы заснем,
А Бог усіх разбудзіць.

## Вайна

Баявымі калонамі —
З баявою песняй —
Пад крык аркестру —
Пад зорачкамі шрапнелі —
Раз — два! Раз — два! —
І ўсе — ў магілу!

***

Усе народы — нацыяналісты,
Як птушкі, свішчуць у сваім гняздзе.
Свой родны шлях, як Сонца шлях агністы,
Усіх людзей да Бога прывядзе.

***

Калі-нікалі, у хвіліну духоўнай слабасці, мільгане ў галаве здрадлівая думка — а, можа, дарэмна па маладым легкадумстве саскочыў я калісьці з рускамоўнага літаратурнага цягніка, саскочыў, каб нырнуць у беларускія лугавыя кветкі, каб дыхаць імі, жыць імі, растварыцца ў іхнім акіяне? Кветкі тыя скасіла бязлітасная вострая каса. Прахіндзеі туды смуроду напусцілі. Няма кветак. Ёсць голы, як дзедава лысіна, цвёрды, як цыганоў бубен, вытаптаны, выкачаны, заліты смярдзючай саляраю інтэрнацыянальны луг.

І ўсё-ткі — не, недарэмна! Я там, дзе жыве беларускае слова. Літаратура Марыніных, Дашкавых, Акуніных і мясцовых нашых іхніх перапявалаў — не мае. Не звініць душа ад такой літаратуры. Не звініць.

www.kamunikat.org

## Веча

— Чуў, Рыгор? За крамай, у канаве пад вярбой, веча збіраецца.
— Што-што?
— Веча. Вячэраць мужчыны будуць. Скінуліся на « чарніла». Ляксей Валадкевіч сала абяцаў прынесці. Павел Кушнер каўбасся прывалачэ. Цягні сырыя яечкі, а я хлеб з соллю дастаўлю.
Праз тры гадзіны ў канаве пад вярбой...
— Я — князь! Я — саўгасны брыгадзір, значыць, я — князь! А ты, палявод, зашмаргні рот!
— Ты — дзярмо на кіёчку! Які ты брыгадзір? Які ты князь? Паглядзі на сябе ў лужыну.
— Я — князь! Зараз сюды прымчыцца мая дружына, і я разганю ваша веча!
— На дохлай курыцы дружына прыедзе. Ха-ха-ха! Не смяшы людзей. Паўзі спаць.
— Я — князь! Вы, баяры, мяне гоніце, і я іду ад вас.
— Ідзі — ідзі! Ты нам патрэбен, як сабаку пятая нага.
— Я — князь!
І гэтак — да самай ночы. А наўкол росна, цёмна, сумна... Убіраецца ў сілу дваццаць першае стагоддзе.

## І смех, і грэх, або Каляндар нашага жыцця

На дварэ дажджыць і дажджыць... 11 красавіка 2006 года Зіна, я і Рокі зрабілі спробу «прарвацца на дачу». Але на слізкай мяккай дарозе метраў за сто ад дачнага пасёлка забуксавалі. Выцягвала «Тэхдапамога». Аб дзверцы яе кабіны Зіна моцна параніла вялікі палец левай рукі. Вярнуліся ў Мінск. Зіна паехала ў лечкамісію. Ёй наклалі на зламаны палец «гіпс». Вось такая атрымалася «паездка на дачу».
Дажджыць... Дажджлівае надвор'е... Дажджлівае жыццё...

***

У сакавіку 415 года ў горадзе Кесарыёне (каля Александрыі Егіпецкай) забілі прыхільніцу «элінізму», выкладчыцу матэматыкі і філасофіі, вельмі прыгожую жанчыну Іпацію. Схапілі на вуліцы за валасы, за рукі — ногі, прывалаклі па гарачым пяску ў цэнтр горада, замардавалі, садралі скуру вострымі марскімі ракаўкамі і на лобным месцы спалілі труп . «Элліністамі» называлі ў той пераломны час язычнікаў, людзей, якія захавалі вернасць Зеўсу і Платону, Арыстоцелю і Апалону, беламармуровай велічы старадаўніх храмаў і святой таямнічасці мудрых папірусавых скруткаў...
Забойцамі былі хрысціянскія манахі і паравалáны. Хто такія паравалáны? З літаратуры вынікае, што гэта — служкі пры царкоўных шпіталях і прытулках, сённяшнія, так мовіць, медбраты. Вось гэтыя «медбраты» і адправілі на той свет «сястру». (Прабачце за суровы гумар.).
Пэўна ж, тужлівай смяротна сполоханай чайкаю віўся над горадам роспачны жаночы крык, трашчалі тонкія костачкі, а манахі з паравалáнамі білі — білі — білі... Не будзь такой разумнай! Не памятай тое, што непатрэбна! У — у — у хх!!! У — у — ухх!!!
Не ведаю чаму, але, пішучы пра далёкую Іпацію, я ўспамінаю нашу Іпатаву. Дзе ты зараз, Вольга Міхайлаўна? Што з табою? Якія «паравалáны» рвуць тваю тонкую чуллівую душу? Ты й славутая пісьменніца, ты й былая наша пісьменніцкая начальніца і прыгажуня, якіх пашукаць. Усе мы, мэнынацмены, здымалі і здымаем перад табой капялюш.
Адкладзі ўбок свае пісьмёны, сястра, прыслухайся... Ці не грымяць за вакном цяжкія няўмольныя крокі «духоўных» паравалáнаў?

***

Мой добры свет, няўжо ты знік,
Склаў залатыя крылы?
Няўжо злавесны чараўнік
Забраў твой воблік мілы?

Там цёплы вецер біў у скронь.
Гуў акіян калосся.
Там смех звінеў. Гарэў агонь.
Святло ў душу лілося.

Там шляхціц у крывавы год
Клаў галаву на плаху.
Там (кажуць кнігі!) жыў народ,
Які не ведаў страху.



www.kamunikat.org

## Кот Байкот

Ах , які няўдалы год!
Не было гадоў цяжэй.
Аб'явіў наш кот байкот —
Перастаў лавіць мышэй.

Бай нам, кот,
Пра байкот.

На мышэй я не палюю.
Ім партрэты я малюю.
Тры даляры за партрэт.
І — гуд бай, ад'ю, прывет!

Бай, кот,
Пра байкот.

Я мышэй лавіць не буду.
«Віскас» я сабе здабуду.
На мышэй я не хаджу.
Тэлевізар я гляджу.

Бай, кот,
Пра байкот .

Я разумны. Я вучоны.
Сябрам Партыі Зялёных
Стаў. Ці ж можа гэткі Кот
Забіваць жывых істот?

Бай, кот,
Пра байкот.

Я вучыўся ў школе слыннай.
Не кацінай, а мышынай.
Мышак я люблю вясёлых.
Я — дырэктар іхняй школы!

Бай, кот,
Пра байкот.

Я — мудрэйшы кот на свеце.
Але трэба спаць вам, дзеці.
Закрывайце вочкі, рот.
Аб'яўляйце мне байкот.

## Крык на лузе

(З украінскага гумару)

... — Гэй, малы!
Скажы малому —
Хай малы
Малому скажа —
Хай малы
Каня прывяжа.

## Акуратны каратыст

Надта ж чыстая рука
І нага, што таньчыць твіст.
Ў вока б'е без сіняка
Каратыст-акуратыст.

## Вольны пераклад з расійскай мовы

«Не скрою, есть еще семейки,
Где с умилением глядят
На заграничные наклейки,
А сало русское едят».

Сяргей Міхалкоў

Ёсць — ёсць у нас яшчэ Эзопы,
Што утварылі антыеўрапейскі фронт —
З усіх экранаў дзень і ноч дзяўбуць Еўропу,
А дома робяць у сябе ЕЎРАРАМОНТ.



www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

***

У дзюбы сваіх паляўнічых дзідаў і стрэлаў абарыгены трапічнай Афрыкі ўкладваюць жывых куслівых насякомых — пчол, восаў, чмялёў, шэршняў... Прымхлівыя абарыгены ўпэўнены, што такім чынам рэзка ўзмацняецца сіла і эфектыўнасць удару.

Не хацелася б, каб у мяркуемым саюзе з Расіяй нашай Беларусі адвялі ролю гэткага «баявога» насякомага. І ў сувязі з гэтым:

Глянь на карту, сівы ветэран,
І ты ўспомніш баі і акопы.
Беларусь — расійскі таран,
Што ўпіваецца ў цела Еўропы.

Божа, што нам з Еўропай дзяліць?
Мы не хочам таранам быць!
Божа, дай, каб не грукаў гром,
Каб не выў смяротны фугас.
Увядзі ў Еўрапейскі Дом
І зрабі еўрапейцамі нас!

## Парадаксізмы

- Праспект Незалежнасці ад Скарыны.
- Нас з Еўрасаюзам 466 мільёнаў!
- На сценах рукамыйнікі,
  На сцэнах рускамоўнікі...
- «Дзеяслоў» не для аслоў.

## Няўмольныя

Гісторыю робяць моцныя людзі. Як лазерны прамень, як таран, яны б'юць і б'юць у адным накірунку, не адхіляючыся ні на ёту ад пастаўленай планкі прыцэлу. Яны не ведаюць, што такое слёзы. Іхнія слёзы высахлі яшчэ ў дзяцінстве, чужыя ж слёзы для іх марская салёная вада.

Візантыйскі імператар Юстыніян Другі і кароль Іспаніі Пілiп Другі... Жылі ў розныя эпохі. Дыхалі розным паветрам, але родняцца між сабою цвёрдай няўмольнасцю.

У верасні 685 года пасля смерці імператара Канстанціна ўлада ў Візантыі перайшла да ягонага 16-гадовага сына Юстыніяна. Яму, нецярпліваму, заўсёды хацелася быць толькі першым, але ён (заўсёды!) быў толькі другім. Ён быў кволым ценем вялікага Юстыніяна, што цвёрда кіраваў калясніцай імперыі з 527 па 565 год, адваяваў Паўночную Афрыку ў вандалаў, Італію ў остготаў, жорстка падавіў паўстанне «Ніка» ў Канстанцінопалі ў 532 годзе, сабраў і кадыфікаваў законы рымскага права, фактычна аднавіў Рымскую імперыю.

Парадокс імператарскага і проста чалавечага жыцця Юстыніяна Другога ў тым, што нічога ў яго не атрымлівалася. За што б ён ні браўся, прычым, браўся з аглядкаю на Юстыніяна Вялікага, з жаданнем зрабіць добрае сваёй дзяржаве і свайму народу, усё выходзіла наадварот. Нейкі злы геній кружыўся над ягонай галавою, сляпіў гарачую душу. Ён пасварыўся з рымскім папам, са сваім чынавенствам і саноўнікамі. Крыкуны на іпадроме дружна зневажалі яго. І тады Юстыніян ухапіўся за адзіную, як яму здавалася, саломінку, што павінна была ўзняць ягоны аўтарытэт — за Жорсткасць. Ён (ягоныя каты!) «тушыў» людзям вочы, гэта значыць, вырываў іх з вачніц, адразаў насы, адсякаў рукі і ногі, кастрыраваў... Візантыя залілася крывёю. Вакханалія скончылася палацавым пераваротам. У ліку ахвяраў Юстыніяна быў славуты водца войскаў Лявонцій. Тры гады гніў ён у турме, ды раптам яму далі карабель, войска і загадалі неадкладна плыць у Эладу, каб падавіць там мяцеж. Дзіўны загад! Свайму ворагу ўклалі ў руку меч. Лявонцій, вядома ж, паплыў, але паплыў абсалютна не ў тым накірунку — ён высадзіўся ў Канстанцінопалі, на чале раз'юшаных народных натоўпаў увайшоў у сталіцу. На плошчах і вуліцах грымеў кліч: «Ды будуць нізрынуты косткі Юстыніяна!» Імператара скінулі з трона. З гэтага дня ён зрабіўся Юстыніянам Рынатметам, г. зн. «З абрэзаным носам». Лявонцій пашкадаваў яго, не забіў, але саслаў у Херсанес Таўрыцкі — так у тыя часы называўся паўвостраў Крым. (Во! Некалі Крым быў Магаданам!).

Абарыгеннае насельніцтва Крыма было пярэстае — грэкі, хазары, готы... Усе яны прызнавалі пратэктарат Візантыі, але імперскіх гарнізонаў у гарадах не было. (У звязку з гэтым, мне прыпамінаюцца словы маскоўскага мэра Юрыя Лужкова: «Крым — русская земля! Севастополь — русский город!». Паважаны Юрый Міхайлавіч, я, беларускі белетрыст, аб'яўляю Крым грэцкай і (увага — ахтунг) нямецкай ( ! ) зямлёю, бо яшчэ ў 3 — 4 стагоддзях н. э. на сонечным паўвостраве жыло германскае племя остготаў. Пра Русь тады ніхто наогул не чуў, і погаласу пра яе не было ( ! ).

Закінуты воляй зменлівага лёсу на самую айкумену тагачаснай цывілізацыі, Юстыніян жыў з адзіна-адзінаю мэтай — вярнуцца ў Канстанцінопаль, адпомсціць! Дзеля гэтага трэба было хітраваць, прыкідвацца прасцячком, блазнам жаніцца на дочцы мясцовага хазарскага хана-тудуна,

размаўляць на мясцовых мовах, есці ў гасцях у тубыльцаў напаўсырую каніну... Усё гэта ён рабіў з вялікім стараннем, можна сказаць, з любоўю. І дамогся свайго.

Тым часам на Палатыі ў Канстанцінопалі ўжо ўладарыў Апсімар, які скінуў Лявонція, адрэзаў яму нос і зачыніў у турме. Гэты Апсімар (па паходжанні гот) звярнуўся да хазарскага хана з патрабаваннем выдаць альбо Юстыніяна, альбо мёртвую Юстыніянаву галаву. Хан паслаў у гоцкі горад Дорас (горны Крым), дзе знаходзіўся Юстыніян, свайго вернага слугу Панацыя з загадам схапіць экскесара. Але ў час абеду Юстыніян уласнаручна ( ! ) задушыў няўдаліцу-слугу і з купкаю сваіх аднамыснікаў паімчаўся на конях да мора, дзе ўжо чакаў рыбацкі човен. На гэтай хісткай шкарлупіне яны аддаліся хвалям, паплылі ўздоўж берага на захад, туды, дзе нязгасна і неадступна ззяла зорка Канстанцінопаля. «Хутчэй! Хутчэй!» — шаптаў Юстыніян...

І вось ударыў начны шторм! Нібы расчыніліся дзверы пекла. Які вар'ят даў гэтаму шалёнаму мору імя Понт Эўксінскі — Гасціннае Мора. Яно раўло, грымела, кіпела, кідала на човен вострыя цяжкія клыкі хваляў... У хвіліну найвышэйшага жаху, калі здавалася, што вось-вось іх паглыне Аід, мярзотны сын Кронаса і Рэі, адзін са спадарожнікаў Юстыніяна Міакій ускліекнуў: «Нам пагражае смерць, уладар! Дай зарок Богу за сваё выратаванне, скажы, што калі Бог верне ў твае рукі тваё царства, ты не будзеш помсціць нікому са сваіх ворагаў!».

І ў адказ прагучалі словы, дзеля якіх, у сутнасці, я й прапанаваў вам, шаноўныя, гэты аповед. Гледзячы на раз'юшаныя мора і неба (а гэта быў адзіны дзікі клубок), Юстыніян горача выдыхнуў: «Калі я пашкадую хоць каго-небудзь з іх, няхай Бог мяне зараз жа ўтопіць!»

Яны ацалелі. Вецер прыбіў іх да балгарскага берага. Там Юстыніян заключыў дамову з балгарскім ханам, паабяцаўшы ледзь не палову імперыі, калі той дапаможа вярнуць трон. З балгарскім войскам, на конях і на вярблюдах ( ! ), падступілі да сценаў рамейскай сталіцы. Ейныя жыхары зверху крычалі зняважлівыя словы, пляваліся, лілі мачу... Уначы Юстыніян са жменькай смельчакоў пралез у горад па вадасцёчнай трубе. У трубе дзіка выў вецер, цякла на твары чорная смярдзючая вада.

Ён захапіў палац, ён захапіў увесь Канстанцінопаль. І адразу ракою шуганула кроў, пачаліся масавыя пакаранні. За дзесяць гадоў ссылкі, за знявагі, за абрэзаны нос Юстыніян помсціў жорстка і вытанчана, з садысцкай насалодаю. Ён знішчыў тысячы ( ! ) пашанотных візантыйскіх сем'яў, прычым, высякаўся ўвесь род да самага маленькага карэньчыка — дзяды, бацькі, дзеці, унукі-праўнукі ... Гэта быў вадаспад крыві . Людзям выколвалі вочы, людзей кастрыравалі , як жывёл... Вядома ж, урэшце рэшт, галава самога Юстыніяна таксама, быццам пераспелы кавун, скацілася з плячэй.



Яшчэ адзін наш «герой» — кароль Іспаніі Піліп Другі. З дынастыі Габсбургаў. Сядзеў на іспанскім троне з 1556 па 1598 г.г. Улюбёнай дочкай ягонай душы была ... інквізіцыя. Любіў кароль пах (прабачце) падсмажаных на інквізітарскіх вогнішчах чалавекаў. Адзін, бачыце любіць труфелі, другі — бульбу з селядцом, а гэты...

Пры Піліпе Другім інквізіцыя рабіла ўсё, што ёй уздумаецца. «Інквізітары — пісаў сучаснік, — былі ў становішчы рыбалова, які, закінуўшы невад, з вялікай цяжкасцю можа цягнуць яго, бо той ірвецца ад цяжару рыбы, што ў яго патрапіла».

Асабліва святочным і напышлівым было аўтадафе (прынароднае спаленне ерэтыкоў) у Вальядалідзе 8 кастрычніка 1559 года. На плошчы перад саборам Святога Францыска была ўзведзена платформа, высцеленая дыванамі і яркімі арнаментамі, на якой сядзелі члены судзілішча. Насупраць яе на каралеўскім балконе сядзеў Піліп Другі з інфантам донам Карласам і прынцэсай Хуанай, з грандамі каралеўства і замежнымі пасламі. Пасярэдзіне чакаў ахвяраў велізарны эшафот.

Вялікі інквізітар Фернанда Вальдэс пачаў прыводзіць караля да прысягі.

— Ваша вялікасць, — грамавым голасам сказаў ён, — ці клянецеся вы крыжам шпагі, на які абапіраецца ваша каралеўская рука, вечна падтрымліваць інквізіцыю супраць ерэтыкоў, адступнікаў і іхніх абаронцаў?

— Клянуся, — гучна прамовіў кароль.

Пачалася лютая кара. Той, хто згадзіўся прыняць споведзь, былі задушаны, а потым спалены. Толькі двое ўпарціліся да самага канца — не захацелі спавядацца перад смерцю. Іх чакаў агонь. Ідучы на эшафот, дон Карлас дэ Саса, фларэнтыйскі шляхціц-пратэстант, спыніўся насупраць каралеўскага балкона і аслабелым ад шматдзённых катаванняў голасам спытаў у караля:

— Навошта ты мучыш сваіх падданых?

— Калі б мой сын, — адказаў Піліп, — быў ерэтык, я сам бы расклаў вогнішча, каб спаліць яго.

***

...Палавы акт. Мужчына вывяргае з сябе 500 мільёнаў ( ! ) сперматазоідаў. Жаночая плоць сустракае гэты ўсёсакрушальны Везувій толькі адной — адзінай ( ! ) яйкаклеткай. І ўспыхвае новае Жыццё! Тое, што праз дзевяць месяцаў станецца чалавекам, з якога вырасце двухмятровы баскетбаліст, або крохкая пяшчотная балерына, мае памеры ігольнага вушка.

І пасля гэтага нейкі дзікун гундосіць, што Бога няма.

www.kamunikat.org



# ВЕРАСЕНЬ ПЕРАКЛАДЫ

славе георгі дзімоскі

www.kamunikat.org



# Славе Георгі Дзімоскі

македонскі паэт. Аўтар кніг паэзіі: «Гравюры» , «Праект», «Апошнія рукапісы», «Пабочны шлях», «Рэчы і аргументы» і інш. Нарадзіўся ў 1959 годзе ў вёсцы Велестава. Жыве ў Охрыдзе.

## Крыніца

У грудзях маіх плюскоча
Срэбны голас,
Выцякае
Крыкам
З апрыклай вязніцы.
Погляд сіні,
Нявінны,
Зямлю наталяе.

Упартая вада,
Як вярнуць цябе небакраю?!

## Цяжар

Поўня просіцца
Стаць пярсцёнкам...

Я прывязваю каня да плота.

Зацягваю пас,
Папраўляю меч.

Пазнаю сябе
У шкляной вадзе

І ў ваўчынай крыві
На снезе.

## Чорны конь ляжыць на гары

Чорны конь ляжыць
На гары.
Чорны конь, чорная грыва,
Чорная падземная вада,
Нястомны Сцікс.

www.kamunikat.org

Я
Праходжу пад канём,
Змрочны і звар'яцелы
Да глухаты,
Адбіваючыся
Ад воўчай зграі.
Што згубіў я тут?
Што шукаю?
Дыхаць робіцца ўсё цяжэй,
Да мяне падбіраецца
Зверху
Агромністая чарапаха.
На гары ляжыць чорны конь.
Яго ногі ў цясніне, дзе
Чорная падземная вада,
Нястомны Сцікс.
І адвечная ціша. Прадзіраюся
Па камянях, парослых мохам.
( Якое ж страшнае
Такое узнясенне!)
Што згубіў я тут? Што згубіў? —
Пытаюся ў каня.
А ён, чорны, ляжыць
На гары.

## Камень. Медытацыя

Ты кажаш: ёсць Бог —
І дастаеш яго з паліцы.

Гэта камень. Чорны.
Ты прынёс яго з гор.

Гэта бездакорна гладкі
Камень. Камень-Бог.

Ён выпраменьвае святло.
У ім — Хаос і Парадак, —

Кажаш ты. Дух і Выратаванне.
Добры Дух. Гэты камень —

Сапраўдны Бог. Ён сядзіць
На нябёсным троне.

Парадак — празрыста сіні.
Хаос — белы. Усё —

Ірэальна. Нічога не
Змяняецца. Усё — ёсць Бог.

Камень!

## Зноў зіма

Жыццё мінае — зноў зіма.
Снежная вокладка кнігі,
Загорнутая на вачах,

Бялее.

Праз імгненне яна старэе:
Бярэцца трэшчынкамі
На марозе.

Жыццё мінае: востры ўздых,
Нібы сняжынка параніла
Сэрца.

А завея

Скалелыя пальцы
Пад пахамі грэе.

www.kamunikat.org

## Смутак

Ноччу ў зялёных нетрах
Азяблага саду
На пару з ветрам,
Зачараваны,
Я заліваўся салаўём для князёўны,
Што жыве ў залатым палацы.
Князёўна ж выглядвала ў вакно,
Яе лашчылі вецер і дождж.
Дождж — касы, як татарскі нож,
Трапляў ёй ва ўлонне і
Прарастаў звонку
Атавай.

## Рамантыка

Заход.

Чаму? Ну чаму
Ў ім схавана смерць.

Сон
У цёмным сутонні
Этэру.

Дзе рыпяць
Па-зладзейску дзверы,
За якімі начуе
Цемра.

Сон плыве
Па люстраной гладзі Сусвету,
Ператвараючы нашы душы
У кроплі дажджу,
Якія з неба падаюць на зямлю

На заходзе.



## Цесная сувязь

Падае снег, засыпае Охрыд і Маскву,
Засыпае Ерусалім і Вавілон.
Мой пакой плыве па Еўфрату,
Мае чобаты — па Дунаю. Падаюць белыя люстэркі

І засыпаюць Александрыю, засыпаюць
Нью-Йорк. Маё цела плыве па Гангу.
Галава — па Нілу. Падаюць белыя
Яскі, заўжды белыя.
І засыпаюць каня святога Георгія.
Каўказ дамаўляецца з Богам...

У гэты момант сыходзіць Белы Анёл.
Кладзе ледзяныя далоні мне на вочы:
— Усё яшчэ бачыш сябе, — пытае.
Бачу: цела маё плыве па Гангу,
Чобаты — па Дунаю...

— Яшчэ бачыш? — пытае і ператварае мяне
У бяскрылага ругана. — Бачыш? —
І ператварае мяне ў ваўка, што
Вые на белую поўню ў скандынаўскіх снягах.
— Усё яшчэ бачыш?...

## Апошнія рукапісы

Зняверана ў сабе,
Уваходжу
У апошнія рукапісы,
Каб спазнаць ісціну.

Свет навокал мяне
Гусцее
І робіцца пылам.

www.kamunikat.org

Цішыня. Маё цела,
Нібы пустка сярод Этэру.

Незнаёмы голас
Прытаіўся на дне Сутоння.

Драпежныя словы
Наждаком
Раздзіраюць горла.

Нямогласць?

Я крычу.
І крык мой — усхліп святла.

І я ўпэўнены —
Гэта Я!

## Сон. Я гуляю ў карты…

Я гуляю ў карты
Са сваёю Смерцю!
Выйгрыш — смеху варты —
жыць або памерці…

За сукном зялёным —
Я, як сфінкс, спакойны.
Новая калода —
З вечнасцю абдоймы.

Раптам выпадкова —
Ў Смерці з рукава
Выпаў туз пікова…



## Родная мова

І ты ўскормлены
Матчыным малаком
Роднай мовы.

Ускормлены ж? Малаком,
Што льецца
У залатую амфару
І прыносіцца
Да стала.

Спадар пісьменнік (малады?),
Пакуль ты п’еш,

Толькі яна губляе моц
На ратным полі
Дзеля цябе. Уноч і ўдзень.
Удзень і ўноч.

**Пераклаў з македонскай мовы Эдуард Акулін**

www.kamunikat.org




# ВЕРАСЕНЬ

## КРЫТЫКА

## ПУБЛІЦЫСТЫКА

## ЭСЭ

раман дубашынскі святлана калядка
рыгор сітніца ася паплаўская
юнэля сальнікава алена гінак
алесь пашкевіч альдона мартыненка
леанід дранько-майсюк
уладзімір караткевіч вітаўт мартыненка
і інш

www.kamunikat.org



## Раман Дубашынскі

**крытык, літаратуразнаўца. Кандыдат філалагічных навук, навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Мінску. Жыве ў Мінску.**

# Вяртанне да *свайго*, або «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел»...

Аповесць Віктара Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» — адна з самых яркіх з'яў у сучаснай беларускай прозе. Яна адметная ў многіх адносінах: мае адмысловую кампазіцыю, пісьменнік удала выкарыстоўвае элементы фантасмагорыі і карнавалізацыі, на што ўжо звяртала ўвагу крытыка [Гл.: 1]. Прысутнічае тут і выразны прыпавесційны пачатак: пэўная абстрагаванасць сітуацый, сюжэтна-вобразная абагульненасць сведчыць пра наяўнасць іншасказальнай і сімвалічнай плыняў. Сімвалічнасць выяўляе сэнсава-змястоўную ёмістасць, шматпланавасць твора. І яшчэ адна ўласцівая жанру прыпавесці дэталь — філасафічнасць аўтарскага мыслення.

Але твор адметны яшчэ і запамінальнымі характарамі, па-майстэрску намаляванымі пісьменнікам. З адным з іх — Лазарам Кагановічам — мы і сустракаемся на пачатку аповесці.

Імя рэальнай гістарычнай асобы ў сюжэтным кантэксце аповеду напаўняецца іншасказальным зместам. На імя персанажа адразу ж звяртае ўвагу апавядальнік і заклікае чытача не блытаць гэтага Кагановіча, механізатара калгаса «Верны шлях» (вясковыя сябры якога, дарэчы, маюць куды больш гучныя імёны — Іосіф Сталін і Лаўрэнцій Берыя), з тым, «вялікім»:

«Лазар Кагановіч сядзеў на дубовай калодцы каля печы і думаў. Канешне, гэта быў не той, сапраўдны Лазар Майсеевіч Кагановіч[1], а зусім-зусім іншы.

<...>

Не ведае чалавек свайго імя. Пачынаецца ён з веры. Вы таксама не ведаеце, хто вы. Ваша імя гучыць вам з вуснаў іншых. Вы проста верыце ім і адгукаецеся» [2, с.5—6].

Фраза «Лазар Кагановіч сядзеў на дубовай калодцы каля печы і думаў» паўтараецца ў аповесці чатыры разы, і гэта невыпадкова. Націск у ёй пісьменнік ставіць на слове «думаў»[2]. У дачыненні да свайго героя В. Казько

---

[1] Лазар Майсеевіч Кагановіч (1893 – 1991) – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч.

[2] Тут можна правесці паралель з прыпавесцямі Б. Пятровіча і Я. Сіпакова – «Версіяй «А» і «Клеткай» адпаведна. Прыпавесць «Клетка» Я. Сіпакоў завяршае думкамі-разважамі ў філасофскім рэчышчы:

«Пакуты, пакуты... Вечныя пакуты... Жыве чалавек у пакутах і памірае з імі ж.

<...>

Калі ёсць пакуты, трэба, каб было і выйсце з іх.

www.kamunikat.org

заўважае, што «не разменьваўся ён ні якія філасофскія разважанні. Лазар Кагановіч быў практык і рабацяга і думаў толькі пра надзённае...» [2, с.7]. У іншым месцы пры чарговым паўторы апавядальнік адзначае, што Лазару неўласціва сядзець і думаць:

«Лазар Кагановіч сядзеў на дубовай калодцы каля печы і думаў. І гэта быў не яго занятак — сядзець і думаць. Седзячы думае толькі дурань і самы апошні гультай. Кагановіч быў прывычны думаць, калі ў яго руках сякера ці каса... Тады і думаць некалі і нечага. Рабіць трэба» [2, с.83].

Словы апавядальніка перамяжоўваюцца са словамі героя, перададзенымі праз няўласна-простую мову. Разважанні Лазара набіраюць ход, думка яго (як гэта ні парадаксальна гучыць) дасягае апагею:

«...Чалавеку трэба забараніць думаць... Думкі да дабра не даводзяць, скарачаюць чалавеку яго век. Вельмі ж шмат непатрэбства ўсякага ў тых думках. Выкрый іх, свет у тую ж мінуту перавярнуўся б...

...Думка людская — сабака шалёны. І на ланцуг яе не пасадзіш, не ўтрымаеш на ланцугу. Не ведае яна мяжы брыдоце сваёй. Усе вялікія войны і маленькія бойкі паміж людзьмі ад яе. Усё самае пачварнае на зямлі ад думкі...

Жахліва Лазару і журботна ад яго ж думак. І схавацца ад іх няма дзе. І сысці няма куды. Ён не хоча, не жадае, адмаўляецца думаць» [2, с.84].

Лазар, як, зрэшты, і кожны чалавек, нясе свой крыж. Сямейнае жыццё ў яго не склалася. Трагічны выпадак — смерць чужога дзіцяці — карэнным чынам паўплываў на яго лёс. Мець сваіх дзяцей ён катэгарычна адмовіўся, пра што проста сказаў ужо цяжарнай дзяўчыне Марэйцы, будучай, як планавалася, жонцы:

«— Сын будзе, Янко! — Ён здрыгануўся, успомніў Петрака.

— У нас не будзе дзіцяці, Марэйка. Не будзе ў нас сына.

— Як гэта не будзе? Куды ж ён дзенецца, калі ўжо ёсць?

— Не прыкідвайся дурной, не прыкідвайся Дзевай Марыяй...» [2, с.89].

У пэўнай ступені герой адмаўляецца прыняць імя, якое нехта некалі даў яму: «Не Лазар ён, не Лазар. Зусім не Кагановіч... У таго Лазара было ўсё: і курыва, і гарэлка, і хата, і сям'я, і сынок, пэўна. А ў гэтага Лазара — нічога. Ні хаты, ні сям'і, ні жонкі» [2, с.84]. Імя ж, дадзенае ёй Лазарам, Марэйка прыняла адразу ж «і назаўсёды для яго і сяла засталася Дзевай Марыяй,

---

Калі ёсць тупік, трэба, каб і сцежка ад яго нарадзілася.

Птушка задумалася. Не зважаючы на дождж, які ліў як з вядра, мокрая і нашатыраная, бездапаможная і рашучая, яна думала...

Не будзем і мы замінаць ёй – няхай думае...» [3, с.14].

Гэта думкі птушкі, у якую ператварыўся герой твора – Сінявок. Аднак аўтар не падае адзнак, не гаворыць, у якую ўсё ж птушку ён ператварыўся. У «Версіі «А» Б. Пятровіча думае пугач. І ў святле сімволікі пугача (савы) як птушкі ведаў і мудрасці [Гл.: 4, с.444] такі стан думання-разважання для яго з'яўляецца натуральным.



хаця і нарадзіла плойму дзяцей. Танкам зрабілася... А была лёгенькая дзевачка Марэйка, на крыллях несла яе ў жыццё» [2, с.84].

Напачатку сапраўды ўсё ў іх жыцці складвалася няблага. Яны сустракаліся з першага па дзясяты клас. «Потым ён ужо рабіў на машыне шафёрам, Марэйка на ферме даяркай. Усё ішло ў іх да вяселля. Але ў яго з'явіўся вораг. Смех і грэх, які вораг, хлопчык смаркаты... Сынок Толі Чорнага. Пяць ці шэсць гадзікаў яму было. Харошы хлопчык, бойкі, разумны, але ўзяў моду яму, Лазару, помсціць» [2, с.85].

Кагановіч трапіў у пастку. Апавядальнік заўважае, што Лазар валодаў дарам прадбачання. «Здагадваўся і прадбачыў Петракову смерць, але не прыпыніў, не стаў пасярод дарогі ён, не задушыў тое сваё прадбачанне і думку сваю грэшную, страшную» [2, с.85].

В. Казько робіць пранікненне ў псіхалогію героя прама і апасродкавана, пакідаючы чытачу поле для ўласных развагаў. Галоўнай пасткі — смерці — не абмінуць у любым выпадку. Іншая справа, якім чынам чалавек у яе трапляе. Магчыма, Кагановіч не прадухіліў смерць Петрака таму, што прадбачыў яго жахлівы будучы лёс. У гэтым выпадку гібель дзіцяці можна разглядаць як вызваленне ад пакутаў. Паказальная наступная думка апавядальніка:

«Ёсць на свеце такая адметная парода людзей, што адразу, ад нараджэння, пачынае шукаць смерці. Пятрок, пэўна, быў з той пароды: настырных праўдашукальнікаў, юродзівых і вялікіх начальнікаў, калі, канешне, пашанцуе.

Петраку не пашанцавала» [2, с.86].

Лазар працягваў жыць з Марэйкай і надалей. Мінулы боль у ім ніколі, напэўна, не сціхаў, бо выхоўваць ён мусіў чужых дзяцей, імя аднаго з якіх — Янко. Яму хацелася быць для яго бацькам, пачуць з вуснаў дзіцяці ласкавае «тата», але замест гэтага даводзілася чуць «дзядзько». І толькі перад самай смерцю ён чуе, як Янко называе яго татам, а Марэйка, у сваю чаргу, імем дзіцяці. Так Лазар «...успомніў сваё імя. Што ён ніякі не Лазар Кагановіч. Янка Каганец» [2, с.147].

У кожнага чалавека ёсць сапраўднае імя. Імя гэтае ў пэўным сэнсе можна атаясаміць з яго асобай. Часам у сілу розных жыццёвых прычын і абставін яно зацямняецца, становіцца нябачным не толькі для іншых, але і для самога чалавека. Так ён можа жыць даволі доўгі час, пакуль не надыдзе момант, калі ён адкрые сябе сапраўднага.

Па-свойму раскрываецца характар Лазара ва ўзаемаадносінах з сябрамі-механізатарамі Лаўрыкам (Лаўрэнціем Берыем) і Гогам (Іосіфам Сталіным), а таксама з іншымі аднавяскоўцамі. У адной з першых сцэн — сцэне раздачы старшынём сельсавета шкарпэтак — кідаецца ў вочы яго нешматслоўнасць, пасіўнасць, засяроджанасць на нечым глыбока асабістым. Паступова гэтае асабістае будзе выяўляцца па меры развіцця дзеяння.

www.kamunikat.org

Важнай часткай аповесці з'яўляецца рэтраспекцыйны аповед пра сустрэчу Кагановіча з чорным буслам. Паказальна тое, што аповед гэты перарывае сцэну агульнага сходу, на якім вырашалася пытанне пра будаўніцтва заказніка. Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды — цэнтральны матыў твора. Лазар вельмі моцна адчуваў уласную еднасць з прыродай. «Зямля зачароўвала яго, засцерагала, прымушала збіцца з нагі» [2, с.41]. Ён ішоў у лес, каб ссекчы малады ясень для вясла, але замест гэтага пабратаўся, паяднаўся з буслам. Яднанне каштавала яму мезенца на правай назе, які ён беражліва пахаваў каля дрэва. Сцэна пахавання пальца, як і сам адсечаны мезенец, глыбока сімвалічная. Па сутнасці, Лазар аддае частку сябе прыродзе, лесу. Адсечаны палец — гэта яшчэ і боль тых, «...хто жыў на гэтай зямлі. Застарэлы і закарэлы, непазбыўны і схаваны. Ціхмяны, пакорлівы боль жывых, але ўжо як бы і нябожчыкаў, жывымі пахаваных»[3] [2, с.45].

Для чалавека, які спрадвеку жыў сярод лясоў, гэтыя лясы з'яўляюцца сапраўдным скарбам. І калі паўстала пытанне пра будаўніцтва заказніка, «у кожнага... знайшоўся ў лесе свой ясянёк, дубок, бяроза і лазовы кусток, з якога адзін дзёр лыка, другі насіў бярозавік, трэці ладзіў вясельца, а бабы і дзеці збіралі ягады, падымалі грыб. Не ведаючы забароны, пасвілася і сыцілася свая і калгасная жывёла. І народ не дазволіў адлучыць сябе ад лесу. Не згадзіўся даць дабро на заказнік. Не даверыў дзяржаве самае апошняе і запаветнае, што ў яго ад дзядоў яшчэ захавалася» [2, с.50].

Лазар Кагановіч паўстаў супраць заказніка, калі пачуў «голас» пахаванага мезенца. Яго «адсечаны палец... ныў і свярбеў, хоць ты разувайся... Не патрэбны, не патрэбны яго ясяньку дзяржаўны клопат. Мо ён тады і захаваецца. Расце лес — хай расце... У дзяржавы рука цяжкая. Яна не разбіраецца і азірацца не звыкла, можа адсекчы не толькі мезенец, але і ўсю нагу і галаву знесці. А так ясянёк расце ў яго лесе» [2, с.50].

Разам з тым мезенец сігналізаваў Кагановічу і пра нешта іншае. Гэта быў знак, які Лазар пакуль не мог прачытаць. Хаваючы палец каля ясеня, на якім месцілася кубло чорнага бусла, ён засведчваў сваю адданасць лесу, прыродзе. І вось надышоў момант, калі гэтую вернасць яму трэба было даказаць на справе. Словы Лазара пра «цяжкую руку дзяржавы» сталі прароцкімі. Быў дадзены загад на высячэнне лесу.

Адданасць сваёй зямлі, роднай прыродзе ў Кагановіча шчырая, непадробная. Па-сапраўднаму кранае душу эпізод, калі перад шэсцем пратэсту

[3] Матыў пахаванага жывым звязаны і непасрэдна з самім Лазарам: на помніку тым, хто загінуў у вайну, было высечана яго прозвішча.
Апавядальнік неаднаразова называе людзей, якія жывуць на забруджанай тэрыторыі, жывымі нябожчыкамі ці кандыдатамі ў нябожчыкі. Яны бачаць, што зямля памірае, што паволі паміраюць яны самі, але нічога змяніць не могуць. У сувязі з гэтым згадваецца «Версія 8» Б. Пятровіча, дзе аўтар паказвае бяссілле чалавека перад тварам пераўзыходзячых сіл гэтага свету і сусвету.



супраць высячэння Лазар зачарпнуў жменю насычанага бярозавым сокам чорнага пяску[4]. «Беражліва трымаючы яго ў руцэ, каб не ўпала ні пясчынкі, Лазар пакрочыў ад бярозы да ганка канторы. З парога спускаўся насустрач яму Аўгуст Серада...

— Што гэта ў цябе, Лазар? — убачыў і вылучыў яго старшыня калгаса.

— Пясочак, пясочак, Аўгуст, зямелька. — Ён і тут не схацеў пазбаўляцца ад таго пясочку, сцяў яго ў кулаку. — Чаго мы чакаем, Аўгуст? Там жа рэжуць ужо, бензапілы шчыруюць» [2, с.137].

Сціснуты ў руцэ Кагановіча пясок сведчыць пра надыход рашаючага моманту. Невыпадкова менавіта Лазар выступіў правадыром «паўстання». Толькі ён ведаў, дзе знаходзіцца кубло чорнага бусла — адзіная надзея захаваць лес. Кагановіч пайшоў да знаёмага дрэва. «Тры брацікі-клёны, што зрасліся разам, крыху наводдаль стаяў і другі знаёмец Лазара. Ён цяпер узмужнеў і на вясельца ўжо быў непрыдатны. Спазніўся Лазар рабіць з яго вясельца. Луб, дзе ён крануў яго сякераю, зацягло, з-пад брацікаў-клёнаў, як і ў тыя далёкія гады, біла крынічка. Лазар леваю рукою зачарпнуў з яе вады, асвяжыў твар і напіўся, сарваў кісліцу, што выбілася ўжо з-пад зямлі. Паглядзеў на вяршыні клёнаў. Гняздо чорнага бусла было на месцы, ён бачыў гэта яшчэ падыходзячы да дрэваў. Цяпер хацеў убачыць самога чорнага бусла, але таго, канешне, там не было. Сышоў. Каб не бачыць, як здзекуюцца з яго хаты, пагібелі яе» [2, с.146].

Гэты шлях вяртання да **свайго** стаў для Лазара выпрабаваннем, праверкай сябе. Усё адбылося нечакана і імкліва. Яму добра было сядзець на цурбане каля печы, назіраць за Янком. Каманду падала Дзева Марыя. Іншая справа, што Марэйка не паведаміла прычыну, чаму трэба ісці. Пра яе Кагановіч даведаўся, відаць, толькі на плошчы каля праўлення калгаса, адкуль і пачалося выратавальнае шэсце. Лазар прадчуваў трагедыю. Прадбачанне вымусіла яго азірнуцца перад дарогай і развітацца з хатай, «каторая так і не зрабілася яму роднай... Ён прадчуваў, ведаў, што больш сюды не вернецца. Вельмі ўжо голасна крычаў яму ў плечы певень. А яшчэ калі ён быў у хаце, сядзеў каля печы..., прылятала сарока. Прылятала і стукала касцяной сваёй дзюбаю па шкле. Падавала яму знак і засцерагала» [2, с.135]. І гэта не адзіныя знакі бяды. Вось Лазар залез у кузаў машыны, «ухапіўся абедзвюма рукамі за абадраны, стрэмкавы борт, нібыта збіраўся збегчы, выскачыць. Заскрыгацела перадача, усё роўна як машыну спрабаваў нехта разрэзаць, разадраць на бясконцую колькасць металічных асколкаў і драўляных трэсак-стрэмак. Лазару здалося, што гэта раздзіраюць і яго, і ў яго не было жадання супраціўляцца гэтаму раздзіранню, ён зняў рукі з борта, але сцяў кулакі» [2, с.136].

[4] Адбываецца адмысловы абмен, прасякнуты сакральным значэннем: аддаючы частку сябе зямлі, Лазар, у сваю чаргу, бярэ ў руку яе кавалачак.

www.kamunikat.org

Напружанне ўзрастае. Сцятыя кулакі — гэта яшчэ не кульмінацыя. Вяршыняй будзе сустрэча з бярозай і заціснуты ў руцэ радыеактыўны пясок. Ніякай мітусні ў дзеяннях Лазара не заўважаецца. Ён ведае, што яго чакае, што належыць здзейсніць. Але неспакой, трывога ўсё адно праступаюць[5]. З часам выяўляецца нецярплівасць Кагановіча, «прага і імкненне дзейнічаць, крушыць» [2, с.138]. Гэты ўсплёск эмоцый адступае, калі ён просіць старшыню калгаса вынесці чырвоныя сцягі. Лазар пераўтвараецца:

«— Слухай, Аўгуст, — сказаў ён умольна, — я столькі гадоў жыву і ні разу не быў на дэманстрацыі. Вынес бы ты сцягі. Хачу пад чырвоны сцяг.

— Чаго, чаго ты хочаш? — Аўгусту здалося, што Лазар жартуе. Але Лазар не жартаваў. Твар яго па-дзіцячы выцягся, зрабіўся вострым, і была ў ім адна толькі просьба. Няголены, зарослы шчэццю хлопчык з не адмытым ад учарашніх дзіцячых гульняў тварам стаяў перад ім, і гэтае дзіцячае перадалося і Аўгусту» [2, с.138].

Метамарфоза шматзначная. Непрыманне існуючага стану рэчаў, імкненне пазбыцца яго цяжару, моцнае жаданне вярнуцца, — такім можа быць яе змястоўнае напаўненне. Лазар урэшце вяртаецца. Ён вяртаецца да сваёй «хаты», у якой яму было сапраўды ўтульна і якую цяпер у яго адбіраюць. Не ўратаваўшы лес, роднае дрэва, Лазар гіне, і смерць яго сімвалічная:

«...Лазар пайшоў на прызначанае ім самім і для сябе месца і сеў. І было яму зноў хораша, як гадзіну нейкую назад, на цурбанчыку, каля печы ў хаце Дзевы Марыі. Адтуль, дзе ён сядзеў, быў добра відзен Янко, усмешлівы і сінявокі. Лазар глядзеў на яго і таксама ўсміхаўся. Ён чакаў ад яго слова і дачакаўся:

— Татку, татку, — закрычаў Янко.

— Добра, добранька, — паспеў яшчэ адказаць яму Лазар. Яму прыгадалася дзяцінства, што ён ідзе ў школу. Сёння беларуская мова, дыктант. Ён возьме пяцёрку. Пяцёрка ў яго ўжо ў кішэні...

— Янко, Яначка, міленькі, родненькі, — пачуў ён яшчэ і галашэнне Марэйкі. Здагадаўся, што галашэнне тое па ім ужо... Клён здрыгануўся. Неба хіснула гняздо бусла, клён пайшоў на яго. Лазар падняўся яму насустрач і ўвайшоў у дрэва» [2, с.147].

Аповесць «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» — твор-пратэст. Чарнобыль толькі надсек лес, а завяршыў справу знішчэння чалавек. Пісьменнік пратэстуе не столькі супраць Чарнобыля, колькі супраць тых, хто чыніць гвалтоўны здзек з прыроды, з людзей, для якіх яна з'яўляецца неад'емнай часткай душы.

---

[5] «Лазар... адышоўся ўбок і закурыў. Курыць хацелася страшна, аж свярбела пад лапаткамі. Але не курылася. І ён больш назіраў, як разгараецца ў яго пальцах самакрутка, дыхаў гаркавым і адначасова салодкім дымам махоркі. Глядзеў праз гэты дым на неба, сонца, людзей, і вочы яго туманіліся» [2, с.136].



**Літаратура:**


1. Друк, Г.М. У храме слова : міфатворчасць Віктара Казько : манаграфія / Г.М. Друк. — Мінск : Бел. кнігазбор, 2005. — 184 с.

2. Казько, В. Выратуй і памілуй нас, чорны бусел : аповесці, апавяданні, эсэ / В. Казько. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 319 с.

3. Сіпакоў, Я. Тыя, што ідуць : кніга прытчаў / Я. Сіпакоў. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 175 с.

4. Валодзіна, Т. Сава / Т. Валодзіна, А. Садоўская, Л. Салавей // Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. — Мінск : Беларусь, 2004. — С. 444—446.

5. Степанов, Ю.С. «Свои» и «Чужие» / Ю.С. Степанов // Константы : словарь русской культуры / Ю.С. Степанов ; изд. 2-е, испр. и доп. — М. : Академический Проект, 2001. — С. 126—143.


www.kamunikat.org



# Святлана Калядка

**літаратуразнаўца, даследчыца сучаснай беларускай жаночай паэзіі, аўтар манаграфіі «Непрыручаная птушка Палесся: творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц», навукова-тэарэтычных даследаванняў жаночай паэзіі, прадстаўленых у вялікіх раздзелах у двух калектыўных манаграфіях, займаецца падрыхтоўкай да выдання Збору твораў Максіма Танка. Жыве ў Мінску.**

# Хіба паміраюць людзі?..

***Экзістэнцыяльныя роздумы ў паэзіі Анатоля Вярцінскага***

Сучасныя пісьменнікі часта звяртаюцца да філасофіі экзістэнцыялізму як да філасофіі, якая ўзнімае праблему жыцця і смерці праз існаванне адзінкі. У цэнтры экзістэнцыяльнай філасофіі чалавек з яго адвечным пытаннем: як зрабіць асэнсаваным уласнае існаванне ў бессэнсоўным і канечным быцці. Гэта праблема шырока ўзнімаецца ў творчасці Анатоля Вярцінскага. «Адчуванні важныя ў пазнанні, але не як крыніца ведаў, а як стымул да таго, каб розум пачаў шукаць ісціну ў сабе»[6], — пастуліруецца ў тэорыі пазнання. Сапраўды, смерць не мае сведак. Таму кожны перажывае прадчуванне смерці на сваім светапоглядным узроўні. А калі гэта паэт з тонкім пранікненнем у сутнасць з'явы, то і дадзеная праблема жыцця і смерці ім падаецца на вышыні глыбокага лірыка-філасофскага асэнсавання. Звернемся да паэзіі А. Вярцінскага, у якога, згодна з характарыстыкай В. Русілкі, «цвярозы і часам усмешлівы рацыяналізм, засяроджаны на роздуме, шырокае выкарыстанне лагічнай аргументацыі — якраз і сталі тым адметным і каштоўным, што вызначае асобу паэта і сёння»[7]. Вярцінскі спрабуе рацыянальна, нават прагматычна паглядзець на праблему жыцця і смерці і хуткаплыннасці чалавечага жыцця. Яго паэтычнаму стылю не ўласцівы экзальтаванасць, містыфікацыя, хутчэй — спакойная разважлівасць і ўзважанасць думкі.

*Людзі як быццам бы смяротныя,*
*а паміраюць параўнаўча рэдка —*
*асабліва ў мірны час.*
*І пахавальнае шэсце на вуліцы горада*
*здаецца нам*
*ледзь не вулічным здарэннем,*
*ледзь не сумным непаразуменнем:*
*«Хіба паміраюць людзі?»*

У вершы «Пахавальнае шэсце» аўтар імкнецца ўглядзецца ў твары людзей, каб зразумець, што для жывых смерць. Пахавальны рытуал — сімвалічны вобраз развітання з чалавекам, аднак часта, як ні парадаксальна, ён не выклікае моцных узрушальных эмоцый, бо не мае ўласнага вопыту смерці, а таму «Вуліца жывая, і яна жыве, / і яна хоча жыць.../ і яна здзіўле-

---

6 История философии. Учебник для высших учебных заведений / Под ред. В.П. Кохановского, В.П. Яковлева. – Ростов-на-Дону, «Феникс», 2002. – С. 218

7 Русілка В. Паэтычныя ўрокі чалавечнасці / А. Вярцінскі. Выбраныя творы. – Мн., «Кнігазбор», 2009. – С. 9.

www.kamunikat.org

на пытае:/ «Хіба паміраюць людзі?» Паэт крочыць ад факта да ўніверсальнай акрэсленасці з'явы — людзі не разумеюць смерці ў духоўна-быційным сэнсе, яны назіраюць толькі за прыродным феноменам знікнення жывога на зямлі. Карыстаючыся выказваннем А. Камю, «твор нараджаецца з адмаўлення розуму тлумачыць канкрэтнае, відавочнае, здзейсненае»[8]. Вуліца ёсць увасабленне шматлікіх форм жыцця, а вось чалавек у труне — адзіная форма смерці, якая не можа мець розных логіка-паняційных азначэнняў. Ёсць фінальная кропка — смерць, якую свядомасць кожнага імкнецца вытлумачыць па-свойму, гэта «сумнае недаразуменне», змрочны напамін у свяце жыцця пра канечнасць існавання.

Камю нагадвае: «Свет боскі, паколькі беспрычынны. Вось таму толькі мастацтву, такому ж безасноўнаму, дадзена зразумець яго. Ніякае меркаванне не дае ўяўлення пра свет, але мастацтва можа навучыць нас паўтараць яго, як паўтараецца свет у вечных вяртаннях»[9]. Паэтычнае слова ў Вярцінскага скіравана на тое, каб разбудзіць разумовую актыўнасць чытача, падключыць яго да працэсу сутворчасці. Ён нібы звяртаецца да пастулата філасофскай тэорыі пазнання ў розных паэтычных мадыфікацыях тэмы смерці — існаванне можа мець толькі адзін сэнс: існаваць — значыць быць успрымаемым у антрапалагічна-прыродным і духоўным сэнсе.

*Спачуваю чалавеку,*
*калі ён баіцца смерці,*
*калі ён паміраць не хоча.*
*Я ж сам смяротны і ведаю:*
*не так лёгка памерці,*
*калі над табой такое сіняе-сіняе неба,*
*калі вакол такая зялёная-зялёная трава.*
(«Спачуванне»)

Аднак, калі адштурхоўвацца ад верша «Спачуванне», яго «ведаю» ўсё ж не мае лагічнага абгрунтавання, яно грунтуецца ў большай ступені на эмацыйным напале роспачы, на душэўным судакрананні з таінствам неўсвядомленага. «Але калі ідэі свету не падпарадкуюцца нашай волі, значыць існуе іншы, больш магутны дух, які іх стварыў, а мы іх толькі ўспрымаем. Гэты вышэйшы Дух і ёсць Бог. Парадак і сувязь ідэй, народжаных Богам, называецца законамі прыроды»[10]. І законамі прыроды ў першую чаргу тлумачыцца шлях чалавека да смерці, пра што гаворыць у сваіх творах Вярцінскі: «Упаў журавель на дасвецці, / выбіўся з сіл і надзей.../ Тое ж і ў нашым свеце, / тое ж і ў нас, у людзей» («***Не ўсе і заўсёды...»). Аднак

[8] Камю А. Бунтующий человек. – М., Изд-во полит.книги, 1990. – С. 77.
[9] Камю А. Бунтующий человек. – М., Изд-во полит.книги, 1990. – С. 174.
[10] История философии. Учебник для высших учебных заведений / Под ред. В.П. Кохановского, В.П. Яковлева. – Ростов-на-Дону, «Феникс», 2002. – С. 316.



боскае прычыненне да смерці людзей разглядаецца Вярцінскім з пазіцый узаемазвязанасці быцця і іншабыцця, таму: «Жылі-былі. / І адышлі, адплылі. / Толькі над намі / лятаюць іх душы птахамі, / толькі сляды іх / цямнеюць усё на зямлі» («Жылі-былі...»). Паэт разважае над тым, што Бог вяртае душы на зямлю, у іх дом быцця. І ў такіх развагах рацыянальнасць саступае месца біблійнай веры ў тагасветнае жыццё душ. Інтэлектуальны пошук прычын існавання заводзіць паэта ў тупік, бо ідэя, рэч, з'ява становяцца для нас відавочнымі і яўнымі толькі тады, калі яны прапускаюцца праз свядомасць і сэрца. Рацыё ўспрымае канечнасць быцця як непазбежнасць, незваротнасць і гэта знаходзіць увасабленне ў аўтарскіх абагульненнях. Ва ўнісон з дадзеным пастулатам гучаць і лірычна-эмацыйныя рэфлексіі ў асэнсаванні ўнутранага стану:

*Даўно мінула маё світанне.*
*Мінае мой поўдзень,*
*мінае мой дзень.*
*Пачынаецца доўгае развітанне*
*З табою, жыцця нязгасны прамень.*
*А там і мой вечар,*
*мой ціхі вечар.*
*А потым — бясконцая ноч мая.*
*Узыдуць зоры*
*над лёсам маім чалавечым,*
*Ды гэтых зораў*
*болей не ўбачу я.*
(«***Даўно мінула маё світанне»)

Верш пабудаваны на шматзначнасці і эстэтычнай змястоўнасці вобразаў, на асацыятыўнай гнуткасці радка, што дало магчымасць апаэтызаваць быццё да смерці, прадставіць згасанне жыцця як лірычна-філасофскую з'яву. Прырода чалавечага духу яго лірычнага героя «зямная», што дазваляе гаварыць пра ўласную смерць абстрагавана, з вышыні прынятай свядомасцю «зямной» ісціны. Вярцінскі на працягу ўсяго жыцця ішоў ад тэмаў смерці да тэмаў жыцця, як бы звяртаючыся да ўстаноўленага адвечнага прыроднага кругазвароту і яго ж адвяргаючы. І паэма віны «Даруйце», напісаная ў элегічнай танальнасці ў 1967 годзе, успрымаецца развітаннем з жыццём (здаецца, як можна думаць пра смерць у такім маладым узросце). А ў 2008 годзе публікуецца верш «Ішоў я, ішоў...», дзе жыццё паўстае ў кантамінацыйнай форме шоу: «Ойча нябесны, па волі тваёй / ці па шайтанавай волі злой / ён ладзіць шоу?». З'яўляюцца іронія, сарказм у адлюстраванні святыні — самога быцця. Праваслаўная антрапалогія заклікае чалавека несці свой крыж па жыцці як волю Хрыста, і толькі пры гэтай умове чалавек знойдзе сапраўдную сваю індывідуальнасць. Вярцінскі таксама не

www.kamunikat.org

адмаўляе дадзенага пастулата, аднак жадае зняць покрыў недатыкальнасці з таямніцы смерці. Ен кіруецца жыццёвай устаноўкай, вельмі трапна пададзенай Сартрам: «Чалавек — гэта істота, што скіравана ў будучыню, і асэнсоўвае, што яна праецыруе сябе ў будучыню»[11]. У вершы, прысвечаным Янку Брылю («Развітальная размова з Янкам Брылём»), Вярцінскі вызначае моц духу чалавека, які «ў дзённым, часовым / вечнасць бычыў добра...». Творца павінен «уваскрашаць другіх / вадою жыватворнай сваіх кніг» («Памяці Васіля Быкава») — толькі тады вечнасць спраецыруецца на рэалізаваную на зямлі асобай праграму існавання. Аптымістычнымі акордамі гучыць верш «***Жыццё даецца, каб жыццё тварыць»:

*Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.*
*Маральны самы, самы натуральны*
*Пачатак гэты вось жыццёстваральны.*
*Інакш — якая ад жыцця карысць?*
*Тварыць!*

*Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.*
*Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —*
*Тварыць!*

Гэта своеасаблівы інтэлектуальна-рэфлексіўны адказ на пытанне аб сутнасці ўласнага існавання і быцця асобы ўвогуле. Пакутлівыя роздумы, адлюстраваныя ў вялікім шэрагу вершаў-прысвячэнняў, набылі характар ачышчальнай эстэтыкі пакут. Сімволіка жыцця перамагае ў лірычных споведзях. Экзістэнцыяльнай ісцінай для героя Вярцінскага з'яўляецца бескампраміснае служэнне праўдзе дабра і напружанаму духоўнаму дыханню, якое і стварае гісторыю жыцця чалавека.

[11] Сартр Ж-П. Экзистенциализм – это гуманизм // Сумерки богов. – М., 1989. – С.324.



# Рыгор Сітніца

**мастак, паэт, публіцыст. Акадэмік Беларускай акадэміі мастацтваў. Першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў. Вершы друкаваліся ў часопісах “Полымя” і “Дзеяслоў”. Карціны знаходзяцца ў музеях Беларусі, Польшчы, Грэцыі, у прыватных зборах Беларусі, Літвы, Польшчы, Германіі, Галандыі, Ізраіля, Вялікабрытаніі, Грэцыі. Нарадзіўся ў 1958 годзе ў в. Курыцічы  на Петрыкаўшчыне. Жыве ў Мінску.**

www.kamunikat.org

# «І голас Бога слухае душа...»

***— Іван Мележ назваў беларусаў «людзьмі на балоце». Маючы такое каларытнае прозвішча «Сітніца», ці адчуваеш ты сябе насельнікам беларускага балота?***

— Маё прозвішча сапраўды вельмі беларускае й вельмі зямное, бо сітніцай беларусы называлі муку, з якое выпякалі сітны хлеб. Таму я адчуваю сябе насельнікам і беларускага поля, і беларускага лесу, і беларускага луга, і беларускіх балотаў, якія ў нашым краі зараз пачалі інтэнсіўна аднаўляць, бо нарэшце зразумелі сапраўднае іх значэнне і для краю, і для свету. Так што, зусім не заганна часам адчуць сябе насельнікам тутэйшага балота, бо яно таксама ёсць не найгоршай часткаю нашай Бацькаўшчыны, над якой ёсць яшчэ і беларускія нябёсы, насельнікам якіх я таксама сябе раз-пораз адчуваю.

***— Як удалося табе, звычайнаму вясковаму хлапчуку, з палескай «глушы» трапіць у беларускую сталіцу і стаць навучэнцам школы па музыцы і выяўленчаму мастацтву імя Ахрэмчыка?***

— У маёй палескай «глушы» — вёсцы Курыцічы, што ў Петрыкаўскім раёне, якая расцягнулася на чатыры кіламетры, недзе годзе ў 75-м былі заасфальтаваныя вуліцы і пад'езды да фермаў і палявых станаў. Праз вёску тройчы на дзень праходзілі рэйсавыя аўтобусы да райцэнтра і чыгуначнай станцыі. У вясковай школе было па два, а то і па тры паралельных класы, у кожным з якіх вучылася па-беларуску 25-30 чалавек. У вёсцы было 5 крамаў, велізарны клуб і шмат чаго іншага. Так што мяркуйце самі, якой была тая «глуш». А галоўнае, гэта было натуральнае беларускае асяроддзе, не сапсаванае ні пахабнай расейскай папсой, ні павальным п'янствам, ні сучаснай амаральнасцю ды цынізмам.

Мастаком я захацеў стаць недзе гадоў з пяці. Жаданне тое было амаль шалёным — маляваў прагна і зацята і ўжо тады спрабаваў уявіць свае малюнкі ў залатых рамах на музейных сценах. Гадоў з васьмі пачаў дасылаць бандэролі з малюнкамі на ўсялякія конкурсы, што ладзіліся газетамі «Піянер Беларусі» ды «Пионерская правда», якія выпісвала мая старэйшая сястра. Кожны тыдзень з вялікім нецярпеннем чакаў тыя газеты, жадаючы ўбачыць свае малюнкі надрукаванымі. Іх чамусці не друкавалі: пэўна мае хаты, хлявы, парканы, дрывотні былі нефарматнымі побач з касманаўтамі, піянерамі ды пад'ёмнымі кранамі. Гэта пачынала абураць, бо надрукаваныя правільныя карцінкі падаваліся мне непараўнальна горшымі за мае-родныя. Сумненняў не было, і цярпенне лопнула: гадоў у дзесяць накатаў на шыкоўнай трасянцы гнеўны ліст у тую «Пионерскую правду» з патрабаваннем даць мне адрас вучэльні, дзе я магу вучыцца на мастака. Маскоўскія дабрадзеі доўга не напружваліся ды адказалі, што я мушу-такі скончыць восем класаў і тады ўжо паступаць у.....Чарнігаўскую мастацкую вучэльню. У Маскве пэўна й зараз лічаць, што калі вёска ў Гомельскай вобласці, дык Чарнігаў адразу за суседскім гародам.

Да восьмага класа, як і да Чарнігава, было дужа далёка. Мяне гэта задаволіць не магло. На маё шчасце, у нашу вёску, пасля заканчэння музычнае вучэльні, прыслалі выкладаць музыку ды спевы Івана Пятровіча Маліноўскага. Апроч іншага, ён яшчэ някепска маляваў, дык яму даручылі выкладаць і маляванне. Гэта было сапраўдным шчасцем. Іван Пятровіч кардынальна змяніў жыццё нашай вёскі. Ён стварыў два харавыя калектывы — дзіцячы і дарослы: дамогся, каб ім пашылі канцэртныя строі, вазіў іх на ўсялякія агляды ды конкурсы ў Гомель, Мінск і шмат куды яшчэ. Пры школе Іван Пятровіч заснаваў музычны гуртох, дзе прафесійна вучыў вясковых дзяцей ігры на баяне ды акардэоне. Тры гады навучаўся ў тым гуртку й я. Займаўся Іван Пятровіч з кожным індывідуальна ў сябе дома. Ніякіх грошай настаўнік не браў. Заўважыўшы мае мастацкія здольнасці, ён пачаў вельмі сур'ёзна і сістэмна са мной займацца маляваннем: паказваў рэпрадукцыі класікаў, ставіў нацюрморты, вадзіў на эцюды, прывучаў маляваць з натуры. Менавіта Іван Пятровіч вышукаў недзе адрас Рэспубліканскай школы па музыцы і выяўленчаму мастацтву ды, угаварыўшы маіх бацькоў, сам адвёз мяне ў Мінск. Вось такія бываюць настаўнікі, і дзякуй Богу, што аднаго з іх ён паслаў мне.

***— Я ведаю, што першым тваім малюнкам сталі крамлёмскія муры... У пазнейшай сваёй творчасці ты неаднойчы звернешся да мураванай тэматыкі. Але на змену крамлёўскім прыйдуць муры Сынкавіцкай царквы, касцёла св.Ганны, Мірскага замка... Чым абумоўлены твой зварот да беларускай гісторыі?***

— Першым маім малюнкам была выява з галубамі, стужачкамі, галінкамі ды вежай з пяцікутнай зоркаю і гадзіннікам, — усё тое, што малявала старэйшая сястра для школьнае насценгазеты. А я —пяцігадовы, падглядваючы з-за спіны, узяў ды й перамаляваў тое піянерскае шчасце на свой аркуш. Здалося, што зрабіў значна лепей за сястру. А яна ж на шэсць гадоў старэйшая... З таго моманту ўсё й пачалося.

Тое, што мая творчасць сцвярджае сябе на грунце нацыянальнай гісторыі, этнаграфіі, фальклору, дойлідства — з'ява цалкам натуральная. Бо для мяне такія паняткі, як нацыянальны светапогляд, нацыянальны менталітэт, душэўнае пакліканне далёка не пусты гук. Мы — еўрапейская нацыя і нашы нацыянальныя каштоўнасці ёсць неад'емнаю часткаю агульнаеўрапейскага культурнага кантэксту. Мастак, які са скуры вылузваючыся, імкнецца быць суперсучасным і еўрапейскім, пры гэтым пагарджаючы нацыянальнымі каштоўнасцямі, можа, канешне, стварыць больш ці менш

www.kamunikat.org

прафесійную рэч дзеля аздобы інтэр'еру, якая будзе мець вартасць не большую, чым астатняя мэбля.

Зрэшты, мастак, які свядома вырабляе мастацкі тавар і хоча за яго мець капейчыну, — звычайны рамеснік, да якога не можа быць ніякіх прэтэнзіяў. Той жа, хто насамрэч лічыць сябе мастаком, мусіць ведаць, што мастацкае янычарства мае ўрэшце вынікі не менш пачварныя, чымся янычарства сапраўднае.

***— У сувязі з гэтым, ці адчуваеш ты сябе вучнем Язэпа Драздовіча, які лічыцца Нестарам беларускага дойлідства?***

— Кожны свядомы беларускі мастак у пэўнай ступені ёсць вучнем Драздовіча хоць бы таму, што дзяцька Язэп першым з тутэйшых мастакоў падпісаў свае творы па-беларуску. Увогуле ж постаць Драздовіча, ягоны жыццёвы чын ды духоўны подзвіг вартыя таго, каб быць далучанымі да беларускіх Святыняў.

Аднак жа знайшоўся сярод тутэйшых мастакоў дзеяч, які справіў сваю пільную патрэбу на помнік Драздовічу ды яшчэ й пахваліўся гэтай гнюснасцю ў кніжачцы «СУчаснікі». Ну хіба не янычарства? Міжволі прыгадваеш, чым пасля плацілі за свае подзвігі тутэйшыя камсамольцы, што палілі храмы ды seклі святыя абразы.

***— Цябе часта называюць «мастаком магічнага рэалізму». Заўсёднае ж імкненне да палёту, светлаценяў і німбалініі выдае прысутнасць у тваёй творчай манеры элементаў супрэматызму. Прадстаўніком якога мастацкага накірунку ты сам сябе лічыш?***

— Гэтак назваў мяне нямецкі калекцыянер і тэарэтык мастацтва Франц Салес Грыль, які зрабіў вельмі грунтоўнае даследванне паводле маёй творчасці. Што да элементаў супрэматызму, а найчасцей канструктывізму, дык гэта прынцыповыя рэчы, якія кладуцца ў аснову маіх кампазіцыйных канструкцыяў у спалучэнні з гіперрэалістычнай трактоўкай формы. У гэтым спалучэнні, на думку мастацтвазнаўцаў, і палягае адметнасць маіх твораў. Хай сабе й так. Мяне ж гэта турбуе найменей. Галоўнае, — быць шчырым і праўдзівым ды сцвердзіць сваю задумку ў максімальна дасягальнай дасканаласці.

***— Яшчэ грэчаскі лірык Сіманід заўважыў, што жывапіс — гэта нямая паэзія. І, наадварот, паэзія — гэта жывапіс словам. Ты згодны з гэтай думкай? Ці жывапіс і паэзія ў тваім жыцці існуюць паралельна?***

— Я пагаджаюся з гэтым і магу толькі дадаць, што жывапіс, як і паэзія, гэта яшчэ й музыка, і архітэктура, і ... У маім асабістым творчым досведзе выяўленчае мастацтва і літаратура спалучаюцца хіба на ўзроўні эмоцыяў. У астатнім жа гэта два самастойныя паралельныя працэсы, якія, аднак жа, пачынаюцца з аднаго вытока ды працуюць на адну й тую ж мэту й вынік.





*З графічнай серыі «Гаспода»*

***— Сёння — ты прызнаны мастак слова, лаўрэат літаратурных прэмій часопіса «Полымя» і «Дзеяслоў». А з чаго пачынаўся Рыгор Сітніца як паэт?***

— Дзякуй. Пра сябе я так меркаваць не рызыкну. Паэзія была ў маім жыцці заўсёды, а ўласныя паэтычныя спробы пачаліся з жадання выславіць тое, што немагчыма выказаць праз малюнак ці будзённыя словы. Жаданне выказаць свае пачуцці й думкі ў слоўна-гукавай гармоніі, якая павінна стацца паэтычнай дасканаласцю (па маёй асабістай ацэнцы) — гэта дужа цяжкая праца, але ж і найвялікшая асалода пры жаданым выніку.

***— Я ведаю, што ты сябруеш з Рыгорам Барадуліным. Калі яно пачалося і што дае табе, як творцу, гэтае сяброўства?***

— Сяброўства з дзяцькам Рыгорам пачалося больш як пятнаццаць гадоў таму ў зусім выпадковых абставінах, але сёння я аніяк не магу назваць гэта выпадковасцю, бо такія сустрэчы проста так не адбываюцца. Для мяне гэта й вялікае шчасце, і немалая адказнасць, бо я ўсведамляю, што маю сяброўскія стасункі з Геніем. І ніяк не менш. Ён першы, каму я чытаю свае новыя тэксты. Зрэшты, я таксама раз-пораз адным з першых чую ягоныя новыя шэдэўры. Барадулін фактычна стаўся маім літаратурным хрышчо-

www.kamunikat.org

ным бацькам, бо без ягонага прымусу і дабраславення мая першая паэтычная публікацыя магчыма не адбылася б і да сёння.

***— Многім тваім карцінам і вершам уласціва глыбокая ўнутраная светлыня. Адкуль вытокі гэтага «духоўнага бачання» свету?***

— Мастацтва — наогул справа духоўная, і калі твору бракуе ўнутранай светлыні, дык узнікаюць сумненні, а ці з мастацтвам мы маем справу. Хоць усё гэта нашмат складаней, бо найтрагічнейшы шэдэўр Пікаса «Герніка» таксама прыклад духоўнай светлыні, як і абстрактныя палотны Хуана Міро, Джэксана Полака, ці шмат каго іншага. Вытокі ж духоўнага бачання — ад Госпада Бога, ды «Ад прадзедаў спакон вякоў...»

***— Найвялікшай падзеяй у сваім жыцці ты лічыш Каханне... Ці памятаеш ты сваё першае каханне?***

— Каханне, сапраўды, — найвялікшая падзея для кожнага, каму пашчасціла спазнаць гэтую неацэнную Божую ласку і ці не самую светлую ісціну. Каханне — гэта пасвячэнне ў найвышэйшую Веду, якая, аднак, патрабуе найвялікшай адказнасці і напружанай духоўнай працы, вынікам якой ёсць сапраўдныя Дзівосы, што апраўдваюць нашае зямное быццё і набліжаюць да Звышняга. Той жа, хто размяняў гэты Дар на будзённую драбязу ды ўсялякія спакусы, ніколі не застаецца беспакараным, і вынікі гэтае кары ў кожнага навідавоку.

Захоўваючы ў памяці тое, што ёсць маёй прыватнай Святыняй, лічу не вартым рабіць яе агульнадаступнай, бо ў гэтым заўсёды ёсць небяспека разбурэння сакральнасці.

***— Якая, на тваю думку, галоўная праблема сучаснага выяўленчага і паэтычнага мастацтва? Мастацтва і мараль для цябе — паняцці супастаўляльныя ці супрацьлеглыя?***

— Найвялікшая праблема палягае ў тым, што фактычна знішчаная сістэма крытэрыяў, паводле якіх ацэньвалася вартасць твора. Мастацкая самадзейнасць, якая сама сябе назвала актуальным мастацтвам і аматарскі постмадэрнізм у літаратуры знялі ўсялякія перашкоды перад графаманіяй і непрафесійнасцю, якія, нягледзячы на прафесійную нямогласць (за рэдкім выняткам), як правіла, маюць неабмежаваную самаўпэўненасць, агрэсіўнасць, ды неабцяжаранасць аніякімі маральнымі абмежаваннямі. Тэксты, наладкаваныя брыдоццем, вычварэннямі, бязглуздзіцай ды мацюкамі з дамешкам перакрыўленых цытатаў з класікі выстаўляюцца зараз як найвялікшыя дасягненні сучаснай літаратуры. «Жывапіс», напэцканы экскрыментамі аўтара, выпатрашаныя чалавечыя трупы, што выстаўляюцца ў якасці арт-аб'екта ў прэстыжнейшых галерэях, святыя старажытныя абразы, пасечаныя канцэптуалістам на вачах у гламурнай публікі, лайно англійскага «мастака», закатанае ў слоікі і выстаўленае на буйны арт-аукцыён — усё гэта падаецца як узор прагрэсіўнейшай авангардовай думкі. Нязгодныя з гэтай думкаю рызыкуюць патрапіць у лік рэтраградаў а то й цемрашалаў. Таму шмат хто баязліва маўчыць, каб, не дай Бог, яго не зачапілі. Зрэшты, прымаючы творчасць ва ўсіх яе формах і накірунках, я далёкі ад думкі, што актуальнае мастацтва ды постмадэрнізм зусім не далі твораў, вартых шырокай увагі. Такія творы ёсць, але гэта хутчэй вынятак з агульнае даволі бруднае плыні.

***— У адным сваім інтэрв'ю ты заявіў, што «жыццё трымаецца на маральных прынцыпах»...***

— Мастацтва — частка нашага жыцця, а мастацкі прадукт — люстэрка душы аўтара. Адсюль вынікае, што маральныя нормы ніяк не могуць быць супрацьлеглымі мастацтву. Бо логіка падказвае, што калі твор свядома выведзены за межы маралі, дык выходзіць, што ён амаральны. А як інакш? Дужа пацешна гучыць: аўтар, які творча працуе ў галіне амаральнага мастацтва. Безумоўна, з ацэнкамі трэба быць вельмі асцярожным, бо развешванне ярлыкоў — улюбёны занятак тых, хто сам мала чаго варты.

Але ж, як на дарозе, мы, каб застацца жывымі, мусім датрымоўвацца ўсталяваных правілаў, гэтак і ў мастацтве, пры ўсёй разняволенасці авангардовай думкі, не лішне раз-пораз прыгадваць тысячагадовыя арыенціры, каб засталася жывою душа. Ведаю, што ў такой пазіцыі знойдуцца ці мала праціўнікаў, якія таксама залічаць мяне ў цемрашалы. Але такой бяды. Мараль — гэта сумленне і пачуццё сораму, якія ёсць асновай духоўнага імунітэту. Іх адсутнасць спараджае духоўны СНІД, які пазбаўляе чалавечую душу імуннай абароны і робіць адкрытай для ўсялякага смецця і бруду.

На вялікі жаль, прыклады гэтай хваробы маем і сярод тутэйшых. Аўтар «СУчаснікаў» — найбольш цяжкая форма захворання. Хлусня, паклёп, абразы, смакаванне ўсялякіх вычварэнняў — вось баявы арсенал гэтага аўтара. Скандальная вядомасць, здабытая праз аплёўванне сваіх сяброў, калегаў, настаўніка ды знакавых асоб нацыянальнай культуры выклікае не толькі абурэнне ды агіду, але й шчырае шкадаванне. Бо чалавек, які скарыстоўвае свае магчымасці на слугаванне злу і цемры, заслугоўвае не толькі пагарды, але й спачування, калі падумаць пра ягоныя перспектывы.

Спроба гэтага аўтара сёлета ўступіць у Беларускі саюз мастакоў, папярэдне апляваны ім з галавы да ног, мела для Адамчыка—Глёбуса камічна — драматычныя наступствы. Бо лётаць «як фанера над Парыжам» ён, вядома, не прывык, але ж давялося. Цяпер, як і чакалася, інтэрнэт-пляўкі на адрас кіраўнікоў Саюза паляцелі з новым імпэтам, што вельмі нагадвае паводзіны малога смаркача, якога пакрыўдзілі ў дваровай пясочніцы. У сваёй улюбёнай манеры ён крыўляе прозвішчы кіраўнікоў Саюза, спрабуючы такім чынам паквітацца. Саюз мастакоў, куды ён так хацеў уступіць, цяпер для Адамчыка — сабачая зграя. Не спыняецца гэты тып і перад тым, каб абразіць даўно памерлых бацькоў старшыні Саюза...



www.kamunikat.org

Зрэшты пляўкі Глобуса хоць і з ядавітай слінаю, але ніякай рэакцыі, апроч спачуванняў да хворага, не выклікаюць, бо ўсё гэта ёсць актам самазнішчэння асобіны, што ў жывой прыродзе не такая ўжо й рэдкая з'ява.

***— Якія галоўныя маральныя прынцыпы існуюць для цябе як паэта і мастака?***

— Папярэдне выказанае вычуванне вынікае з маіх маральных прынцыпаў, якія грунтуюцца на Божых запаветах. Нічога больш праўдзівага ды ўніверсальнага людства, як бачым, не выпрацавала ды й не магло, бо з Богам не паспаборнічаеш. Адмаўленне маральных нормаў ёсць, у выніку, адмаўленнем Бога. І тады ты суперсвабодны. А дзе гэткая свабода, там вольніца і спакуса. І тады лёгка можна апынуцца ў цэнтры шматлюднай увагі ды зрабіцца скандальна вядомым, апаганіўшы Святыню, ці апляваўшы лепшых Сыноў нацыі, як тое зрабіла сумнавядомая Марыйка М. Лукаш Бэндэ можа спачываць спакойна: справа ягоная жыве і квітнее нават там, дзе ён і не спадзяваўся. Не прыняць гэтае хамства і цынізм, запярэчыць ім, абурыцца... Паспрабуйце. Паспрабавала праз «ЛіМ» інтэлігентна і годна запярэчыць літаратурнаму янычарству спадарыня Людміла Сінькова і адразу ж у «Архэ» нейкі Вратачкін абвінавацiў яе ў напісанні даноса. Хеўра абараняцца ўмее. «Ды нічога страшнага, гэта ўсяго толькі дэсакралізацыя нашай літаратуры» — прыблізна так супакойвае спадарыню Сінькову і ўсіх

*Менск. Верхні горад. 1994*



нас А. Лапіцкая — маладая супрацоўніца «ЛіМа». Дык можа й сапраўды не варта абурацца? Але ж дэсакралізацыя — гэта абвяржэнне святыняў. Гэта разбураныя храмы, пасечаныя абразы, спаленыя святыя кнігі. Дэсакралізацыя — гэта апаганеныя Купала, Колас, Багдановіч, Ластоўскі, Быкаў, Брыль... «...Не давайце Святыню псам». Гаворка не пра тое, каб нашай літаратуры вечна хадзіць у сініх панчохах ды звекаваць цнатліўкай. Але ж і ў базарныя лярвы ды правакатаркі яе вербаваць не варта.

«Не апраўдваю, не аспрэчваю — спрабую разабрацца,»— гэтак завяршае свае развагі ў часопісе «Верасень № 1» В.Кустава, адказваючы на пытанне, датычнае гнюсных правакацыяў М.М., хоць гэтыя развагі — акурат пошук апраўдання тым гнюснасцям. « ... З іншага боку...спрабую дайсці да сутнасці, зразумець, чаму... Яна іх шкадуе: а шкадаваць... — значыць кахаць...» Вось як, аказваецца.

Мілая дзяўчынка Лера! Калі табе, не дай Бог, нейкі вулічны хам, абмацаўшы, плюне ў вочы, — паспрабуй дайсці да сутнасці і зразумець яго. Можа гэта зусім не хамства, а праява глыбокага кахання. Мне ж у мае 52 гады даўно зразумела, што ў хамстве няма іншай сутнасці, апроч хамства, а цынізм, як ты яго ні разглядвай, застаецца цынізмам. А яшчэ я ведаю, што жывучы з ваўкамі, зусім не абавязкова па-воўчы выць, бо гэтак можна хутка страціць чалавечае аблічча. Я ўжо аднойчы назваў гэтую з'яву беларускім хунвэйбінствам, эпідэмія якога, на жаль, пашыраецца й набірае моц, не сустракаючы належнага супраціву з боку тых, хто яшчэ не страціў духоўны імунітэт.

А вось і свежая порцыя бруду там, дзе я ніколі не думаў у бруд патрапіць.

Да майго вялікага смутку ў маім любімым «Дзеяслове», які ствараюць блізкія мне людзі і шанаваныя мной літаратары, чытаю вялізную падборку прысвячэнняў Ларысе Геніюш, сярод якіх нямала й такога, ад чаго бедная Ларыса Антонаўна пэўна не раз перавярнулася ў сваёй дамавіне. Я дапускаю, што юныя аўтары тых «прысвячэнняў» пагуляліся ў эпатаж, ці наогул не цямілі, каму прысвячаюць сваю пісаніну. Але ж тое журы, што дабраславіла іх у друк.... Хай гэта будзе прыкрай недарэчнасцю. Даруй нам, Святая Жанчына.

***— Адной з галоўных ліній тваёй творчасці з'яўляецца тэма «Храма». Гэта таму, што «голас Бога слухае душа...»***

— Праз усё, што я раблю ў мастацтве, я спрабую пачуць Божы голас. Можа залішне пафасна, але шчыра.

***— З 2007 года ты з'яўляешся першым намеснікам старшыні Беларускага саюза мастакоў. Як пачуваешся ў новай іпастасі? Наогул, ці магчыма кіраваць творцамі? І наколькі ўдзячная гэта справа?***

— Кіраванне творчым саюзам — справа цяжкая, тлумная і няўдзячная, але рабіць яе некаму трэба. Можа й не ўсё мы зрабілі як хацелася б, але

www.kamunikat.org

працуем мы сумленна і аддана, што за тры гады прынесла вынікі, якімі не грэх і пахваліцца. Кіраваць творчымі людзьмі немагчыма і непатрэбна, бо кіраваць імі можа толькі Той, хто сапраўды з'яўляецца Творцам. Мы ж, у лепшым выпадку, толькі Ягоныя чаляднікі.

***— Ведаю, што займаешся яшчэ адной «няўдзячнай» справай — паэтычнымі перакладамі. Каго ты перастварыў па-беларуску? Для цябе мастацкі пераклад — творчае спаборніцтва ці сумоўе з аўтарам?***

— Так. Зрэдку ўзнікае такая патрэба. Па-беларуску ў маіх перакладах загучалі Бунін, Набокаў, Хадасевіч, Таркоўскі, Самойлаў, Вазнясенскі ды некалькі сучасных польскіх аўтараў. Мастацкі пераклад, калі да яго ставіцца сур'ёзна, — працэс нашмат складанейшы, чым стварэнне ўласнага верша. Таму для мяне гэты занятак ёсць спробай яшчэ раз праверыць свае магчымасці адносна высокіх класічных узораў. Апроч таго, дасканалы пераклад шырокавядомага твора дазваляе лёгка паставіць на месца любога недабразычліўца беларушчыны, калі заходзіць гаворка пра нашу мову. Ну і да ўсяго, гэта высокая асалода ў выпадку ўдачы.

***— Аднойчы ты назваў мастацтва — «тэрыторыяй свабоды». Ці маеш ты сваю асабістую тэрыторыю для свабоды творчасці?***

— Мастацтва — сапраўды тэрыторыя свабоды, якая знаходзіцца ў душы мастака. Ларыса Геніюш, зняволеная ў сталінскім Гулагу, заставалася абсалютна вольнай як паэт у сваё духоўнай тэрыторыі. Разам з тым мы зараз бачым шэрагі так званых творцаў, сытых, уладкаваных, але дабраахвотна паняволеных рабскай псіхалогіяй лёкая, ці адбіваннем халяўных даляровых грантаў. І тое, і другое — несвабода, што паралізуе творчасць, якая не церпіць фальшу.

***— Здаецца, што само слова «тэрыторыя» ўтрымлівае ў сабе абмежавальны сэнс. Ці былі ў тваім творчым лёсе творчыя абмежаванні? Ці трапляў ты ў «пракруставае ложа» айчыннай цэнзуры?***

— Калі мастак адказны, ён абавязаны сябе абмяжоўваць, але гэтыя абмежаванні датычаць духоўнай тэрыторыі. Я не цярплю ніякай вонкавай цэнзуры, але самы строгі цэнзар для мяне — я сам. З айчыннай цэнзурай я практычна не сутыкаўся, можа таму, што «не пашчасціла», а хутчэй таму, што імаверныя цэнзары ведаюць мой верагодны адказ на вонкавую цэнзуру.

***— У твайго сябра паэта Леаніда Дранько-Майсюка ёсць мясціны ў Мінску, якія ён апаэтызаваў: оперны тэатр, вуліца Сухая, кавярня «Батлейка». Які ён твой, любімы Мінск?***

— Эстэтычныя прыярытэты Леаніда, як і маральныя, практычна супадаюць з маімі. Што да Мінска, дык я шчымліва люблю ў ім усё, што хоць — кольвек нагадвае пра нашу гісторыю. Як асабістую трагедыю я перажываю разбурэнне хоць якога старога будынка. Я шмат у чым не згодны з працэсам, які ў нас называюць рэстаўрацыяй і рэканструкцыяй, ды усяляк спрабую ўплываць на яго праз грамадскую наглядчую камісію пры Міністэрстве культуры, сябрам якой я з'яўляюся.

***— Ты ўмееш і любіш спяваць. Гэта ад бацькоў ці ад Бога? Якая музыка табе падабаецца?***

— Спяваць вельмі люблю, асабліва ў вясёлых сябрынах. Людзі кажуць, што і ўмею гэта рабіць. Спеўнай, дзякуй Богу, была ўся наша сям'я: маці, сястра, брат.... Музыку люблю ўсялякую: класічную, джазавую, эстрадную. Шмат што ў гэтай галіне (асабліва класічнай) ведаю, ці, прынамсі, імкнуся даведацца. Не цураюся й найноўшых плыняў.

***— Вось чаму ўжо колькі год запар ты з'яўляешся вядоўцам фольк-мадэрн-фестывалю «Таўкачыкі». Што гэта за фестываль, дзе ён праходзіць?***

—Так, сапраўды з маім сябрам Юр'ем Выдронкам — заснавальнікам і колішнім лідэрам гуртоў «Палац», «Крыві», «Юр'я» я правёў чатыры фестывалі фольк-мадэрну, у якім бралі ўдзел шматлікія гурты з Беларусі, Украіны, Польшчы, што працуюць у галіне рок-фольку ці фольк-мадэрну. Разам з імі выступалі аўтэнтычныя калектывы з глыбінных вёсак. Фестываль ладзіўся ў Маладзёжным тэатры эстрады, канцэртнай зале «Мінск», Белдзяржфілармоніі, Палацы ветэранаў, а таксама ў палявых умовах, дзе рабіліся рэканструкцыі старажытных беларускіх абрадаў. Робіцца гэта на голым энтузіязме, але ж вымагае немалых грошай, таму рэгулярным быць, на жаль, не можа.

***— «Жыццёвы шлях прайшоўшы да паловы», ты кнігу вершаў так і не займеў... Калі чытачы дачакаюцца твайго паэтычнага зборніка?***

— У чарговы раз кажу, што неўзабаве... і зноў сарамачуся сваіх абяцанкаў. З іншага боку, я даўно ўжо злавіў сябе на тым, што мне цікава дасягнуць жаданага выніку ў напісанні ды «прэзентацыі» новага твора тамy-сяму з сяброў. А вось публікацыя ды выданне кнігі натыкаюцца на маю ляноту, а хутчэй на тлум і бясконцыя асабістыя ды грамадскія клопаты. І так з года ў год.... Але ж неўзабаве....

***— У адным з вершаў ты напісаў:***
***« І гэтых аблокаў маўклівы рух,***
***І рэха зліваў і завірух,***
***І цемры велічнае Нішто —***
***Пра што?»***
***Ці адшукаў ты адказ на сваё запытанне?***

— Той верш заканчваецца так: «... Калісь аднойчы я стану вамі, тады спасцігну ваш альфабэт». Адказ наперадзе.

*5 кастрычніка 2010 г.*

**Эдуард Акулін**

www.kamunikat.org



# Ася Паплаўская

журналіст, крытык. Студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ. Аўтар шматлікіх публікацый у беларускім друку.
Нарадзілася ў 1988 годзе ў Таржку (Расія).
Жыве ў Мінску.

# Два лісты Уладзіміру Сіўчыкаву

Вітаю, спадар Уладзімір!

Атрымала вашыя лісты колькі месяцаў таму, але вольная часіна для адказу выдалася толькі зараз. Ці то мая новая праца закруціла мяне ў сваім віры ды досыць працяглы час не давала вольна дыхнуць, ці то нейкія ўнутраныя перашкоды сталіся прычынай такой затрымкі. Зрэшты, як вы трапна пішаце ў сваім другім лісце, «шмат чаго мы маем, але нам няма калі пабачыць гэта за штодзённай мітуснёю»...

На двары пачатак лістапада. Халоднае, дажджлівае надвор'е сцішвае, запавольвае хуткаплыннасць жыцця. Сённяшні золкі вечар я прысвяціла адказам на шматлікія лісты, што дасылаюць мне сябры і знаёмцы. Не на электронныя лісты ды паведамленні ў так званых сацыяльных сетках, але на лісты сапраўдныя — папяровыя.

Жывую папяровую перапіску я распачала напачатку лета. І бясконца радая, што яна прыйшла ў маё жыццё, надала яму таямнічасці (бо надараецца, што пішуць мне людзі малазнаёмыя альбо тыя, каго я зусім не ведаю) ды прыемнага чакання (вам, безумоўна, знаёмае пачуццё шчымлівага чакання ліста. Часам гэтае датклівае пачуццё прыемней ды даражэй за самі атрыманыя капэрты)...

Захуталася ў цёплы бабулін плед, запарыла зялёнай гарбаты і пры святле лямпы, што таксама засталася мне ад бабулі, пішу лісты. Найперш вырашыла адказаць вам. Не таму, што затрымалася з адказам (хаця і гэта, безумоўна, свідравала мяне, не пакідала сумленне ў спакоі. Не люблю, калі не адказваюць на лісты. Гэта яшчэ горш, чым не адказаць на пытанне. Я ж, як журналіст, прывыкла атрымліваць адказы на свае пытанні. Таму і сама заўжды на пытанні — адказваю), але збольшага таму, што лісты вашыя вельмі блізкія мне. Сапраўды блізкія. Як кажуць маладзёны, «у тэму».

Адказваць буду ў той паслядоўнасці, у якой атрымала вашыя лісты. Адным вялікім тэкстам. Можа, больш слушна было б адаслаць вам два адказы, але мне хочацца адказаць адразу на ўсё (хто яго ведае, што будзе заўтра? Пакуль ёсць час, не буду яго марнаваць на іншыя заняткі. Буду пісаць. Вам). Да таго ж, я выбрала самую прыгожую капэрту з тых, што маю. З валошкамі. Вы любіце валошкі, спадар Уладзімір?..

**Ліст першы. Вінсэнт**

Ваш ліст, прысвечаны Ван Гогу, стаўся для мяне вельмі прыемнай неспадзяванкай. Калі атрымала яго, я акурат чытала кнігу «Лісты да брата Тэа» за аўтарствам мастака. Дарэчы, чытаючы шчымлівыя лісты Вінсэнта

www.kamunikat.org

да брата, адзінага чалавека, які сапраўды яго падтрымліваў (прычым, як маральна, так і матэрыяльна) цягам усяго нялёгкага жыцця мастака, пашкадавала, што нічога не напісала да 150-гадовага юбілея любімага постімпрэсіяніста.

Але, відаць, праўду кажуць: усяму свой час ды што ні робіцца — усё да лепшага. Тады, у 2003 годзе, я пра Вінсэнта ведала мала. Нашмат менш, чым зараз (навучаючыся на журфаку (цяперака — у Інстытуце журналістыкі) прачытала багата літаратуры пра Ван Гога, перагледзела па мноству разоў ягоныя карціны, а пасля азнаямлення з эпісталярнай спадчынай мастака — суаднесла карціны, малюнкі ды эскізы з канкрэтнымі перыядамі жыцця Ван Гога, што дапамагло мне зразумець, чаму мастацкая манера жывапісца была менавіта такой менавіта тады). А калі прачытала тэксты, прысвечаныя юбілею мастака, то і зусім супакоілася...А тут атрымліваю ваш ліст. Прысвечаны любімаму мастаку. Цікавае супадзенне, не знаходзіце?..

Вы пішаце, што не згодныя з характарыстыкай Ван Гога ў «Беларускай энцыклапедыі»: «...маляваў партрэты і пранізаныя стрыманым жыццялюбствам пейзажы». Я, як і вы, лічу, што адметнай рысай вангогаўскага стылю ёсць лішак. Якая ж тут стрыманасць? Вінсэнт і ў жыцці (і, адпаведна, у мастацтве) быў чалавекам парыву. Халерыкам, чый настрой ды рашэнні рэзка мяняліся цягам кароткага часу. «Я — чалавек апантаны, здольны і вырачаны на больш-менш безразважныя ўчынкі... Мне часта даводзіцца гаварыць альбо дзейнічаць занадта хутка там, дзе варта было б набрацца цярпення і пачакаць», — піша ён Тэа ў ліпені 1880 года. Ды і, гледзячы на карціны мастака, ніколі не скажаш, што яны выкананыя ў стрыманай манеры. Пачынаючы з насычанай, яркай колеравай гамы і нечаканымі спалучэннямі (а Ван Гог — выдатны каларыст. Надаваў вялікую ўвагу ўсяму, што звязана з колерамі, не стамляўся шукаць і эксперыментаваць, аб чым вельмі шмат пісаў брату) і сканчаючы віхрастай, закручанай, буйнай (і буйной) манерай пісьма.

Дзякуй вам вялікі, за падрабязны аповед пра неадпаведнасць перакладаў назваў карцін Ван Гога на рускую мову з ангельскай, пададзеных у альбоме «Van Gogh» з серыі «Masters of World Painting». Дзякуй, і за згаданыя ў лісце назовы кніг пра Вінсэнта. Некаторыя з іх я пакуль не чытала. Як прачытаю, то напішу вам пра свае ад іх уражанні.

Прыгадваючы, што Ван Гог у 24 гады вырашыў стаць святаром ды памыліўся (!) з прафесіяй, вы заўважаеце: «А ў нас такое лёсавызначэнне мусіць прымаць падлетак!... Фактычна яшчэ дзеці без ніякага жыццёвага вопыту павінны ўзяць на сябе цяжкую адказнасць — вырашыць, куды паступацьмуць вучыцца далей, а значыць, і выбраць прафесію, далейшы шлях па жыцці...»

Тут я з вамі і згодная, і не. Насамрэч у 17-18 гадоў самастойна вырашыць, якую прафесію абраць (пры тым, што чалавек проста можа нават не ведаць пра існаванне пэўных прафесій!) дастаткова складана. Высокая верагоднасць памыліцца. Але часцей за ўсё ў выбары прафесіі дапамагаюць бацькі, якія зведалі жыццё, ведаюць схільнасці і цікавасці свайго дзіцяці — могуць яго скіраваць на правільны шлях. Вядома, часта бывае, што бацькі хочуць *навязаць* дзецям пэўную навучальную ўстанову (мая бабуля настойвала, каб я паступала ў медыцынскі ўніверсітэт, а вось матуля рана заўважыла маю схільнасць да пісьма і накіроўвала мяне на журфак — не памылілася. Дзякуй ёй за гэта!), але тут ужо многае залежыць ад мэтанакіраванасці самога абітурыента.

Да таго ж, сёння дастаткова маладых, перспектыўных прафесій, якім папросту *нідзе не вучаць*. Напрыклад, SEO-спецыялісты, кантэнт-менеджэры, капірайтэры, web-рэдактары — спецыяльнасці, запатрабаваныя сёння, у час глабальнага развіцця інтэрнэта (чаго не было ў часы вучобы маіх бацькоў). І прафесіі гэтыя будуць запатрабаваныя і надалей (з кожным годам — усё болей і болей!). Што рабіць? Атрымліваць адукацыю дзеля развіцця, пажадана, максімальна набліжаную да абранай вамі спецыяльнасці (хочаце быць сеошнікам — ідзіце на праграміста, капірайтэрам — на журналіста), а пасля набываць неабходныя навыкі на месцы працы. Праз гэта прайшла і я, уладкаваўшыся ў буйную SEO-кампанію... Журналісцкая адукацыя, бясспрэчна, мне дапамагла асвоіцца на працы: неабходныя навыкі я займела падчас вучобы ды журналісцкай дзейнасці. Адукацыя ў любым выпадку (супадае яна з абранай вамі прафесіяй альбо не) — толькі адпраўная кропка для ўласнага росту. Далей — самаадукацыя, вопыт, якія нашмат больш істотныя за адукацыю ўніверсітэцкую. Ці згодныя вы са мной, спадар Уладзімір?..

У Ван Гога, які канчаткова абраў свой жыццёвы шлях у 27 гадоў (пазнавата, ці не так?), і настаўнікаў-та не было. Быў, вядома, галандскі мастак Антон Маувэ, у якога Ван Гог браў урокі, але было тое непрацяглы час: праз свой складаны характар ды непрынянцце акадэмічнага разумення жывапісу мастак хутка разыходзіцца са сваім настаўнікам і далей ідзе па шляху самаразвіцця, спробаў і памылак, якія загартавалі Ван Гога. Вы скажаце, што быў Гаген, якога так любіў Ван Гог. Быў. Але ў Вінсэнта ўжо выпрацаваўся ўласны стыль да таго, як ён пазнаёміўся з Гагенам. А яго ўплыву Ваг Гог пабойваўся, з аднаго боку, але з іншага — радаваўся, што пазнаёміўся з таленавітым постімпрэсіяністам, нават меў магчымасць працаваць разам з ім хай і непрацяглы час у Арлі.

Памятаеце, спадар Уладзімір, ліст Вінсэнта, у якім ён выказваў жаданне, каб Гаген убачыў, што ў яго, Вінсэнта, выпрацаваўся *уласны стыль*?

www.kamunikat.org

Тут, на маю думку, у мастаку гаварыла не столькі хваляванне за меркаванне сябра наконт яго карцін, колькі няўпэўненасць у сабе. Гэтая няўпэўненасць, самакрытычнасць, незадаволенасць сабой былі цяжкім крыжам Вінсэнта.

«Вядома, нічога незвычайнага з мяне не атрымаецца», «Тое, што малюнкі мае не сталі такімі, як я хачу, з'яўляецца для мяне крыніцай перажыванняў», «Паступова мяне ахоплівае вусціш, што я ніколі не прыйду да мэты», «Сённяшняе пакаленне *не хоча мяне*», «Прадбачу, што мяне чакае ў будучыні мала поспехаў і шмат барацьбы», «Са мной здарыцца тое ж, што адбылося з многімі мастакамі: я падохну альбо, што яшчэ горш, ператваруся ў ідыёта», — дзяліўся перажываннямі Вінсэнт з братам.

Але былі ў Ван Гога і хвіліны веры ў сябе і сваё прызначэнне, ва ўласныя сілы, у слушнасць абранага шляху: «Але барацьбу трэба працягваць і я буду змагацца за сябе, як бы мала я ні каштаваў», «Мая задача — працаваць і час ад часу ствараць такое, што застанецца надоўга». Зрэшты, Ван Гог многае разумеў і прадбачыў: «Пройдуць гады перад тым, як карціны імпрэсіяністаў стануць карыстацца сталым попытам».

Ці не ёсць павышаны ўзровень самакрытыкі праявай сапраўды таленавітага мастака? Мне здаецца, што сённяшнім творцам яе вельмі і вельмі не стае. Сёння кожны лічыць сябе геніем, гуру. Мала хто здольны прызнаваць уласныя памылкі і выпраўляць іх. Гэта, на маю думку, прызнак нездаровага грамадства. Як вы лічыце?

Вы пішаце, што Ван Гог лічыў сябе «*сялянскім* мастаком»? Ці сялянскім? Мне бачыцца, што Вінсэнт быў не сялянскім мастаком, але тым, хто пісаў, раскрываў душы і характары *працоўнага* люду. Гэта былі не толькі сяляне, але і прачкі, і ткачыхі, і шахцёры (узгадайма хаця б знакамітую карціну «Едакі бульбы», на якой — сям'я шахцёраў)...

Песня «Абсэнт» гурта «Крамбабуля», тэкст якой вы прыводзіце ў лісце, — адна з маіх любімых. Ізноў вы ўгадалі! Дарэчы, я вельмі люблю «напой імпрэсіяністаў». Вы спрабавалі яго ў Маскве, а я — у Кракаве. Піла зялёны ды чорны гішпанскі абсэнт. А вы спрабавалі чорны абсэнт?

Чытаючы лісты Ван Гога, мне страшэнна хацелася патрапіць у ягоны жоўты домік у Арлі, які ён распісаў сланечнікамі. Калі б у мяне была магчымасць загадаць любое жаданне, я б папрасілася перанесціся ў 1898 год у Арлі, у госці да Ван Гога. А што б вы загадалі, калі б надарылася такая магчымасць?

На гэтай светлай ноце, распавёўшы вам пра сваю мару (толькі нікому не распавядайце, добра?), спыняю бурлівую плынь свядомасці (бо пра любімага Вінсэнта магу гаварыць і пісаць багата. Што не напісала сёння — напішу ў наступным лісце).



**Ліст другі. Віцебшчына**

Другі ваш ліст «Мюнгхаўзэнаў камень, або Пілігрымка ў Крывію» мяне ўзрушыў не менш за першы. Зараз зразумееце, чаму.

Вы пішаце пра падарожжа па Віцебшчыне (Глыбокае — Удзела — Мосар — Слабодка — Браслаў — Опса — Відзы), у якім вы былі ў чэрвені 2004 года.

Я ж сёлета, у ліпені, падарожнічала па маршруце Бягомль — Докшыцы — Глыбокае — Мосар — Слабодка — Парыж — Паставы — Відзы — Браслаў — Мёры — Дзісна — Наваполацк — Полацк — Ушачы — Лепель.

Практычна адным і тым жа шляхам мы з вамі праехалі! Толькі вы — летам 2004 года, я — летам 2010. Вы з групай на аўтобусе, а я — з перакладчыкам, вядомым ў Беларусі нямецкім філолагам Андрэ Бёмам на аўтамабілі.

Каб падрабязна распавесці пра нашу з Андрэ вандроўку, трэба пісаць доўгі ліст на некалькі аркушаў (калі вам будзе цікава, я яго напішу), а паколькі мой выдаткаваны для адказаў на лісты вечар ціхенька, але ўпэўнена пераходзіць у ноч, то я падзялюся з вамі толькі самымі яркімі ўражаннямі ад паездкі.

У Бягомлі на аўтавакзале — вельмі файная кавярня. Ветлівы персанал, хуткае абслугоўванне, смачныя стравы. Для падарожнікаў харчаванне — вельмі істотны чыннік! Я гэта зразумела асабліва пэўна, калі, прыехаўшы сёлета ў Слонім, ледзве знайшла, дзе падсілкавацца: мясцовыя жыхары на пытанне: «Падкажыце, калі ласка, дзе бліжэйшая кавярня?» — адно паціскалі плячыма...

У Глыбокім асабліва запомнілася «Дошка ганьбы», якая знаходзіцца ў цэнтры горада. Хадзілі на могілкі, бачылі Ільінскую капліцу, пра якую вы пішаце. Нічога асаблівага ў ёй, па шчырасці, я не знайшла. Будынак як будынак...

Мосар. Вось тут мне вельмі спадабалася! На жаль, я не заспела ксёндза Ёзафа Бульку (ён адыйшоў у лепшы свет за колькі месяцаў да майго падарожжа), але з ім размаўляла мая матуля, якая падзялілася са мной сваімі ўражаннямі. Андрэ, паглядзеўшы на ўпарадкаваную тэрыторыю касцёла Святой Ганны, прамовіў: «Тут так ўсё прыведзена да ладу і вылізана, што робіцца няўтульна!» Я з ім не пагадзілася. Мне ў Мосары было вельмі камфортна. Асабліва мяне ўразілі вялікія ружовыя, белыя і жоўтыя гарлачыкі ў затоцы каля касцёла. Такіх буйных і прыгожых гарлачыкаў я не бачыла з часоў майго побыту ў вёсцы, калі мне быдо 12-14 гадоў. Могілкі ў Мосары ствараюць уражанне, што там не ступае нага чалавека. Я, шчыра прызнаюся, не адразу наважылася зайсці на іх тэрыторыю: доўга разглядала анёлаў, якіх аж занадта шмат, ды іншыя фігуры, што ўпрыгожваюць магілы. З

www.kamunikat.org



Касцёл Св. Антонія Падуанскага ў Паставах

Мосара з'язджаеш нейкім іншым, перароджаным. Гучыць, мабыць, пафасна, але па-іншаму тут не скажаш. Дакрануўшыся да прыгожага, зробленага з любоўю, немагчыма застацца такім, якім ты быў да гэтага...

У Паставах мяне ўразіў касцёл Св. Антонія Падуанскага. Паколькі я вельмі люблю касцёлы (адкрыю вам яшчэ адну таямніцу: я хачу наведаць усе касцёлы Беларусі), то я адразу патанула ў яго веліччы і харастве. Гэта немагчыма апісаць. Пачуццё, захапіўшае мяне ў палон, немагчыма перадаць на фотакартках. Гэты велічны будынак трэба бачыць на ўласныя вочы.

Касцёл Святой Тройцы ў мястэчку Відзы мяне ўзрушыў не менш за пастаўскі. Цалкам згодная з вашым меркаваннем: «Лічу гэты касцёл за адзін з шэдэўраў нашай неаготыкі. Вока проста раскашуе! Храм уражвае найперш прыгажосцю і зладжанасцю прапорцый, маналітнасцю і дынамізмам». Лепей не скажаш! Пакуль Андрэ, прывыкшы да харастве нямецкіх храмаў,



хадзіў у краму па ваду, я стаяла, бы зачараваная, і, задраўшы галаву ды згубіўшы мову, глядзела на веліч касцёла...

Мёры. Ізноў касцёл! Ізноў велічны і гарманічны. Ізноў у мяне адымае мову. Я дранцвею і застываю каля яго на паўгадзіны. Андрэ ж у гэты час сядзіць у машыне і прапрацоўвае наш далейшы маршрут...

Па вялікім рахунку, з нашага падарожжа па Віцебшчыне мне найбольш запомніліся менавіта касцёлы. Якія яны прыгожыя, узнёслыя ў нас! І мы пасля гэтага гаворым, што ў нас няма на што паглядзець!? Пасаромеліся б! Усім, хто кажа такую бязглуздзіцу, я паказваю фотаздымкі, зробленыя ў падарожжы. Паказваю найперш касцёлы. І гарлачыкі. Ківаюць галовамі, пагаджаюцца. «Сапраўды прыгожа», — цягнуць разгублена... А чаму лічым, што няма на што паглядзець у нас? Ды таму што не былі нідзе! Не ез-



Касцёл Святой Тройцы ў мястэчку Відзы

www.kamunikat.org

Касцёл у Мёрах



дзілі, не глядзелі самі. Бо — нецікава. Бо ў галаве сядзіць сабе стэрэатып: «У нас няма на што паглядзець!» Ух, і злуюся ж я, спадар Уладзімір, на такіх! Злуюся таму, што нядаўна сама была такой... Але — усё змянілася. І падарожжа па Віцебшчыне мне дапамагло расплюшчыць вочы на ўласную краіну. Наступная мая вандроўка будзе па Гарадзеншчыне. Абавязкова. Ці падарожнічалі вы там? Мне будзе вельмі цікава пачытаць тэкст пра Гарадзеншчыну з-пад вашага пяра.

Дзякуй вам за дасланыя лісты!
Чакаю адказу.
Ася.



# Юнэля Сальнікава

крытык. За шэраг публікацыяў была ўзнагароджаная II прэміяй СБП у галіне літаратуразнаўства сярод маладых літаратараў (1999). Кандыдат філалагічных навук (2004). Магістар філасофіі (2009). Нарадзілася ў 1977 годзе ў Гомелі. Жыве ў Гомелі.

www.kamunikat.org

# Макс Шчур: Сучаснае разуменне інтэлектуала

Макс Шчур вядомы як эсэіст, музыка, паэт, раманіст, перакладчык, кінарэжысёр-пачатковец. Трацiну свайго маладога веку (Максу — крыху больш за 30 год) ён стала жыве ў чэшскай Празе. Макс Шчур заўсёды заставаўся на слыху — ягоныя творы рэгулярна з'яўляюцца ў перыёдыцы, складанках, на літаратурных сайтах. 2010 год стаўся асаблівым для творцы і ягоных прыхільнікаў: у Мінску ў серыі «Галерэя «Б» былі выдадзены паэтычны зборнік «Амальгама», а напрыканцы года ў Празе ўбачыць свет кніга малой прозы «Лісты, знойдзеныя на папялішчы».

Я звычайна вельмі рэдка бяруся пісаць пра паэзію, бо разумею недасканаласць чалавечага ўспрыняцця мастацтва, якое мае відавочна не толькі чалавечае паходжанне. Мяне заўжды на арганічным узроўні шакавала працэдура анатаміравання вершаў у школьна-ўніверсітэцкіх аўдыторыях — вызначэнне рытму, рыфмаў, метафар, націскных складоў і іншых «ідэйна-мастацкіх асаблівасцей». Самае цікавае, што пасля раскладання на часткі верш пасля не збіраўся назад у адно цэлае, а пераўтвараўся ў труп і губляў сваё гучанне.

Зборнік «Амальгама» толькі замацаваў мяне ў думцы, што вершы — гэта самадастатковыя сутнасці, якія жывуць сваім жыццём, і не варта спраўджваць, дзе ў іх знаходзіцца селязёнка і ці рытмічна грукае сэрца. «Мне цяжка вызначыць дыягназ ці імя...» — прызнаецца ў адным з вершаў аўтар і тым самым дае індульгенцыю свайму чытачу ад кампаратывісцкіх і літаратуразнаўчых намаганняў.

Слова «разуменне» — гэта не тое слова, якім можна апісаць маю рэакцыю пасля першага знаёмства са зборнікам. Зрэшты, разуменне як «рацыянальны стан мыслення» не прыйшло да мяне і пасля дзясятага перачытання. Спачатку я шчыра намагалася прадзірацца скрозь складаныя рызомы сэнсаў, метафар, прыхаваных спасылак, але гэта не давала спасціжэння. Толькі калі я «адключыла» аналітычную ўстаноўку, вершы загучалі і сталі прыносіць асалоду. Насамрэч пасля вершаў Шчура застаюцца не думкі і развагі, а вобразы, колеры, пахі, імгненні настрою:

*Яшчэ лістапад, але ўжо без лістоты,*
*аголенасць сьвет прасьвятляе навокал...*

Калі б мяне папрасілі абраць праграмны верш Макса Шчура (гэткім панящэм — прынамсі раней — абазначалі твор, у якім паэт выражае сваю творчую пазіцыю, праграму), я б адкрыла любую старонку зборніка. Літаральна ў кожным вершы «Амальгамы» прысутнічае тое, што складае творчы маніфест аўтара: дзёрзскасць на мяжы блюзнерства, насычаная інтэлектуальнасць, татальная (сама)іронія, і нарэшце надрыўнасць, якая гранічна завастрае думку й стыль.

*...Стаіць чыгуначніца ў бельм,*
*праводзіць позіркам састаў,*
*маўляў гандлюе мажным целам*
*каля Варшаўскага маста.*

*Каб не гарчычнікі абвестак —*
*голым слупам заўжды хварэць...*
*Я сёньня шчасны, як падлетак,*
*што ўмазаў некаму ў тарэц.*

З псіхааналітычнай перспектывы аўтар зусім верагодна выглядае на бунтарнага падлетка, які руйнуе аўтарытэты і катэгарычна адмаўляецца жыць па стандартах папярэдніх пакаленняў. Адзін «Патрыятычны раманс» чаго варты! З жахам думаю пра тое, што калі-небудзь гэты верш будзе ўключаны ў школьную праграму і дасягальны для прачытання падлеткамі з несфармаванымі поглядамі!

*Чарадзей у сьне затросься*
*увушшу званы пішчаць*
*крыж на сэксе ставіць Фрося*
*каб цырульню заснаваць*

*Каляда Дзяды Купала*
*Купалінка Белабог*
*як зязюля пракувала*
*шышка ўпала праміж ног...*

Ствараецца ўражанне, што творца перманентна правакуе, прычым не столькі чытача, колькі самога сябе. Кожны раз ён выпрабоўвае межы паэтычнага радка і свае ўласныя. Вершы Шчура не дазваляюць знаходзіцца ў стане рэлаксацыі — яны мабілізуюць увагу з першага радка і трымаюць напружанне да апошняга. Мне складана ўявіць, што пра паэзію Шчура можна весці разважлівую гутарку ў паэтычным салоне за кубкам гарбаты. Зборнік «Амальгама» больш арганічна глядзіцца на вуліцах горада, на прасторы субкультураў, дзе адбываюцца міксаванні, сутыкненні, канфлікты, барацьба. Зрэшты, назва «амальгама» дае падказку на тое, што чытач бачыць за вокладкай кнігі, — гэта не проста сплаў мяккіх ці вадкіх рэчываў, а спалучэнне металаў, розных па сваіх уласцівасцях. Адсюль металічная катэгарычнасць высноваў і вусцішны спакой халоднай зброі пры назіранні за непазбежным згасаннем інтарэсу людзей да саміх сябе.

www.kamunikat.org

*Бог памірае ў час, калі*
*за трыццаць не яму, а вам.*
*Дзяцей яшчэ не завялі?*
*Ну што ж, хутчэй шэршэ ля фам...*

Вершы Шчура — гэта не філасофскія развагі пра сэнс і логіку жыцця, не інтымныя перажыванні лірычнага героя, не настальгія. Паэзія Шчура актуалізуе базавыя чалавечыя інстынкты і дэманструе, як сучасны чалавек выжывае ў джуглях гарадоў і як ліхаманкава спрабуе знайсці для сябе стрыжань існавання. Правакацыйная скіраванасць вершаў не ёсць самамэтай, як можа падасца на першы погляд. Аўтар зусім свядома дэканструюе рэіфікаваныя сутнасці, каб паказаць іх неканкурэнтаздольнасць у найноўшых варунках. Традыцыйныя «гуманістычныя» каштоўнасці страчваюць сваю вагу, бо ўжо не з'яўляюцца той тканінай, якая яднае людзей і забяспечвае індывіду разуменне свайго месца ў грамадстве. Па сутнасці, сёння кожны чалавек мусіць сам для сябе прыдумляць сваю мэтазгоднасць. У гэтым сэнсе я б нават казала пра пралетарскую скіраванасць паэзіі Шчура, дзе галоўнае месца займае не абстрактны чалавек, а канкрэтная асоба ў эпіцэнтры сацыетальных разрываў.

Адметна, што вызначыць месца творцы даволі складана. Дыстанцыяванасць аўтара вельмі трапна заўважыў Ігар Бабкоў, які напісаў прадмову да зборніка. І тут справа не ў снабізме паэта, які, праўда, мае выключную інтэлектуальную падрыхтоўку ды чытае ў арыгінале сучасных філосафаў. Наадварот, адстароненасць аўтара ў вершах падобна на пазіцыю ўключанага назірання: у часе даследавання захоўваецца навуковая дыстанцыя датычна падзей і людзей — толькі тады карціна падлягае адэкватнай раскадыроўцы. Вершы Шчура — гэта своеасаблівы дыягнастычны інструмент, які дазваляе творцу апісаць атачэнне і самога сябе — у паўсядзённасці, памежных сітуацыях, іншых рэальнасцях. Як амальгама служыць для вытворчасці люстэркаў, так і зборнік Шчура — гэта спроба адлюстраваць сучаснасць у тэрмінах самой сучаснасці, перакласці сённяшні хаос на чалавечую мову.

*Мы не капітулюем! Мы адступаем з баямі*
*па пройдзеных намі сьцежках углыб бацькоўскіх*
*абшараў,*
*агромністага балота, раскінутага за намі,*
*дзе водзяцца партызаны, падобныя да кляшараў...*

Паўтаруся, аўтар не ставіць за мэту крытыкаваць ці ацэньваць. Для яго важна даць апісанне таго, што ён бачыць навокал і тым самым забяспечыць матэрыял для канструявання новай, больш камфортнай рэальнасці. Хто з'яўляецца архітэктарам новых стасункаў і новай сацыяльнасці? Адказу на гэтае пытанне ў зборніку, няма, як зрэшты, няма сэнсоўнага адказу і ў самім грамадстве. Па сутнасці, сваім вершамі Макс Шчур тлумачыць ролю інтэлектуала сёння — знаходзіцца адначасова ўнутры грамадства і па-за ім, любіць людзей і не давяраць ім, каб быць незаангажаваным дэскрыптарам эпохі.



*Хто толькі вынясе прысуд,*
*ці быў у гэтым сэнс, ці будзе?*
*Адказваць нам — цяпер і тут.*
*Абвінавацца — бог, мы — судзьдзі.*

Варта зацеміць, што факт эміграцыі паэта яшчэ не дае падставы называць ягоную паэзію эмігранцкай ці замежнай беларускай. І справа не ў адсутнасці «класічных» матываў тугі па радзіме, сябрах, дзяцінстве, etc. Настальгія ў вершах Шчура ёсць — але гэта настальгія не па Беларусі як геаграфічнаму ці нават сімвалічнаму аб'екту. Цяпер прасторавыя межы лёгка пераадольваюцца з дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій (і ў гэтым сэнсе Прага знаходзіцца бліжэй да Мінску, чым беларуская вёсачка да абласнога цэнтра). Паэт хутчэй адчувае брак сапраўднасці і глыбіні ў сучасным еўрапеізаваным ладзе жыцця.

*Свабода вока, безумоўна — руху,*
*не азначае шчэ свабоды духу...*

Еўрапейская топіка творцы арганічна ўлучае ў сябе беларускасць і дбайнае абыходжанне са словам — асноўны таму доказ. Аўтар часта знаходзіць удалыя стылістычныя фігуры, што сілкуюць мову новай энергетыкай. Калі па сваім змесце вершы — гэта суцэльны сарказм і кепікі, то адшліфаванасць мовы цешыць відавочна сур'ёзным падыходам.

*Адну на дваіх цыгарэту зь віхурай*
*папаліш — і зноў у вагонны трыбух.*
*Як дэманаў зь цела свайго ні выкурвай —*
*апошні чакацьме, як выпусьціш дух.*

Унутраная кантраверсійнасць, фундаментальная незадаволенасць уласцівы і прозе Макса Шчура. Аўтара зборніка «Лісты, знойдзеныя на папялішчы» я б акрэсліла як «мадэрнага закладніка постмадэрнасці»[12].

Паспрабую абгрунтаваць вынайдзены цэтлік з дапамогай тэкстаў. Пачнем з «жаночай» — маёй улюбёнай — часткі зборніка. У апаведах *«Твар»*, *«Паэтка»*, *«Спажывец»* галоўнымі гераінямі з'яўляюцца дзяўчыны, хаця часцей апавядальнік мае відавочна мужчынскую прыналежнасць. Аўтар з захапленнем сочыць за ўчынкамі сваіх гераінь і дэманструе з імі, па ягонай уласнай фармулёўцы, «змоўніцкую блізкасць».

У апаведзе *«Паэтка»* вобраз гераіні паўстае толькі праз ейныя вершы, накрэмзаныя на каменнай хаціцы чыгуначнага прыпынку. Вершаваны

[12] Наступная частка дадзенага артыкула – з некаторымі зменамі – была напісана як пасьляслова да зборніка Макса Шчура «Лісты, знойдзеныя на папялішчы», які мусіць напрыканцы года выйсці ў пражскім выдавецтве «Белы крумкач».

www.kamunikat.org

фальклор эратычна-парнаграфічнага зместу правакуе фантазію аўтара на ўяўленне вясковай феміністкі, творчасць якой гучыць «як адчайны маніфэст грамадзянскага непадпарадкаваньня бязьмежнай вакольнай тупасьці». Сапраўды, вершаваныя радкі малююць эмансіпаваную, з інтэлектуальным бэкграўндам дзяўчыну, здольную публічна выказвацца на табуяваныя тэмы.

Паверхня для візуалізацыі вершаў абраная цалкам постмадэрная — сцены прыпынку агульна дасягальныя для шматлікіх мастакіх і калямастацкіх надпісаў і толькі пільнае спрактыкаванае вока можа адрозніць стыль розных аўтараў. Своеасаблівы палімпсест паўстае ў выніку творчага спаборніцтва ананімных творцаў, якія займаюцца як стваральнай, так і разбуральнай дзейнасцю — замаўлёўваюць фарбай з балончыкаў ці заціраюць падэшвамі мастацтва папярэднікаў. Высілкі забяліць прыпынак вапнай і такім чынам вымкнуць яго з творчага працэсу апынаюцца марнымі — рызома працягвае існаваць і пашыраць свае шматлікія парасткі.

Прыпынак як панятак па сваім вызначэнні ўяўляецца тым, што знаходзіцца ў перманентна пераходным стане. Будынак прыпынку — гэта апрыёры пункт руху: праз яго пралятаюць, не затрымліваючыся, таварнякі, а для пасажыраў гэта не больш чым месца паміж выпраўным і канцавым пунктамі прызначэння. Але менавіта ў гэтай прасторы «паміж» — свабоднай ад семантычнай татальнасці — адбываецца прыкладанне творчых сілаў, агаляецца разрыў вясковай паўсядзённасці. Уяўнасць прыпынку як фізічнага аб'екта падкрэсліваецца фактам яго разбурэння напрыканцы апаведу. На месцы «нерукатворнага помніка» паўстае шкляны акварыюм-сімулякр, паверхня якога непрыдатная для праяваў культуры. Разам з прыпынкам знікае і ананімная шматаўтарная творчасць як акт.

На тле хэпенінгу парадаксальна выглядае ангажаваная ўключанасць апавядальніка, ягонае жаданне захаваць мастацкія аскепкі і прыхаваная горыч з нагоды стану сучаснай паэзіі. Значна больш постмадэрныя паводзіны дэманструюць персанажы апаведа, якія п'юць піва на іншым баку чыгункі, індыферэнтна назіраючы за творчай актыўнасцю. Ці лічаць яны вар'ятам (як мяркуе апавядальнік) таго, хто спрабуе занатаваць выпадковыя надпісы і тым самым парушыць правілы гульні? Верагодна. Ва ўсялякім выпадку роля аўтара для постмадэрнага апоседа занадта суб'ектная і «жывая».

Адметна, што мадэрныя рысы аўтара яўна канфліктуюць з ягонай свядомай пазіцыяй фемініста. У апаведах не проста заўважная сімпатыя да жаночых вобразаў — творца іранізуе з мужчынаў, якім складана існаваць у мужчынскім(?) грамадстве. Зрэшты, у зборніку ёсць адпаведны афарызм — «Найцяжэй выжываць у «сьвеце мужчын» не жанчынам, а самім мужчынам» (апавед *«Сямнаццаць імгненьняў музы, альбо Бататуйская літаратура XX стагодзьдзя ў эміграцыі ад «А» да «Ю»*). У такім падыходзе бачыцца трапнае назіранне аўтара, які здолеў зафіксаваць канцэптуальную дэфармацыю постмадэрнай матрыцы, калі ў пэўны момант галасы «прыгнечаных» атрымалі ўзровень легітымацыі, параўнальны з метанаратыўным парадкам. Сацыялагічна гэта нескладана патлумачыць: на Захадзе і ў краінах, якія знаходзяцца ў зоне ўплыву заходняй цывілізацыі, існуе цэлая плеяда інтэлектуалаў ды іншых экспертаў, для якіх абарона і прасоўванне правоў «меншасцяў» з'яўляецца асноўнай прафесіяй і заробкам. Маючы добра разгалінаваную інстытуцыянальную сістэму, лобі ў фундацыях, урадах і мас-медыя, тыя, хто прамаўляе ад імя «маргінальных групаў», здолелі пераразмеркаваць на сваю карысьць значную частку рэсурсаў (у тым ліку сімвалічны рэсурс) і тым самым прасунуць свае правілы гульні на ўзровень усяго грамадства. Выглядае так, што постмадэрн, захапіўшыся гульнёй з мікранаратывамі, празяпаў мадэрныя амбіцыі іх стваральнікаў.

У апаведзе *«Спажывец»* якраз такі выяўлена змена ў расстаноўцы сацыяльных сілаў, у першую чаргу што тычыцца базавага падзелу — гендэрнага. Тут апавед ідзе ад першай асобы фемміннай маркіраванасці, і праз гэта, мне падаецца, твор губляе частку мастацкага нерва, які прысутнічаў дзякуючы фемінізму апавядальніка-мужчыны. Жаночы погляд на сітуацыю прымушае канцэнтравацца на перажываннях гераіні і правакуе сфармуляваць для яе квазі-клінічны дыягназ. Сапраўды, дзяўчына блізу 30 год пакутуе ад адсутнасці «людзкай працы» і партнёра ў стасунках. Адначасова яна не выяўляе эмоцыяў у звязку са сваім звальненьнем і пераходам на яшчэ менш аплочваемую працу, а таксама яе раздражняе ўвага з боку мужчынаў. Калі адзін з наведвальнікаў бара, дзе яна працуе барменкай, запрашае яе на спатканне, дзяўчына размаўляе не столькі з кавалерам, колькі вядзе ўнутраны маналог, загадзя прагназуючы нулявы вынік сустрэчы. Сумесь комплексаў і фобіяў памнажаецца за кошт павышанай самарэфлексіі і самакантролю. Асабіста мяне ад падобнага прачытання апаведа выратоўвае тэзіс Дэлёза пра тое, што літаратуру нельга зводзіць да псіхааналізу.

Мне ўяўляецца больш цікавым інтэрперсанальны ўзровень, выкладзены ў апаведзе, а менавіта: прыхаванае адчуванне жанчынамі сваёй пераважгі над мужчынамі. Нягледзячы на незадавальненне сваёй прафесійнай ды сямейнай ідэнтычнасцю, галоўная гераіня з'яўляецца самадастатковай і захоўвае іранічную дыстанцыю да выпадковых знаёмцаў і неспрыяльных для сябе падзеяў. Пра выніку спаткання яна перажывае толькі таму, што няма чаго распавесці сяброўкам. Ейны ж кавалер пасля няўдалай сустрэчы вар'яцее і становіцца бамжом. Паўстае заканамернае пытанне: ці сапраўды ў «мужчынскім свеце» існуе залежнасьць паміж гендэрнай прыналежнасцю і паспяховай сацыяльнай адаптацыяй?

www.kamunikat.org

Героі аповеда *«Твар»* — таксама моцныя жанчыны і разгубленыя мужчыны. Спачатку сюжэт нічым не выдае інтуіцыі аўтара. Маладая дзяўчына (ці хутчэй нават дзяўчынка) удзельнічае ў тэлевізійнай праграме для дарослых — порнакастынгу і ў здымках порнафільма, — каб пераканаць аднакласніка ў сваёй нестарамоднасці. Толькі адна гераіня мае імя — Надзя, а астатнія персанажы ў лепшым выпадку маркіруюцца загалоўнай літарай. Развіццё падзеяў дэманструе не проста адважнасць Надзі. Ейныя радыкальна антыпатрыярхальныя паводзіны — індыферэнтнасць да ўласнага цела як сексуальнага аб'екта і аб'екта спажывання — разбураюць ідэалогію папулярнай перадачы і соцыума ў цэлым. Дзяўчына не саромеецца ўласнага нязграбнага цела, не спрабуе выглядаць эратычна, а паводзіць сябе цалкам натуральна, нібыта знаходзіцца па-за ўплывам часавых і сацыяльных варункаў.

«Пудзіла з анёльскім тварам» як контркультурны вірус выкрывае ўсю штучнасць і гульнёвасць (пост) сучаснага грамадства, якое па сваёй сутнасці засталося глыбока патрыярхальным. Вось таму дарослыя мужчыны апынаюцца ў стане няўпэўненасці і нават сораму, а Надзя — калі выкарыстаць штамп акадэмічнай савецкай крытыкі — атрымлівае маральную перамогу над светам татальнай камерцыяналізацыі. Дзяўчына імкнецца даказаць сваю сучаснасць, але фактычна яна й так апынаецца па-сапраўднаму «сучаснай», у адрозненне ад тых, для каго ўстаноўка сучаснасці — гэта толькі даніна модзе і жаданне быць у мэйнстрыме. Як мне падаецца, высновы аповеда «Твар» мусяць быць зроблены менавіта ў сацыялагічным, а не маральным рэчышчы, тым больш што аўтар вызначае жанр свайго твора як фельетон, а Надзя за ўдзел у праграме атрымлівае ганарар.

Што тычыцца жанравых вынаходак зборніка, увагу на сябе звяртаюць апавед-кампутарная гульня *«Экспэдыцыя ў Шынан»*, верш з каментарам *«Анэйрычная дыеталёгія»*, старонкі з энцыклапедычнага даведніка *«Сямнаццаць імгненьняў музы, альбо Бататуйская літаратура XX стагодзьдзя ў эміграцыі ад «А» да «Ю»*, храналагічны апавед *«Кароткая гісторыя П.А.Р. у датах»*, ліст пацыента псіхіятрычнай клінікі *«Ліст, знойдзены на папялішчы»*, *«Дзёньнік аднаго падарожжа»*. Вышэйпералічаныя жанры маюць рысы постмадэрнай разамкнутасці, адкрытасці да саўдзелу, інтэртэкстуальнасці, шызафрэніі. Аднак дыхтоўна прадуманыя формы ды адшліфаваны стыль часам канфліктуюць з экзістэнцыяльным кантэнтам. У часе чытання прозы Макса Шчура мяне, як і ў выпадку з ягонай паэзіяй, не пакідае адчуванне вусцішу і надрыву. З аднаго боку, аўтар здзекуецца практычна з усяго. Для яго не існуе забароненых тэмаў: сямейныя каштоўнасці, секс, нацыяналізм, творчасць калегаў, уласны мастацкі геній — усё падпадае пад дэканструкцыю. Але ў той жа час аповеды насычаны вострымі рэакцыямі аўтара на паўсядзённасць, прыхаваным імкненнем вырвацца з сітуацыі гульні і перманентнай нявызначанасці.



У творы *«Дзёньнік аднаго падарожжа»* герой па гадзінніку апісвае сваю незавершаную вандроўку на электрычцы. Сам факт падарожжа займае не больш 5 хвілінаў, але паспявае справакаваць вандроўніка на раскрыццё свайго супярэчлівага ўнутранага свету. Перадусім, як і ў большасці іншых аповедаў, вызначыць месца знаходжання героя немагчыма. Па ўскосных сведчаннях геаграфія часам звужаецца да Цэнтральна-Усходняй Еўропы, хаця зноў такі варункі мультыкультуралізму не дазваляюць сказаць напэўна.

«Дзёньнік» уяўляе сабой крытычны мікс негатыўных эмоцыяў, перажыванняў, хранічнай стомленасці, прыступаў шалу, фізічных ды духоўных паталогій — адным словам, праяваў аголенай экзістэнцыі сучаснага чалавека. Перапоўненая пахамі і людзямі электрычка з'яўляецца квінтэсэнцыяй усяго таго, што замінае жыць індывіду са здольнасцямі да рэфлексіі. Лакальная маркіроўка, зразумела, ужо не мае значэння: на першы план — ва ўмовах немагчымасці змяніць варожую рэчаіснасць — выступае асоба, ейнае духоўнае жыццё. Вастрыня ўспрыняцця героя — надзвычайная, ён бачыць найменшыя рухі жыцця вакол сябе, якія аднак змушаюць яго яшчэ глыбей занурацца ў сябе і ў графаманства.

Дасціпна і трапна ён каментуе вонкавыя падзеі і людзей — трыццацігадовага дзецюка, які вучыцца ездзіць на скейтбордзе, бо без гэтага «яму не дасць ніводная маладзейшая дзяўчына»; пенсіянераў, якія праз бязглуздую спрэчку ледзь не скончаюць на чыгуначных рэйках калектыўным самагубствам; пасажыраў, якія «ўспрымаюць цягнік, як быка на карыдзе — скачуць перад ім, уцякаюць ад яго, дражняць». Усе назіранні прасякнуты глыбокім сарказмам і нелюбоўю да рэальнага свету. Вакольная рэчаіснасць становіцца крыніцай нянавісці героя ў тым ліку да самога сябе. Ягоны крызісны стан узмацняецца ўсведамленнем уласнай тоеснасці з «потнымі, маўклівымі, ніякімі» і адпаведна адчуваннем сораму за такое падабенства. Свой пратэст герой выказвае дэманстратыўным актам запісвання ў нататніку спарадычных думак, што таксама з'яўляецца спосабам згасіць прыступы агрэсіі і нянавісці.

Значна спакайнейшым тон аповеду становіцца, калі герой пакідае перапоўнены вагон, застаецца сам-насам і рушыць пешшу назад дахаты. Нервовыя назіранні саступаюць месца радасным фантазіям пра тое, што ён апынуўся ў іншай краіне адзіным чалавекам. Натхненне не пакідае героя і ў вясковай рэстарацыі, у якой яму бачыцца «аазіс звычайнага, простага, цалкам легітымнага й асэнсаванага народнага жыцьця».

Такое экзістэнцыяльнае апісанне падарожжа наўрад ці адпавядае заявам аўтара пра постмадэрную маркіраванасць сваёй творчасці. Праявы стомленасці, антыабывацельскі пафас, скандальнасць, пошук сэнсу характэрны хутчэй для познемадэрнага суб'екта. Апошняй кропкай, якая пера-

www.kamunikat.org

конвае ў мастацкай прыхільнасці аўтара да традыцыяналізму, з'яўляецца лагічнае (!) завяршэнне «Дзёньніка», якое выліваецца ў паведамленне пра аварыю пакінутага героем цягніка.

І што атрымліваецца: перманентны перфоманс адступае перад літаратурай як тэкстам са сваёй мастацкай задумай, мэтазгоднасцю і каштоўнасным грунтам. Макс Шчур удала выкарыстоўвае постмадэрныя абалонкі для ўвасаблення анталогіі ды рэанімацыі ў новых варунках мадэрных установак. Гэткі сплаў робіць маладога творцу адметнай з'явай сённяшняй літаратуры.

Дарэчы, творчасць Макса Шчура ўвогуле ставіць пытанне пра мэтазгоднасць падзелу літаратуры паводле геаграфічнай прыкметы. Цяпер, калі людзі маюць магчымасць вандраваць і жыць па ўсім свеце, губляюцца межы метраполіі і перыферыі. Больш актуальнай катэгарыяльнай адзнакай выступае самавызначэнне самога пісьменніка і ягоная інтэлектуальная, маральная і сацыяльная здольнасць прыняць сучасныя глабальныя выклікі.

Макса Шчура з упэўненасцю можна ўпісаць у тыя ці іншыя трэнды сучаснай літаратуры Беларусі. Удалы пошук постмадэрных форм параўнальны з творчасцю Сяргея Балахонава і Альгерда Бахарэвіча. Для Югасі Каляды, Марыйкі Мартысевіч і Віктара Марціновіча гэтаксама важна апісаць і зразумець унутраны свет сучаснага маладзёна ва ўстаноўцы паўсядзённасці. Разам з Сяргеем Прылуцкім Макс Шчур выкарыстоўвае ў апоседах піджнмову (трасянку) для вызначэння межаў мастацкага ў літаратуры. Дэтэктыўныя павароты сюжэта выпісаны гэтак жа вытанчана, як ва Уладзіміра Сцяпана і Максіма Клімковіча. Сур'ёзнасць да творчага працэсу вельмі нагадвае Алеся Аркуша. Лёгкасць стылю ў апісанні экзотыкі эміграцкага досведу падобна да твораў Алеся Асташонка. Асцярожнае і чуйнае заглыбленне ў гендэрныя пытанні можна параўнаць з мастацкім падыходам Наталкі Бабінай. У апоседах Макса Шчура гэтаксама паталагічна выражаны апакаліптычныя настроі, як у Юрыя Станкевіча. Захапленне метафізікай і пошукі адказаў на быційныя пытанні збліжаюць яго з беларускімі творцамі старэйшага пакалення.

Сваёй творчасцю Макс Шчур дэкларуе, што сучасны інтэлектуал не вымагае класіфікавання, ён сам становіцца пунктам адліку для новых генерацый і інсайтаў. Малады творца сам сабе стварае кантэкст і сам яго дэканструюе. Макс Шчур, не прэтэндуючы на місіянерства, спрабуе наноў сфармуляваць фундаментальныя пытанні і падштурхнуць кожнага канкрэтнага чалавека да самастойнага пошуку адказаў. Як па мне, у гэтым сёння і заключаецца няхай сціплая, але гранічна неабходная роля сучаснай літаратуры і ейных стваральнікаў.



# Алена Гінак

**літаратуразнаўца. Пасля заканчэння ліцэя пры БГАКЦ працягнула навучанне на філалагічным факультэце. З 2002 года залічана ў аспірантуру БДУ, якую пазней паспяхова скончыла распрацоўкай тэмы: «Постмадэрнісцкая рэпрэзентацыя ў творчасці Умбэрта Эка». З таго ж года з'яўляецца выкладчыкам замежнай літаратуры на філфаку, а таксама аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў, прысвечаных сучаснай італьянскай літаратуры. Жыве ў Мінску.**

www.kamunikat.org

# У пошуках прыгажосці, альбо Лабірынты дзівос Умбэрта Эка

**«Усе кажуць Італія, Італія, але як паглядзіш — бот ботам!» — пад гэтымі вядомымі словамі мог падпісацца амаль кожны пры гутарцы пра сучасную італьянскую літаратуру, і толькі спакушаны чытач прыгадваў імены І. Кальвіна, П. П. Пазаліні ці Л. Пірандэлла. Так было да 90-х гадоў мінулага стагоддзя.**

Умбэрта Эка зачараваў грамадскасць сваім раманам «Імя ружы», узорным творам пастмадэрнісцкай гістарычнай матапрозы. Наступны раман «Маятнік Фуко», пра абсурднаць ідэі сусветнай змовы, не толькі натхніў ледзь ні армію асоб на прадзіва павуціны самых разнастайных фактаў, домыслаў ды міфаў. Як вынік, з'явіліся разнастайныя сеткавыя гульні, а таксама шэраг твораў, на хвалі якіх вылучыліся раманы Д. Браўна. Далей у свет выйшлі яшчэ тры раманы Эка, кожны з якіх стаў важнай падзеяй у літаратурным свеце. Апошні на сёння раман «Таямнічае полымя каралевы Лааны» з'явіўся ў 2004 годзе і выклікаў досталь здзеклівых водгукаў, быццам прафесар балонскага ўніверсітэта вырашыў пайсці простым шляхам: выцягнуць з паддашку запыленыя рэчы і ўспаміны маленства і на іх падставе стварыць настальгічную атмасферу Італіі 30-50 гадоў, часоў даўно мінулых і ўбачаных вачыма дзіцяці. Але ці не паспяшылі пакпіць аматары лёгкіх для ўспрымання і неверагодных інтэлектуальных гульняў? Прайшло дастаткова часу, каб разгледзіць нейкі плён.

Найперш узгадаем, што сіньор Эка, патрыярх семіётыкі, медыевіст, выдатны знаўца творчасці Дж. Джойса і ў пэўным сэнсе тэарэтык пастмадэрнізма, мае ўражлівую вагу ў навуковым асяроддзі. Толькі пералік ганаровых званняў і ўзнагарод займаў бы добрую старонку, а самы сціплы агляд навуковых прац — яшчэ болей. Зразумела, што надрукаваная ў 2007 годзе «Ад дрэва да лабірынту» не ўзнікла на пустым месцы. Асноўнае пытанне, якое Эка задае: што ляжыць у аснове чалавечага мыслення? Шлях да адказу праходзіць праз гісторыю да сучасных палемік з постструктуралістамі, постмадэрністамі і італьянскай школай «слабой думкі», якая сцвярджае, што «факты не існуюць, ёсць толькі іх ітэрпрэтацыя». На дапамогу ў сцвярджэнні ўласнай пазіцыі навукоўца прыходзіць паняцце энцыклапедыі. Для Эка гэта не проста навукова-даведніцкае выданне, а метафара карціны свету, якая ўмяшчае ўсе маўлівыя веды і ўяўленні, даступныя досведу як цывілізацыі, так і кожнай асобы. Характэрнай рысай энцыклапедыі з'яўляецца яе накапляльная структура, якая дазваляе спалучаць звесткі без усялякага размежавання на праверанын і выдуманыя ці ўпарадкаваныя веды. Галоўнае — выказанасць, прыняцце той або іншай думкі ў грамадстве. Такім чынам, асноўным прынцыпам энцыклапедыі бачыцца найбольш поўная інтэрпрэтацыя Сусвету. Прыкладаў такой структуры мноства: ад сярэднявечных энцыклапедый, накшталт «Фізіёлага», да борхесаўскай класіфікацыі жывел, якія падзяляюцца на «а) належных да імператара, б) набальзамаваных, в) прыручаных, г) смактуноў, д) сірэн, е) казачных, ж) асобных сабакаў, з) унесеных у гэтую класіфікацыю, і) бегаючых бы звар'яцелыя, к) шматлікіх, л) намаляваных танчэйшым пэндзлем з вярбдюджай поўсці...». Энцыклапедыя валодае некалькімі цікавымі ўласцівасцямі. Найперш, яна дазваляе ўнутраныя спасылкі на падставе аналогій і асацыяцый, якія неабавязкова маюць рацыянальна-лагічнае абгрунтаванне. Па-другое, такая структура дазваляе стварэнне новых інтэрпрэтацый у залежнасці ад умоў і абставін. І нарэшце, яна не спакушаецца на завершанасць і канчатковасць сваіх сцверджанняў.

Менавіта структура энцыклапедыі стала асновай для ці не самага ўдалага праекта У. Эка ў новым XXI стагоддзі — серыі вытанчаных выданняў, прысвечаных пытанням эстэтыкі, што ўключае «Гісторыю прыгажосці» і «Гісторыю пачварства». Гісторыямі гэтыя творы названы выключна на той падставе, што грунтуюцца на матэрыяле розных эпох у заходнееўрапейскай культуры. Па словах самаго У. Эка, першапачатковай ідэяй было даць уяўленне пра тое, як людзі ў розныя часы разумелі і адчувалі Прыгажосць ці, адпаведна, пачварства. Аднак сам навуковы тэкст — гэта толькі зыходны пункт для сутыкнення паліфанічнага мнагагалосся выяў, літаратурных тэкстаў, разваг мысляроў, навукоўцаў, містыкаў ды тэолагаў. Гэтыя працы можна ўспрымаць і як тэматычныя альбомы з якаснымі ілюстрацыямі, і як анталогіі разнастайных тэкстаў з прафісійнымі каментарамі, і як навуковыя даследванні, якія датычацца актульных праблем і выкарыстоўваюць мультымедыйны прынцып выкладання. Пастмадэрнісцкі прынцып нон-селекцыі, які, дарэчы, быў распаўсюджаны ў сярэднявечных творах па апісанню рэчаіснасці, дазволіў наглядна прадэмастраваць цікавыя сувязі, напрыклад, паміж экзальтацыяй машыннай моцы футурызма ў XX стагоддзі, эстэцкімі прыладамі Эрона Александрыйскага (І ст да н. э.) і нястомнай вынаходніцкай дзейнасцю Леанарда да Вінчы альбо паміж Венерамі каменнага веку і эратычнымі фота на сучасных календарах.

Нічога ў культурнай спадчыне не праходзіць бясследна: кожны рух творчага духу чалавека займае месца ў інтэртэкстуальнай прасторы і рэхам адгукваецца ў будучыні. Старажытная Грэцыя развіла паняцці «калакагацыя» (прыгажосць, якая гарманізуе душу і цела) і «калон» (тое, што да спадобы). Антычнае ўяўленне пра прыгажосць як гарманічная і ўпарадкаваная суад-



www.kamunikat.org

несенасць розных элементаў мае непасрэднае дачыненне да далейшых пошукаў гармоніі праз матэматычныя формулы прапорцый, рытмы і метры (піфагарэйсі тэтракціс, залатое сячэнне, вітрувіанаў чалавек), да сімволікі лічбаў і колераў, а таксама да маральна-этычных каштоўнасцяў, бо «дабрадзейныя паводзіны адпавядаюць слушнай прапорцыі словаў і спраў». Каноны жаночага харава ці ідэалы гераічнай асобы, пачуццёвая прывабнасць ці духоўная дасканаласць, прыгажосць магічная і звышнатуральная ці штодзённая і практычная — калейдаскоп разнастайных выяў, турботных мрояў ды вытанчаных разважанняў ствараюць стракаты малюнак крокаў да Ўзвышанага, Нявыказнага і Неабсяжнага, што спрадвек вабіць чалавецтва.

Вопыт розных эпох стаўся асновай сучаснага светабачання і тых ідэалаў, якія зараз распаўсюджваюцца ў кіно, музыцы ці індустрыі моды. Сучасны стан культуры прымушае думаць, кананічныя ідэалы прыгажосці засталіся ў мінулым і цяпер уладарыць «оргія талерантнасці», «татальны сінкрытызм» і «абсалютны і несупынны політэізм Прыгажосці».

Шлях нашай цывілізацыі ідзе не толькі ў напрамку да абстрактнага ідэала, адкідаючы ўсё, што лічыцца памылковым, шкодным ці дысгарманічным. Яшчэ Геракліт казаў, што прыгажосць свету праяўляецца як казуальнае бязладдзе, таму сапраўдная гармонія ўзнікае з напружаннага ўзаемадзеяння супрацьлегласцяў. Пытанне пра прывабнае адлюстраванне вычварнага паўстала ў тыя ж даўнія часы, што і неабходнасць выявіць прыгажосць. Старажытная Грэцыя спарадзіла вобразы цыклопаў, хімер, кентаўраў, Сярэднявечча — пачвар, накшталт адзінарогаў, кінацэфалаў ды чарцей, якія закліканыя палохаць уражанне дабрадзейных хрысціян. Выявы болю, смерці ды пакут — неад'емная частка еўрапейскага мастацтва. Тым не менш, толькі ў асяроддзі рамантыкаў ды дэкадэнтаў пачалося адкрытае абмеркаванне чароўнасці жарстлівага і прывабнасць дэманічнага.

Тэма жудаснага, мярзотнага, кашмарнага, банальнага, непрыстойнага, моташлівага, сатанінскага, дрэннага, жорсткага, бязглуздага, агіднага, грубага і наўпрост непрыемнага развіваецца ў наступнай кнізе «Гісторыя пачварства». Брыдкае не з'яўляецца самастойнай эстэтычнай катэгорыяй, нават калі вызначаецца ў супрацьпастаўленні з прыгажосцю, і ў яго няма сваіх філосафаў і тэарэтыкаў. Асноўная падстава яго азначэння — індывідуальны густ кожнай асобы, агульнакультурныя каштоўнасці ці, нават, сацыяльны фактар, як тое намагаўся даказаць К. Маркс. Італьянскі даследчык вылучае «фармальную брыдкасць» або парушэнні прапорцый і «брыдкасць саму па сабе», але іх абедзьве можна зграбна перадаць мастацкімі сродкамі.

«Гісторыя» дэманструе самыя разнастайныя адносіны да таго, што не лічыцца нармальным ці прыгожым, і пачынаецца яна з Антычнасці, якая спарадзіла шматлікія міфы, дзе пануюць хтанічныя монстры, жах і жорсткасць. Хрысціянскае Сярэднявечча прапанавала новы позірк на феномен: пачвары таго ці гэтага свету з'яўляюцца стварэннямі боскімі і таму не могуць парушаць сусветную гармонію. Празмерныя пакуты, катаванні ды смерць Хрыста служаць павучальным прыкладам і выклікаюць ужо не агіду, а замілаванне і захапленне моцай чалавечага духа і веры. Сярэднявечча адкрыла такія тэмы, як трыумф смерці, танец смерці, апакаліптычныя і інфернальныя папярэджанні; да таго ж шматлікія фрагменты тэкстаў і спасылкі на сучасных аўтараў і рэжысёраў сведчаць аб іх актуальнасці і на сённяшні дзень. Асобнае месца займае пералік страхаў, жудасных прыкмет будучых бедстваў, якія іх увасабляюць. Яны больш звязаны з эмацыйнай сферай і несвядомым. Пачынаючы ад эпохі Рамантызму да нашых дзён, чалавечая свядомасць няспынна працуе над папаўненнем іх орд — ад Франкенштэйна і Дракулы да хадзячых мерцвякоў і прышэльцаў. Гэтаксама і вобраз д'ябла прыстасаваўся да розных эпох, і ў XX стагоддзі ён атаясамліваецца з крывавымі дыктатарамі, персанажамі коміксаў ды фільмаў, дзе вядзецца барацьба з ворагамі чалавецтва.

Брыдкае выклікае не толькі жах, але і смех, асабліва калі яно звязана з непрыстойным і вульгарным. Прыап і саціры, вясёлыя карлікі і базарная блазены, карнавальнае вызваленне ад правіл і гратэскныя дэфармацыі карыкатур — гэта прыкметы камічнага ўспрымання ўсяго, што выходзіць за межы нармальнага эстэтычна дазволенага.

Мяжа XIX і XX стагоддзя прайшла пад знакам дэкаданса з яго эстэтызацыяй зла, але з станаўленнем авангардызма можна казаць пра ўрачыстае ўсхваленне пачварнага, якое правакуе, парушае традыцыйныя эстэтычныя каштоўнасці. Дастаткова ўзгадаць экзальтацыю вайны і «выхаванне брыдкім» італьянскіх футурыстаў, «тэатр жорсткасці» А. Арто, эстэтыку спажытага Э. Уорхала.

Што датычыцца сучаснага жыцця, то цікавасць да пачварнага прыносіць камерцыйны поспех прадукцыі індустрыі забаў. Брыдкае і абуральнае часта выкарыстоўваецца ў *happenings* і *perfomances*, становіцца стылем адзення і жыцця некаторых субкультур, выходзіць у эфір праграм пра навіны і на старонкі газет. Але наш час як ніколі ўважлівы і адказна ставіцца да феномену пачварства і іншаснасці, бо, перайначваючы словы Гётэ, «хто мае смеласць прысвяціць сваё жыццё палягчэнню пакут гаротнікаў, здабыў права разважаць пра іх».

Пошук прыгажосці і пераадоленне брыдкіх і пачварных рэалій — той шлях, які мае сэнс пакуль ён развіваецца. Не супыняцца і памятаць, каб не згубіцца ў лабірынтах дзівос — ці не самая паўторная думка сіньора Эка ў апошніх творах.

www.kamunikat.org

Ва ўзгаданай серыі асобнае месца займае праца «Галавакружэнне спіса». Гэта такая ж эцыклапедыя, як і папярэднія творы, але цяпер гутарка вядзецца пра прыёмы і сродкі яе стварэння. Найперш У. Эка праводзіць размежаванне паміж спісамі з адкрытай і закрытай формай. Тут паўтараецца думка пра «выказанасць» формы, бо менавіта тое, што акрэслена формай і з'яўляецца яе мяжой. Адкрытая форма прадугледжвае альбо бясконцую колькасць пазіцый і на яе заканчэнні можна паставіць «і г.д.», альбо ўзнікае калі немагчыма ясна вызначыць яе сутнасць. Такім бясконцым спісам, дзе прыгадваюцца караблі грэкаў, пачынаецца «Іліяда» Гамера. Што датычыць выяўленчага мастацтва, форма атрымліваецца заўжды закрытай, бо яна абмяжоўваецца прасторай, якую фізічна займае, але змест дазваляе пашыраць межы, што можна назіраць у «Садзе асалод» І. Босха і розных галандскіх нацюрмортах. На старонках гэтага рафініраванага выдання мысляр складае мазаіку тонкай інтэлектуальнай гульні, якая набывае голас і знешні выгляд за кошт цытат і ілюстрацый. Спісы нявыказанага, надзённых рэчаў, выдуманых і далекіх мясцін, дзівос і галавакружныя спісы камбінаторных гульняў, паэтычныя і практычныя спісы і шмат іншых у займальнай і дасціпнай форме асэнсаваны даследчыкам.

Мажлівасці спісаў, пералікаў, каталагізацыі і стварэння калекцый не менш бясконцыя за рэчы, якія яны могуць змяшчаць: яны ўпарадкоўваюць рэчаіснасць, сістэматызуюць самы разнастайны вопыт і веды, надаюць рытм і абуджаюць адпаведныя пачуцці і настрой, выкарыстоўваюцца ў навучальных мэтах. Калекцыі і знойдзеныя скарбы дапамагаюць навукоўцам аднавіць гістарычную сітуацыю і ўладкаваць музеі і кунсткамеры.

У гісторыі мастацтва ёсць неверагодная колькасць цудоўных узораў спісаў з разнастайнымі структурамі — ад лінейных і рацыянальна ўпарадкаваных да хаатычных і рызом, што падобны да карэнішча некаторых дрэў, пазбаўлены цэнтра ці фіксаваных пунктаў і могуць стварадь перакрыжаванні ў любым месцы. Магчымасці для плённага карыстання спісамі выпрацавала рыторыка і яна прапаноўвае цэлы арсенал сродкаў: акумуляцыя, пералічэнне, накапленне, перыфраз, градацыя, інверсія, анафара, эпіфора, полісіндэтон і не толькі.

У творы ізноў гучыць думка, што ў заходнееўрапейскім грамадстве ў Сярэднявечча была вынайдзена найбольш удалая структура для апісання і сістэматызацыі сусвету. Тагачасныя бестыярыі, лапідарыі, кнігі вандровак і дзівос сталі асновай для барочных каталогаў, якія ўпершыню дазволілі весці гаворку пра бясконцасць, якая разгортваецца ў спісах, і пераадолець замкнёнасць формы. Пастмадэрнісцкае светаадчуванне часцей за іншыя эпохі звяртаецца як да бясконцых і празмерных, так і да хаатычных спісаў, пазбаўленых адзінай падставы для іх складання. Такім чынам, па сцвярджэнню Эка, спісы з'яўляюцца ледзь ні самым адэкватным спосабам спасціжэння свету і маюць фактычна невычарпальныя магчымасці для мастацтва.

Тут варта звярнуцца да рамана «Таямнічае полымя каралевы Лааны» як да літаратурнага эксперыменту, у якім сталы чалавек губляе сваю «уласную энцыклапедыю» або іншымі словамі памяць пра індывідуальны досвед, але цудоўна памятае факты гісторыі і культуры. Так, на простае пытанне, як яго імя, узнікае шэраг адказаў, выбраных з неабсяжных прастораў інтэртэкстуальнасці. І гэтак далей: на кожнае, нават самае банальнае пытанне, можна адказаць цытатай, кожную рэч ці ўражанне можна агарнуць параўнаннямі ці трапнымі метафарамі.

Атрымліваецца парадаксальная рэч: чалавек здольны ўспрымаць толькі тое, што знаходзіцца ў кампетэнцыі яго «энцыклапедыі», альбо іншымі словамі — тое, што кімсьці было некалі праартыкулявана. Але пры гэткім падыходзе, ці не адмаўляецца ўнікальнасць чалавечай асобы? Не дзіва, што галоўны герой не ў стане проста жыць і рухацца далей, бо кожны крок — гэта больш ці менш асэнсаваны выбар. Каб яго ажыццявіць, суб'ектыўнае стаўленне больш карысна за самыя выкрунтасныя высакалобыя разважанні.

З гэтага пачынаюцца прыгоды ў стылі пошукаў страчанай самаідэнтыфікацыі. Можна было б чакаць, што герой пад праглядам дактароў пройдзе курс псіхааналізу, каб расчыніць дзверы памяці. Аднак сталы антыквар вырашае звярнуцца да сваёй звычайнай працы — складання каталога таго, што калісьці магло ўразіць яго ці прыносіла асалоду. На пэўным этапе высвятляецца, што рэчы самі па сабе не маюць сэнсу, аднак здольныя распавядаць пра густы і характар іх гаспадароў, эпоху, калі яны былі створаны і нават пра пануючую ідэалогію часоў іх выкарыстання. Іх сукупнасць стварае атмасферу, якая зачароўвае і абуджае тое нявыказанае, што робіць унікальным чалавечы досвед. Аўтар сцвярджае, што часам самыя мізэрныя рэчы мацней уздзейнічаюць на асобу, чым дасягненні высокай культуры. «Таямнічае полымя каралевы Лааны» змяшчае разнастайныя выявы: ад коміксаў і эстампаў да марак, скрынак з-пад мыла і цыгарэт. Ідэя каталога прысутнічае і ў кампазіцыі твора, паколькі напрыканцы асноўнага тэкста змяшчаецца паказальнік крыніц цытат і ілюстрацый. Аднак заўважна, што гэта толькі прыкладны спіс, які змяшчае тое, што складальнік вылучыў як найбольш істотнае, і апускае «неўсвядомленыя» запазычанні. Ствараецца эфект узгадвання не толькі персанажам свайго мінулага, але і далучэння да гэтых блуканняў па інтэртэкстуальнасці і чытача твора.

Эка-семіётык эксперыментуе са спалучэннем розных культурных кодаў: традыцыйнае ілюстраванне мастацкага слова ўзбагачаецца прыёмамі кінематографа, СМІ (газет, часопісаў мод, лістовак, радыё), калажам, а са-

www.kamunikat.org

старэлая нянька гатуе ўлюбёныя з маленства героя стравы. Гэткім чынам сіньёр Бадоні ўсімі органамі пачуццяў абдымае свет і даведваецца, што ж яго звязвае з былым. «Каталог мінулых часоў» дазваляе спасцігнуць, што дзіцячыя кнігі стварылі ідэал актыўнай асобы, схільнай да прыгод і смелага пераадолення любых цяжкасцей; энцыклапедыі, атласы, эстампы на сценах абудзілі цікавасць да мінулага; жаночыя часопісы і рэпрадукцыі вядомых карцін садзейнічалі стварэнню ўяуленняў пра жаноцкасць; знаёмства з кіно мела правакацыйны характар і прывяло да адкрыцця сексуальнасці. Вопыт «пражывання» нанава маленства, ваенных часоў і далейшага аднаўлення краіны ў 50-60 гады дапамог герою не толькі аднавіць памяць, але і адчуць сваё месца ў грамадстве.

Цікавым уяўляецца і фінал твора: герой не здолеў канчаткова рэканструяваць памяць, але ён аднаўляе сферу эмацыйнага ўспрыняцця, адбудоўвае перакананні, ідэалы і напаўняе памяць звычнымі з маленства вобразамі. Апошнія старонкі «Таямнічага полымя каралевы Лааны» апісваюць перадсмяротную агонію свядомасці, у якой адбываецца дэканструкцыя, пераазнсаванне і гібрыднае зліццё вобразаў, думка рухаецца за мудрагелістай гульнёй асацыяцый, пазбаўленых лагічнага цэнтра. У калажах пададзена рыштаванне ў выглядзе лесвіцы, з якой сыходзяць персанажы коміксаў і невядомы Святы. Разам з тым, лесвіца — гэта і старазапаветны сімвал сувязі паміж зямным і нябёсным светам, таму менавіта гэты элемент калажу ўвасабляе адыход Бадоні ў іншы свет. Паралель паміж традыцыйнымі прыкметамі пастмадэрнісцкай рэпрэзентацыі і паўтрызненнем згасаючай свядомасці відавочная.

Ці з'яўляецца гэта іранічным дыягназам сучаснага мастацтва застаецца вырашаць чытачу.



# Алесь Пашкевіч

паэт, празаік, літаратуразнаўца. Аўтар кніг: «Нябесная сірвента», «Пляц волі», «Зваротныя дарогі», «Круг» і інш. Нарадзіўся ў 1972 годзе ў в. Набушава на Случчыне. Жыве ў Мінску.

www.kamunikat.org

# Дрэва,
# або Што без кораня — не расце

## А

У класе чацвёртым ці пятым атрымаў я двойку. Першую і, спадзяюся, апошнюю ў жыцці. Двойку па мове...

Пачыналася вясна, абуджалася зяленіва, і ў слупок з адушаўлёнымі назоўнікамі я шчодра ўпісаў і бярозу з дубам. А яны, аказваецца, як цвердзіла школьная граматa, прадметы неадушаўлёныя, г.зн. нежывыя.

Аніяк не цяміла мая галава, чаму яно так і чаму назоўнік «труп», наадварот, — адушаўлёны...

Калі не вядома, што з'явілася першым — яйка ці курка, дык у супастаўленні чалавек і дрэва ўсё зразумела. Таму, натуральна, хто ўжо злез з яго.

А першымі тое, па-мойму, зрабілі друіды — паэты-жрацы старадаўніх кельтаў. І з тысячагоддзе не дажылі, каб спартызаніць немцаў-нацыстаў, па загадзе якіх выразалі сотні дубоў за вёскай маіх набушаўскіх дзядоў, а разам з тымі нацыстамі дапартызаніць і дрэвасекаў развітога сацыялізму, якія збаёдалі не адну прыпяцкую дубраву.

Друіды нашмат болей за нашых настаўнікаў кумекалі і ў пытаннях педагогікі, хоць — па шчырасці — іхнія альмаматэры праходзіць не хацелася б: кандыдатаў у друідскую касту чакала ў пагудасе-лесе выпрабаванне адзінотай (каля 20 гадоў жылі і навучаліся яны ў святых пушчах). Затое з маіх мрояў аніяк не можа выблытацца сухаваты белабароды жрэц, які на шосты дзень маладзіка вядзе да аграмаднага вяза двух белых быкоў, завязвае ім рогі і ўзлазіць на вузлаватыя галіны; залатым сярпом — як месяцам — зразае крыважэру-амялу, кладзе ў свой белы хітон; злятае на зямлю і ў спевах суродзічаў тым жа сярпом перацінае быкам гарлякі. Змочаная ў ахвярнай крыві амяла пасля таго станавілася цудадзейнымі лекамі, магла ратаваць нават ад наймоцнай атруты, толькі ж мне трызніцца іншае: барадаты друід пытлюе той амялой-венікам то немцаў-нацыстаў, то дрэвасекаў развітога сацыялізму, то маю настаўніцу мовы, а то і — часцей — мяне самога...

Хрысціянства таксама паўставала на дрэве. Крыж, на якім распнулі Збаўцу, асіна, на якой павесіўся Юда...

І ўсё жыццё чалавек — з пакалення ў пакаленне — з дрэвам і ў дрэве: ад матчынай калыбкі да лёсавай труны.

І радавод ягоны — ад каранёў да кроны — таксама выяўляецца ў форме дрэва.

## Б

У ВЁСЦЫ мы патанаем у садах, кустах, лясах, аднак не заўважаем дрэваў — як тое, што было, ёсць і будзе. Не вітаем тых, якія не прыносяць пладоў. Гонім іх (нібыта ў нас абуджаецца цяжкая памяць трыполля, калі далёкія продкі мусілі адваёўваць у лясоў сваю жыццёвую плошчу: рэзаць, карчаваць, паліць — і вырошчваць на тым хлеб). Старая суседка, якая адолела за зіму два інсульты, з цяжкасцю даклыпала да майго плота і, заўважыўшы каля яго мятровы дубец клёна-самаростка, шчыра-клопатна раіць: «Абламі яго, а то вырасце»...

Мы не заўважаем іх — акрамя, хіба што, некаторых знакавых, памятных. Як тыя два вязы, пасаджаныя каля маёй бацькоўскай хаты яшчэ бацькам майго прадзеда. Іх два аграмадныя маякі доўга паказвалі мне дарогу на родны прычал-падворак — з якога б боку не дабіраўся дадому. Адхаваўшы пад сваім летнім ценем чатыры пакаленні Пашкевічаў і адсцяваўшы ім пад акампанемент зімовых завей начныя калыханкі, яны памерлі. Памерлі таксама — як і належыць — знакава і памятна. Бацькі пераехалі жыць да майго брата, падворак асірацеў, і ў бязветраную ноч адзін з вязоў...

«Школьная» мова не дазваляе развесці іх па полавай прыналежнасці, хоць я з маленства атаясамліваў тыя дрэвы і па роду (за што мог бы «схлапатаць» яшчэ адну двойку). Атаясамліваў і дзяліў іх на «яна» і «ён». Яна — вязыня — была больш шацістая, а знізу, паміж ствалом і карэннем, мела глыбокае дупло, у якое я доўга баяўся што-небудзь хаваць... Пазней даведаўся, што ў вязавай сям'і — некалькі дзясяткаў відаў, а ў свеце іх наогул завуць па-рознаму: ільм — ад яшчэ кельцкага «elm», па-латыні ulmus; на славяншчыне яшчэ — і ільмавік, і берaст, і карагач. Але мова чамусьці не развяла дрэвы па полавай прыналежнасці, не падзяліла (як і большасць раслінаў) на пары. Хай бы б, здавалася, кветкі гермафрадзіціліся сабе ў песціках ды тычынках... А дрэвы? Ці не мова ў тым вінаватая, а — закладзеная ў ёй міфалагічная памяць? Мама сполашна забараняла мне, падлетку, садзіць меншыя за мяне дрэвы-«мужчыны» (клён, дуб...), бо — казала — яны забіраюць рост. Тады я не вызначаўся даўжынёй і — як ні карцела — не парушаў загад.

Мова ж, адказваючы, вінаваціць ва ўсім прыроду, у сваё апраўданне прыводзячы зборна-сямейныя супрацьпастаўленні: ён-дуб — яна-дубрава; яна-хвоя — ён-хвойнік; яна-бяроза — ён-беразняк...

...Дык вось, калі падворак асірацеў, у бязветраную ноч вязыня ўпала. Акурат на комін, пасярод даху. І разваліла б сваім шматтонным целам хату, калі б не вяз, які рос на крокаў пятнаццаць бліжэй да сцяны. Ён і прыняў сяброўку на свае стогадовыя рукі ды на развітанне абняў яе — так моцна,

www.kamunikat.org

што ў самага магутнага раённага крана, калі сіліўся падняць і пакласці вязыну на вуліцу, зламалася страла.

А вяз засох у адзіноце на другую вясну — і яшчэ доўга раскідваў над вёскай свае безлісцёвыя галіны, пакуль знайшліся штукары распілаваць яго ды спусціць на зямлю.

Ані каліва ягонага я не змог ні парэзаць, ні спаліць...

## В

У ГОРАДЗЕ мы не тонем у садах, кустах ды парках, аднак бачым дрэвы — як тое, чаго не было, няма і не будзе...

Першую сваю кватэру па чарзе ў Саюзе пісьменнікаў у 1996 годзе я «атрымаў ад бацькі-прэзідэнта». Так, гэта раней ва ўсёй гісторыі СП яго членам жыллё давала дзяржава: ці сталічна-гарадское, ці сібірска-барачнае. А цяпер першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь распарадзіўся забраць дом, які будаваўся для парламентарыяў, і аддаць яго творчым работнікам. Не толькі распарадзіўся, але і асабіста прымаў яго «здачу». Сам зайшоў праверыць — акурат у мой будучы пад'езд — якасць тынкоўкі ды паклейкі шпалераў. А з ім — і тагачасны міністр культуры з драўляна-памятным



прозвішчам Сасноўскі. Міністр у прапагандысцкім запале доўга распавядаў журналістам пра незвычайныя дзівосы ўбачаных ім «творчых» кватэраў: «усё новенькае, усё зіхціць... нават замочкі на паштовых скрынях з ключыкамі...».

Мой родны бацька пасля таго быў перакананы, што паркет на сынавых метрах як мінімум пазалочаны, аднак не бедаваў, убачыўшы звычайную старую планіроўку ды мутнаваты лінолеум. Ані грама, дапіваючы на ўлазінах з сябрамі трохлітровік бацькавай самагонкі, не шкадаваў аб тым і я. І быў, натуральна, удзячны ўсім — ад бацькі роднага да бацькі прэзідэнцкага (хоць і ведаў, што дом у аніякіх парламентарыяў не адбіраўся; народным абраннікам узвялі даміну зусім па іншым праекце над Свіслаччу — нашмат бліжэй да цэнтра, чым тая «прэзідэнцкая» ў Малінаўцы). Быў, паўтараюся, удзячны, хоць размова — не аб тым.

А — пра дрэвы. Якія аж трашчалі ў колішняй вёсцы Малінаўка і якіх не стала ў новаўзведзеным на тым месцы аднайменным мікрараёне. Зрэзалі старыя сады ды прысады — і каля новых каменных сценаў і цяпер — праз дзясяткі гадоў — анічога толкам не расце. Збульдозерылі пласт чарназёму, угноены вясковым клопатам і потам — а на пустым пяску нават кусты не галіняцца. Як і тыя дубцы, якія будаўнікі ці жэсаўцы, дачуўшыся пра прэзідэнцкую праверку, імпэтна садзілі ў замерзлую зямлю. Перад домам ломам прабівалі дзіркі ды, як аловак завастрыўшы ствolік клёніка ці ліпкі, уганялі ў жоўты гравій. А вясной навасёлы дзівіліся, чаму ўраз тыя прысады засохлі. Некаторыя неразумныя апазіцыянеры (і такія прабіліся тады ў кватэрную чаргу па ордэры) зубаскалілі, што дрэўцы кеўкнуліся ад злоснага вока высокага інспектара, але ж мы яшчэ са школы ведаем: тое, што без кораня — не расце...

Не расце ўжо і яблыня-малінаўка над вырытым катлаванам, з якога пачалося будаўніцтва чарговага шматкватэрнага гмаху побач. Высільвалася па вясне яшчэ накінуць на сябе хаўтурны вэлюм з квецені — ды так і абвалілася ў кар'ер-дамавіну. У якую я паспеў укінуць свой амаль школьны вершык:

Кар'ера вузкая дамоўка
уаксамічана зімой.
Старая яблыня-вяскоўка
укленчыла перада мной...

Вакол — хрыбты мікрараёна,
выратавальны сонца круг
і госці: хворая варона
ды адзінокі вецер-зух.

www.kamunikat.org

А ноччу — сніць каля магілы,
як малады йшчэ гаспадар
на месяца двузубец-вілы
збірае копы вогкіх хмар, —

нябёсы znічкамі засее
і жменю зорачак-зярнят
малінаўкі мядова-спелай
пасадзіць ля каменных хат.

Сны — снамі, а ў рэчаіснасці бульдозеры дабраліся і да высозных вербаў ды алешын за недалёкай кальцавой. А яшчэ нядаўна з іх травеньскіх шатаў да вокнаў маёй малінаўскай кватэркі даносіліся салаўіныя спевы! Аднак не да пацераў... То бок — не да спеваў, калі дарогу пашыраюць...

Адляцелі салаўі, а за імі і я — на іншую кватэру, крыху большую, цішэйшую ды бліжэйшую да цэнтра. І пакуль «чэсныя» сарокі на сваіх руплівых хвастах разносяць чуткі аб тым, што я на варожыя гранты пабудаваў пентхаўз у элітным раёне (з гаражом і саўнай) ды з паркетнага кабінета сквапна пазіраю на пасольскія асабнякі, пад маімі лоджыямі на чацвёртым паверсе шыхтом-ланцугом растуць і пераўзыходзяць паверх злева направа: нестары вяз (з падрэзанымі жэсаўскай пілой галінамі), задуменная ліпа, падшыванец ясень, дзве гонкія бярозы, каржакаватаразлапістая акацыя (белая), пенсіянерка-вярба, апатычная сліва, абрыкос-асілак, два двухпавярховыя букеты бэзу (белы і фіялетава-ружовы) ды дванаццацімятровая елка (каржакаватыя дубцы туі ды язміну не згадваю). Растуць яны сабе хораша ды мяне цешаць. А яшчэ — і некаторых прадстаўнікоў нашага мірнага электарату, якім заманецца то бэзу адламаць, а то — як у вясковым садзе — натрэсці на закусь абрыкосаў: бала-зе растуць яны, не раўнуючы, з кулак.

А дзякуючы прэзідэнту і ягонаму штодзённаму клопату аб дабрабыце мінчанаў, неўзабаве недалёка ад дома з абрыкосам з'явіцца новая станцыя метро. І салаўі зноў збіраюцца ў эміграцыю, перад якой паспелі насяваць мне аб тым, што каля Адміністрацыі прэзідэнта з клёнаў дбайныя зелянгаспаўцы зразаюць квецень. Маўляў, дбаюць пра чысціню ходнікаў. Бо напачатку асыпаюцца — куды вецер вее — пялёсткі, а за імі — і каштаны-лімонкі...

Думаю, што гэта — яшчэ адна вылазка ці лесавікоў-нацыстаў, ці дрэвасекаў так і неразвітага сацыялізму, пра што збіраюся неадкладна напісаць прэзідэнту. Ён, колішні вясковец, павінен пашкадаваць пасаджаныя яшчэ ці не пры Машэраве каштаны, з якіх па загадзе зялёншчыкаў-апрычнікаў робяць гермафрадытаў, ці па-сучаснаму — кастратаў. Калі ж той ліст не



перададуць адрасату альбо паважаны рэспандэнт не пачуе мой клопат — і ім прысніцца сівы друід з вострым сярпом.

Бо хто нішчыць кветкі — не прычакае ягадаў.

## ...Я

Калі ад аднаго з кіраўнікоў Саюза «чэсных» пісьменнікаў пачуў плётку аб маім хатнім кабінеце з выглядам на дыпламатычны корпус, чамусьці ўсплыла згадка пра апеты Адамам Міцкевічам у «Пане Тадэвушу» кабінет майго даўняга аднафамільца пісьменніка і краязнаўцы канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў Дзяніса Пашкевіча, абсталяваны ў жарале паганскага дуба, у якога было нават сваё імя:

Маёй радзімы дрэвы! Неба мо адкрые
Яшчэ мне к вам дарогу. О, сябры старыя,
Ці вас тады застану? Помню, як раслі вы,
А я вакол вас поўзаў у свой час шчаслівы.
Ці той Баўбліс расце, старэча дуплаваты,
Ў якога ў жарале, не меншым добрай хаты,
Дванаццаць чалавек за стол сядала ўкола?
Ці ёсць Міндоўгаў гай ля фарнага касцёла?
*(Пераклад Пятра Бітэля.)*

На жаль, разам з касцёламі і цэрквамі на нашай з Міцкевічам радзіме нішчылі і гаі з пушчамі. А таму ў класе чацвёртым ці пятым атрымаў я двойку. Першую і, спадзяюся, апошнюю ў жыцці. Двойку па мове, калі адушаўлёнымі назваў і дрэвы. Аднак і дагэтуль упарта ўважаю яе сваёй ці не найвышэйшай адзнакай. Прынамсі, у тым не запярэчылі б мне і пракаветныя друіды, і мае набушаўскія дзяды.

І я, супакоены тым — цьфу-цьфу — стукаю па дрэве...

www.kamunikat.org



# Альдона Мартыненка

музычны крытык, журналіст. Студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Аўтар канцэптуальнай мастацкай аздобы кнігі Вітаўта Мартыненкі «Rock On-Line» (2010). Свае малюнкі і журналісцкія тэксты друкавала ў газетах «Раніца», «Зорька», «Знамя Юности», у зборніку пераможцаў вучнёўскага конкурсу «Вецер свабоды» («Блізкая гісторыя», 2006). Нарадзілася ў 1992 годзе ў Мінску. Жыве ў Мінску.

# «Amaroka» — панкі без замарочак

**Мінскі панк-гурт «Amaroka» яшчэ не назавеш кітамі беларускага року, хоць яны ўжо пяць гадоў праторваюць уласны творчы шлях, стала падвышаюць свой прафесійны ўзровень, удзельнічалі ў такіх прэстыжных CD-складанках, як «Чарнобыльскі вецер» (2006), «НезалежныЯ» (2008), дзялілі сцэну з такімі знакамітасцямі, як «N.R.M.», «Мутнае вока», «zIGZAG». А вось цяпер яны ўжо распачалі ў студыі запіс свайго першага паўнафарматнага альбома. І каб не спазніцца з адкрыццём новага імя, мы вырашылі сустрэцца з лідэрам калектыву Змітром Афанасенкам (вакал, гітара), які акурат і распавядзе, што ўяўляе сабой «Amaroka» сёння ды чаго чакаць ад яе ў будучыні.**

***— Прывітанне! Цудоўна выглядаеш! А надпіс на кепцы гаворыць сам за сябе (у Змітра там фірмовы лагатып «Amaroka» —*** *заўвага аўтара* ***).***

— Прывітанне! Дзякуй! Што зробіш, даводзіцца самому займацца рэкламай (*смяецца*).

***— Скажы, што найбольш складанае ў працы рок-музыкаў?***

— Ну... Я мяркую, самае складанае — гэта здолець данесці сэнс песень да людзей. І яшчэ — каб каманда была камандай!!!

***— Як нарадзіўся гурт «Amaroka»?***

— Гісторыя доўгая і заблытаная, можна гадзінамі распавядаць, як усё зрасталася. Шмат людзей памянялася: сыходзілі, прыходзілі. Цяпер са мной працуюць лідэр-гітарыст Глеб Пігулеўскі, басіст Мішка Шэстак і бубнар Улад Пірожнік. А вось больш падрабязную гісторыю гурта можна прачытаць на афіцыйным сайце калектыву: www.amaroka.org

***— А адкуль у вас такая назва?***

— Назва беларуская, даволі містычная. Да таго ж надзвычай трапна перадае рок-кантэкст. Я знайшоў гэтае слова ў старым беларускім слоўніку В. Ластоўскага, 1924 года выдання. І нам падабаецца такая назва.

***— Хто піша тэксты песень?***

— Я пішу. Раней і іншыя хлопцы спрабавалі пісаць, але не склалася.

***— Што натхняе вас на творчасць? Альбо хто?***

— Не ведаю, што натхняе іншых удзельнікаў гурта, але мяне заўжды натхнялі ці адносіны з дзяўчынамі, ці нейкія іншыя жыццёвыя сітуацыі, якія выбіваюць з раўнавагі...

***— А бацькі як ставяцца да вашай творчасці?***

— Бацькі добра, падтрымліваюць. Не кожная мама можа пахваліцца, што ейнага сына надрукавалі ў «Камсамолцы». Спачатку, праўда, былі траблы, а цяпер ужо ўсё гуд!

www.kamunikat.org

***— Чым займаецеся ў вольны час акрамя музыкі?***

— Усе хлопцы ўжо працуюць, паспелі адвучыцца сваё. Нехта спрабуе наладжваць асабістыя адносіны, нехта выкладае ігру на музычных інструментах, нехта вядзе канцэрты ў клубах, я вось старыя машыны аднаўляю.

***— Чым, на ваш погляд, «Amaroka» адрозніваецца ад астатніх гуртоў?***

— Тым, што «Amaroka» робіць свой стыль, мы — каманда! І стараемся вельмі сур'ёзна ставіцца да творчасці. Я намагаюся зрабіць з «Amaroka» не проста адзін з тысячаў музычных калектываў, а сапраўдны гурт, з сваймі лагатыпамі, стылістыкай. Міша Млявы за апошні год шмат зрабіў для «Amaroka» ў плане стылю музыкі. Я ж усё больш займаюся прасоўваннем і прамоўтэрствам, бо без гэтага цяпер нікуды! І ўдаецца нешта, бо пачыналі ад нейкіх маленькіх актавых залаў, а цяпер выступаем і ў салідных клубах, і вось нядаўна ў верхняй зале Мінскага палаца мастацтваў.

***— «Amaroka» праз пяць гадоў, якая яна?***

— О, ну і пытаннейкі ў вас. Не ведаю, планы ёсць, але варажыць не будзем. Пажывем — пабачым.

***— Чым ганарыцеся як гурт?***






— Тым, што мы адзін з лепшых беларускіх гуртоў, няхай сабе пакуль і мясцовага маштабу, але гэта толькі пытанне часу і, безумоўна, грошай. Усе ж цяпер ужо працуюць і даспелі да таго, каб калясіць з гастролямі па Беларусі.

***— У 2006 годзе вы выступалі на разагрэве «N.R.M.». А як асабіста вы ставіцеся да старажылаў беларускай альтэрнатыўнай сцэны?***

— У мяне да старажылаў асобныя адносіны. Проста, як і ўсюды, хацелася б, каб мацёрыя музыкі з доследам дапамагалі маладым, падтрымлівалі, а на практыцы атрымліваецца наадварот. Тут, як і ў эстрадзе, паўсюль наседжаныя месцы, якія ніхто не жадае саступаць маладым і нявопытным. Мімаходзь пра тое, што ўсе былі пачаткоўцамі, многія хутка забываюць. Але што ж паробіш, так заўжды было і будзе. Гэта сістэма.

***— Што б вы параілі пачаткоўцам рок-сцэны дзеля таго, каб дасягнуць поспеху?***

— Ну, перш за ўсё рыхтавацца да магчымых цяжкасцяў. Трэба мець вялізнае жаданне і памкненне: гурт робіцца не адразу, тут не дастаткова напісаць пару песень і ўсё, ты ўжо вядомы і ўсімі шанаваны. Тут суткі карпатлівай працы ад пошука назвы да выбару стылістыкі і падбору высокакласных музыкаў!

***— Калі параўноўваць тое, якой «Amaroka» задумвалася спачатку, і тое, якая яна ёсць цяпер, вы задаволены тым, чаго дасягнулі?***

— Я б сказаў, што задумвалася кардынальна іншае, але што мы ў выніку маем цяпер мне на 1000% падабаецца. Зрэшты, межаў удасканалення няма, ёсць да чаго імкнуцца!

***— У жыцці ўдзельнікі гурта такія ж пазітыўныя і вясёлыя, як на сцэне?***

— Стараемся, хоць усялякае здараецца...

***— Ці ёсць у вас лідэр у гурце?***

— Гурт без лідэра — гэта не гурт, а бесталковы статак. Лідэр павінен быць, і ён павінен усіх аб'ядноўваць і гнуць лінію, выгодную для каманды. Няхай часам яна здаецца крыху абсурднай, але часта толькі такія рашэнні ўтрымліваюць калектыў ад развала і катастрофы.

***— На якую публіку вы арыентуецеся?***

— Перш за ўсё на інтэлектуальна развітую моладзь, але ў прынцыпе абмежаванняў няма: калі нехта чаго не дагоніць на нашым канцэрце, дык хоць сагрэецца.

***— Ваша песня «Людзі» ўвайшла ў праграму складанкі «Чарнобыльскі вецер». Што падштурхнула напісаць песню на гэткую сур'ёзную тэму?***

— Даўно гэта было. Я нават ужо не памятаю. Здаецца, запісалі песню (неяк сама стварылася), потым я даведаўся, што складанку нехта на тую

www.kamunikat.org

ж тэматыку рыхтуе. Адправіў без найменшага спадзявання, што патрапім. Затое колькі шчасця ў выніку было. А потым былі і іншыя складанкі, напрыклад, у CD «НезалежныЯ» наша песня «Імёны Свабоды» трапіла побач з такімі кітамі, як той жа «N.R.M.», «P.L.A.N..», Памідораў, «B.N.», «IQ48», з маладзейшымі «Глюкі», «Заточка», «Акропаль».

***— Якім будзе ваш першы прафесійны альбом?***

— Ну, самарэзікаў пару мы ўжо кінулі ў свет, а зараз мяркуем замахнуцца на прамысловы тыраж. Праўда, у нас пакуль у калектыве невялікія сямейныя траблы, таму працу над кружэлкай давялося прыпыніць, хоць да запісу было падрыхтавана ўсё. Але гэта ненадоўга. Варажыць не буду, але матэрыял класны, мы вырашылі перазапісаць і некалькі старых хітоў пановаму, а астатняе паводле лініі пазітыву ідзе праз увесь альбом + крыху панкаўскага олд-скула.

***— Што вы хочаце данесці да слухачоў сваёй музыкай?***

— Як і ўсялякі калектыў, мы намагаемся быць люстэркам грамадства, адлюстроўваць свой погляд на нейкія сацыяльныя моманты, якія нас глыбока хвалююць. А таксама нейкія розныя сітуацыі з асабістага жыцця... Усяго пакрысе і ў меру.

***— Што ж, дзякуй, Зміцер, за прыемную гутарку. Было цікава даведацца шмат новага пра ваш гурт.***

# Які лёс чакае MAUZER?..

**Думаю, што на сённяшні дзень гурт MAUZER ведае ўся альтэрнатыўная палова насельніцтва Беларусі і не толькі. Музыкі ўдзельнічалі ў шматлікіх фэстах, складанках, адыгралі вялікую колькасць канцэртаў. Але за апошні час у гурце адбыліся не вельмі прыемныя змены: гурт па сутнасці разваліўся. Мы сустрэліся з лідэрам гурта Янам Маўзэрам, каб даведацца, які ж лёс чакае гурт?**

***— Прывітанне!***

— Хай!

***— Бачу: у цябе добры настрой. Не сумуеш з-за рэчаў, якія адбываюцца ў гурце?***

— Я думаю, усё адбываецца правільна.

***— А калі раптам здарыцца, што MAUZER спыніць свае існаванне, ці плануеш ты далей займацца музыкай?***

— Я нічога не планую ўвогуле.

***— Вы дабіліся таго, аб чым марылі ў пачатку?***

— Не. Мы марылі збіраць стадыёны па ўсім свеце...



Вокладка альбома «Порна».

***— Тым не менш, у гурта шмат прыхільнікаў...***

— Колькі? Мне мала.

***— Чаму Таварыш Маўзэр стаў проста Маўзэрам?***

— Тав. Маўзэр, Маўзэр — пра гэта ўсе пытаюцца. Ну... Так карацей. Назва не нясе ніякага сэнсу.

***— Музыка займае увесь твой час?***

— Далёка не ўвесь, але ў мяне з музыкай стасункі як з дзяўчынай, у якую толькі закахаўся — ты можаш нават не думаць пра яе, але яна ўвесь час у падсвядомасці прысутнічае.

***— Чаму MAUZER атрымаўся менавіта такога стылю? Што паўплывала?***

— Гэта пытанне да псіхолагаў. Ці псіхіятраў...

***— Што ты хочашь пакінуць пасля сябе ў свядомасці людзей?***

— Як у кнізе Мілана Кундэры «Бессмяротнасць». Мной, у тым ліку, рухае жаданне бессмяротнасці. Але я не ведаю наколькі ў выніку апынуся важным для беларускай культуры. Мне здаецца, што гісторыя робіць класікай тое, што некалі было панкам — Пушкін, Маякоўскі, Багдановіч — тое, што стрэліла, што змяніла свядомасць. Шапенгаўер са мной не згодны, яму здавалася, што важнае праз сто год зусім не тое, што важнае зараз.

www.kamunikat.org




***— У беларускай музыкі ёсць будучыня?***

— Чаму не?

***— Што цябе натхняе на напісанне песень?***

— Калі б я ведаў, то пісаў бы больш.

***— Ці гатовы ты саступіць месца новым героям беларускай альтэрнатыўнай сцэны?***

— А гэта хто? Я ў прынцыпе не думаю, што «павінен застацца толькі адзін». Групы робяць разнастайную музыку. Калі хтосьці будзе рабіць тое ж, што й мы, гэта ўжо будзе другасна. Калі не — то навошта саступаць. Мы будзем суіснаваць. Калі ты — пра папулярнасць, то ў любога выканаўцы ёсць узлёты й падзенні. Як інакай?

***— Ці лічыш ты MAUZER сваім дзіцём, якога ты стварыў, выхаваў і вывеў у свет?***

— MAUZER — сумеснае дзіця. Цяжка сказаць, наколькі ўсё залежыла менавіта ад мяне. Розныя людзі стараліся па-рознаму, усе ўдзельнікі рабілі прамыя ці ўскосныя ўнёскі ў тое, чым MAUZER стаў у плане творчасці й папулярнасці.

***— Чаму ўдзельнікі гурта так часта змяняліся?***

— Мне здаецца, не часта. Мы пачыналі з нуля. Бралі ў групу любых людзей, згодных з намі граць. Потым раслі і пачыналі выбіраць.

***— Параўноўваючы альбомы «Радасць» і «Порна» можна заўважыць істотныя змены. Што гэтаму садзейнічала?***

— «Порна» — больш тонкае. Гэта творчае сталенне. Калі мы пісалі песні да першага альбома, то толькі вучыліся. Мы не ведалі, як можна і былі падуладныя стэрэатыпам. Таму альбом гучыць як класіка амерыканскага ню-метала-рэп-кора. І рыфавыя, і меладычныя хады. Хоць і не паўсюль. А потым мы адпусцілі сваё натхненне і рухаліся туды, куды яно нас вяло.

***— Як ты лічыш, з чаго пачынаецца разлад у калектыве?***

— З пачатку.

***— Колькі часу патрэбна на тое, каб тутэйшы гурт стаў сапраўдным кумірам музычнай сцэны?***

— Ад капітала й таленту залежыць.

***— Што, на твой погляд, самае каштоўнае ў жыцці?***

— Я чытаў, што самае філасофскае пытанне — ці варта здзяйсняць самагубства.

***— А сям'ю заводзіць не плануеш?***

— Я нічога не планую.

***— І нарэшце, галоўнае пытанне, MAUZER працягне сваё існаванне?***

— Як Бог дасць.

**Фота: Юля Шадура, Жэня Бык. http://mauzers.org**

www.kamunikat.org

# Анкета «Верасня»

1. Пад чыёй літаратурнай зоркай Беларусь пражыла 2010 год?

2. Назавіце, на ваш погляд, найбольш значныя творы або кнігі, якія з'явіліся сёлета.

3. Якая самая яркая падзея ў вашым творчым лёсе адбылася ў гэтым годзе?

4. Як вы ставіцеся да такой формы паэтычнага існавання, як «слэм»?

5. Ці ўдзельнічалі вы хоць раз у паэтычным слэме? Каго з беларускіх слэмераў вы ведаеце?

6. Ці маеце вы свой блог у інтэрнэце? Як вы лічыце, для чаго ён патрэбны сучаснаму творцу? Чые інтэрнэт-дзённікі вам падабаецца чытаць?

7. Што вас натхняе на творчасць?

8. Што замінае вам тварыць?

9. Ваша «залатая» дзясятка маладых беларускіх аўтараў.

10. Што вы асабіста чакаеце ў творчым плане ад новага 2011 года?



## Алесь Емяльянаў



**1.** На мой погляд, 2010 год Беларусь пражыла пад літаратурнай зоркаю нашай слыннай пясняркі Ларысы Геніюш, чыё 100-годдзе мы адзначалі 9 жніўня. Ларыса Геніюш — гэта сімвал нязломнасці духу, чалавечай годнасці і сапраўднага патрыятызму (у добрым сэнсе гэтага слова). Маё знаёмства з творчасцю паэткі адбылося зусім нядаўна, але ж пакінула незабыўны след і пэўным чынам паўплывала на творчасць. Вершы ўражваюць жыццёвай мудрасцю, адказнасцю за кожнае слова і радок.

**2.** Асабіста для сябе я б склаў такі топ-5 кніг, якія больш уразілі: кніга выбраных вершаў Ул. Някляева «Кон», 2-томны збор твораў Ларысы Геніюш, кніга вершаў Р. Барадуліна «Перакуленае», «Ля дзікага поля» Ул. Арлова, «Бойня № 5» К. Вонегута ў перакладзе П. Касцюкевіча.

**3.** Самая яркая падзея ў творчым жыцці — гэта, безумоўна, выхад у фінал конкурсу маладых літаратараў, арганізаванага беларускім ПЭН-цэнтрам да 100-годдзя Ларысы Геніюш і паездка ў Прагу.

**4.** Слэм — справа вельмі патрэбная і карысная, асабліва для беларускіх літаратараў, бо не ўсе нашыя паэты ўмеюць чытаць свае вершы, а тым больш не ўсе ўмеюць падаць свае творы так, каб гэта было смачна і з густам. Нават добра прыгатаваная страва патрабуе спецый (хаця б солі ці горкага перчыку). І нашым творцам дзесьці не хапае солі ці перцу для прыгатавання таго ці іншага паэтычнага блюда. А слэм дае такую магчымасць. Галоўнае — не перабаршчыць са спецыямі...

**5.** Слэм — з'ява для нашай літаратуры даволі маладая, але ўжо досыць папулярная, і не ведаю чаму, але ж ён неяк мяне абышоў. Вельмі хацелася б паўдзельнічаць у такога кшталту мерапрыемстве.

**6.** Гэтая даволі папулярная з'ява таксама пакуль мяне не зачапіла. Сучаснаму творцу (літаратару, музыку і астатнім творчым людзям) так званы Жывы часопіс патрэбны ў асноўным, каб паведамляць пра якія-небудзь чарговыя мерапрыемствы, ці падзеі ў культурніцкім жыцці, а функцыю дзённіка ён выконвае толькі часткова, шчыра выкласці свае думкі наважыцца далёка не кожны і, па вялікім рахунку, гэта проста інтэрнэт-вобраз,

нябачны і не зусім уяўны, як маска, за якой хаваецца сапраўднае аблічча. Дзённік — гэта нешта патаемнае, вельмі інтымнае, для чаго ён і вядзецца ў асобным сшытку і нікому не паказваецца. Але ж гэта яшчэ больш падаграе інтарэс да творцы. Таму інтэрнэт-дзённік мне падаецца карысным, як крыніца інфармацыі.

**7.** Натхніцца можна чым заўгодна, дзе заўгодна і калі заўгодна. Натхніць можа проста сонечны праменьчык, які пабудзіў цябе ўранку, птушыны спеў травеньскім ранкам і шмат якія рэчы, на якія не заўсёды звяртаюць увагу астатнія. Вось прыклад аднаго з такіх момантаў, калі прыходзіць натхненне:

Прачнуся ў сонечным пакоі
На ложку ў промнях залатых
І штосьці дзіўнае прымрою.

У сне яшчэ, аднак мой слых
Таемныя пачуе гукі,
Птушынай песенькі: «Цень-цень!
Хутчэй прачніся, азірніся!
Які цудоўны сёння дзень!»

**8.** Спіс фактараў, якія замінаюць тварыць, можа быць бясконцым, бо чалавек звык скардзіцца на сваё жыццё, асабліва, калі яго пра тое просяць. Замінаць можа ўсё, пачынаючы ад дрэннага надвор'я за вакном і заканчваючы неўладкаванасцю ў асабістым жыцці.

**9.** Ніколі не засяроджваў увагу на такім пытанні, але ж з вопыту папярэдняга топу беларускіх аўтараў — была ўжо такая спроба вызначыць 100 лепшых беларускіх паэтаў у Віктара Яраца і выклікала шмат палемікі і нараканняў — скажу, што справа гэтая вельмі няўдзячная і суб'ектыўная. Але ж асабіста для сябе я склаў бы такую дзясятку маладых беларускіх аўтараў:

Віталь Рыжкоў
Валерыя (Валярына) Кустава
Віка Трэнас
Рагнед Малахоўскі
Мікола Кандратаў (калі казаць менавіта пра творчую маладосць)
Віктар Ываноў (Лупасін)
Аксана Спрынчан
Сяргей Календа
Ігар Кананові<br>ч
Юлія Новік



**10.** Што можна чакаць ад наступнага года? Новых твораў, напэўна. Было б добра паспрабаваць сябе ў новай якасці — даўно хацеў заняцца прозай, напісаць якую-небудзь сучасную п'есу, паперакладаць.

# Аксана Данільчык



**1.** Я б назвала яго годам перакладной літаратуры, і, такім чынам, годам «Прайдзісвету».

**2.** Зноў жа перакладныя, але, на маю думку, яны ўзбагацілі беларускую літаратуру. Гэта «Правек ды іншыя часы» В.Такарчук (пераклад з польскай) і «Папулярная музыка з Вітулы» М. Ніемі (пераклад са шведскай). Гэта сучасныя аўтары, якія да таго ж з гэтай нагоды наведалі Беларусь. Здаецца, кнігі напісаныя ў розных краінах і дзеянне адбываецца ў розныя часы, але ў абодвух творах месца дзеяння — аддаленыя вёскі, да якіх далятае вецер гісторыі. Магчыма, гэта тэндэнцыя. Ёсць пра што задумацца.

**3.** На жаль, гэты год для мяне не быў багатым на творчыя падзеі. Хоць зноў жа, гледзячы што лічыць падзеяй. Публікацыі і інтэрв'ю — гэта таксама падзеі. Затое ён парадаваў мяне цікавымі падарожжамі, у тым ліку, і па Беларусі.

**4.** Да ўсяго, што спрыяе літаратурнаму жыццю, стаўлюся станоўча. А слэм дазваляе прыцягнуць увагу да літаратуры.

**5.** Сама ні разу не ўдзельнічала. Можна назваць шмат імёнаў, але наколькі я ведаю, вызначыліся ў гэтым жанры Віктар Жыбуль і Вера Бурлак.

**6.** Так, ёсць — danilchyk.livejournal.com. Свая старонка ў інтэрнэце дапамагае знаёміцца з цікавымі людзьмі і абменьвацца інфармацыяй на далёкія адлегласці за кароткі час. З цікавасцю чытаю нататкі з Амерыкі М. Мартысевіч, Ю. Шамецькі з Канады, развагі аб перакладах Lady z shalomam і многіх іншых.

Шчыра скажу, што зусім не радуюць сваркі з абразамі на адрас адзін аднаго. Можа яны і робяць літаратурны працэс весялейшым, але карысці ад іх мала.

www.kamunikat.org

**7.** Жыццё. І цішыня.

**8.** Жыццё. І адсутнасць цішыні.

**9.** З паэтаў — Л. Д. Панамарова, В. Рыжкоў, Ц. Велет, Н. Кудасава, В. Чайкоўская. З маладымі празаікамі мне больш складана вызначыцца, тым не менш, назаву Ю. Каляду.

**10.** Цікавых літаратурных сустрэчаў і падарожжаў.

# Настасся Кухарэнка



**1.** Безумоўна, пад зоркай Ларысы Геніюш. Для мяне гэтая Жанчына, Маці, Паэтка і Хрысціянка ёсць — не магу сказаць была — рэальнае ўвасабленне ўсяго, што я ўкладаю ў слова БЕЛАРУСКА. Я б хацела быць такой жа моцнай духам і вольнай душою, як яна.

**2.** «Кон», Ул. Някляеў;
«Навошта», Р. Барадулін;
«Дзікае паляванне ліхалецця», В. Казько;
«Каралева не здраджвала каралю», А. Бутэвіч;
«Архіпелаг Беларусь», В. Акудовіч.

**3.** Тое, як ён пачаўся. Я даўно пісала вершы, але, шчыра кажучы, ніколі не лічыла іх вартымі друку. А ў мінулым годзе яны з'явіліся ў першым нумары «Верасня», а праз паўгода, зусім ужо нечакана для мяне, — на старонках «Дзеяслова». Я бясконца ўдзячная ўсім, хто палічыў іх вартымі і спрычыніўся да гэтых маленькіх цудаў.

**4.** Вось у гэтым пытанні я дылетант. Вельмі мала ведаю і стаўлюся хутчэй як да аб'ектыўнай рэальнасці, якая мяне суб'ектыўна не кранае. Для мяне паміж слэмам і паэзіяй такая ж розніца, як паміж фальклорам і рэпам. Цалкам згодная, што чытаць вершы перад аўдыторыяй можна і трэба з элементамі тэатралізацыі, перфоманса, калі хочаце. Але яны павінны служыць толькі інструментам для раскрыцця сэнсу твора, а не зброяй для перамогі ў конкурсе.

Паэзія такая ж тонкая і празрыстая з'ява, як крынічная вада. Каб адчуць яе смак і каб яна падзялілася сваёй прыроднай сілай, яе трэба піць асцярожна, зачаравана і з удзячнасцю адчуваць рух кожнай кроплі на вуснах. І будзе цуд. Толькі недасведчаныя будуць імкнуцца выпіць як мага болей, альбо як мага хутчэй.

На жаль ці на шчасце, мы жывем у маленькім Сусвеце, і мода лёгка пераносіць новае з кантынента на кантынент. Вось і слэм прынесла. Новае дыханне, новы імпульс, новы рытм... Можа спачатку варта зведаць хтанічны рытм гэтае зямлі? Маю на ўвазе наш фальклор з яго моцнай і ўнікальнай энергетыкай.

**5.** Думаю, адказ відавочны: не, не ўдзельнічала і не збіраюся. Хаця ўсё магчыма ў далёкім будучым. Ведаю, што ў першым слэме перамог Віктар Жыбуль, а ў другім — Віталь Рыжкоў. Ды яшчэ чула, што Ева Гілевіч ды Надзейка Кропачка бралі ўдзел у адным са слэмаў.

**6.** Не, не маю. Зараз не да блогаў. Таму і інтэрнэт-дзённікі стала не чытаю. Творцу дзённік патрэбны па той жа прычыне што і публікацыі твораў: каб камунікаваць з чытачамі, каб чытаць парады і крытыку сяброў, атрымоўваць новыя ідэі. Праз інтэрнэт значна прасцей падзяліцца са светам сваімі новымі творамі. Але мне сумна, што жывыя чалавечыя стасункі ўсё часцей замяняюцца віртуальнымі.

**7.** Жыццё. Беларусь. Асабліва прырода. Толькі жыццё і людзі здараецца натхняюць на скрушныя думкі і тады, каб не памнажаць сум, якога і так досыць у Беларусі, я звяртаюся да мудрай прыроды. Часам амаль фізічна адчуваю жывую энергію лесу і асабліва балотаў «над ракой Арэсай». Сярод гэтых лясных вазёраў ды балацін схаваная крыніца майго натхнення.

**8.** Нічога. Бо намагаюся кожную хвіліну нешта ствараць. Добры настрой, смачныя стравы (ці будзем спрачацца, што добра прыгатаваная страва — гэта мастацкі твор?), слушныя парады і рэальную дапамогу, вершы, нарэшце. Раблю, што магу, аж пакуль канчаткова не стамлюся. Наконт творчасці, часта бракуе часу занатаваць, гэта — як ва ўсіх.

**9.** Дзясятка, дык дзясятка. Я проста пералічу: В. Кустава, В. Быль, Р. Малахоўскі, А. Спрынчан, В. Рыжкоў, Ю. Новік, В. Гапеева, А. Емяльянаў, В. Трэнас, У. Сцебурака, — і дадам, што магу назваць і больш, а вось перачытаць усіх толькі мару пакуль.

**10.** Вельмі чакаю нарэшце атрымаць дыплом МДЛУ. А творчыя планы пакуль няхай будуць таямніцай. Як ажыццявяцца, то Вы пра гэта даведаецеся.



www.kamunikat.org

# Наста Грышчук



**1.** За ўсю Беларусь не скажу, для мяне ж кожны год праходзіць пад зоркамі Караткевіча, Сыса і Барадуліна. Яны не толькі «свецяць» вялікай мудрасцю, але і скіроўваюць мяне на правільны шлях, не даючы патануць у сучасным акіяне разгубленасці.

**2.** Кніга Рыгора Барадуліна «Халодная памяць вады».

**3.** Падзей у творчым жыцці было шмат. Найбольш яркія — гэта, безумоўна, публікацыі ў часопісах «Маладосць» і «Верасень».

**4.** Як на мой погляд, слэм не столькі паэзія, колькі яе піяр. Калі трэба зрабіць сабе імя, лепшага шляху і не знойдзеш. Тым больш, што ў такіх паэтычных спаборніцтвах элемента шоу больш, чым уласна літаратуры. Даводзілася бачыць так званых «зорак» слэм-культуры, якія з мастацтва слова рабілі нешта пачварнае... З іншага боку, гэткі «бой» — шанец раскрыць сябе як акцёра. У гэтым выпадку размова ідзе не пра паэтычнае спаборніцтва — а пра тэатральнае. Адным словам, стаўленне да слэму неадназначнае.

**5.** Я ў слэмах не ўдзельнічала і, мякка кажучы, не вельмі да гэтага імкнуся. Аднак паэт-слэмер Віктар Жыбуль мяне шчыра захапляе сваім майстэрствам.

**6.** Хаця свайго блогу я не маю (пакуль), усё ж такі лічу, што ён патрэбны сучаснаму літаратару. Інтэрнэт-прастора — гэта яшчэ адзін шлях да чытача, і, як мне падаецца, найбольш лёгкі і кароткі шлях на сённяшні дзень. Выкласці на блогу можна што заўгодна — і новы, зусім свежы твор, і афішу імпрэз, і свае разважанні пра «такое цяжкое» жыццё літаратара... Поўная воля! Што яшчэ трэба для творчага шчасця?

Цікавы інэрнэт-дзённік журналіста і паэта Глеба Лабадзенкі (дзе ён выступае менавіта як журналіст). Заходжу і на іншыя блогі, але вельмі рэдка.

**7.** Што заўгодна: ад мухі на вакне, да касмічнага карабля на арбіце.

**8.** Ёсць вялікая спакуса спіхнуць усё на вучобу ды паскардзіцца, як многа часу яна забірае. Аднак хлусіць не буду: пісаць замінае ўласная лянота. Змагаюся, але пакуль — беспаспяхова.

**9.** Дазволю сабе не адказваць на гэтае пытанне, бо, па-першае, незразумела, каго адносіць да маладых аўтараў, па-другое, уціснуць шматлікіх творцаў у дзясятку даволі складана...

**10.** Чакаць не чакаю, толькі спадзяюся. Спадзяюся, што будуць новыя больш-менш удалыя творы; што з галоў пачаткоўцаў выветрыцца модны тлум; што адкрыюцца новыя яскравыя імёны — і не сыйдуць у нябыт ужо вядомыя. Для сябе ж мне шмат не трэба. Як продкі казалі, што Бог пашле...

# Воля Чайкоўская



**1.** Сёлетні год Беларусь бясспрэчна пражыла пад дзвюма зоркамі. Пад зоркай Уладзіміра Караткевіча, чыё 80-годдзе святкавалі тыя, хто неабыякавы да роднай культуры. І пад зоркай несмяротнай Ларысы Геніюш.

**2.** «Лісты да запатрабавання» Генадзя Бураўкіна (гэты зборнік рыхтаваўся-пісаўся шмат гадоў, і тое, што ён нарэшце выйшаў — сапраўдная падзея. Гэта насамрэч «лісты да запатрабавання» для кожнага, бо кніга працятая шчырымі асабістымі і грамадзянскімі зваротамі-заклікамі да чытача), «Бойня № 5, або Крыжовы паход дзетак» Курта Вонегута (шыкоўны раман шыкоўнага Вонегута ў перакладзе Паўла Касцюкевіча значны як адзін з узораў перакладной беларускай літаратуры, якой, на жаль, вельмі мала і якой павінна быць больш).

**3.** У канцы 2010 года выходзіць другі альбом праекта МЯТNA — «Мітрэнгі»!

**4.** Да слэму стаўлюся нармальна. Адзінае, мне здаецца, што ён вельмі аддалена звязаны з паэзіяй. Хутчэй, гэта нейкі новы сінтэтычны від тэатральнай творчасці. І дакладна не мой спосаб самавыражэння ў паэзіі.

**5.** Я ўдзельнічала ў дыскусіі, прысвечанай слэму, якая адбывалася сёлета ў Мінску з ўдзелам Марка Сміта. Слэм, думаю, гэта такі хісткі, нявызначаны жанр (гэткая гульня ў новую тэрміналогію), што любога беларускага паэта, які добра-выразна чытае свае вершы, можна, па сутнасці, смела ахрысціць слэмерам.

www.kamunikat.org

**6.** Маю ўласны блог, які мне патрэбны для папулярызацыі «творчых выказванняў». Як правіла, змяшчаю там тое, што звязана з уласнай творчай дзейнасцю. Улюбёных блогераў у мяне няма. Часцей за ўсё проста праглядаю «фрэндастужку» і чытаю тое, за што вока зачапілася.

**7.** Унутранае святло.

**8.** Стомленасць, з якой вынікае лянота, — два самыя страшныя ворагі любой творчасці.

**9.** Вельмі складана адказваць на гэтае пытанне, бо я сама «малады беларускі аўтар»... І, наогул, думаю, калі выбраць так шмат аўтараў, то «залатой» гэтая «дзясятка» не атрымаецца, бо прыйдзецца проста пералічыць бадай усіх маладых — не будзе ніякай «выбаркі». Таму назаву тры імені: Віка Трэнас, Марыйка Мартысевіч, Віталь Воранаў.

**10.** Чакаю, што нарэшце на ўсё хопіць часу!

# Валерыя [Валярына] Кустава



**1.** На маё адчуванне, год у беларускай літаратуры прайшоў пад зоркай Уладзіміра Караткевіча. Ягонае 80-годдзе адзначалася сёлета не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Як чалавек, які піша па творчасці Караткевіча дысертацыю, магу адназначна сказаць, што мой год дакладна прайшоў з ягоным імем на вуснах...

**2.** Для мяне — гэта кніга «Маладзічок», якую сёлета выпусціла ў свет мая бабуля Валянціна Юбко (Салаўёва). Гэта кніга для маленькіх беларусаў і для іх бацькоў, якія хочуць гадаваць сваіх дзетак па-беларуску. Бабулі споўнілася 80 гадоў, а яна яшчэ працуе — займаецца методыкай выкладання беларускай мовы, піша... Над гэтай кнігай яна працавала шмат гадоў. Таму для мяне — гэта вялікая падзея!

**3.** Цяжка вылучыць нейкую адну падзею, бо практычна ўвесь год прайшоў у падарожжах па Польшчы, Нямеччыне, Чэхіі, Аўстрыі, Славеніі, Італіі — усе паездкі мелі дачыненне — праўда, у розных ступенях — да маёй літаратурнай дзейнасці. Палову лета я правяла ў Берліне па запрашэнні міжнароднага Літаратурнага калёквіума, дзе жыла і працавала над сваімі новымі творамі, мела выступы... Бадай, гэты час даў мне найболей у плане асэнсаванняў і спраўджвання задумаў.

**4.** Як да магчымасці павыдурняцца ды павесяліцца, якая даецца маладым людзям, якія пішуць вершы. Але ў нас задужа сур'ёзна да гэтага з'явішча ставяцца, як на мяне.

**5.** Удзельнічала, і ў камандным слэме ў Кіеве, і ў Першым беларускім слэме ў Мінску, і яшчэ ў некалькіх... Уваходзіла ў лік пераможцаў. Але магу сказаць, што я не слэмер. Я проста чытаю свае вершы так, як адчуваю. Магчыма, гэтае чытанне можна назваць — выразным, магчыма — тэатральным.

Падаецца, кожны малады беларускі аўтар паспрабаваў сябе ў жанры слэму... Але большасць не прылічваюць сябе да слэмераў. У нас хіба толькі адзін Віця Жыбуль, які так клаўнадзічаў (у добрым сэнсе слова) яшчэ да таго, як сам спадар Слэм дайшоў да Беларусі — і мы дазналіся, як ён называецца. А да гэтага думалі, што гэта аўтарская манера чытання Віктара...

**6.** Так, я вяду блог пад назвай: Дзеўка-паэт-неба (http://valjaryna.livejournal.com/) Гэта вельмі зручна для размяшчэння абвестак літаратурных вечарынаў, справаздачаў з фэстаў, чарнавікоў твораў... Цяпер абсалютна бракуе часу чытаць кагосьці з фрэндаў рэгулярна. Але стараюся праглядаць па магчымасці дзённікі ўсіх сваіх калег і сяброў.

**7.** Калі штосьці зашкальвае ўнутры (ці ціснe зверху) так, што ты не можаш гэтага трываць — то ідзеш і запісваеш. Гэта «штосьці» можа быць не толькі памежна пакутным ды балючым, трывожным ці смутным, але і памежна радасным... Калі раней мяне найчасцей натхнялі вобразы па-засвету, то цяпер усё часцей натхняе само жыццё, што цешыць.

**8.** З большага — нічога. Але здараецца, што папросту не хапае сіл і часу, каб спраўдзіць свае задумы. Мне б хацелася зрабіць так, каб з'явілася (ці зноў вярнулася) у Беларусі такая прафесія — пісьменнік. І каб ёй можна было аддавацца напоўніцу. І я прыкладу максімум намаганняў, каб так сталася.

**9.** Заўсёды на кагосьці ды забудзешся... Пералічваю ў адвольнай паслядоўнасці прозвішчы, што апошнім часам асабіста ў мяне на слыху... Усе-



www.kamunikat.org

валад Сцебурака, Анатоль Івашчанка, Рагнед Малахоўскі, Віталь Рыжкоў, Глеб Лабадзенка, Віктар Жыбуль, Віка Трэнас, Марыя Мартысевіч, Вальжына Морт, Югася Каляда... Наста Манцэвіч, Анка Упала, Віталь Воранаў, Серж Мядзведзеў, Джэці, Дзмітры Дзмітрыеў, Аляксей Арцёмаў, Уладзь Лянкевіч, Сяргей Балахонаў, Юля Новік, Ірына Бельская... Таццяна Сівец, Наста Кудасава, Ганна Аўчыннікава, Таццяна Нядбай, Алесь Емяльянаў, Алесь Вярцейка...

Час, вядома, лепей за мяне скажа, наколькі хто «залаты».

**10.** Новую кнігу. Магчыма, нават некалькі. А яшчэ мне б хацелася, каб у Беларусі з'явіўся свой вялікі міжнародны літаратурны фестываль. Але, бадай, адным годам тут не абыдзешся.

## Глеб Лабадзенка



**1.** Пад зоркай Рыгора Барадуліна, які адзначыў 75-годдзе ў рэанімацыі, і якога Бог трымае на Зямлі.

**2.** Найбольш значны твор і кніга асабіста для мяне — «Ладдзя Роспачы». Гэта першае непадцэнзурнае выданне Уладзіміра Караткевіча, над якім я працаваў цэлы год і якое выйшла да 80-годдзя Караткевіча цалкам на прыватных ахвяраванні прыхільнікаў пісьменніка. У гэтай кнізе я прааналізаваў усе дасяжныя варыянты «Ладдзі» — ад чарнавых накідаў да акадэмічнага кніжнага тэксту. Удалося паэтапна паказаць графічна 296 цэнзарска-рэдактарскіх правак на 23-х старонках рукапісу.

**3.** Я ажаніўся.

**4.** Цудоўна. Раз удзельнічаў. Але назіраць цікавей.

**5.** Самы варты беларускі слэмер — Віктар Жыбуль. Яшчэ ведаю Андрэя Хадановіча, Аксану Спрынчан, Сяргея Прылуцкага, Віталя Рыжкова ды іншых.

**6.** Мой блог — www.labadzenka.by. Выкладаю туды свае артыкулы, вершы, здымкі, розныя цікавосткі. Выкарыстоўваю блог і для правядзення дабрачынных акцыяў — праз блог былі сабраныя грошы на пліту для сястры Васіля Быкава спадарыні Валянціны, дабрачынная акцыя ў падтрымку Рыгора Барадуліна, акцыя па перакладу на беларускую мову сайта электроннай архітэктурнай энцыклапедыі «Глобус Беларусі», сабрана 1200 даляраў на выданне непадцэнзурнай «Ладдзі Роспачы» Караткевіча. Радуюся, калі ўдаецца перавесці віртуальную прастору ў рэальныя справы. Чытаю вельмі мала інтэрнэт-дзённікаў, не сачу за тамтэйшымі падзеямі, бо бракуе часу.

**7.** Бязмежная цікавасць да жыцця.

**8.** У асноўным — праца і неабходнасць думаць пра надзённае.

**9.** Карыстаючыся парадай Андрэя Хадановіча, яго ды ягоных аднагодак маладымі аўтарамі не лічу. З тых, хто прыходзіць адразу ў галаву — Валярына Кустава, Віталь Рыжкоў, Янка Санько, Віка Трэнас, Вальжына Морт, Наста Манцэвіч...

**10.** Чакаю, што ў 2011 годзе мне ўдасца выдаць фотаальбом-манаграфію сямейных здымкаў князёў Радзівілаў. Працую над гэтай кнігай ужо тры гады — і нарэшце хачу патрымаць яе ў руках.

www.kamunikat.org



# Уладзімір Караткевіч

**паэт, празаік, драматург, перакладчык, публіцыст, кінасцэнарыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984 г.). Аўтар кніг: «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі», «Мая Іліяда», «Каласы пад сярпом тваім», «Чазенія», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Зямля пад белымі крыламі», «Чорны замак Альшанскі», «Быў. Ёсць. Буду» і інш. Нарадзіўся ў 1930 годзе ў Оршы. Памёр у 1984 годзе.**



Леанід Дранько-Майсюк

# Кнігі і рукапісы

***Да 80-годдзя Уладзіміра Караткевіча***

Спачатку я ўбачыў кнігі Уладзіміра Караткевіча — зборнік прозы «Чазенія» і першы том рамана «Каласы пад сярпом тваім».

Першую кнігу дадому з давыд-гарадоцкай бібліятэкі прынесла мая цётка Тася, другую ж са свайго хатняга кнігазбору прынесла ў школу настаўніца беларускай мовы і літаратуры Надзея Дзмітрыеўна Васільева.

А яшчэ Надзея Дзмітрыеўна разгарнула перад намі, пяцікласнікамі, зборнік вершаў на той час маладых паэтаў, у якім былі творы Еўдакіі Лось, Уладзіслава Нядзведскага, Ніла Гілевіча, Алега Лойкі, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна і зноў жа Уладзіміра Караткевіча...

Так пачаўся першы мой урок — урок сучаснай беларускай паэзіі!

Вершы былі размеркаваны, мы іх вучылі дома на памяць; пасля, стоячы ля дошкі, расказвалі, і ў класе на розныя лады гучала:

«... часцей, часцей прыпамінай імёны тых, што ўсё зрабілі... трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем... я ўдзячны лёсу, што з усіх краёў ён для мяне навекі выбраў гэты...»

Мне ж дастаўся верш Алега Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...», а майму сябру — шэдэўр Караткевіча «Заяц варыць піва».

Божа мой, які гэта слаўны твор!

Я люблю паэзію Караткевіча, але не захапляюся ёй, аднак жа ёсць у аўтара «Дзікага палявання караля Стаха» вершы, якім пазайздросціў бы й Максім Багдановіч.

«Заяц варыць піва» — з ліку такіх вершаў.

А яшчэ — «О каханне маё бясконцае...»

Паэзія Караткевіча — бачная душа; душа, якая мае кроў!

У эсэ «Званы ў прадоннях азёр» паэт назваў мой Давыд-Гарадок «Пагарынскай Венецыяй» і гэтым самым прымусіў мяне звыклае ўспрымаць нязвыкла...

У 1984 годзе я рэдагаваў альманах «Дзень паэзіі — 84»; галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Серафім Андраюк заўважыў, што ў альманаху няма вершаў Караткевіча.

Каб выправіць гэту памылку, я пазваніў Уладзіміру Сямёнавічу, і ён коратка сказаў:

— Прыходзь...

Памятаю, Караткевіч даставаў рукапісы з шуфляды; гэты былі старонкі, засеяныя выразным почыркам; тады ён адабраў, здаецца, з дзясятак вершаў і папрасіў у выдавецтве перадрукаваць...

www.kamunikat.org

— Калі перадрукуеш, рукапісы вярні...

Я так і зрабіў.

І вось, чамусьці мне думаецца й думаецца, што спачатку я ўбачыў яго кнігі, а рукапісы ўбачыў недзе ў траўні 1984-га — месяцы за два да ягонай пагібелі...

*2 лістапада 2010 г.*

**Уладзімір Караткевіч**

## «На Беларусі Бог жыве»

«На Беларусі Бог жыве» —
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса ў траве
І адвечны зор карагод.
Тую праўду сцвярджае
Упартасць хваль,
І продкаў запавет,
І мовы залатая сталь,
І нашых дум сусвет.
Тую праўду сцвярджае
Усё зноў і зноў
Усім лёсам, —
Няхай спакваля, —
У хмарах дубоў,
У вясёлках агнёў
Купальская наша зямля.
І няхай давядзе мне
Іншая кроў,
Што брашу,
Як сабачы сын, —
А няма нідзе
Вярнейшых сяброў
І прыгажэйшых жанчын.
Гэта край раскрытых душ і дзвярэй,
Гэты край —
Твой дом і сабор...
Ў нас дваццаць з лішнім тысяч рэк,
Адзінаццаць тысяч азёр.
Нам ёсць што піць,
З падмосткаў ліць,
Чым палі свае акрапіць,
А як давядзе, то ёсць нам дзе
І ворага ўтапіць.
І тая памяць жыве не ў царкве,
А ў кожнай жыве галаве:
«На Беларусі Бог жыве...» —
І хай сабе жыве.
А калі ён шле на нас кару і гнеў, —
Ну што ж, — мы з ім свае:
Ў вяршыні самых гонкіх дрэў
Маланка з неба б'е.
У вяршыні маленькіх і ніцых дрэў
Маланка ніколі не б'е.
І пра тое кожны пяе салавей
Росным кветкам у роднай траве:
«На Беларусі Бог жыве», —
І няхай да веку жыве.

## Заяц варыць піва

Туман плыве з нізіны сівы
Над нівай голай і пустой.
«Глядзіце, заяц варыць піва», —
Жартуюць людзі між сабой.
А я відушчым бачу зрокам,
Як ён прысеў каля агню,
Трыгубы, шэры, касавокі,
І піва варыць з ячмяню.
Яліна іскрамі страляе,
А ён прыладзіў кацялок
І трэскай варыва мяшае,
Каштуе, сплёўвае набок.
І піва заяц варыць густа,
А на закуску — бурачок,
Трава, заечая капуста,
Галін асінавых пучок.
З зайчыхай вып'юць па маленькай
І дзеткам трошкі паднясуць,
Пужлівым галаском таненькім
«Цвіцела морква» завядуць.
Пабачыш — не гані з абсады,
Дай хоць на гэты дзень спакой,



www.kamunikat.org

Павінна ж быць і ў зайца радасць
Перад халодную зімой.

***

О каханне маё бясконцае,
Не ўцякай ад мяне, пашкадуй!
За табой, як за светлым сонцам,
Па штодзённай дрыгве іду.

Чарада нада мной жураўліная,
Пада мною — балот віры.
Журавінамі, журавінамі
Кроў мая на куп'і гарыць.

На шляху толькі чорная лотаць,
А за мной, ад маёй крыві,
Утрапёна квітнеюць балоты
Смолкай песень, пярэснай любві.

Кроў сплывае. Няма спакою.
І калі ўпаду нежывы,
Красаванне кветак жывое
Застанецца на месцы дрыгвы.

***

Ў сітнягах над соннай ракою
Бугай вадзяны маўчыць.
Спяць лілеі пад цёплай вадою,
Каб не змерзнуць ўначы.

Калі ж выплывуць ранкам на волю
І распусцяць пялёстаў рой,
З кветкі вылеціць мушка вясёлая,
Што ўсю ноч спала пад вадой.

Залатая, як новы чырвонец,
З цёмнай бронзаю на нагах,
Ўся ў пылку ад лілеі і сонца
Паляціць у шчаслівы шлях.



Каб з табой мы сталі малятамі
І любілі ў начы цяпло, —
Мы б лілею абралі хатаю.
Вось бы добра было!

***

Радок бяззбройны і бясспрэчны
Слабым — адзіна верны шчыт.
І не знікаць паэтам вечна,
У вечнай песні жывучы.

Калі пайду з юдолі гора,
Не скончыўшы найлепшы сказ,
То божы свет мяне паўторыць,
Як паўтараў ужо няраз.

Як моры, зоры і азёры,
Якія ў вечнасць забяру.

Свет шчодры.
Свет мяне паўторыць...

Ну, а не свет, дык Беларусь. —
Мне — досыць...

www.kamunikat.org



# Вітаўт Мартыненка

публіцыст, паэт, перакладчык, музычны крытык.
Працаваў у моладзевай прэсе 80—90-х гадоў, на «Радыё Свабода». Аўтар кніг «Праз рок-прызму» (сумесна з А. Мяльгуем), «Свой сярод чужых», «222 альбомы беларускага року і ня толькі» (сумесна з А. Мяльгуем). Падрыхтаваў і выдаў поўны беларускі тэкст рамана Генрыха Сянкевіча «Quo Vadis».
Нарадзіўся ў 1959 годзе ў Мінску. Жыве ў Мінску.

# CD-калекцыя

## Вечная актуальнасць класікі in rock

*«Мроя» — «Дваццаць восьмая зорка», Мн., 2009, «БМAgroup», паводле ліцэнзіі фірмы «Мелодия», 1989*

Вось жа зноў можам пераканацца, што класіка — яна і ў рок-н-роле класіка. У папулярнай CD-серыі «Беларускі музычны архіў», якая спершапачатку абвяшчалася выдаўцамі як жанрава надзвычай шырокі праект, выходзілі ўжо кружэлкі геніяльных нацыянальных кампазітараў сімфанічнай музыкі (Станіслаў Манюшка, Мікола Равенскі), зборы оперных спевакоў (Міхась Забэйда-Суміцкі, Віктар Скорабагатаў), узоры бардаўскай творчасці (Сяржук Сокалаў-Воюш, Эдуард Акулін), музычнае ўвасабленне класічнай паэзіі (Ларыса Геніюш, Наталля Арсеннева), творы зорак папулярнай песні (Сяржук Новік-Пяюн, Данчык) і г.д. Але на дванаццатым выпуску калекцыя нераў парадавала чарговае адкрыццё — першай рок-старонкай серыі стаў альбом «Дваццаць восьмая зорка» знакамітага рок-гурта «Мроя».

Ну які ж гэта музычны архіў? — спытаеце вы, слушна намякаючы на факт, што і «N.R.M.», цяперашняя рок-зорка №1 на беларускай сцэне, ёсць не што іншае, як «Незалежная Рэспубліка Мроя». Але нельга і забываць пра зменены склад калектыву, пра адметнасць стылістычных нюансаў, варыяцыі тэматычных пошукаў у песнях. Да таго ж у альбома «Дваццаць восьмая зорка» даволі значны ўласны юбілей — 20 гадоў, як кружэлка выйшла грунтоўным вінілавым накладам колішняга фанаграфічнага гіганта — усесаюзнай фірмы «Мелодия» ў Маскве. А дадайце, што гэтага неразваротлівага монстра «Мроя» прабіла тады разам з яшчэ адным класікам нацыянальнага року «Ulis» (альбом «Чужаніца», 1989), і вы зразумееце, як хутка ляціць час, як сплываюць у аналы гісторыі яшчэ нядаўнія прыкметы надзвычайнай сучаснасці.

Хто памятае такія прывабныя адметнасці серыі «Беларускі музычны архіў», як наяўнасць грунтоўнай навуковай падмацоўкі (бібліяграфія, дыскаграфія ды ілюстраваная біяграфія), пэўна, не без подзіву ўбачыць тут яшчэ больш ёмісты аналіз эпохі, у якім жыла і тварыла «Мроя» — першая сапраўды нацыянальная зорка нашай маскультуры. І паверце, нялёгка стаць нацыянальнай зоркай, калі дзяржаўны шавінізм абвесціў сур'ёзную вайну нацыяналізму ў культуры нацыянальных рэспублік, калі нават легендарных «Песняроў», якія ў 70-х захапілі свет менавіта моўнай адметнасцю беларускіх мелодыяў, змушалі да заказных праектаў кшталту рускамоўнага

www.kamunikat.org

Бёрнса, Маякоўскага. Ды нават «Через всю войну» беларусы амаль абышліся без беларускіх песень. Вось такая эпоха і паўстае ў біяграфіі гурта «Мроя», якая змешчана ў серыйным буклеце. Хто ёсць хто ў той эпосе, цікаўныя даведаюцца ў вобразах канкрэтных суб'ектаў падзей.

Найлепшы абрыс той эпохі слухач знойдзе ў саміх песнях гурта, якія не толькі пазбягаюць банальных традыцыйных схемаў мёртвага мастацтва («любіш/не любіш», «спаткацца/развітацца», «весяліся/не напіся»), але і даюць надзвычайны прыклад творчай смеласці, якой не чакалася і ад ангажаванай афіцыйнай эстрады, і нават ад манументальных літаратурных класікаў:

*Чорна-белыя вочы, каляровыя сны,*
*Неспакойныя ночы набліжэння вайны*
*Адчувае кожны трэці.*
*Кожны трэці стаіць у чарзе па віно,*
*Каб была спакайнейшай наступная ноч,*
*Каб суцішыць грукат сэрца, —*

цвердзіць герой загалоўнай песні «Дваццаць восьмая зорка», якую паклікала гнятлівая атмасфера, што апанавала краінай у час руйнавання краважэрнай партыі пасля XXVIII з'езду КПСС. Калі некаму здаецца, што грамадства даўно перажыло тыя праблемы, дык сваю надзённасць зноў ды зноў даводзяць і іншыя песні альбома: «Не бойся, Пеця, нас не засудзяць,/ Бо ёсць наверсе нашы людзі» («Мама-мафія»), «Шмат вякоў цэрквы будавалі,/ Шмат вякоў продкаў шанавалі,/ А цяпер брудна лаемся» («Шмат»), «Там беларусаў вельмі багата,/ Хоць у гасцёх ты гадамі сядзі,/ Там валацугі не лаюцца матам,/ Там нарадзілася «AC/DC»...» («Аўстралійская полька»), «Вось мая зямля пад нагой бяжыць,/ Вось мая зямля у снягох ляжыць,/ Закаваная лютым холадам,/ Падуладная чужым волатам» («Зямля»).

Дзіўная рэч, але стары альбом «Мроі» дорыць сапраўдныя адкрыцці з кожным новым праслухоўваннем, нібыта нейкі надзвычай сучасны бестселер. Але па-за тым трэба мець на ўвазе, што на кампакт-дыску да вінілавай кружэлкі дадалі дадаткова і «Паляванне на вядзьмарак» ды «Ён яшчэ вернецца» — дзве песні з так і невыдадзенага альбома «Зрок» (1987), а славуты альбомны трэк «Я — рок-музыкант» пададзены не толькі ў аудыёверсіі, але і відэа, з канцэрта 1993 года. Які там маладзенькі Лявон Вольскі, ды яшчэ ў дэталёва дагледжаным стылістамі зорным макіяжы!






Не выпадае доўга гаварыць пра тагачасны склад калектыву, бо класіку павінен ведаць кожны. Дый у буклеце кожны знойдзе ўсе патрэбныя звесткі. А вось на мастацкай аздобе, зробленай фронтмэнам Лявонам Вольскім і бубнаром Алегам Дземідовічам, варта спыніцца. Многім загартаваным рок-фэнам яна нагадвае відарыс вядомага брытанскага альбома «DEEP PURPLE in rock», але не прагледзьце нюансы: калі партрэты славутых брытанцаў паўстаюць у грунтоўным каменным увасабленні, дык беларускія музыкі проста гліняныя. У аводвух выпадках пародыя: брытанцы парадыруюць слынны помнік амерыканскім прэзідэнтам у скале, а беларусы дэманструюць вечную мройнасць беларускіх ілюзіяў, якія заўжды нехта здолее растаптаць (адбітак следу і віднеецца на карцінцы). Але «Мроя» ставіцца да гэтага з гумаркам, а ў слушнасці пераконвае і чарговае перавыданне гэтай кружэлкі.

Да таго ж, калі маскоўскія выдаўцы неахайна падрэзалі вельмі сімвалічную для прафесійных мастакоў акантоўку з нацыянальных сімвалаў-васьмірогаў, дык мінскія рэдытары здолелі аднавіць першасную задуму, за што варта падзякаваць новаму дызайнеру Антаніне Ліньковай. Удалося ёй і гарманічна ўпісаць цэльны альбом у структуру серыі «Беларускі музычны архіў», не руйнуючы ягонай сутнасці.

## Час чырвона-чорных тузінаў

*«Прэм'ер тузін'2009», Мн., 2010, West records*

У «Верасні» № 2 за ліпень 2010 года мы ўжо прадставілі адну чырвона-чорную жалобу белшоўбізу — CD «Тузін перазагрузка», аж вось вам і яшчэ адна, гэтаксама тузінская — CD «Прэм'ер тузін'2009».

Яшчэ пяць гадоў таму, у снежні 2005-га, я аналізаваў у газеце «Голас Радзімы» першую складанку музычных шлягераў, выдадзеную паводле вынікаў хіт-парада «Тузін гітоў», і, натуральна, не мог не падзівіцца маштабнасці, надзённасці, пільнасці праекта: «За сорак (на той час) этапаў назапасілася столькі яркіх песень, што акрамя 12 залатых шлягераў (ад мінскіх «Крамы» і «Partyzone», бярозаўскага «:B:N:», гродзенскай «Айшы») дыск уключыў у фармаце mp3 яшчэ 30 небанальных твораў, якія мо і менш вылузваліся на слых інтэрнэт-меламанаў, але неадночы дасягалі вяршыняў таго плебісцыту: медыевальная музыка «Старога Ольсы», меладычныя блюзы «P.L.A.N.», модныя хіп-хопавыя замесы «IQ48», няўрымслівы панк-рок «Нейра Дзюбеля» і «Жыгімонта Вазы», традыцыйная эстрада Ірыны Дарафеевай і Стэфана ды нават класічныя традыцыі «Camerata»...».

Па шчырасці, ніякіх структурных зменаў у праекце не адбылося: 12 mega-tops + 30 бягучых усплёскаў творчай удачы. Толькі раней у гэтых ліч-

www.kamunikat.org




бах выразна чуўся водгук на тое, аб чым на працягу года пераважала меламанская пагалоска, а цяпер...

Вось і прыгадваю ўражанні мінулага года: двойчы выступаў у сталіцы бярозаўскі гурт «:B:N:» і абодва разы з татальным аншлагам. Першы раз была звыклая прэзентацыя чарговага перавыдання дэбютнага альбома «Не трывай!», на якую мая дачушка Альдона зацягнула ў клуб «Reactor» не толькі мяне, але і з пяток сваіх школьных сяброўак. А потым было святкаванне 10-годдзя гурта, на якім трашчаў па швах ад перапоўненасці новы «R-Club». І такі вэрхал учынілі невыпадковыя маргіналы, якіх заманіў танны PR ці ўзмоцненая рэклама, а надзвычай актыўны люд, які падпяваў на канцэрце ўлюбёныя песні, актыўна зазіраў у музычны кіёск, скупляючы і новыя выданні сваіх улюбёнцаў, і ўсялякую іншую беларускую музыку, якую там можна было слухануць на плэеры.

А яшчэ з падзеяў года ўспамінаюцца прэзентацыі новага альбома гурта «P.L.A.N.» — «У пошуках страчанага». Уражвалі яны не толькі меладычнымі песнямі, але і колькасцю сваёй. І гэта былі выступы надзвычай розныя — ад акустычных ва ўсялякіх партыйных офісах ды маленькіх клубах да маштабных фестывальных сцэнаў (у Львове, Чарнігаве) і к/з «Мінск». «P.L.A.N.» аб'ехаў усю рэспубліку з канцэртамі (Брэст, Гомель, Віцебск, Наваполацк, Магілёў, Бярозаўка, Смалявічы, Вілейка)... А колькі спрэчак было ў інтэрнэце пра тую ж «Песню случчака» альбо неверагодна пушыстыя Плясанаўскія кавэры на расійскую песенную класіку, на заходнія супер-хіты, на ўкраінскія перапеўкі (напрыканцы года некаторыя з іх трапілі і на эпахальны CD «Беларускі глобус» побач з кавэрамі наймаднейшых сучасных куміраў «Крама», «Neuro Dubel», «Partyzone», «Мутнае вока», «IQ48»).

Ну а як жа не ўзгадаць фестывальныя поспехі беларускага року! Колькі адкрыццяў было ў Чарнігаве на «BeFree»! А перамогі гродзенскага «TlustaLusta» і магілёўскіх «Глюкаў» на «БАСовішчы»! Абодва апошнія выдалі каркаломныя альбомы, прычым другі з названых паспеў разваліцца перад выхадам свайго «Ідыятызму»... Бясконцыя гутаркі пра гэта ўвесь год бянтэжылі беларускі інтэрнэт і музычную прэсу, уздымаючы процьму пытанняў. Ніякіх адказаў на тыя пытанні складанка «Прэм'ер тузін» №5 не дае (хоць дачка аднекуль ведае ўжо пра неа-глюкі — пад назвай «Akute»), бо няма на CD ні «Глюкаў», ні «TlustaLusta», ні «P.L.A.N.», ні «:B:N:» ні «Akute». Няма нават тых, хто прэтэндуе на званне бэнд №1 у розных плынях беларускага року: «N.R.M.», «Крама», «Znich», «Уліс» і г.д., хоць яны тым часам не маўчалі.



З аднымі «Тузін» пасварыўся, другіх не прымае з-за нейкіх тактычных меркаванняў, а слухачу застаецца тупа верыць у магчымасць аб'ектыўнага выбару ў Беларусі — ты галасуеш, а яны падлічваюць. У выніку ўсе размаўляюць пра адно, а як даходзіць да выбараў, галасуюць за нешта іншае, патаемнае.

Праўда, не скажу, што «Тузін» №5 такі ўжо цалкам нягеглы. Калі няма «N.R.M.», дык ёсць жа Лявон Вольскі, які з Уладзімірам Пугачом («J_Морс») і сябрамі стварыў нейкі сумесны праект «Такога няма нідзе». А пра яго таксама не змаўкаюць пагалоскі. Знайшоў я ў mp3 і адну песеньку таямнічага праекта «Крывакрыж», да якога чамусьці цягнула. Нарэшце паслухаў, каб вызначыцца, ці шукаць іхні паўнафарматны альбом «Гімны вайны». Дый увогуле, з 42 хітоў знойдзе слухач і нямала іншых традыцыйна прывабных імёнаў (Вайцюшкевіч, Камоцкі, Несцярэнка, «Палац», «Neuro Dubel»). А колькі новых імёнаў («Djum», «Da! Бл...», «Avana», «Glofira»), аж самі выдаўцы робяць на іх памылкі ў буклеце («Glfira»)... Бы падманлівая спадзяванка на будучыню, каб слухач, як у іх кажуць, «не ствараў сабе трывалых куміраў». А мо знойдзе акурат трывалых?

Абы хапіла настойлівасці дабрацца да іх праз «скарбонку» падноўленай няўцямнай старызны кшталту «Белы снег» Паплаўскай і Ціхановіча, пад якую яшчэ маю маму на пенсію праводзілі, неамаргіналаў «Dzed», «Остап Бендер», «Жнюв», «Crimsonland», якія так закранулі музычную публіку, што нават ніякай паказкі пра іх не ўзнікла за год.

## У чым «Загана крыжовых паходаў»?

*«Vicious Crusade» — «The Unbroken», Мн., 2009, «БМAgroup», паводле ліцэнзіі «Metal Records», 1999.*

Менавіта пра метал-экстрым меламаны найперш прыходзяць да думкі, калі спрачаюцца, які стыль рок-музыкі ў Беларусі мае найбольшыя патэнцыялы нацыянальнай свядомасці. Праўда, апаненты імпэтна крыюць гэтую высноў ву нібыта слушным тэзісам, што найвялікшыя зоркі беларускай метал-музыкі ўсё ж традыцыйна англамоўныя — «Gods Tower» і «Vicious Crusade». Але ж невыпадкова ў 2005 годзе ў Расіі ды Беларусі выйшаў падвойны альбом-трыб'ют «Варта Вежы Багоў», у якім песні «Gods Tower» былі пераспяваны па-беларуску не толькі нашымі музыкамі, але і расіянамі ды ўкраінцамі. Дый сам «Gods Tower» у 2001 удзельнічаў у складанцы «Hard Life — Heavy Music» з беларускай песняй «Ухвала Сонца». Не гэтак усё адназначна і ў творчасці «Vicious Crusade», што паказаў і выдадзены кампаніяй «БМAgroup» да 10-годдзя адзін з першых альбомаў «The Unbroken» з бонусамі.

www.kamunikat.org

Каб я быў радыёдзіджэем у вольнай краіне, дык ужо толькі паводле таго перавыдання мог бы зрабіць цалкам беларускую праграму пра «Vicious Crusade». І без аніякіх вычварэнстваў, бо творчасць таленавітых музыкаў ніколі не падпадае пад класічнае азначэнне абсурднасці сучаснай эпохі, «калі другі артыст народны не знаў і двух народных слоў, затое меў тут харч нязводны і ўволю цешыўся з аслоў». Не аслы і «Vicious Crusade», якія вызначылі сваім брэндам заганнасць крыжовых паходаў: пачнем з таго, што прыгледземся да англамоўных песень гурта. Як вы мяркуеце, пра што твор Дзмітрыя Басіка «Land of the lakes»? Ды няйначай пра нашу родную зямлю азёраў! А пра «Тодараву песьню» і казаць няма чаго, бо сам Тодар Кашкурэвіч грае там пранікнёную мелодыю на беларускай дудзе. Ну а што мова англійская, дык чаго не зробіш дзеля ўмоваў салідных еўрапейскіх прадзюсараў. Затое дух беларускі застаўся. А вось у славутай песні «Айчына» не толькі дух, але і мова, і покліч:

*Айчына, скажы ў трывожны час,*
*У цяжкія гады ці адчуваеш ты*
*Патрэбу ў кожным з нас?*
*І мой уласны лёс ці звязаны з табой,*
*Адзінаю маёй? Скажы, Айчына!*

З такім геніяльным тэкстам Паўля Ермака «Vicious Crusade» у 2003 трапілі ў другую частку грандыёзнай складанкі «Hard Life — Heavy Music», а для новага выдання альбома «The Unbroken» твор быў нанова перазапісаны з удзелам запрошаных музыкаў — вакаліста гурта «Znich» Алеся Таболіча, вакаліста гурта «Aillion» Кастуся Дударава (ягоны юначы вакал асабліва вылучаецца). Абедзьве версіі настолькі адрозныя, што разам не сапсавалі б тую перадачу.

Але і на тым не сканчаецца беларускі кантэкст альбома «The Unbroken», які выйшаў у свет пасля дэбютніка «Life That Kills». Упершыню ў ягоным перавыданні апублікаваны яшчэ адзін беларускі бонус — «Апошні спеў». Не дай, Божа, каб назва стала прарочай лебядзінай песняй, але новы тэкст Паўля Ермака надта пякучы. Гэта глабальны роздум над сэнсам жыцця:




*Чым ёсць жыццё: мо Божы дар,*
*А можа шлях бясконцых мар?*
*Чым вера ёсць — святлом ці тым,*
*Ці хворым трызненнем маім?*
*Да перамог звіняць званы*
*Ці да бясконцае вайны?*
*Нясу свой крыж, мой лёс гарэць*
*Ці пад нябёсы узляцець.*

*А дзе ж сябры? Не стала іх:*
*Хто стаўся здраднікам, хто знік...*
*А цемра вочы засціць мне,*
*Яны ў крыві ды ймгле.*
*Ніяк не вырвацца з яе,*
*Дапамажы ў змаганні мне.*

Па-за іншымі крытэрыямі тут ніяк не абыдзеш назойлівае дэжавю. Ну хіба не памятаеце:

*Нам ніколі ніхто патлумачыць не змог*
*Сэнс пакутлівай з'явы на свет:*
*Ці нас д'ябал вядзе, ці пільнуе сам Бог,*
*А жыццё — гэта вэрхал бед.*

Так, гэта ранні «P.L.A.N.», знакамітая песня «Шукальнікі сэнсу» (1968/2002). І такая пераемнасць традыцыяў толькі ўражвае, бо паказвае, што «Vicious Crusade» не фармальна капіюе модную нацыянальную плынь беларускага року, а трапна развівае ейную змястоўную базу.

Аўтарства музыкі адзінаццаці асноўных трэкаў альбома выдаўцы прыпісваюць усяму гурту «Vicious Crusade», а вось англійскія тэксты згаданы Зміцер Басік (вакал, гітара) ствараў з дапамогай Алеся Вертэля (гітара). Праўда, да неадназначнай шматмоўнай (але не для беларусаў) «Patriot Games» далучыўся яшчэ і М. Шчур.

Хітоў тут шмат, многія з іх здаўна падабаюцца публіцы, але такога глыбокага пранікнення ў свядомасць суродзічаў, як «Айчына» і «Апошні спеў», ім наўрад ці наканавана.

Распачаўшы гутарку пра тагачасны склад гурта (канца 90-х), нельга абысці ўвагай і яркую прыгажуню-вакалістку Таццяну Лабаду, экзатычнае аблічча каўказскай нацыянальнасці Баграта Вартаняна, які віртуозна пілiць на скрыпцы і клавішных, каларытнага басіста Сяргея Адынца. Ну і, безумоўна, нельга забыць бубновага караля Аляксея Гладыша, які і тады, і пазней запальваў не толькі ў «Vicious Crusade», але і ў «DeadMarsh». У буклеце згадваюцца і нямала іншых імёнаў, але разабрацца ў ягоным чужамоўі не надта проста: колькі ж насамрэч там вакалістак ды басістаў і дзеля чаго?

Не выпадае тут надта глыбока аналізаваць english або francoise тэксты, бо ў апошнім я не надта кампетэнтны, а вось першы... Ну добра, безумоўна, што герой загалоўнай песні дзярэ горла, што «I fight for My Land», але за якую сваю зямлю ён збіраецца змагацца — мо за Чачню, Карабах ці за Прыднястроўе?.. Дый сярод палеглых за «родны» Афганістан 30% беларусаў, а краіна Беларусь ці расквітнела ад таго, каб яе зноў піхаць у саюзы з вечна ваюючым бокам? Праўда, не музыкі вінаватыя ў гэтым, але таму я і аналізую больш беларускамоўныя песні, бо акурат у адсутнасці цвярозай свядомасці нацыі вінаватая процьма не звернутых да нашай свядомасці песень.

www.kamunikat.org




Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку
Пятру Паўлавічу Шаранкову і спадару Паўлу П.
за падтрымку ў выданні
трэцяга нумара часопіса «Верасень»

Да ведама аўтараў: рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца
Рэдакцыя не нясе адказнасці за выкладзеныя ў аўтарскіх тэкстах факты